# ВЕРХНЯДЗВІНСКІ РАЁН

У 2-х КНІГАХ

Кніга 1

МІНСК
«ПАЛІГРАФАФАРМЛЕННЕ»
1999

# 1941

# 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

### На рубяжы жыцця і смерці

На досвітку ў трывожныя дні 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзе, пачала вайну супраць СССР. Вораг меў значную перавагу ў артылерыі і амаль двайную — у жывой сіле. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне байцоў Чырвонай Арміі, войскі Заходняга фронту не змаглі стрымаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія імкліва рваліся на ўсход.

Жыхары раёна мужна сустрэлі цяжкую вестку аб пачатку вайны. Адразу ж адбыўся раённы актыў, на якім былі абмеркаваны неадкладныя меры па пераводзе мірнага жыцця на ваенны лад. Патрэбна было правесці мабілізацыю мужчын прызыўнога ўзросту, вывесці калгасную жывёлу, тэхніку на ўсход, эвакуіраваць архівы. Жыхарам выдавалася з крамаў усё, што там было, каб нічога не засталося гітлераўцам. Прадумваліся спісы тых, хто павінен быў застацца на акупіраванай тэрыторыі для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. У калгасах, у буйных населеных пунктах праходзілі мітынгі і сходы, на якіх жыхары раёна з гневам і абурэннем успрынялі вестку аб вераломным нападзе гітлераўскай Германіі, заяўлялі аб сваёй рашучасці са зброяй у руках абараняць Радзіму.

Улічваючы складанасць сітуацыі, 25 чэрвеня 1941 г. Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання прыняла рашэнне аб стварэнні ў тыле Заходняга фронту абарончага рубяжа на лініі: сярэдняе цячэнне ракі Заходняя Дзвіна — Віцебск — рака Днепр да Краменчуга, а таксама аб перадыслакаванні і канцэнтрацыі на гэтым рубяжы групы армій Рэзерва Галоўнага камандавання (19-я, 20, 21 і 22-я) на чале з Маршалам Савецкага Саюза С.М. Будзённым. Рэзервовыя арміі тэрмінова накіроўваліся з Уральскай, Прыволжскай, Паўночна-Каўказскай і іншых акруг, атрымаўшы задачу да зыходу 28 чэрвеня заняць і ўтрымліваць абарону па лініі Краслава — Дзісна — Полацкі умацаваны раён — Віцебск — Орша — рака Днепр да Лоева. Яны налічвалі 37 дывізій, што даўкамплектоўваліся на Беларусі яе жыхарамі, у тым ліку і ўраджэнцамі Верхнядзвінскага раёна.

Помнік савецкім артылерыстам, якія вялі бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў ліпені 1941 г. каля вёскі Добранікі.

Прыбыўшыя з рэзерва арміі разгортваліся на шырокім фронце. 22-я армія генерал-лейтэнанта П.А. Ершакова рыхтавалася да абароны на ўчастку ад Ідрыцы да Дрысы і далей па Заходняй Дзвіне да Віцебска. У яе тыле размяшчалася 19-я армія, якой камандаваў генерал-лейтэнант І.С. Конеў.

Падрыхтоўка да абарончых баёў на мяжы рэк Заходняя Дзвіна і Днепр адбывалася ў надзвычай складаных умовах. Многія злучэнні і часці 19-й, 20-й, 21-й армій (13 дывізій) знаходзіліся толькі на падыходзе да фронту. Да моманту выхаду нямецка-фашысцкіх войск на рубеж Заходняя Дзвіна — Дняпро прыбыўшыя сюды з рэзерва арміі не паспелі сканцэнтравацца, стварыць абарончыя пазіцыі, разгарнуць войскі ў неабходны баявы парадак, наладзіць кіраванне. У той жа час нямецка-фашысцкія войскі мелі істотную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы.

Першы ўдар гітлераўскіх дывізій прынялі на сябе дывізіі 51-га стралковага корпуса 22-й арміі. Да пачатку ліпеня яны трымалі фронт на ўчастку па Заходняй Дзвіне да Краславы і далей на поўнач. Галоўны цяжар баёў выпаў на долю байцоў 112-й і 98-й стралковых дывізій. На працягу першых чатырох дзён 98-я дывізія стрымлівала ворага на рубяжы Заходняй Дзвіны, а 112-я, сфарміраваная на Урале, упарта абаранялася на тэрыторыі Латвіі.

5 ліпеня войскі 112-й дывізіі пад пагрозай акружэння былі вымушаны адысці на новы рубеж, які праходзіў па ўсходнім беразе р. Сар'янкі і правым флангам упіраўся ў Асвейскае возера. 98-я дывізія вяла баі, замацаваўшыся на мяжы Вусце — Дрыса — Дадэкі — Вадва і далей на тэрыторыі Полацкага раёна (Кушлікі).

Адступаючы, часці 112-й дывізіі наладжвалі мінныя загароды ў раёне возера Асвейскае, былі разбураны і замініраваны магчымыя шляхі падыходу праціўніка ад Дагды на Асвею, з вёскі Бігосава на вёску Расіца, ад Краславы да вёскі Вусце і, на выпадак прарыву ворага з поўдня, у раёне вёсак Задзежжа — Каханавічы.

У справаздачы 3-й нямецкай танкавай групы адзначалася: «Кіраўніцтва войскамі ў праціўніка характарызуе энергічнасць і мэтанакіраванасць. У апошніх баях мы панеслі істотныя страты ў тэхніцы і жывой сіле... Рускія салдаты змагаліся ўпарта і бязлітасна, былі вельмі стойкімі ў абароне, па ўсіх даных, знаходзіліся пад добрым кіраўніцтвам камандзіраў».

Але сілы былі няроўныя: толькі супраць 112-й дзейнічалі чатыры варожыя дывізіі. На фронце 98-й дывізіі вораг імкнуўся нанесці ўдар па лініі

Дзісна — Боркавічы і далей у напрамку Невеля сіламі 57-га матарызаванага корпусу.

Байцы і камандзіры Чырвонай Арміі змагаліся стойка і мужна, насмерць стаялі ар'ергардныя заслоны; параненыя, як маглі, дапамагалі сваім таварышам. Але гінулі людзі, выходзілі са строю гарматы, не хапала патронаў і снарадаў, на рэзервы можна было не разлічваць. Байцы, што загінулі пры абароне вёсак Дадэкі і Добранікі, Сар'я і Боркавічы, памерлі ад ран у г.п. Асвея і вёсцы Каханавічы, навечна засталіся невядомымі.

Узнікла пагроза акружэння. 98-я стралковая дывізія крок за крокам адступала на паўночны ўсход. Каб прыкрыць адыход суседа, 9 ліпеня 385-ты стралковы полк 112-й стралковай дывізіі пад камандаваннем А.І. Садава здзейсніў начны марш на рубеж Валынцы — Боркавічы, дзе наступала 14-я матарызаваная дывізія праціўніка. Удар наносіўся ў двух напрамках: левым крылом уздоўж шашы на вёску Валынцы і правым — уздоўж чыгункі на станцыю Боркавічы.

Полк Садава мужна стаяў супраць цэлай дывізіі, яго байцы ўжо маглі лічыцца вопытнымі ваярамі — у адным баі на рубяжы рэчкі Сар'янкі яны нанеслі нечуваны ўрон ворагу, які склаў 2,5 тыс. забітых і параненых гітлераўцаў.

І на гэты раз, 10 ліпеня, фашысты дзевяць разоў беспаспяхова кідаліся ў атакі і толькі пад канец дня здолелі па чыгуначным мосце прарвацца на станцыю Боркавічы. У гэты ж дзень, ведучы абарончыя баі на лініі Валынцы — Ігнатова — Уладычына, за межы раёна выйшла 98-я стралковая дывізія.

Полк Садава ў апошніх баях панёс вялікія страты, у яго шэрагах не засталося і паловы байцоў. Быў цяжка паранены камандзір першага батальёна Лукічоў, загінулі начальнік штаба палка Штрэкер, камандзір трэцяга батальёна капітан Усцінаў, камандзір роты старшы лейтэнант Мікалаеў і многія іншыя воіны.

Тым часам асноўныя сілы 112-й дывізіі пад націскам ворага і пастаяннай пагрозай акружэння павольна адыходзілі на ўсход. Апошняя лінія абароны была арганізавана ў раёне азёр Ізубрыца, Страдна, Лісна, дзе праходзіў важны шлях на вёску Юхавічы.

Выключная адвага і масавы гераізм асабовага саставу дывізіі былі адзначаны падзякай Ваеннага Савета 22-й арміі. Прыклад мужнасці, воінскага майстэрства і знаходлівасці паказваў байцам камандзір дывізіі палкоўнік Іван Андрэевіч Капяк, ардэнаносец часоў грамадзянскай вайны. Паранены, ён камандаваў рэшткамі дывізіі, пакуль тая, прарваўшы акружэнне, не выйшла за лінію фронту, збярогшы баявы сцяг часці.

Ужо за межамі Верхнядзвіншчыны з баямі выйшла з акружэння ў складзе 1049 чалавек і 98-я стралковая дывізія.

...Роўна праз тры гады тым жа Юхавіцкім шляхам 22-я армія ішла з баямі на захад, вызваляць Асвейшчыну.

*А.Ф. Бубала, С.М. Ходзін*

## Як гэта было

### З успамінаў Рувіма Якаўлевіча Рыца, жыхара г. Верхнядзвінска

Я — з апошняга перадваеннага выпуску Дрысенскай сярэдняй школы № 1. Толькі адгучалі вальсы на выпускным балі, буяла лета. 22 чэрвеня ў гарадскім скверы праходзілі спартыўныя спаборніцтвы. Уся моладзь была там, шмат гараджан прыйшло. І раптам — сірэна. Усе некуды пабеглі. А над галовамі ляцелі самалёты. Пачалася паніка. Адзін банкаўскі работнік нават страляў па самалёце з пісталета. Усе чакалі чагосьці страшнага. З-за Дзвіны ж патокам ішлі бежанцы. Яны ішлі і раней, яшчэ з 1939 г., але зараз іх стала шмат.

Потым па радыё выступіў Молатаў, аб'явіў пра вайну. Усё ў жыцці стала хісткім, няпэўным. Цывільнае насельніцтва рушыла ў эвакуацыю, кожны як мог. Мая сястра, што працавала ў банку галоўным бухгалтарам, у суправаджэнні двух чалавек павезла на крытай машыне банкаўскія дакументы ў Маскву. Дарэчы, праз усе прыгоды ваеннага шляху яны завезлі ўсё куды трэба, і гэта дапамагло потым Дрысе пасля вызвалення вырашыць пэўныя фінансавыя праблемы.

Дырэктар банка даў нашай сям'і падводу, і мы, некалькі сем'яў, рушылі ў невядомасць. Ехала паклажа, мы ж самі ішлі пеша. Аднойчы ўдалечыні спусціліся парашутысты ды накіраваліся да нас. Пыталіся, што бачылі мы па дарозе. Форма на іх была чырвонаармейская, але, мусіць, гэта былі немцы.

У Юзэфове наляцелі самалёты, пачалася бамбёжка. Мы кінулі свае пажыткі і пайшлі ў бок Невеля. Начавалі проста пад адкрытым небам, харчаваліся, чым бог адорыць. Цягнікі праз Невель ужо не хадзілі, і мы дайшлі аж да Таропца. Там удалося сесці на цягнік, які давёз нас да ст. Шуя ў Кіраўскай вобласці, дзе нас, бежанцаў, вельмі сардэчна і добра сустрэлі, дапамаглі перажыць вайну. Адсюль пачалася і мая франтавая дарога.

### З успамінаў Іосіфа Васілевіча Русака, жыхара г. Верхнядзвінска

Якраз напярэдадні вайны я скончыў 7 класаў. 22 чэрвеня пра вайну мы пачулі па радыё, а 23 ужо аб'явілі мабілізацыю мужчын і хлопцаў 1906—1921 гадоў нараджэння. Я праводзіў сваіх канчанскіх старэйшых сяброў у Асвею. Неўзабаве пачалася бамбёжка Асвеі, увесь цэнтр ляжаў у руінах. Загінула шмат мірных жыхароў.

Мне ўжо было 16. Усіх нас, 280 навабранцаў, накіравалі за лінію фронту па зброю. Вярнулася 150 чалавек, на 75 % з нямецкімі вінтоўкамі. Боепрыпасы сказалі здабываць у баі. Меўся на ўсіх адзін кулямёт. Палову з нас абмундзіравалі ва ўсё нямецкае, палову — у маскхалаты. Харч здабывалі, як маглі. Я вяртаўся ўжо у тыфозным стане, шмат што вылецела з галавы. Ведаю толькі, што моцна дапамагала нам пад Пустошкай тамтэйшая настаўніца нямецкай мовы. Яна пераўяла нас проста цераз чыгуначны пераезд, патлумачыўшы ў паставой будцы, што гэта ідзе нямецкі атрад на аблаву супраць партызан. А за чыгункай ужо быў тыл, дзе я і ваяваў, як і шмат хто яшчэ з канчанцаў, у 7-й Калінінскай брыгадзе.

### З успамінаў Івана Іосіфавіча Талкачова, жыхара г. Верхнядзвінска, былога партызана

Пра вайну я даведаўся на вяселлі. Гулялі ў Стралках. Дзяўчына была мясцовая, а хлопец — з Кабыленцаў. Мо не паспелі яны і шлюбную ноч разам прабыць. У разгар застолля прыйшоў старшыня калгаса, і вяселле ператварылася ў мітынг. Нам аб'явілі пра вайну, а праз дзень прыйшло прадпісанне з'явіцца ў Асвею. Сабралі нас, чалавек 100, у Доме культуры, што месціўся ў былым панскім палацы, і аб'явілі пра стварэнне знішчальнага батальёна. Там, у клубе, мы жылі і вучыліся. Вывучалі зброю — вінтоўку, гранаты ды тое-сёе з тактыкі.

Калі пачалі бамбіць райцэнтр, мы атрадам чалавек на 30 рушылі на ўсход — праз Лісна і Юхавічы ў накірунку Невеля. Ля Белага возера «асабісты» забралі ў нас камандзіра, патлумачыўшы, што ён здраднік.

Да Невеля мы не дайшлі кіламетраў пяць і паспрабавалі далучыцца да воінскай часці. Толькі вельмі хутка камандзір часці сказаў, што мы ўсе акружаны, і параіў разыходзіцца малымі групамі. Тым, хто адышоў недалёка ад дому, ён даў параду прабірацца дахаты. Так мы і зрабілі. Вярталіся разам з калгаснікамі калгаса «Чырвоная Армія», якія гналі назад, у Свяціцу, свой статак. З імі дайшоў я да Лісна, бо жыў у суседнім Страдне.

Хутка мы з сябрамі па заданні падполля ўжо вербавалі хлопцаў у партызаны. Хадзілі ў Іванцова, Каменцы, Стараселле і іншыя вёскі. Усе сувязі ішлі праз Якава Зунду. Да канца ліпеня 1942 года ў нашым першым партызанскім атрадзе налічвалася ўжо 60 чалавек.

## Дакументы сведчаць

### З ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б АД 22 ЧЭРВЕНЯ 1941 г. «АБ ЗАДАЧАХ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ У СУВЯЗІ З ВЫСТУПЛЕННЕМ ПА РАДЫЁ НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ СНК СССР ТАВ. МОЛАТАВА В.М.»

...Созвать в Минске и в других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки...

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии.

Секретарь ЦК КП(б)Б П.К. Пономаренко.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 1.*

### З ДЫРЭКТЫВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) АД 29 ЧЭРВЕНЯ 1941 г. ПАРТЫЙНЫМ І САВЕЦКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПРЫФРАНТАВЫХ АБЛАСЦЕЙ

...4) При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки его в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно, безусловно, уничтожаться.

5) В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С. 50—51.*

### З ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б АД 1 ЛІПЕНЯ 1941 г. ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ І КАМСАМОЛЬСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПА РАЗГОРТВАННІ ПАРТЫЗАНСКАЙ ВАЙНЫ Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

...2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

4. Подпольные организации и партизанские отряды должны иметь явочные квартиры, адреса которых сообщить военному отделу ЦК. Эти явки помогут держать связь, объединять [подпольщиков] и направлять [им] директивы и помощь.

5. Твёрдо помнить, что партизанская борьба не имеет ничего общего с выжидательной пассивной тактикой. Она имеет боевой наступательный характер. Не надо ждать врага — надо его искать и уничтожать.

6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолёты, устраивать крушения поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем ни ночью. Убивать их всюду, где застигнешь, убивать чем попало: топором, косой, ломом, вилами, ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть ночью на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков...

7. Нельзя ждать ни минуты, начинать действовать сейчас же, быстро и решительно.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С. 53—54.*

## Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумнавядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі, «Інструкцыі пра асобныя вобласці» да дырэктывы № 21 плана «Барбароса» (13.03.1941 г.), дырэктыве па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы цалкам развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам і план падзелу захопле-

най тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічна цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа, якая склалася гістарычна. Баранавіцкую, Вілейскую, Мінскую (без усходніх раёнаў), паўночныя раёны Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі трэцюю частку тэрыторыі Беларусі. Паўднёвыя раёны Брэсцкай, Гомельскай, Пінскай і Палескай абласцей былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна». Беластоцкая вобласць, паўночна-заходнія раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці далучылі да генеральнай акругі Літвы. Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай вобласці, а таксама большую частку Гомельскай, усходнюю частку Палескай і Пінскай абласцей аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Германская акупацыйная палітыка ўяўляла сабой шырокі комплекс мер, неад'емнымі састаўнымі часткамі і напрамкамі якіх разам з жорсткім тэрорам і вынішчэннем насельніцтва былі ліквідацыя ідэолага-палітычных асноў савецкай дзяржавы, разбурэнне прадукцыйных сіл, паўсюднае ўвядзенне рабска-прыгонніцкай арганізацыі працы, у тым ліку падлеткаў і дзяцей.

З першых дзён акупацыі жыхары раёна адчулі на сабе так званы «новы парадак». Нацысцкае ваеннае камандаванне не толькі лічыла апраўданымі масавы тэрор, грабежніцтва, гвалт, забойствы, але і заклікала салдат і афіцэраў праяўляць жорсткасць у адносінах да мясцовага насельніцтва. Згодна з дырэктывай ад 13 мая 1941 г. за подпісам фельдмаршала Кейтэля «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і асобных паўнамоцтвах войск» узброеныя сілы Германіі «вызваляліся» ад усякай адказнасці за любыя злачынствы на акупіраванай зямлі, афіцэрам вермахта давалася права расстрэльваць па сваім вырашэнні, без суда і следства ўсіх, хто трапляў пад «падазрэнне».

У загадзе, падпісаным Кейтэлем 17 верасня 1941 г., указвалася на неабходнасць «найбольш жорсткіх мер» як у барацьбе з партызанамі, так і ў адносінах да насельніцтва.

Шматлікія карныя арганізацыі і спецыяльныя часці — служба бяспекі (СД), зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), фельдкамендатуры, ортскамендатуры, сельгаскамендатуры, паліцыя, жандармерыя, ахоўныя паліцэйскія часці, войскі СС — усё было кінута супраць савецкіх людзей.

Выканаўчым органам у руках ваеннага камандавання ахоўных войск і камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» былі камендатуры — палявыя (фельдкамендатуры) і мясцовыя (ортскамендатуры), надзеленыя ўсёй паўнатой улады.

У тыле армій «Цэнтр» канцэнтраваліся вялізныя сілы карнікаў. Органы паліцыі бяспекі і СД прадстаўлялі тут спецыяльныя аператыўныя атрады ваеннага тылу, вядомыя пад назвай айнзацгрупы (аператыўныя групы).

Асобую ролю ў сістэме ваенна-фашысцкага акупацыйнага апарату па тэрыторыі «вобласці армейскага тылу» выконвала тайная палявая паліцыя (ГФП). У ГФП набіраліся супрацоўнікі гестапа, нямецкай паліцыі і іншых карных органаў. Каманды ГФП пры мясцовых камендатурах і ахоўных дывізіях дзейнічалі ў кантакце з паліцыяй бяспекі і СД, палявой жандармерыяй і іншымі карнымі органамі.

Для падтрымання «новага парадку», масавага крывавага тэрору была створана сістэма нямецкіх гарнізонаў, а таксама апорных пунктаў дапаможнай паліцыі службы парадку, у якую ўваходзілі мясцовыя жыхары, што перайшлі на службу да акупантаў.

У г. Дрыса была створана раённая ўправа, на тэрыторыях сельскіх саветаў —

воласці на чале з валаснымі бургамістрамі, у вёсках прызначаліся старасты.

Аграрная палітыка на вёсцы была падпарадкавана мэтам рабавання. Рабавалася грамадская ўласнасць, асабістая маёмасць насельніцтва. Яно абкладвалася непасільнымі падаткамі, паборамі, прымусовымі пастаўкамі, працоўнымі павіннасцямі. Нарабаваныя прадукты і жывёлу акупанты пастаўлялі сваёй арміі і вывозілі ў Германію, асуджаючы сялян на голад.

Беларускі народ узняўся на ўсенародную вайну супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У раёне былі створаны падпольныя і камсамольскія арганізацыі, тысячы людзей пайшлі ў партызанскія атрады. Пад выглядам барацьбы з партызанамі акупанты праводзілі карныя аперацыі супраць цывільнага насельніцтва і масава знішчалі яго. У загадзе Гімлера ад кастрычніка 1942 г. гаварылася, што барацьбу з партызанамі трэба весці з «самай бязлітаснай жорсткасцю», што ў гэтай барацьбе не павінна быць палонных, бо яна вядзецца да поўнага вынішчэння. Гітлераўцы паўсюдна ажыццяўлялі палітыку генацыду і «выпаленай зямлі». Гэтая нацысцкая палітыка ва ўсёй паўнаце праявілася ў перыяд правядзення карных аперацый, якія ўяўлялі сабой сукупнасць тэрарыстычных акцый ваеннага, палітычнага, эканамічнага характару, мелі на мэце задушыць партызанскі рух, знішчыць як мага больш цывільнага насельніцтва, устанавіць непадзельнае панаванне фашысцкай улады на акупіраванай тэрыторыі.

Дзесяткі карных аперацый правялі гітлераўцы. Буйнейшая з іх — «Зімовае чараўніцтва» (лют.—сак. 1943 г.). У ходзе аперацыі гітлераўцы забілі і спалілі жывымі толькі ў былым Асвейскім раёне больш за 6000 мірных жыхароў, 2000 адправілі на катаржныя работы ў Германію, больш за 1000 дзяцей — у Саласпілскі лагер смерці (Латвія), разрабавалі і спалілі цалкам 158 населеных пунктаў, у тым ліку каля 120 цалкам або часткова разам з жыхарамі.

За гады вайны на тэрыторыі раёна фашысты загубілі 20 228 мірных жыхароў, на франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 5190 чалавек (у тым ліку 640 партызан і падпольшчыкаў). На тэрыторыі раёна пахаваны 2880 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, спалены 426 вёсак, з іх 186 не адрадзіліся. Не скарыліся савецкія людзі. 9 мая 1945 г. адзначылі вялікую Перамогу над фашысцкай Германіяй.

## Дакументы сведчаць

### З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА*

**7.07.1941**
**Пераклад з нямецкай**

**I. О назначении бургомистров в волостях**

1. На должность бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надежные и квалифицированные лица, по возможности из числа белорусов.

2. Бургомистр является представителем волости.

3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.

4. Бургомистр несет ответственность за финансовые дела волости.

5. Все жители, проживающие в волости по состоянию на 21.06.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.

6. Бургомистры немедленно должны позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и

* Падобныя аб'явы расклейваліся нямецка-фашысцкімі захопнікамі ва ўсіх акупіраваных раёнах Беларусі.

имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.

7. Бургомистры привлекаются к ответственности за совершенные акты саботажа во вверенной им волости. Они должны всеми средствами предотвращать акты саботажа. В их обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.

8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 000 жителей, назначает местный комендант, а в населенных пунктах свыше 20 000 жителей назначает комендант полевой комендатуры.

**II. О запрещении оставления квартир в ночное время**

1. В период с 21-00 до 5-00 утра населению запрещается покидать квартиры.

2. Исключения допускаются по письменному разрешению местного коменданта для лиц, работающих в ночное время на жизненно важных предприятиях, врачами, акушерками, на машинах «скорой помощи».

3. Нарушители будут строжайшим образом наказываться местными комендантами. Как вспомогательными мерами наказания могут быть временный арест с ограниченным питанием, насильственное задержание и привлечение к работам.

**VIII. Создание вспомогательной полиции**

1. Для проведения полицейских мер безопасности бургомистрам поручается привлечь во вспомогательную полицию надежных «фольксдойче», белорусов и, если таковых не имеется, то поляков и использовать эту полицию по согласованию с начальниками команд полиции безопасности.

2. Служащие вспомогательной полиции, которые работают в тесном контакте с местными айнзатцкомандами полиции безопасности и СД, могут поддерживать связь только с местными начальниками полиции безопасности и СД или назначенными ими органами.

3. Служащие вспомогательной полиции носят белую нарукавную повязку с надписью «Вспомогательная полиция».

4. Местные комендатуры до 20-го числа каждого месяца, а впервые к 20.07.1941 года, сообщают о численности и вооружении вспомогательной полиции.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1–2, 4–5.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак*

# Падполле дзейнічае

З першых дзён акупацыі раёна пачалася актыўная барацьба насельніцтва супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У вёсках Сар'я, Прошкі, Боркавічы, у г.п. Асвеі і іншых населеных пунктах ствараліся падпольныя групы. Партыйныя, савецкія актывісты, камсамольцы, школьная моладзь аб'ядноўвалі разрозненыя ачагі супраціўлення ў адну магутную плынь. Патрыёты зрывалі гаспадарча-эканамічныя, палітычныя і ваенныя мерапрыемствы, арганізоўвалі збор пакінутай у месцах нядаўніх баёў зброі і боепрыпасаў, вялі разведку, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, якія прымаў «радыёцэнтр» М.І. Слічнага з вёскі Вышнарава. Разгалінаваным было Асвейскае падполле. Яно аб'ядноўвала падпольныя групы ва ўсіх сельсаветах і асобных вёсках. Падпольшчыкі Асвейскай, Задзежанскай і Малашкаўскай груп сабралі 3 станковыя, 15 ручных кулямётаў, 75 вінтовак, некалькі тысяч патронаў. Яны знішчалі гітлераўцаў, вывелі са строю 14 аўтамашын, 6 танкаў, разбурылі 10 мастоў, сапсавалі тэлеграфную сувязь на шашы Асвея – Полацк, Каханавічы – Расоны, Стралкі – Себеж. Патрыёты арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных, вызвалілі палкоўніка А.Ц. Горскага, батальённага камісара В.П. Уладзіміра, ваенурача А.Ф. Вараб'ёва, якія пазней сталі актыўнымі ўдзельнікамі партызанскага руху. Да вясны 1942 г. было створана 9 падпольных груп колькасцю 100 чалавек.

У жніўні – верасні 1941 г. сетка пад-

Г. У. Капусцёнак.

С. А. Даніловіч.

В. Я. Васілеўскі.

З. К. Савейка.

польных патрыятычных груп, якія спачатку не мелі агульнага арганізацыйнага цэнтра, але так ці інакш былі звязаны паміж сабой справамі, узнікла ў Боркавіцкай зоне.

Былы падпольшчык і партызан спецатрада «Баявы», пісьменнік-мемуарыст Генадзь Капусцёнак даследаваў дзейнасць пяці такіх груп: Фартунаўскай (арганізатары — 15-гадовыя падлеткі Генадзь Капусцёнак і Іван Галынскі), Савейкаўскай (настаўнік Боркавіцкай СШ Станіслаў Даніловіч), Ермакоўскай (сяржант Чырвонай Арміі Уладзімір Падабед, які ўцёк з палону) і дзвюх Боркавіцкіх — былога палоннага лейтэнанта Сяргея Цыры і таксама ўцекача з палону, былога палітработніка Віктара Васілеўскага. Кантакты паміж групамі ўсталяваліся пры вырашэнні канкрэтных задач. Так, зарэчныя групы дапамаглі падпольшчыкам В. Васілеўскага адабраць зброю ў боркавіцкага бургамістра, якую ён захоўваў у Навадворскай царкве, потым адправіць па месцы прызначэння.

Сярод белага дня на дзвюх падводах, нагружаных скошанай травой, на якіх ехалі юны падпольшчык Дзмітрый Вішнеўскі, настаўніца Марыя Зайцава і аграном Фаіна Жалязнова, праз усе Боркавічы і кантралюемыя пераезд і пераправу былі дастаўленыя ў Буракоўскі лес «максім», тры ручныя кулямёты, вінтоўкі і мяхі з патронамі і гранатамі. Неўзабаве ермакоўцы пачалі з блізкага зарэчча абстрэльваць вёску Боркавічы, наводзячы паніку ў гарнізоне.

Праз начальніка разведкі спецатрада «Баявы» В.М. Хартулары («Харын») была наладжана сувязь с партызанамі. Пры падтрымцы партызан і па іх парадах былі «нейтралізаваны» некаторыя паліцаі, распушчана Клімаўшчынская школа, якую ўзначальваў нямецкі паслугач, арганізавана самаабарона, праведзены дывэрсіі па знішчэнні лесапільнага завода і новага лакамабіля.

Вялікую дапамогу аказалі падпольшчыкі Савейкаўскай групы партызанам атрада «Баявы», калі па загадзе з Масквы ён перабіраўся на захад, у іншы раён дзеянняў. Атраду трэба было перайсці чыгунку Полацк — Бігосава і пераправіцца на другі бераг Заходняй Дзвіны. Пераходзілі невялікімі групамі.

У гэты раён, абмежаваны з аднаго боку чыгункай, а з другога — Заходняй Дзвіной, камандаванне атрада паслала разведгрупу з пяці чалавек на чале з Генадзем Капусцёнкам. Праз сувязных, членаў падпольнай арганізацыі Зіну і Веру Савейкаў, група павінна была падтрымліваць сувязь з камандаваннем атрада. Сустрэчы з дзяўчатамі-сувязнымі праходзілі ў лесе ва ўмоўленым месцы.

Разведчыкі і падпольшчыкі дзейнічалі вельмі асцярожна, захоўвалі канспірацыю, але дзесьці ўсё ж дапусцілі промах.

Здраднік высачыў дзяўчат і данёс акупантам.

Раніцай немцы ўварваліся ў вёску Савейкі і схапілі Зіну Савейка. Астатнім падпольшчыкам удалося ўцячы. Пры ўцёках Веру Савейка паранілі ў нагу. Некалькі дзён яна праляжала ў лесе, дзе яе даглядалі падпольшчыкі і разведчыкі атрада «Баявы». Яе брат Валодзя перавёз Веру ў вёску і схаваў там, але немцы даведаліся аб гэтым і схапілі адважную падпольшчыцу.

Гітлераўцы здзекваліся з Зіны Савейка, катавалі яе, патрабавалі выдаць месцазнаходжанне партызанскай разведгрупы. Ёй удалося ўцячы з-пад аховы. Выратаванне, здавалася, было ўжо зусім блізка, але стараста дапамог немцам схапіць Зіну.

Зноў пачаліся катаванні. Зіна маўчала. 19 мая 1943 г. Зіну Савейка, яе дваюрадных сясцёр Лену — 23 гадоў, Зіну — 14 гадоў, брата Валодзю — 16 гадоў — расстралялі.

Падпольшчыкі ведалі, хто выдаў сясцёр Савейка, аднак усе спробы злавіць здрадніка аказаліся безвыніковымі. Затое ім удалося пакараць смерцю другога здрадніка, які наводзіў жах на жыхароў Забор'я і навакольных вёсак. Менавіта на яго сумленні была смерць настаўніцы Скапцовай і іншых патрыётаў.

З ліку падпольшчыкаў расстралялі таксама вучня Боркавіцкай школы Сёму Рудзіна, былога вучня Аляксея Лінова, загадчыка сталоўкі Мікалая Цыру. З усёй групы застаўся жывым былы акружэнец Ігнат Твараповіч, які загінуў у партызанах.

Партызанамі загінулі Мікалай Садоўскі і Аляксандр Рубін, Мікалай Іосіфаў з вёскі Савейкі, Міхаіл Бадун, Міхаіл Вішнеўскі, Уладзімір Казачонак з вёскі Фартунава. Цяжка паранены, падарваў сябе разам з гітлераўцамі Іван Галынскі.

Састаўной часткай Сакалішчанскага партыйна-камсамольскага падполля была Боркавіцкая група.

У 1941 г. падпольшчыкі вывелі са строю лакаматыў, піларараму на лесапільным заводзе, дзесяткі вагонаў на чыгуначнай станцыі. Для атрымання звестак аб працаўніку Марціноўская ўладкавалася на працу перакладчыцай каменданта. Па даручэнні Сакалішчанскага падполля І. Каваленка дамогся адкрыцця Боркавіцкага медпункта. Пры дапамозе сувязной Г. Шанько з лагера ваеннапалонных Баравуха 1-я былі вызвалены і сталі працаваць у медпункце ўрачы С. Бяляеў і К. Шадурскі. Яны аказвалі дапамогу насельніцтву, забяспечвалі падпольшчыкаў медыкаментамі, неаднаразова зрывалі адпраўку моладзі на катаржныя работы ў Германію, у медыцынскіх заключэннях завышалі колькасць захворванняў тыфам сярод насельніцтва. Бяляеў атрымаў пропуск для наведвання хворых у 18 вёсках, што расшырыла яго магчымасці для падпольнай дзейнасці. Атрымліваючы інфармацыю па

Мемарыяльная дошка ў гонар дзейнасці Сар'янскай патрыятычнай групы і партызанскага атрада імя А.Я.Пархоменкі ў вёсцы Сар'я.

Р. С. Лукашонак.

В. І. Лукашонак.

У. І. Вестэнберг.

радыёпрыёмніку, падпольшчыкі вялі работу сярод мясцовых жыхароў. Яны вызвалілі з лагера ваеннапалонных некалькі камандзіраў Чырвонай Арміі.

Шмат карысных спраў на рахунку Сар'янскага партыйнага падполля. Удзельнікі яго збіралі зброю, распаўсюджвалі лістоўкі, зрывалі збор акупантамі прадуктаў харчавання і вываз людзей на катаргу ў Германію, чынілі засады і напады на дробныя гарнізоны. У вёсцы Сар'я разбурылі млын, захопленую муку адправілі ў лес партызанам. У арсенале падпольшчыкаў мелася 12 ручных кулямётаў, ротны мінамёт, 20 вінтовак, шмат боепрыпасаў. У сувязі з пагрозай выкрыцця 21 падпольшчык у маі—чэрвені 1942 г. пайшоў у партызаны. На базе гэтай групы створаны партызанскі атрад імя А.Я. Пархоменкі, які ўжо ў жніўні разграміў паліцэйскі гарнізон у вёсцы Расіца, пусціў пад адхон варожы эшалон каля станцыі Бігосава.

У барацьбе з акупантамі загінулі Л.С. Аткін, А.А. Воранаў, С.Г. Купрын, Е.І. Лядак, П.К. Пілюшкін, М.В. Чыркун. 12 удзельнікаў падполля ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

З жніўня 1941 г. пачало дзейнічаць Прошкаўскае камсамольска-маладзёжнае падполле. Дакладней кажучы, камсамольская арганізацыя калгаса імя Дзяржынскага (Прошкі) не спыніла сваёй даваеннай дзейнасці, адно што дзейнасць гэта змяніла свой змест, напрамак і арганізацыйныя формы.

У вёсцы Прошкі, што размешчана на крайняй поўначы Беларусі, у непасрэднай блізкасці да стыку межаў нашай Беларусі, Расіі і Латвіі, яшчэ да вайны сярод моладзі павагай і папулярнасцю карысталіся пагранічнікі блізкай Доманаўскай заставы. Камсамольцы, сябруючы з вайсковай моладдзю, не толькі ладзілі сумесныя вечарыны, але і дапамагалі ім несці вахту па ахове мяжы з Латвіяй.

У першыя ж дні вайны ў Красоўскім сельсавеце, да якога адносілася вёска Прошкі, быў створаны знішчальны атрад, у які ўваходзілі і мясцовыя камсамольцы. Атрад узначальваў старшыня сельсавета Р.С. Лукашонак, добры арганізатар, валявы і аўтарытэтны чалавек.

Як толькі фронт наблізіўся да вёскі, члены знішчальнага атрада схавалі ўсю зброю ў загадзя вырытых у лесе зямлянках, там жа імі быў нарыхтаваны і пэўны запас харчу.

З прыходам немцаў замест сельсаветаў былі арганізаваны валасныя ўправы, а пры іх — паліцэйскія пастарункі, узнікла сетка нямецкіх гарнізонаў. Бліжэйшы да вёскі Прошкі гарнізон знаходзіўся за 5 кіламетраў, у латвійскай вёсцы Забор'е. У саміх жа лясных Прошках фашыстаў не было, што спрыяла арганізаванай дзейнасці моладзі. Па ініцыятыве камандзіра знішчальнага атрада Р. Лукашонка склікалі камсамольскі сход, на якім быў выбраны сакратаром Васіль Лукашонак. Гэты сход арганізацыйна аформіў падпольную

групу, у якую акрамя іх таксама ўвайшлі дырэктар мясцовай сямігодкі Уладзімір Вестэнберг (з паволжскіх немцаў), Міхаіл і Пётр Лукашонкі, Яўгенія Фралёнак, Марыя Прошка, Антаніна Фралова — вучні 9-х і 10-х класаў, студэнтка Ефрасіння Прошка, былы намеснік старшыні калгаса Герасім Фралёнак. На сходзе ўсе прынялі клятву, замацаваўшы асабістым подпісам яе тэкст:

«Я, член ВЛКСМ, уступаючы ў падпольную камсамольскую арганізацыю, клянуся ў бязмежнай адданасці Радзіме, у тым, што не пашкадую сіл і жыцця ў барацьбе з фашызмам, буду выконваць усе даручэнні арганізацыі. Калі я не стрымаю гэту клятву, то я гатовы загінуць, Мая клічка...»

(Тэкст прыблізны, запісаны па ўспамінах былых сяброў групы. Арыгінал, схаваны адразу пасля сходу на могілках, не захаваўся).

Строга захоўваючы канспірацыю, камсамольцы збіралі зброю, вучыліся валодаць ёю, праводзілі шырокую тлумачальную работу сярод насельніцтва, актыўна шукалі кантакты з патрыётамі з іншых вёсак.

Па даваеннай традыцыі прошкаўцы ладзілі пачаргова вячоркі ў розных населеных пунктах, на іх спявалі савецкія песні, вялі жывыя гутаркі з аднагодкамі пра вайну. У выніку патрыятычны «тонус» навакольнай моладзі быў высокі. Паказчыкам таму наступны факт: ніводзін хлопец з заазёрных вёсак не пайшоў служыць у паліцыю, партызанам жа стаў амаль кожны.

Стратэгічная мэта падпольшчыкаў — стварэнне партызанскага атрада — канчаткова вызначылася, калі цераз У. Вестэнберга была ўстаноўлена сувязь з падпольнымі камсамольскімі групамі вёсак Савейкі і Стралкі — звеннямі разгалінаванага Асвейскага падполля. Усталяваліся цесныя кантакты Р. Лукашонка з кіраўнікамі Асвейскай падпольнай партыйнай арганізацыі. Сумеснымі сіламі стварэнне партызанскага атрада ішло хуткімі тэмпамі.

Адметнай рысай Прошкаўскага падполля з'яўляецца яго інтэрнацыянальны характар. На сувязь з прошкаўцамі выйшаў Аляксандр Гром з латвійскай вёскі Забор'е. Ён стаў наведваць камсамольскія сходы ў вёсцы Прошкі, а неўзабаве і прыняў клятву падпольшчыкаў.

А. Гром стварыў на латвійскай тэрыторыі падпольную агентурную сетку, якая

Сходка прошкаўскіх падпольшчыкаў каля вёскі Сукалі. 1942 г.

Месца былога базіравання латышскага партызанскага атрада каля вёскі Дабраплёсы.

працавала эфектыўна, ладзячы дыверсіі і збіраючы зброю. У хуткім часе частка яго людзей увайшла ў Прошкаўскую арганізацыю. Іх прыцягвала ідэя стварэння ўзброенага атрада, якую лягчэй было ажыццявіць на «вольнай» тэрыторыі.

У арсенал прошкаўцаў сябры з Латвіі не без прыгод даставілі 4 кулямёты, аўтамат, 20 вінтовак, 4 пісталеты, 8 гранат і 9 тысяч патронаў. У якасці «рэкамендацыі» на іх рахунку быў спушчаны пад адхон на Рыжска-Маскоўскай чыгунцы паравоз з 6 вагонамі.

Дзеля канспірацыі і пашырэння дзейнасці А. Гром легалізаваўся як брыгадзір «карчакопаў», якія нарыхтоўвалі ў беларускіх лясах сыравіну для смалакурнага завода. Так яму ўдалося вывесці сваіх людзей з-пад носа гарнізона і мясцовых айсзаргаў, раскватараваць свой «асабовы састаў» па хатах у вёсцы Прошкі і, правёўшы лясны курс ваеннага «ўсенавучу», адправіць моцную баяздольную групу ў першы партызанскі атрад І.К. Захарава, пасля сапраўднай баявой практыкі сумесна з В. Самсанам стварыць на базе «карчакопаўскага» ядра Латвійскую партызанскую брыгаду.

У пачатку красавіка 1942 г. А. Гром пераправіў з вёскі Забор'е ў вёску Прошкі 6 былых акружэнцаў. Іх размясцілі ў лясным «інтэрнаце», дзе ўжо жылі 9 хлопцаў-яўрэяў, што ўцяклі з Асвейскага гета. Уся група «лясных жыхароў» таксама ўлілася ў атрад І.К. Захарава.

Крыху раней, яшчэ ў снежні 1941 г., праз Пятра Лукашонка была наладжана сувязь з падпольшчыкамі суседняга Ляхаўскага сельсавета Себежскага раёна Расіі, якой кіраваў былы старшыня сельсавета Ягор Шакуроў.

Група себяжан была невялікая, але баявітая. У яе ўваходзіў кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, атрыманага за баі на Халхін-Голе, Пётр Сямёнавіч Смычкоў. У яго меўся свой рахунак да немцаў за расстраляную маці. У брыгадзе І.К. Захарава ён стаў выдатным камандзірам атрада. Ды і да прошкаўцаў расіяне прыйшлі не з пустымі рукамі. У вёсцы Ляхава яны знішчылі бургамістра і яго памагатага-даносчыка, мелі добрую зброю.

Важныя сувязі завязаліся праз былога прошкаўскага настаўніка Віктара Язутава, які ўвосень 1941 г. наведаў сваіх сяброў, прыехаўшы з роднай Расоншчыны. Ён паведаміў аб намерах расонцаў стварыць партызанскі атрад. У наступны прыезд у красавіку 1942 г. ён паведаміў ужо каардынаты базы будучага Расонскага атрада. Гэта абумовіла праз кароткі час цеснае ўзаемадзеянне захараўцаў з партызанамі Расоншчыны, разам яны правялі не адну баявую аперацыю.

Такім чынам, Прошкаўскае падполле разам з Асвейскім выканала галоўную за-

Я. К. Шакуроў.

П. С. Смычкоў.

дачу — стварэнне партызанскага атрада. Да канца красавіка 1942 г. такі атрад ужо існаваў і дзейнічаў. Гэта быў атрад «Іванова». Прошкаўцы перадалі ў яго зброю, боепрыпасы і ўсім баяздольным саставам уліліся ў атрад разам з сваім кіраўніком Рыгорам Лукашонкам і камсамольскім важаком Васілём Лукашонкам.

Але падполле працягвала сваю дзейнасць. Васіля Лукашонка замяніла Яўгенія Фралёнак (Громава). Арганізацыя, трымаючы сувязь з партызанамі, дапамагала ім у разведцы, дапамагала камплектаваць атрад надзейнымі людзьмі. У маі 1942 г. прыйшоў у вёску Прошкі былы сакратар ЦК ЛКСМ Латвіі Імант Судмаліс, які шукаў партызан. Пасля своеасаблівай праверкі ён быў накіраваны да захараўцаў, нейкі час ваяваў на беларускай зямлі. За мужнасць і адвагу яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Прошкаўцы паказвалі ўзоры гераізму. Аб гэтым сведчаць і пасмяротныя ўзнагароды тых, хто не вярнуўся з бою, і тых, хто выжыў. Пасівелыя ветэраны штогод прыязджаюць на магілу свайго камандзіра і сябра, Рыгора Лукашонка. Група былых падпольшчыкаў усё радзее, вось ужо побач з магілай Рыгора і грудок зямлі з помнікам Яўгеніі Фралёнак — Жэні Громавай.

Шануючы памяць баявой маладосці, яна пісала:

Мы в юности своей недолюбили,
Прошла она в походах и боях.
Мы в партизанах, мы в подполье были,
Нас не поставил на колени враг.

На вайне загінулі Уладзімір Іосіфавіч Вестэнберг і Ісак Смірын, Міхаіл Сяргеевіч Лукашонак і Ягор Кузьміч Шакуроў, Аляксандр Карлавіч Дубра і Георгій Васілевіч Дубра, Ягор Сямёнавіч Равінскі, Яўген Васілевіч Дубра, Леў Гельфанд, Павел Андрэевіч Жылко.

Фашысты расстралялі і тых, хто дапамагаў, спачуваў або проста любіў падпольшчыкаў, бо сярод іх былі родныя, блізкія, каханыя...

Перамога савецкіх войск пад Масквой і зімовае наступленне Чырвонай Арміі, жорсткасць фашысцкага акупацыйнага рэжыму садзейнічалі актывізацыі партызанскага руху. Яго арганізатарамі і кіраўнікамі на тэрыторыі цяперашняй Верхнядзвіншчыны былі Дрысенскі і Асвейскі падпольныя райкомы партыі.

**АСВЕЙСКАЕ ПАРТЫЙНА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ПАДПОЛЛЕ**

Дзейнічала са жніўня 1941 г. да ліпеня 1942 г. у г.п. Асвея і Асвейскім раёне. Арганізатары і кіраўнікі: У.У. Сімацкі (да 18.11.1941), І.К. Захараў. Аб'ядноўвала 9 падпольных груп (каля 100 чалавек): у Асвеі — кіраўнік Сімацкі, у сельсаветах: Задзежанскім — С.І. Жвірбля, Каханавіцкім — І.П. Петрыенка, Кісялёўскім — К.П. Яськін, Красоўскім — Р.С. Лукашонак, Малашкаўскім — М.Я. Белабародаў, Савейкаўскім — У.І. Хвежанка, Сенькаўскім — І.А. Марачкоўскі, Сухарукаўскім — К.І. Мядзюта.

**БОРКАВІЦКАЕ ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ПАДПОЛЛЕ**

Дзейнічала з кастрычніка 1941 г. да чэрвеня 1942 г. у в. Боркавічы. Кіраўнік І.Р. Каваленка; члены: С.В. Бяляеў, М.Р. Зайцава, Ф.А. Жалязнова, М.В. Марціноўская, Г.П. Шанько.

**ПРОШКАЎСКАЕ КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПОЛЛЕ**

Дзейнічала з жніўня 1941 г. да кастрычніка 1942 г. у вёсцы Прошкі. Аб'ядноўвала каля 30 чалавек. Кіраўнікі В.І. Лукашонак, з мая 1942 г. Г.Я. Фралёнак. Мела групы ў в. Забор'е Рэзэкненскага павета Латвіі (кіраўнік А.М. Гром) у вёсках Рылькі (П.С. Смычкоў), Ляхава Себежскага р-на Расіі, Сукалі, Востраў, падпольнае піянерскае звяно ў в. Стралкі. Трымала сувязь з падпольшчыкамі Асвеі, Расонскага р-на, з партызанскім атрадам, потым брыгадай імя Фрунзе. Аб'ядноўвала беларусаў, рускіх, латышоў.

І. П. Петрыенка.

І. А. Марачкоўскі.

Г. Я. Фралёнак.

Р. П. Герасімаў.

## САР'ЯНСКАЕ ПАРТЫЙНАЕ ПАДПОЛЛЕ

Дзейнічала з жніўня 1941 г. да чэрвеня 1942 г. у вёсцы Сар'я. Кіраўнік Б.А. Жук. Створаны групы партызанскага рэзерву: у вёсцы Дзегцярова (кіраўнік В.І. Аўсюк), Громаўкі (А.А. Воранаў), Мушына (А.Ф. Ліпскі), Шчунькі (П.К. Пілюшкін). Актыўную работу праводзілі былыя салдаты-акружэнцы М. Гінько і Г. Купрын, бухгалтар былога пагранічнага ўчастка І. Мандрык, мясцовы трактарыст С. Купрын, былы вучань Ч. Лаўрыновіч і іншыя.

**Асвейскі падпольны райком КП(б)Б** (7.1941—10.1941—27.6.1942—31.12.1943). Яго сакратары С.Б. Гелер (7.1941—10.1941), П.В. Цішкоў (7.1941—10.1941), І.К. Захараў (27.6.1942—31.12.1943) — першы сакратар, П.П. Кузьміноў (27.6.1942—31.12.1943) — другі сакратар; члены: С.П. Дробат (7.1941—10.1941), В.П. Уладзіміраў (27.6.1942—1.11.1942), К.І. Давыдзёнак (27.6.1942—1.11.1942), І.П. Петрыенка (27.6.1942—31.12.1943), У.У. Сімацкі (27.6.1942—17.10.1942 загінуў), І.А. Марачкоўскі (29.11.1942—31.12.1943), Ф. А. Нікалаенка, А.І. Сяргушка (5.10.1943—31.12.1943).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Ленінскі шлях». Рэдактар Я.В. Лукашонак.

**Дрысенскі падпольны райком КП(б)Б** (18.7.1942—26.12.1943; 15.1.1944—12.7.1944). Першы сакратар Р.П. Герасімаў (18.7.1942—26.12.1943), другі сакратар А.І. Сяргушка (20.8.1942—6.4.1943), другі сакратар В.А. Бохан (6.4.1943—26.12.1943), сакратар А.І. Лісоўскі (15.1.1944—12.7.1944); члены: В.А. Бохан (18.7.1942—6.4.1943), Ф.Ф. Шаблоўскі (18.7.1942—26.12.1943), А.І. Лісоўскі (25.6.1943—26.12.1943).

Друкаваны орган падпольнага райкома КБ(б)Б — газета «Патрыёт Радзімы».

**Асвейскі падпольны райком ЛКСМБ** (9.7.1942—10.1.1944). Сакратары: У.І. Хвежанка (9.7.1942—10.1.1944), У.І. Вестэнберг, сакратар па прапагандзе (9.71942—29.8.1942, загінуў), Л.І. Гароднік, сакратар па прапагандзе (30.8.1942—1.4.1943), А.М. Шаўрак, сакратар па прапагандзе (10.4.1943—10.1.1944), члены: А.А. Наваеўскі (9.7.1942—10.1.1944), Л.І. Татарынава (9.7.1942—5.1943), Л.І. Гароднік (1.4.1943—10.1.1944, загінуў), Я.У. Фралёнак (Громава) (5.5.1943—10.1.1944), І.Ц. Кузьмянкоў (1.6.1943—9.9.1943, загінуў).

**Дрысенскі падпольны райком ЛКСМБ** (18.6.1942—12.7.1944). Яго сакратары: В.А. Бохан (18.6.1942—1.4.1943), В.Р. Васілеўскі (1.4.1943—1.7.1943), У.Р. Гаўрыловіч (1.7.1943—12.7.1944), сакратар па прапагандзе (1.3.1943—1.7.1943), М.С. Лобар, сакратар па прапагандзе (1.11.1943—12.7.1944), члены: У.І. Быкоўскі (18.6.1942—1.1944), С.І. Кісялёў (18.6.1942—20.11.1943, загінуў), І.М. Камарова (18.6.1942—20.7.1944), І.І. Кудзім (18.6.1942—12.7.1944), У.Р. Гаўрыловіч (1.9.1942—1.3.1943), А.А. Яцухна (1.9.1942—20.4.1943), Р.П. Сыраежка (1.4.1943—12.7.1944).

**ЛІТАРАТУРА**

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945. Мн., 1990; Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944. Мн., 1975; Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944. Мн., 1976; Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1967.

*А.Б. Антонаў, Б.В. Неманскі*

## Боркавіцкія маладагвардзейцы

**З успамінаў Г. Капусцёнка, былога разведчыка атрада «Баявы»**

Лютаўскай раніцай 1942 года фашысты сагналі амаль усіх жыхароў пасёлка Боркавічы да цэнтральнага магазіна. Там ужо арудавалі гестапаўцы і іх паслугач Іван Леўчанка. На тэлеграфным слупе фашысты ладзілі шыбеніцу.

За дзеяннямі карнікаў з натоўпу назіралі былыя вучні Боркавіцкай сярэдняй школы Сяргей Прышчапёнак, Коля і Валодзя Садоўскія. Яны ведалі, што фашысты арыштавалі шэсць іх таварышаў: Сяргея Цыру, Леаніда Свіржэўскага, Івана Дукшынскага, Валодзю Бернатовіча, Валодзю Беляя і Мікалая Паўлёнка.

З-за павароту паказалася машына. Усе застылі ў журботным маўчанні. Арыштаваныя са звязанымі рукамі ляжалі ў кузаве. Першым гітлераўцы паднялі Беляя. З цяжкасцю можна было пазнаць Валодзю. Твар у кровападцёках. Падранае адзенне вісела шматкамі. Кат-гестапавец прывычным рухам накінуў пятлю і адышоў убок. Адно імгненне — і пятля абхапіла шыю юнака.

— Бывайце, таварышы, нашы прыйдуць, — паспеў крыкнуць патрыёт.

Другім каралі Мікалая Паўлёнка. Калі машына ад'ехала, Мікалай абхапіў нагамі слуп, але Леўчанка адарваў яго, і пятля тужэй зацягнулася на шыі.

Цяжкі ўздых ускалыхнуў натоўп. Гнеў і нянавісць можна было прачытаць на тварах людзей.

Валодзю Бернатовіча гестапаўцы павезлі ў вёску Уладычына. Там, як і ў Боркавічах, да месца пакарання сагналі людзей. Яны шчыльным кальцом акружылі сані. Нехта непрыкметна развязаў Валодзю рукі. У той момант, калі сані пад'ехалі да шыбеніцы, Валодзя моцным ударам зваліў гестапаўца з ног і кінуўся бегчы. Але аўтаматная чарга, пасланая ўслед, дастала юнака, і ён упаў на снег.

Трагічна склаўся лёс і астатніх трох юных мсціўцаў. Фашысты падверглі іх зверскім катаванням, а затым расстралялі ў Полацкай турме.

Што ж адбылося ў Боркавічах у пачатку 1942 года? Кім былі шэсць адважных хлопцаў? Да апошняга часу на гэта пытан-

С. А. Прышчапёнак.

У. П. Садоўскі.

Л. В. Свіржэўскі.



Помнік настаўнікам і вучням Боркавіцкай школы, якія загінулі ў барацьбе з гітлераўцамі.

не нялёгка было адказаць ні старажылам Боркавічаў, ні многім партызанам, якія ведалі аб пакаранні смерцю савецкіх патрыётаў. І вось чаму. Многія баявыя таварышы Сяргея Цыры і яго сяброў загінулі. Сустракаючыся з роднымі загінуўшых і з былымі ўдзельнікамі падпольнай групы ў Боркавічах, я даведаўся, што Сяргей Цыра некалькі разоў ездзіў у Полацк. Але па якой справе? Устанавіць гэта доўга не ўдавалася. Толькі ў снежні 1969 года ў гутарцы з братам Сяргея Іванам Рыгоравічам Цырам удалося высветліць, што Сяргей наведваў у Полацку свайго стрыечнага брата Міхаіла Сцяпанавіча Фарынку.

Ад Міхаіла Сцяпанавіча я і даведаўся аб падрабязнасцях жыцця і дзейнасці Сяргея Цыры; Фарынка даў мне некалькі старэнькіх школьных сшыткаў, спісаных дробным почыркам. Гэта былі дзённікі Міхаіла Сцяпанавіча, напісаныя ў ваенныя гады. «Сяргей Цыра, лейтэнант Чырвонай Арміі, камандзір кулямётнага ўзвода, у першыя дні вайны трапіў у палон, але неўзабаве яму ўдалося ўцячы, і ён жыў у бацькі ў Боркавічах. У лістападзе 1941 года Сяргей і яго брат атрымалі заданне па зборы зброі і вярбоўцы мясцовых жыхароў у падпольныя партызанскія групы».

У канцы кастрычніка 1941 года Сяргей паведаміў групе «Адважныя»: «Завербаваны і прымаюць удзел у зборы зброі Леанід Свіржэўскі з вёскі Антонава, лейтэнант Чырвонай Арміі; Мікалай Паўлёнак з Боркавіч; Кузьма Скоп — настаўнік Дзёрнавіцкай школы; Іван Дукшынскі, былы камсамольскі кіраўнік у Боркавічах; сем ваеннапалонных, што скрытна жывуць у вёсках Антонава і Зялёнаўшчына: Малаткоў, Сачэўскі, Суораў, Саламахін, Салаўёў, Сокалаў і Вераб'ёў. Сабрана, змазана, запакавана ў скрынкі і закапана ў зямлю каля вёскі Жукава: станковы кулямёт, дванаццаць рускіх вінтовак, чатыры скрынкі патронаў і дзве стужкі да станковага кулямёта «максім».

Ішлі тыдні, месяцы. Група Сяргея Цыры разрасталася. Да работы былі прыцягнуты Валодзя Бернатовіч, Валодзя Белянкоў, Барыс Паўленка, браты Коля і Валодзя Садоўскія, лейтэнант Твараповіч, які ўцёк з палону, і іншыя.

Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, якія прывозіў з Полацка Сяргей Цыра, збіралі радыёпрыемнікі і рэгулярна слухалі Маскву, запісвалі і распаўсюджвалі сярод мясцовага насельніцтва зводкі Савецкага інфармбюро. Падпольшчыкі рабілі дыверсіі, вялі разведку.

Фашысты з ног збіліся ў пошуках разведчыкаў. Але знайсці іх было не так проста.

У канцы 1941 года Сяргею Цыру даручылі адказнае заданне — здабыць прадукты для галадаючых дзяцей Полацкага дзіцячага дома. Але дзе і як? Падпольшчыкі рашылі ўзяць хлеб і мясныя прадукты ў здраднікаў. Гэту аперацыю Сяргей даручыў Валодзю Бернатовічу, Валодзю Беляю і Мікалаю Паўлёнку. Накіраваліся ў дом бургамістра вёскі Уладычына Пятра Шупейкі. Але падзвяла нявопытнасць падлеткаў. Калі яны пачалі за-

біраць сала, Шупейка абяззброіў іх. На наступны дзень прозвішчы ўсіх трох сталі вядомы гестапа. Туды ж бургамістр аднёс пісталет, на рукаятцы якога былі надрапаны тры літары: «ЦСГ» (ініцыялы Сяргея Цыры). Так Сяргей і яго сябры былі арыштаваны і пакараны смерцю.

Пасля арышту Сяргея яго сястра Аня і яе сяброўка Фаіна Дудкіна падарожным эшалонам дабраліся да Полацка і расказалі аб арышце сяброў.

Фашысты разумелі, што ўхапіліся за нітку, што вяла да падполля. Арышты следавалі адзін за адным. Хтосьці паведаміў фашыстам, што часта ў кампаніі арыштаваных бачылі Івана Дукшынскага. І калі Іван тайком прабраўся дамоў, каб забраць закапаны ім у двары кулямёт, натыкнуўся на засаду.

У гэты цяжкі для падпольшчыкаў час

А. Р. Цыра

Аня Цыра і Фаня Дудкіна ні на мінуту не спынялі барацьбы з акупантамі. Не шкадуючы жыцця, яны помсцілі фашыстам за пакуты і смерць таварышаў. Дзяўчаты распаўсюджвалі лістоўкі сярод моладзі. Але неўзабаве і яны былі схоплены фашыстамі і расстраляны.

## Абавязаны жыццём

Марыя Ягораўна Зайцава была настаўніцай ў Боркавічах, а яе бліжэйшыя сувязныя працавалі перакладчыкамі ў камендатуры, урачамі, рабочымі нямецкага гарнізона. Таму гэта «звяно ланцуга» для партызан было залатым.

Праз Марыю Ягораўну набываліся лекі, перапраўлялася зброя, вызваляліся ваеннапалонныя, чэрпаліся звесткі аб становішчы не толькі ў Боркавіцкім гарнізоне, але і ў Дрысе, Полацку і інш. Выконвала яна даручэнні і асабліва важныя.

Муж М.Я. Зайцавай быў на фронце, на руках яе было двое малых і маці — калека (без рукі), а яна, тым не менш, вяла адчайную і рызыкоўную працу па разведцы ў логаве ворага.

У сакавіку 1943 г. стараннямі здрадніка ў камендатуры з'явіўся спіс партызанскіх сувязных. Марыя Ягораўна зрабіла ўсё магчымае, каб папярэдзіць нас усіх аб небяспецы. Васьмігадовы хлапчук Коля Чыгак па яе даручэнні а другой гадзіне ночы аббягаў двары тых, каго павінны былі закатаваць на світанку. Асабіста я ўцякла праз раку Дрысу да партызан. А вось Лапкоўскія з Новага Двара не паверылі малому і былі забітыя немцамі.

Сама ж Марыя, як і некалькі іншых падпольшчыкаў, не змагла выйсці з гарнізона і была схоплена фашыстамі.

Я б вельмі хацела, каб новыя пакаленні ведалі імя мужнай патрыёткі, якая загінула ў імя перамогі над фашызмам. У сэрцах жа тых, хто абавязаны ёй жыццём, імя Марыі Ягораўны Зайцавай не сатрэцца ніколі.

*Т. Уладзіміраўа*

## «Калі так трэба, ідзі, сынок!»

**З успамінаў І. Мандрыка, удзельніка Сар'янскага падполля, былога начальніка штаба партызанскага атрада імя А. Я. Пархоменкі**

Вечарам 25 жніўня 1941 г. я сустрэўся са сваімі школьнымі сябрамі. Яны завялі мяне на горку, што ўзвышаецца над рэчкай Сар'янкай, пакрытая густымі кустамі бэзу, клёнамі ды ясенямі, і давай распытваць аб тым, што творыцца на белым

свеце. Тут жа дамовіліся сумесна дзейнічаць супраць вылюдкаў-акупантаў. У рады падпольшчыкаў сталі Коля Гінько, Часлаў Лаўрыновіч, Герман Купрын, Валодзя Пірог. Узначаліў нас Браніслаў Антонавіч Жук, былы брыгадзір трактарыстаў Бігосаўскай МТС. Пазней да нас далучыліся Сяргей Купрын, Аляксей Аткін з акружэнцаў, Саша Громаў з Бічыкава, Віктар Сардыка, Дуся Лядак, Вольга Махонька, сястра мая Люся. У вёсках Мушына, Дзегцярова, Громаўкі, Шчунькі ўзніклі групы рэзерву. Іх узначалілі Антон Ліпскі, Вячаслаў Аўсюк, Аркадзь Воранаў, Павел Пілюшкін.

Клопатаў у падпольшчыкаў было шмат. Перш за ўсё збіралі і рамантавалі зброю, зрывалі планы мясцовых улад па ўсталяванні так званага «новага парадку», усімі мерамі перашкаджалі звозіць моладзь на рабства ў Германію.

Нялёгка ўсё давалася. Неяк на золаку з боку Расіцы праз нашу вёску праязджаў абоз карнікаў. Закарцела ім перадыхнуць. Спынілі свае падводы пад старымі таполямі, што стаялі каля самай дарогі, на якіх гняздзіліся буслы. Тыя тут жа адгукнуліся. Іх густы клёкат фашысты ўспрынялі як стральбу з аўтаматаў. Падхапіліся, а калі зразумелі, што да чаго, са злосцю перабілі ўсіх нашых цыбатых. У адказ на гэта Даніла Найдзёнак — былы выхаванец дзетдома, першы ў вёсцы апякун чарнакрылых, паламаў крыжы на могілках каля касцёла, дзе былі пахаваныя гітлераўцы.

У дадатак да гэтага паліцэйскі воласці Каласоўскі перахапіў двух акружэнцаў, якія прабіраліся на ўсход. Пасля ўсяго гэтага Сар'я трапіла пад асобы ўлік. Ёй стаў пагражаць лёс Марцінава.

Але небяспека неяк мінула. Больш таго, удалося вырваць з кіпцюроў карнікаў тых двух заложнікаў, якіх затрымаў паліцэйскі. Аня Урбан, дзяўчына з вёскі Абухава, дапамагла. Яна часта наведвала палоннікаў, што рамантавалі мост цераз рэчку Сар'янку. Пазнаёмілася, падказала ім, як лепш уцячы на волю. Адным з іх быў уралец Мікалай Глазаў, другі — ленінградзец Васіль Сазонаў, абодва лейтэнанты Чырвонай Арміі. Пазнаёміліся яны з намі і згадзіліся дзейнічаць разам.

На базе Сар'янскага падполля з цягам часу арганізаваўся адзін з першых на тэрыторыі Дрысенскага раёна партызанскі атрад імя А.Я. Пархоменкі. Месцам дыслакацыі яго стала лясная дзялянка адразу за вёскай Вознава. Мы не асцерагаліся мясцовага насельніцтва. Яно чым магло дапамагала партызанам. Ды і як інакш? У Сар'і, да прыкладу, амаль з кожнай хаты хтосьці быў ужо ў партызанах.

Памятаецца, як стаў партызанам чатырнаццацігадовы юнак Валодзя Малей з вёскі Дзегцярова. Калі праходзілі тут перадавыя часці заваёўнікаў, нашы на рэчцы Сар'янка аказалі ім супраціўленне. На месцах бою Валодзя падабраў некалькі вінтовак, ручны кулямёт і ротны мінамёт. Усё гэта надзейна схаваў у лесе. Колькі ні ўпрошвалі яго адкрыць свой тайнік, нічога не атрымоўвалася. Адзін быў у хлопца адказ: «Возьмеце мяне ў партызаны, тады пакажу».

Атрад рыхтаваўся да разгрому паліцэйскага гарнізона ў Расіцы. Востра патрабаваўся Валодзеў мінамёт. Мікалай Глазаў, ён ужо быў камандзірам атрада, звярнуўся неяк да мяне і Вячаслава Аўсюка і папрасіў: «Наведайце-ка свайго мінамётчыка і скажыце яму, што камандаванне згодна з яго ўмовай».

На другі дзень з самай раніцы мы наведалі вёску Дзегцярова, патаемна дабраліся да стажаркі, дзе, па ўмоўленасці, спаў Валодзя, разбудзілі яго і перадалі атрыманы загад камандзіра. Ён тут жа вылез з сена, хуценька сабраўся і... За вёскай на ўзлеску яго перахапіў бацька, стары Сямён, часцей звалі яго Сенька.

— Ты куды, сынку, сабраўся? — усхвалявана запытаў ён.

— У партызаны, тата... Так трэба, — паступіў кароткі адказ.

Той абхапіў свайго адзінага крэўнага, патрос у моцных абдымках і прамовіў:

— Калі так трэба, ідзі, сынок. Дай Бог табе ўдачы...

Вось так ішлі ў партызаны.

Праз месяц які ў атрадзе было больш

за сотню байцоў. Дружна са сваім важаком Аркадзем Воранавым прыйшлі хлопцы з Громавак, Шчунек, а з Свяціцы заявіўся цэлы артылерыйскі разлік з гарматай саракапяткай.

На пачатку верасня — гэта быў другі год вайны — атрад раздзяліўся на дзве часткі. Першая разам з камандзірам Глазавым і начальнікам штаба Сазонавым, зберагаючы за сабой назву атрада імя Пархоменкі, накіравалася за Дзвіну, на тэрыторыю былой Вілейскай вобласці. Другая частка з камісарам Антонам Ліцвінавым засталася на месцы, стварыла атрад імя Г.І. Катоўскага і ўлілася ў склад толькі што створанай Асвейскай партызанскай брыгады.

На рахунку атрада імя А.Я. Пархоменкі многа добрых баявых спраў. Па прыбыцці на новае месца дыслакацыі ён яшчэ некалькі разоў дзяліўся, утвараючы ўсё новыя баявыя адзінкі — асобны партызанскі батальён, потым і брыгаду, якая ўдзельнічала ў баях з акупантамі на тэрыторыі Ушацкага, Докшыцкага, Бягомльскага, Глыбоцкага раёнаў, у Нарачанскім краі. Перад сустрэчай з Чырвонай Арміяй вызваліла ад ворага раённы цэнтр Астравец, што ў Гродзенскай вобласці, перахапіла тры эшалоны праціўніка каля чыгуначнай станцыі Гудагай і ўсё гэта перадала нашым войскам. З ліку байцоў-пархоменцаў выйшлі вопытныя важакі партызанскага руху. Б.А. Жук, М.Т. Глазаў, В.С. Сазонаў, А.П. Громаў, І.П. Шалькоў, К.П. Міхайлаў, А.Д. Ловінаў у свой час сталі камандзірамі атрадаў, у тым ліку ў іншых партызанскіх злучэннях.

Толькі вайнаў без ахвяр не бывае. Загінулі ў баях з ворагам былыя Сар'янскія падпольшчыкі Коля Чыркун — юны брыгадны разведчык, Аляксей Аткін, Аркадзь Воранаў, Павел Пілюшкін, Уладзімір Цыра, Дуся Лядак, Валодзя Пірог, Пётр Солтан, Аркадзь Гадун. Загінуў ад рук фашыстаў Ігнат Аляксандравіч Цяста, які быў начальнікам штаба батальёна, потым брыгады, родам з Бігосаўшчыны. Загінуў яго зямляк Міхаіл Бакша.

Ды дзе б ні былі пахаваны нашы загінуўшыя баявыя сябры, пра іх мы помнім і будзем помніць, пакуль жывём.

## Стварэнне падпольнага райкома

**З успамінаў А.І. Сяргушкі, другога сакратара падпольнага райкома КП(б)Б**

18 чэрвеня 1941 г. я выехаў на лячэнне ў Крым, аднак лячыцца доўга не давялося.

28 чэрвеня ў Туле усе пасажыры, якія ехалі ў Маскву і не мелі маскоўскай прапіскі, былі высаджаны з вагонаў. Я звярнуўся ў гарваенкамат з просьбай накіраваць мяне ў Чырвоную Армію, але атрымаў адмову і параду выехаць у глыб краіны. Прыехаўшы да брата на Алтай, я напісаў пісьмо ў ЦК ВКП(б).

10 лютага 1942 г. мяне выклікалі ў ЦК у Маскву і залічылі ў спецшколу № 1 (рэзерв ЦК). У красавіку нашу групу з 26 чалавек накіравалі ў Гарахавецкія лагеры Мурамскай вобласці, дзе адбывалася фарміраванне партызанскіх атрадаў для дзейнасці ў варожым тыле. Я быў зацверджаны камісарам атрада «Бясстрашны» і адначасова сакратаром Дрысенскага падпольнага райкома партыі. Камандзірам ат-

А. І. Сяргушка.

рада быў назначаны С.Ф. Рубін. Лінію фронту пераходзілі з дапамогай ваеннай разведкі паміж Веліжам і Усвятамі.

20 ліпеня 1942 г. атрад прыйшоў на тэрыторыю Дрысенскага раёна. Размясціліся мы ў лесе на месцы былога хутара Папялкі Малавідаўскага сельсавета. Аб сваім прыбыцці адразу ж па рацыі далажылі ў ЦК. Праз пару дзён да нас далучыўся з групай Георгій Пятровіч Герасімаў, які прыйшоў у раён тыднем раней.

24 ліпеня мы аднадушна вырашылі аб'яднацца і стварыць падпольны райком партыі. У яго увайшлі: Г.П. Герасімаў — першы сакратар, А.І. Сяргушка — другі сакратар, а таксама Ф.Ф. Шабалоўскі, А.І. Лісоўскі, В.А. Бохан. На першым пасяджэнні бюро былі распрацаваныя мерапрыемствы па арганізацыі партызанскага руху ў раёне, намечаныя людзі для сувязей з насельніцтвам.

Вельмі хутка разышлася чутка, што на Дрысеншчыну прыйшла вялікая група воінаў з савецкага тылу. Нас сталі клікаць «масквічамі», хаця ўсе таварышы, што прыбылі з-за фронту, былі выхадцамі з Беларусі.

...Вывучыўшы абставіны, бюро падпольнага райкома вырашыла правесці сход камуністаў раёна. Я, як ураджэнец тутэйшых мясцін, добра ведаў многіх камуністаў. Па сельсаветах нашы людзі правялі вялізную арганізацыйную работу, аднак, на вялікі жаль, на першы падпольны сход з'явіўся толькі адзін кандыдат у члены КПСС — Міхаіл Ліпскі з вёскі Вознава. Расказаўшы яму аб разгроме немцаў пад Масквой і аб задачах камуністаў, якія павінны падняць насельніцтва на барацьбу з гітлераўскімі захопнікамі, мы дамовіліся аб сувязі. Я запытаўся ў Ліпскага, чаму, на яго думку, не з'явіліся камуністы на гэты сход. Ён адказаў, што людзі, пэўна, пабаяліся правакацыі.

Пытанне аб зрыве сходу было абмеркавана на бюро. Мы напісалі кожнаму камуністу афіцыйнае запрашэнне прыкладна наступнага зместу:

«Дрысенскі падпольны райком партыі другі раз запрашае Вас на раённы сход, які адбудзецца 30 ліпеня 1942 г. У выпадку няяўкі вы будзеце лічыцца здраднікам Радзімы. Сакратар райкома Кухарэнка (мой псеўданім — А.С.)».

Нашы людзі яшчэ раз наведалі многіх камуністаў і ўручылі ім асабіста «запрашальныя білеты».

30 ліпеня 1942 г. на ўзлеску паблізу Марачкова сабраліся 23 камуністы. Сярод іх былі М. Ліпскі, К. Верамееў, А. Кужаль, С. Амяльчонак, К. Садоха і іншыя. Прыйшоў і адзін камсамолец — Ніцецкі... Былі створаны пярвічныя партыйныя групы, якія ўзначалілі М. Ліпскі, П. Шамшур, І. Родзік, А. Кужаль і іншыя. З гэтага часу я ўжо дзейнічаў пад уласным прозвішчам Сяргушка.

## Нескароны край

З кожным днём на тэрыторыі былых Асвейскага і Дрысенскага раёнаў шырыўся партызанскі рух. Атрады ўмацоўваліся арганізацыйна і вырасталі колькасна, актывізавалася іх дзейнасць. Важкі ўклад ва ўздым барацьбы з ворагам унеслі і падпольныя газеты «Ленінскі шлях» і «Патрыёт Радзімы».

На тэрыторыі раёна дзейнічалі 1-я, 2-я Дрысенскія, Асвейская брыгады імя М.В. Фрунзе, у якія ўваходзіла больш за 10 партызанскіх атрадаў. Атрады знішчалі нямецка-фашысцкія гарнізоны, падрывалі масты, узрывалі рэйкі і эшалоны, рабілі рэйды ў суседнія раёны.

Атрад імя М.В. Фрунзе пачаў актыўныя дзеянні з 25 красавіка 1942 г. (камандзір атрада І.К. Захараў, камісар І.П. Петрыенка). Атрадам былі разгромлены ўсе валасныя ўправы на Асвейшчыне, разбураны масты на дарогах, што вялі на Себеж і Дрысу. Толькі за адзін дзень 16 мая партызаны гэтага атрада знішчылі 5 аўтамашын, 18 салдат і афіцэраў, узялі значныя трафеі. Першыя буйныя аперацыі правялі фрунзенцы сумесна з атрадам

імя Сяргея, названым так у гонар яго загінуўшага заснавальніка С.Б. Маісеенкі. 12 чэрвеня быў зроблены дзёрзкі налёт на моцны гарнізон у м. Палішчына ў Латвіі (зараз Шкяунэ), што месціцца на самай мяжы з Беларуссю. Перарваўшы сувязь гэтага гарнізона з іншымі, партызаны ўчынілі ўдалы штурм казармы, перастралялі гітлераўцаў і айсзаргаў, падпалілі будынак, знішчылі пагранічны атрад немцаў. Нападаючыя правялі «рэвізію» пошты і іншых устаноў, спалілі іх, забраўшы падрыхтаваныя пасылкі ў Германію з нарабаваным дабром. З разбуранага нямецкага склада забралі каля 1,5 тоны цукру, столькі ж мукі, запалкі, масла, тытунь і іншае. Частку прадуктаў раздалі жыхарам навакольных вёсак. У час гэтай жа аперацыі спалілі дзве крамы, узяўшы 10 пудоў падэшвавай скуры, вопратку, абутак, які прызначаўся для германскай арміі. 14 чэрвеня ў вёсцы Лісна правялі бой са значнымі сіламі праціўніка. Супраць 150 партызан было кінута 600 фашыстаў. Умела выкарыстоўваючы асаблівасці мясцовасці, флангавыя засады, партызаны адбілі ўсе атакі ворага. Асабліва адчайна змагаліся Уладзімір Вестэнберг, Імант Судмаліс, Пётр Лукашонак, Васіль Равінскі і іншыя. Шмат фашыстаў знайшло тут магілу. У баявым данясенні камісара атрада І.Ф. Петрыенкі паведамлялася: забіта 40 фашыстаў, 35 паранена.

У ноч з 20 на 21 чэрвеня партызаны напалі на нямецкі гарнізон у г.п. Асвея. У палон былі ўзяты паліцаі і нямецкія паслугачы. Партызаны забралі са свірна ўсё збожжа, з аптэкі — медыкаменты. Вялікую каштоўнасць мелі дакументы, якія трапілі ў рукі партызан з нямецкай управы. Пасля налёту на Асвею дзесяткі жыхароў з вёсак Барысава, Лісна, Мядзведзева, Стралкі папоўнілі партызанскія атрады. Білі фрунзенцы фашыстаў каля вёсак Мікуліна, Асёткі, ажыццяўлялі дыверсіі на чыгунках, шашэйных і грунтавых дарогах. Правялі многа адкрытых і засадных баёў, у тым ліку, разам з партызанскімі брыгадамі Дрысенскай (пазней 1-я Дрысенская) і «За Савецкую Беларусь»

Месца былога базіравання партызанскага лагера каля р.Піжаўка.

(пазней імя Ракасоўскага), аперацыю па адначасовым разгроме варожых гарнізонаў на чыгуначных станцыях Боркавічы і Дрыса (кастрычнік 1942), разгромілі варожыя гарнізоны ў вёсцы Вэцслабада (Латвія), Каханавічы Асвейскага, Глямбочына Себежскага раёнаў, у вёсках Саўчонкі і Балотнікі (красавік 1943) Дрысенскага раёна, у вёсцы Кабыльнікі Дрысенскага раёна (разам з партызанскай брыгадай 1-й Дрысенскай).

Партызаны Асвейскай брыгады імя М.В. Фрунзе за час яе існавання знішчылі больш за 5 тысяч нямецкіх салдат, афіцэраў і іх паслугачоў, спусцілі пад адхон дзесяткі эшалонаў праціўніка, падарвалі і пашкодзілі больш за 2 тысячы рэек, узарвалі 248 аўтамашын, збілі 2 самалёты і г.д. Камандзіру брыгады І.К. Захараву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля разгрому Каханавіцкага гарнізона фашысты засталіся толькі ў Асвеі. Асвейскі гарнізон быў умацаваны абарончымі збудаваннямі, абцягнуты калючым дротам. Пазней ён перамясціўся ў Дрысу.

Рашэннем падпольнага райкома КП(б)Б на ўсёй тэрыторыі раёна аднаўлялася Савецкая ўлада. У кожным населеным пункце прызначаліся вясковыя старасты, пры былых сельсаветах — упаўнаважаныя партызан. Тэрыторыя раёна была падзелена на зоны па колькасці атрадаў, якія ўваходзілі ў створаную Асвейскую

партызанскую брыгаду імя Фрунзе. Кожны атрад быў «прыпісаны» да пэўнай групы вёсак з сваім «цэнтрам», у абавязак партызан уходзіла праводзіць работу сярод насельніцтва і абараняць яго ад ворага.

У вёсках збіралі цёплыя рэчы для фронту, грашовыя сродкі і каштоўнасці ў фонд арміі, нарыхтоўвалі прадукты для партызан.

Па ўказанні Віцебскага падпольнага абкома партыі была праведзена мабілізацыя ў шэрагі Чырвонай Арміі на добраахвотных пачатках. У верасні 1942 г. за лінію фронту накіравалі больш за 1000 мабілізаваных.

На рахунку толькі аднаго атрада імя Кірава на канец верасня мелася сем знішчаных мастоў, вадакачка, льнозавод, маслабойныя пункты і... тры злоўленыя шпіёны. Дзейнасць самой брыгады абагульнена ў палітданясенні па Дрысенскай партызанскай брыгадзе толькі за кастрычнік 1942 г.: «...дыверсійнымі групамі брыгады падарвана і знішчана: эшалонаў з жывой сілай праціўніка — 4, разбіта паравозаў — 4, знішчаны 71 таварны вагон. Забіта немцаў — 1104, паранена — 248, узята ў палон 5 чалавек. Спушчаны пад адхон адзін эшалон з гарматамі і аўтамашынамі. Знішчана 27 платформаў... Узарваны 4 чыг. будкі, абсталяваныя пад дзот, спалены і падарваны на шашэйных дарогах драўляныя масты даўжынёй ад 15 да 25 м — 5 шт. Разведкай брыгады на ст. Свольна спалены лесапільны завод, канюшня, сенасховішча, 3 халодныя пабудовы, прадуктовы склад, 3 павозкі з боепрыпасамі. У в. Валодзькава спалена казарма. У г. Дрыса спалена трансфарматарная будка...»

Позняй восенню дрысенцы напалі на гарнізоны ў вёсках Гараўцы і Буракова. Помсцячы партызанам, фашысты накіравалі ў Гараўцы карнікаў з Боркавічаў. У вёсцы пачаліся расстрэлы, запалалі хаты. Партызаны ў абход немцаў зладзілі засаду ў лесе і з боем выбілі фашыстаў назад за раку, абстраляўшы іх у дадатак з гарматы на пераправе.

Па рашэнні Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б у чэрвені 1942 г. для арганізацыі партызанскага руху ў Дрысенскі раён прыбыла спецыяльная група на чале з П.Р. Мандрыкіным і Р.П. Герасімавым. Абапіраючыся на камуністаў і камсамольцаў ужо існуючых падпольных груп, спецгрупа 17 ліпеня стварыла 1-ю Дрысенскую партызанскую брыгаду. Спачатку былі сфарміраваны атрады імя Калініна і імя Суворава, а крыху пазней — яшчэ тры баявыя адзінкі — атрады імя Аляксандра Неўскага, імя Кірава, «КІМ». Яны пастаянна папаўняліся новымі людзьмі. За некалькі дзён у атрад імя Калініна ўлілося каля ста добраахвотнікаў.

Аб'яднанымі сіламі партызанскіх атрадаў Дрысенскага і Расонскага раёнаў у ноч з 3 на 4 жніўня быў узарваны чыгуначны мост цераз раку Дрыса каля раз'езда Беніслаўскі. У выніку рух воінскіх эшалонаў ворага на гэтай чыгунцы быў спынены амаль на тры тыдні.

Фашысты былі вымушаны здымаць з фронту і накіроўваць супраць партызан батальёны і палкі, умацоўваць свае гарнізоны на чыгуначных станцыях. Але патрыятычны рух народных мсціўцаў шырыўся з кожным днём. Да лета 1943 года атрад імя Калініна настолькі вырас, што яго давялося падзяліць на дзве баявыя адзінкі. А восенню быў створаны трэці атрад імя Калініна. На базе атрадаў імя Калініна і імя Кутузава сфарміравана другая Дрысенская партызанская брыгада, якая пачала свой баявы шлях 1 кастрычніка 1943 г. Атрады створанай брыгады кантралявалі паўднёвую частку Дрысенскага і паўночна-заходнюю частку Полацкага раёнаў.

Партызаны рабілі дыверсіі на чыгунцы Полацк — Даўгаўпілс, шашэйных і грунтавых дарогах Полацк — Даўгаўпілс, Асвея — Полацк, Расоны — Янкавічы, Боркавічы — Дрыса і інш. У лістападзе — снежні 1943 г. вялі баі з карнікамі, утрымлівалі абарону на рэках Дрыса і Нішча каля вёсак Латышава, Залессе, Аляксееўцы, Пярэкі, Дзёрнавічы, Жукі. У лютым і ліпені 1944 г. разграмілі гарнізоны ў вёсках Зялёнаўшчына і Пярэкі. У «рэйкавай

вайне» на ўчастку чыгункі Баравуха—Свольна падарвалі больш за 700 рэек.

Мужнасць, гераізм, няўлоўнасць праяўлялі партызаны ў час карных аперацый.

14 лютага 1943 г. пачалася карная аперацыя фашыстаў «Зімовае чараўніцтва», якая прынесла на нашу зямлю нечалавечыя пакуты і смерць тысячам і тысячам людзей.

Карнікаў узначальваў обергрупэнфюрэр СС Екельн. Улічыўшы памылкі свайго папярэдніка — генерал-маёра Якобі, ён дзейнічаў больш прадумана і сістэмна. У складзе наступаючых карнікаў былі паліцэйскія і жандарскія падраздзяленні. Было задзейнічана больш за 20 тысяч салдат: удзельнічалі ў аперацыі 5 палкоў СС, 14 батальёнаў паліцыі і нават асобныя падраздзяленні 3-й танкавай арміі.

Перад карнікамі стаяла задача не толькі расправіцца з партызанамі, але сцерці з твару зямлі ўсё насельніцтва раёна.

Галоўныя ўдары фашысты нанеслі на трох напрамках: на Красова ішлі часці палкоўніка Кнехта, на Сар'ю—Юралава — паліцэйскія палкоўніка Вайса, на Каханавічы вёў сваіх галаварэзаў брыгадэнфюрэр СС Шрэдэр.

Першы бой прынялі атрады імя Фрунзе і Катоўскага Асвейскай брыгады. Цэлы дзень немцы бамбілі з самалётаў і абстрэльвалі з артылерыі пярэдні край партызанскай абароны.

На другі дзень у бой уступілі атрад імя Арджанікідзе і частка дрысенскіх атрадаў.

16 лютага звыш трох тысяч фашыстаў пачалі наступ з чыгункі на ўчастку паміж рэкамі Свольна і Дрыса. Перад Клімаўшчынай іх сустрэлі партызаны атрада імя Калініна і «КІМ» Дрысенскай брыгады. У выніку жорсткай сутычкі вораг быў адкінуты. 17 лютага партызаны адкінулі карнікаў ад вёсак Верхняе і Ніжняе Хамінo.

Аднак пасля трохдзённых цяжкіх баёў партызаны вымушаны былі пакінуць свае пазіцыі і адысці на новы рубеж па лініі в. Задзежжа—воз. Стралкоўскае—воз. Белае (Каплярова). Партызаны Дрысенскай брыгады з баямі трымалі абарону пад Задзежжам з 22 лютага да 3 сакавіка.

Пад націскам карнікаў партызаны адступалі крок за крокам да ляснога масіву, дзе хаваліся ад карнікаў жыхары занятых ворагам вёсак. За лясамі была рака Свольна.

У вёсцы Роўнае Поле адбылося пасяджанне аб'яднанага партызанскага штаба. Загадам начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) П.К. Панамарэнкі ад 1.3.1943 кіраўніцтва сумеснай аперацыяй супраць карнікаў было ўскладзена на А. Раманава, А. Бардадына (прадстаўнік ЦШПР) і А. Штрахава (прадстаўнік Калінінскага ШПР). Фактычна кіраўніцтва адразу лягло на плечы А. Раманава, бо А. Бардадын яшчэ не прыбыў на месца баёў, а А. Штрахаў атрымаў з свайго штаба па рацыі іншы загад і наогул вывеў свае брыгады з паласы баёў за межы Беларусі.

Была пастаўлена цяжкая задача — стрымаць праціўніка на рубяжы Свольны. Дадатковая задача — адкінуць карнікаў з ужо занятых пазіцый шляхам атак — не была рэалізавана, хаця тыдзень абарончых баёў на падыходзе да лясоў быў насычаны прыкладамі мужнасці і кемлівасці асобных партызан, іх камандзіраў і цэлых атрадаў.

10 сакавіка фашысты выйшлі да вёсак Лісна, Дабраплёсы, Ардаўскія. Партызанскія брыгады адышлі на левы бераг Свольны. Атрад імя Арджанікідзе застаўся ў лясах у варожым кальцы, каб дзейнічаць у тыле ворага.

У глыбокім тыле — пад Каханавічамі і Канчанамі, у іншых мясцінах — ужо дзейнічалі асобныя групы партызан. Латышскія мінёры з атрада В. Самсана маланкавымі рэйдамі з тэрыторыі Латвіі паспявалі мініраваць важныя дарогі з Асвеі ў бок Латвіі літаральна перад носам у карнікаў пры любым напрамку іх руху, навязалі фашыстам лятучыя баі. Дыверсійныя групы фрунзенцаў, нечакана нападаючы на канвой, адбівалі гурты жывёлы і калоны людзей, якіх гналі ў няволю.

Атрад імя Арджанікідзе без значных

страт выйшаў з акружэння. Аднак у кальцы засталіся сотні мірных жыхароў, якія не здолелі ўцячы за Свольну. Прачэсваючы лясы, фашысты бязлітасна знішчалі ўсіх на сваім шляху.

Толькі 8 сакавіка на Сяляўшчынскі партызанскі аэрадром закінулі з-за лініі фронту зброю і боепрыпасы. Яшчэ праз два дні яна трапіла па прызначэнні, на рубеж абароны.

Трынаццаць брыгад і чатыры атрады, у тым ліку вядомыя ратным майстэрствам «Баявы» і «Няўлоўныя», не толькі ўтрымалі абарону па рацэ, але, зламаўшы супраціўленне карнікаў з іх артылерыяй і авіяцыяй, перайшлі ў наступ. Разграміўшы «свежаспечаныя» гарнізоны ў вёсках Дабраплёсы, Мельніца, Лісна, Малавіды і Маторына і заблакаваўшы пагранічныя гарнізоны ў Расіі, партызаны вымусілі карнікаў пакінуць пазіцыі. 20 сакавіка 1943 г. карнікі адступілі. За тры дні адступлення яны знішчылі ўсё, што яшчэ заставалася цэлым на іх шляху, пагналі ў няволю працаздольнае насельніцтва, пастраляўшы старых, малых і нямоглых.

## Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна

### 1-я ДРЫСЕНСКАЯ БРЫГАДА

У ліпені 1942 года ў Дрысенскі раён камандаваннем брыгады «За Савецкую Беларусь» накіравана арганізацыйная група на чале з Р.П. Герасімавым і П.Р. Мандрыкіным і атрад імя Сяргея. Неўзабаве тут створаны новыя атрады імя М.І. Калініна, імя М.В. Фрунзе, імя С.М. Кірава, імя Аляксандра Неўскага, якія былі аб'яднаны ў дрысенскую групу партызанскіх атрадаў і ўключаны ў брыгаду «За Савецкую Беларусь». У жніўні да іх далучыўся атрад «Бясстрашны», які прыбыў з савецкага тылу. Па распараджэнні аператыўнай групы партызанскага руху пры Ваенным Савеце 4-й ударнай арміі ад 26 жніўня 1942 года гэта група атрадаў вызначана як Дрысенская партызанская брыгада (з кастрычніка 1943 года — 1-я Дрысенская брыгада). Атрад імя Сяргея застаўся ў брыгадзе «За Савецкую Беларусь». Пазней у складзе Дрысенскай брыгады створаны атрады «КІМ», імя У.І. Леніна і імя М.І. Кутузава.

Па распараджэнні БШПР у лютым 1943 года атрад «Бясстрашны» вылучаны ў самастойную баявую адзінку, у кастрычніку атрады імя М.І. Калініна і М.І. Кутузава перададзены для фарміравання 2-й Дрысенскай брыгады.

Пасля цяжкіх баёў з карнікамі ўвосень 1943 года брыгада ў складзе атрадаў імя А.В. Суворава, імя С.М. Кірава, імя У.І. Леніна, «КІМ» і імя Аляксандра Неўскага, агульнай колькасцю 729 чалавек, выйшла ў савецкі тыл і была рэарганізавана. У студзені 1944 года яна ў складзе 4 атрадаў (153 чалавекі) вярнулася ў раён баявых дзеянняў, дзе аб'ядналася з пакінутымі тут партызанамі сваёй брыгады (127 чалавек).

Брыгада дзейнічала ў Дрысенскім, Асвейскім і Расонскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 12 ліпеня 1944 года ў складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 281 партызан.

Камандзіры брыгады: П. Р. Мандрыкін (ліпень—верасень 1942, загінуў), Р.

А. І. Грыгор'еў.

П. Герасімаў (верасень 1942 — студзень 1944), А. І. Грыгор'еў (студзень — ліпень 1944); камісары: Р.П. Герасімаў (ліпень — верасень 1942), Ф. Ф. Шаблоўскі (верасень — лістапад 1942), А. І. Лісоўскі (лістапад 1942 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Ф. А. Рабцаў (ліпень — лістапад 1942), С. Ф. Ламінскі (лістапад 1942 — май 1943), А. А. Шыбаеў (май 1943 — студзень 1944), К. П. Кузьміцкі (студзень — ліпень 1944).

**АТРАД імя СУВОРАВА**

Арганізаваны ў ліпені 1942 года. Да жніўня 1942 года насіў назву імя М.В. Фрунзе. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 62 партызаны.

Камандзіры атрада: А.І. Грыгор'еў (сакавік 1943 — студзень 1944), І. М. Собалеў (студзень — ліпень 1944); камісары: А.І. Лісоўскі (ліпень — лістапад 1942), Ф.А. Рабцаў (лістапад 1942 — студзень 1944), А. М. Свінцілаў (люты — ліпень 1944); начальнікі штаба: А. С. Шушпанаў (ліпень 1942 — ), А.А. Шыбаеў (сакавік — май 1943), К.П. Кузьміцкі (май 1943 — студзень 1944), М. В. Урбан (студзень — чэрвень 1944, загінуў), Я. А. Лаўчыноўскі (чэрвень — ліпень 1944).

**АТРАД імя С.М. КІРАВА**

Утвораны ў канцы ліпеня 1942 года з жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 48 партызан.

Камандзіры атрада А.М. Свінцілаў (жнівень — снежань 1942), А.І. Грыгор'еў (снежань 1942 — сакавік 1943), П. Я. Габелка (сакавік 1943 — студзень 1944), У. У. Гардзей (студзень — ліпень 1944); камісары: В. Ц. Жалязноў (жнівень 1942 — студзень 1944), І. М. Палявечка (май — ліпень 1944); начальнікі штаба: Г. М. Красноў (жнівень — кастрычнік 1942), А. Р. Хаткевіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1943), І.М. Собалеў (чэрвень 1943 — студзень 1944), Э. А. Макарскі (май — ліпень 1944).

**АТРАД імя АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА**

Створаны ў канцы ліпеня 1942 года з жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 64 партызаны.

Камандзіры атрада: Я. Дз. Цыганкоў (жнівень 1942 — ліпень 1943), Б. Н. Шчарбакоў (май — ліпень 1944); камісары: А. С. Поснікаў (жнівень 1942), К. П. Базыленка (жнівень — верасень 1942, загінуў), У. С. Нікулін (верасень — кастрычнік 1942), П. К. Кралько (кастрычнік 1942 — ліпень 1944); начальнікі штаба: В. Т. Арышаў (ліпень 1942 — красавік 1944), П. І. Быкаў (май — ліпень 1944).

**АТРАД «КІМ»**

Арганізаваны ў верасні 1942 года з партызан, вылучаных брыгадай. У канцы снежня 1943 года ў складзе 157 партызан выйшаў у савецкі тыл і быў расфарміраваны.

Камандзір атрада — І. Р. Галубкоў (верасень 1942 — снежань 1943); камісары: А.С. Поснікаў (верасень 1942 — чэрвень 1943), А. А. Бохан (чэрвень 1943 — снежань 1943); начальнік штаба — У.У. Гардзей (верасень 1942 — снежань 1943).

**АТРАД імя У.І. ЛЕНІНА**

Створаны ў ліпені 1943 года. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 84 партызаны.

Камандзір атрада — С. Дз. Дзеліжонак (ліпень 1943 — ліпень 1944); камісар — П. Ф. Беладзедаў (ліпень 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Ф. М. Макараў (ліпень — лістапад 1943, загінуў), А. П. Гаркоўскі (лістапад 1943 — ліпень 1944).

**АСВЕЙСКАЯ БРЫГАДА імя М.В. ФРУНЗЕ**

У ліпені 1942 года ў Асвейскім раёне камандаваннем атрада імя М.В. Фрунзе, які дзейнічаў тут з вясны 1942 года, створаны атрады імя А.А. Жданава (пазней імя У.У. Сімацкага), імя Г.К. Арджанікідзе, імя А.Я. Пархоменкі. Гэтыя атрады

Камандны склад Асвейскай партызанскай брыгады імя М.В.Фрунзе, 1943 г.

і атрад імя М.В. Фрунзе былі аб'яднаны ў асвейскую групу партызанскіх атрадаў і ўключаны ў брыгаду «За Савецкую Беларусь». Па распараджэнні аператыўнай групы партызанскага руху пры Ваенным Савеце 4-й ударнай арміі ад 26 жніўня 1942 г. гэтая група атрадаў атрымала найменне Асвейскай брыгады імя М.В. Фрунзе. Атрад імя А.Я. Пархоменкі застаўся ў брыгадзе «За Савецкую Беларусь» (пазней — брыгада імя І.К. Ракасоўскага). Пазней у Асвейскай брыгадзе імя М.В. Фрунзе арганізаваны атрады імя Г.І. Катоўскага, імя А.А. Жданава, 2-гі імя М.В. Фрунзе. У канцы снежня 1943 года пасля цяжкіх баёў з карнікамі брыгада (1169 чал.) у складзе атрадаў імя А.А. Жданава, імя М.В. Фрунзе, 2-га імя М.В. Фрунзе, імя У.У. Сімацкага і імя Г.І. Катоўскага выйшла ў савецкі тыл і была рэарганізавана. У лютым 1944 года яна ў складзе атрадаў імя М.В. Фрунзе, імя У.У. Сімацкага і імя Г.І. Катоўскага (усяго 206 чалавек) вярнулася ў раён баявых дзеянняў. Тут у яе ўключаны атрад імя Г.К. Арджанікідзе, які не выходзіў у савецкі тыл.

Камандзіру брыгады І. К. Захараву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Асвейскім, Расонскім, Дрысенскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 13 ліпеня 1944 года ў складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 345 партызан.

Камандзіры брыгады: І.К. Захараў (ліпень 1942 — студзень 1944), М. М. Кузьмін (студзень — ліпень 1944); камісары: В. П. Уладзіміраў (ліпень 1942 — сакавік 1943, загінуў), А. І. Сяргушка (сакавік 1943 — студзень 1944), А.А. Бохан (студзень — чэрвень 1944); начальнікі штаба: А. Д. Мядзведзеў (ліпень — верасень 1942), А. І. Трафімаў (верасень 1942 — сакавік 1943), Ц. Ф. Радзівонаў (сакавік 1943 — студзень 1944), Г. Ахмадзьяраў. (люты — ліпень 1944).

### АТРАД імя М.В. ФРУНЗЕ

Утвораны ў Асвейскім раёне ў красавіку 1942 года з удзельнікаў падпольных арганізацый — партыйна-камсамольскай г.п. Асвея і камсамольска-маладзёжнай вёскі Прошкі. Да ліпеня 1942 года дзейнічаў самастойна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 84 партызаны.

Камандзіры атрада: І. К. Захараў (красавік — ліпень 1942), В. П. Калайджан

М. М. Кузьмін.

М. А. Шыпіла.

(жнівень 1942 — жнівень 1943), І. Л. Міхайлаў (верасень 1943 — студзень 1944), П. С. Смычкоў (студзень — ліпень 1944); камісары: І. П. Петрыенка (красавік — жнівень 1942), І. М. Бадыль (верасень 1942 — красавік 1943), П. С. Смычкоў (красавік 1943 — студзень 1944), А. А. Чарамісаў (люты — ліпень 1944); начальнікі штаба: А.І. Трафімаў (жнівень 1942), М. П. Ярмак (кастрычнік 1942 — студзень 1943), А. А. Дзямідаў (студзень — люты 1943, загінуў), В. Р. Пугачоў (сакавік — верасень 1943), М. Г. Кашалёў (верасень 1943 — студзень 1944), В. М. Бубноў (студзень 1943 — ліпень 1944).

Месца былога базіравання партызанскага атрада імя Г. К. Арджанікідзе каля возера Святое.

**АТРАД імя У.У. СІМАЦКАГА**

Арганізаваны ў ліпені 1942 года з партызан, вылучаных атрадам імя М.В. Фрунзе. Да кастрычніка называўся імя А.А. Жданава, пасля гібелі камандзіра Уладзіміра Уладзіміравіча Сімацкага (17 кастрычніка 1942 г.) атраду прысвоена яго імя. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 69 партызан.

Камандзіры атрада: У.У. Сімацкі (ліпень — кастрычнік 1942, загінуў); М.М. Кузьмін (кастрычнік 1942 — студзень 1944), К. Я. Мацкевіч (студзень — ліпень 1944); камісары: І.М. Бадыль (ліпень — верасень 1942), Ф. А. Ніколенка (верасень 1942 — студзень 1944), П. І. Агурэцкі (студзень — сакавік 1944); начальнікі штаба: С. І. Жвірбля (верасень 1942 — студзень 1944), М. А. Шыпіла (студзень — ліпень 1944).

**АТРАД імя Г.К. АРДЖАНІКІДЗЕ**

Створаны ў ліпені 1942 года з партызан, вылучаных атрадам імя М.В. Фрунзе. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 118 партызан.

Камандзіры атрада: Г. Ахмядзьяраў (ліпень 1942 — студзень 1944), П. П. Ліцвінаў (люты — ліпень 1944); камісары: М. П. Маліноўскі (жнівень — лістапад 1942), Ц.Ф. Радзівонаў (лістапад 1942 — сакавік 1943), М. І. Грыцкевіч (сакавік — чэрвень 1943), П. Л. Шкляроў (чэрвень 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: П.П. Ліцвінаў (ліпень 1942 — люты 1944), М. М. Шэф (люты — ліпень 1944).

**АТРАД імя Г.І. КАТОЎСКАГА**

Арганізаваны ў верасні 1942 года з партызан, вылучаных атрадам імя А.Я. Пархоменкі і жыхароў Асвейскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 38 партызан.

Камандзіры атрада: А. А. Шамаль (верасень 1942 — студзень 1944), І.М. Бадыль (студзень — красавік 1944, загінуў), А. С. Фадзеенка (красавік — ліпень 1944); камісары: А. І. Ліцвінаў (верасень 1942 — кра-

савік 1943), І. І. Сцяпанаў (красавік—верасень 1943), А. М. Пятроў (люты—красавік 1944, загінуў), М. А. Дзяльцоў (красавік—ліпень 1944); начальнікі штаба: Я. В. Лукашэнка (верасень 1942— ), І. І. Гіруцкі ( —май 1943), М. І. Карнаушанка (чэрвень—ліпень 1943), Р. К. Сляпнёў ( —кастрычнік 1943), А. В. Няфёдаў (кастрычнік 1943—студзень 1944), М. П. Муранаў (люты—ліпень 1944).

### АТРАД імя А.А. ЖДАНАВА

Утвораны ў чэрвені 1943 года. У канцы снежня 1943 года ў складзе 157 партызан выйшаў у савецкі тыл і расфарміраваны.

Камандзір атрада — С. У. Грабёнкін (чэрвень 1943—студзень 1944); камісары: П. Е. Рудэнка (чэрвень—верасень 1943, загінуў), М. М. Балтрушэвіч (верасень 1943—студзень 1944); начальнік штаба — І. М. Бадыль (чэрвень 1943—студзень 1944).

### 2-гі АТРАД імя М.В. ФРУНЗЕ

Арганізаваны ў верасні 1943 года з партызан, вылучаных атрадам імя М.В. Фрунзе. У канцы снежня 1943 года атрад колькасцю 105 партызан выйшаў у савецкі тыл і быў расфарміраваны.

Камандзір атрада — М. І. Іваноў (верасень—снежань 1943); камісар — А.І. Ліцвінаў (верасень 1943, загінуў); начальнік штаба — І.І. Гіруцкі (верасень—снежань 1943).

Група партызан атрада імя Г. К. Арджанікідзе. Першы злева ў першым радзе П. П. Ліцвінаў.

### 2-я ДРЫСЕНСКАЯ БРЫГАДА

Створана 4 кастрычніка 1943 года паводле загаду БШПР на базе атрадаў імя М.І. Калініна і імя М.І. Кутузава, вылучаных 1-й Дрысенскай брыгадай. Атрады былі перайменаваны ў 1-шы Калінінскі і 2-гі Калінінскі, пазней створаны 3-ці Калінінскі. У канцы снежня 1943 года пасля баёў з карнікамі брыгада ў складзе 1-га і 2-га Калінінскіх атрадаў (усяго 245 чал.) выйшла ў савецкі тыл, дзе была расфарміравана. 16 студзеня 1944 года камандны састаў брыгады з падраздзяленнем партызан (92 чал.) зноў прыйшлі ў Дрысенскі раён, дзе злучыліся з 3-м Калінінскім атрадам, які працягваў тут дзейнічаць.

Брыгада дзейнічала ў Дрысенскім і Расонскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 12 ліпеня 1944 года ў складзе 3 атрадаў агульнай колькасцю 230 партызан.

Камандзір брыгады — І. М. Кухарэнка (кастрычнік 1943—ліпень 1944); камісар — І. В. Хут (кастрычнік 1943—ліпень 1944); начальнік штаба — А. К. Касач (кастрычнік 1943—ліпень 1944).

### 1-шы КАЛІНІНСКІ АТРАД

Арганізаваны ў ліпені 1942 года з жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 61 партызан.

Камадзіры атрада: І.М. Кухарэнка (ліпень 1942—кастрычнік 1943), І. Я. Харкевіч (студзень—ліпень 1944); камісары: А.А. Бохан (ліпень 1942—чэрвень 1943), М. І. Жыгач (чэрвень—кастрычнік 1943), Л. Ц. Прозараў (студзень—ліпень 1944); начальнікі штаба: С. А. Чувахін (ліпень 1942—красавік 1943, загінуў), А. К. Касач (красавік—кастрычнік 1943), У. А. Несцярэнка (студзень—ліпень 1944).

**2-гі КАЛІНІНСКІ АТРАД**

Утвораны на пачатку ліпеня 1943 года з жыхароў вёсак Залессе, Клімаўшчына, Горнава, Асінаўка Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 63 партызаны.

Камандзіры атрада: Г. М. Іваннікаў (ліпень 1943—студзень 1944), А. А. Цехановіч (студзень—ліпень 1944); камісар — У. Р. Брыль (лістапад 1943—ліпень 1944); начальнікі штаба: А. А. Цехановіч (ліпень 1943—студзень 1944), В. В. Пястоўскі (студзень—ліпень 1944).

**3-ці КАЛІНІНСКІ АТРАД**

Сфарміраваны ў канцы кастрычніка 1943 года з партызан, вылучаных 1-м і 2-м Калінінскімі атрадамі і жыхароў Дрысенскага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 60 партызан.

Камандзір атрада — У. М. Арлоўскі (студзень—ліпень 1944); камісары: У.М. Арлоўскі (кастрычнік 1943—студзень 1944), П. М. Казачонак (студзень—ліпень 1944); начальнік штаба — С. П. Марозаў (кастрычнік 1943—студзень 1944).



Партызаны вядуць бой.

*Друкуецца па кн.: Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944. Мн., 1983. С. 274—281, 258—360.*

## Дакументы сведчаць

### З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ АСВЕЙСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ імя М.В. ФРУНЗЕ

**24.V.1943.**

За перыяд з 1.5.1943 спушчана эшалонаў з жывой сілай і розным грузам 5, у выніку чаго: узарвана паравозаў 5, знішчана вагонаў з жывой сілай 5, з розным грузам 20, платформаў 7 з аўтамашынамі і гарматамі сярэдняга калібру. У выніку забіта салдат і афіцэраў да 150 чалавек і паранена звыш 200 чалавек, разбіта аўтамашын 13, гармат 16.

Узарвана аўтамашына на шашы...

Кам. бр-ды Захараў
Нач. штаба Радзівонаў

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Спр. 32. Л. 38.*

* * *

**за перыяд з 1 па 10 лістапада 1943 г.**

2-й Дрысенскай парт. бр-дай за гэты перыяд агнём артылерыі і ПТР падбіты нямецкія танкі, знішчаны 2 легкавыя штабныя і 1 грузавая аўтамашыны.

Захоплены ў палон унтэр-афіцэр войск СС Антон Браун, забіты 1 штабс-фельдфебель, 1 унтэр-афіцэр і 21 нямецкі салдат. На мінах падарвана 17 салдат і афіцэраў.

Камандзір 2-й Дрысенскай парт. бр-ды Кухарэнка

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 29. Л. 4.*

## З ДЗЁННІКА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ АСВЕЙСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ імя М.В. ФРУНЗЕ ЗА ПЕРЫЯД З 8.2.1943 г. ПА 10.3.1943 г.

8.2.43. Самалёты не прыляцелі, настрой дрэнны, трымаць абарону брыгада не можа. Затрыманы яшчэ адзін шпіён, яго дзейнасць удакладняецца. Атрымана паведамленне, што праціўнік заняў мястэчка Сяляўшчына.

9.12.43. Склікана нарада каманднага саставу па пытанні стварэння засады ў раёне Каханавіч для вылоўлівання шпіёнаў на шляху ад станцыі Дрыса. Самалёты не прыляцелі. Становішча дрэннае.

10.2.43. Боепрыпасаў не даставілі. Становішча брыгады не зусім добрае...

11.2.43. Боепрыпасаў не даставілі... Завезены харчы для шпіталя ў в. Малавіды. Размешчаны бежанцы ў раёне на ўчастку атрада Арджанікідзе.

12.2.43. Брыгада стаіць у абароне ў раёне Каханавіч... Самалёты не прылятаюць. Становішча з боепрыпасамі дрэннае, атрад Сімацкага зрасходаваў усе патроны...

13.2.43. ...Самалёты не прыляталі. Боепрыпасаў няма. Становішча пагаршаецца. Атрад Сімацкага апынуўся ў зусім цяжкім становішчы, без патронаў.

14.2.43. ...Камандзір брыгады паехаў у атрад Фрунзе па пытаннях разведкі ў Латвіі і абсталявання пасадачнай пляцоўкі ў в. Дубровы. Начальнік штаба паехаў у в. Малавіды для ўладкавання пытанняў аб шпіталі.

15.2.43. Разведкай устаноўлена, што праціўнік вялікімі сіламі пачаў весці наступ з боку Дрысы, Бігосава і з боку Латвіі, куды для сустрэчы праціўніка выйшлі атрады для арганізацыі агульнай абарончай паласы. Камандзір брыгады паехаў у Расонскую брыгаду для падвядзення вынікаў праведзенай аперацыі па разгроме карнай экспедыцыі. Туды ж паехаў і доктар Вараб'ёў. Па шляху наведалі камбрыг Раманаў і камісар брыгады Караткова Фёдараў.

16.2.43. Атрады выйшлі на баявы рубеж Мядзведзева. Праціўнік заняў вёскі Ніжняе Хаміно і Вознава, паліць вёскі і знішчае мірнае насельніцтва. Камбрыг паехаў на КП у Каханавічы.

17.2.43. Праціўнік заняў абарону ў раёне Ніж. Хаміно і Вознава, устанавіў палявую сувязь і кантралюе партызан праз сваю авіяцыю. Яго задумкі нам невядомы. Праціўнік нават збірае ў вёсках катоў, навошта — невядома. Ёсць меркаванні, для аналізу атрутных рэчываў, якія можна прымяніць супраць партызан.

Закончана капіроўка карты.

Дастаўлены партызан Калеснік з заключэннем Несцярэнкі расстраляць, бо ў таго ў кішэні знайшлі нямецкі пароль.

18.2.43. Брыгада працягвае трымаць абарону ў раёне Мядзведзева. ...У брыгадзе адчуваецца востры недахоп боепрыпасаў. Самалёт застаецца адно абяцанкай. Настрой у атрадах кепскі. Атрымана радыёграма з абяцаннем боепрыпасаў. Рэзерваў узяць няма з чаго... З поля бою дастаўлены пяць параненых партызан з атрада Катоўскага, адзін па дарозе памёр...

19.2.43. Брыгада знаходзіцца ў абароне ў раёне Мядзведзева, усе спробы праціўніка прасунуцца наперад адбітыя. Праціўнік пачаў гнюсную раправу над мірнымі жыхарамі, спаліў 12 вёсак і знішчыў усё насельніцтва, старых і малых. Брыгада адчувае стомленасць і недахоп боепрыпасаў, што прыводзіць людзей у панічны стан. Начальнік штаба паехаў на пляцоўку чакаць самалёта і іншы груз.

20.2.43. Прыляцеў самалёт РБ-5. Мелі кароткую гутарку з камандзірам эскадрыллі па пытанні адпраўкі параненых і дастаўкі боепрыпасаў для брыгад, якія вядуць баі.

Расонская брыгада накіравалася для падмацавання ў распараджэнне Захарава. Арганізавана падвозка параненых на пляцоўку. Найперш павезлі для адпраўкі параненых з брыгады Караткова. Становішча брыгады з-за адсутнасці боепрыпасаў дрэннае.

21.2.43. Брыгада знаходзіцца ў абароне на старым месцы. Прыляцелі самалёты. Прыляцелі, але прывезлі толькі ўзрыўчатку. Пры атрыманні — поўны скандал. Груз атрымалі толькі Калінінскія брыгады.

22.2.43. Становішча пагоршылася. Праціўнік даведаўся, што ў нас няма боепрыпасаў, пачаў націскаць з усіх бакоў. Брыгада пачала адыход. Боепрыпасаў няма. Становішча пагражальнае. Пасланы прадстаўнік на самалёце за фронт для вырашэння пытання аб боепрыпасах.

23.2.43. Брыгада стаіць у раёне абароны Дзедзіна—Каханавічы. Праціўнік баявых дзеянняў не вядзе, заняты пахаваннем сваіх трупаў. Прыкладны падлік ягоных страт — да 500 чал. Нашы страты — 1 забіты і 7 параненых. Праціўнік вёў наступ у выключна п'яным стане.

Самалёты засталіся на возеры Лісна. Нельга завесці і дрэнная бачнасць.

24.2.43. Самалёты застаюцца на возеры. Праціўнік асноўныя баявыя дзеянні не вядзе. На пляцоўцы дзяжураць Несцярэнка, Бажок, камандзір эскадрыллі. Паглядзеў стан

брыгад і запэўніў, што ўсё, што будзе залежаць ад яго, будзе ўладкавана і боепрыпасы будуць падкінуты. Наведаў шпіталь і гутарыў з параненымі.

25.2.43. Брыгада стрымлівае праціўніка ў раёне Каханавіч. За 24.2. праціўнік спаліў некалькі вёсак. Сёння намі пакінуты Каханавічы. Праціўнік стаў актыўна дзейнічаць у некалькіх месцах і на Асвею. Праціўнік моцна бамбіў Каханавічы.

Самалёты паляцелі за фронт. Становішча дрэннае, чакаем боепрыпасы... З-за адсутнасці боепрыпасаў раён утрымаць не можам...

26.2.43. Брыгада вяла баі ў раёне Стралкоў. Праціўнік пры падтрымцы авіяцыі брыгаду адцясніў у лес за Мікуліна. Штаб брыгады перайшоў у Малавіды. Шпіталь пераведзены з Малавідаў у Пірагова.

Дрысенская брыгада заняла абарону на рубяжы Селядцова—Буёва—Марачкова. Праведзена нарада камандавання брыгад па пытанні адзінага кіраўніцтва.

27.2.—1.3.43. Брыгада ў баі не ўступае з-за адсутнасці боепрыпасаў. Самалёты праціўніка бамбілі і часткова спалілі Буёва, Селядцова, Задзежжа і шэраг іншых вёсак.

2.3.43. Атрады Фрунзе і Катоўскага адышлі на новыя рубяжы абароны ў Селішча. Самалёты праціўніка бамбілі і спалілі рэшткі в. Гарадзілавічы і абстралялі вёскі Макуты, Ардаўскія, Страдна, Лісна і інш...

3.3.43. Праціўнік заняў вёскі Нямыцькі і Маскалёнкі. Апошнія спалілі. Атрад Катоўскага ад немцаў адышоў. На паўночным участку праціўнік прасунуўся да Гарадзілавіч. Брыгада перабазіравана ў Роўнае Поле. Самалёт праціўніка бамбіў некаторыя вёскі на паўночным участку.

5.3.43. Брыгада затрымлівала праціўніка на рубяжы абароны. Усе спробы праціўніка прасачыцца ў лес пацярпелі няўдачу. Самалёты праціўніка бамбілі шэраг вёсак. Самалёты нашы не прыляцелі. Боепрыпасаў няма. Становішча дрэннае. Чаканне застаецца дарэмным. Вырашана накіраваць пешую групу па зброю і боепрыпасы.

6.3.43. Ездзілі сустракаць самалёты, але яны не прыляцелі. Адсутнасць боепрыпасаў прыводзіць у паніку. Што рабіць? Няма ніякіх рашэнняў. Надвор'е стаіць цудоўнае. Самалёты праціўніка не даюць спакойна жыць, часта робяць налёты на вёскі, якія ім не ўдалося спаліць. Група для адпраўкі за лінію фронту сабрана ў колькасці 200 чал. Дасталі адзін камплект жыўлення для рацыі. Праехаў па лесе, дзе стаяць бежанцы. Ёсць выпадкі — паміраюць дзеці ад голаду і холаду. Становішча насельніцтва цяжкае, што рабіць далей — невядома. З-за фронту ніякіх распараджэнняў не даюць.

7.3.43. Начальнік штаба прыехаў з в. Галяшы, па дарозе наведаў партызанскія сем'і, што жывуць у лесе. Вельмі многа розных скаргаў. Прыкметна, што сярод сем'яў ёсць чужыя элементы, якія пускаюць паніку сярод жыхароў аб прасоўванні праціўніка ў глыб лесу.

Праціўнік узяў ініцыятыву ў свае рукі, асабліва на паўднёвым і паўночным участках. Асабліва на паўночным участку, дзе пад прыкрыццём сваёй авіяцыі вядзе паспяховы наступ у бок вёсак Белае і Ельніца, Лісна.

Брыгада атрымала папаўненне боепрыпасамі, што падняло дух у партызан.

8.3.43. Праціўнік вядзе наступ на папярэднім напрамку. Спаліў вёскі Селядцова, Буёва і вядзе наступ на Марачкова, Маторына і на поўначы на вёску Лісна.

9.3.43. Атрады знаходзяцца ў паўкальцы. Вырашана атрады пакінуць у тыле ворага. Праціўнік пусціў супраць нас 15 самалётаў, якія на працягу дня рабілі бесперапынныя налёты на вёскі і ўзлессе. Пры бамбёжцы вёскі Ардаўскія загінуў батальённы камісар Уладзіміраў...

10.3.43. Па рашэнні камандавання брыгады атрады павінны заставацца ў размяшчэнні сваіх баз і пасля пачаць дзеянні ўнутры захопленай тэрыторыі. Становішча сем'яў, што засталіся ў кальцы, яшчэ невядомае. Праціўнік вёў актыўны наступ на Малавіды і Лямно. Пасля дзённага бою праціўнік дасягнуў сваёй мэты. Кальцо замкнулася. Атрад Арджанікідзе застаўся ў лесе ў кальцы ворага. Становішча атрада невядомае. Астатнія адышлі ў бок Лямна. Штаб брыгады пераехаў у в. Вялікае Балота.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3912. Воп. 1. Спр. 4. Л. 61—73.*

## З БАЯВЫХ ДАНЯСЕННЯЎ АСВЕЙСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ імя М.В. ФРУНЗЕ

24.08.43 брыгадная разведка праз сваю агентуру ст. Дрыса дамовілася з пастухамі, якія пасвілі статак кароў з в. Запруддзе і ст. Дрыса, перадаць жывёлу партызанам. А ў 14.00 партызан Шкецік і партызанка Марынская, схаваўшы пісталеты ў кішэні, накіраваліся да статка за 200 м ад чыгункі. Пастухі заўважылі, што ідуць партызаны, падагналі бліжэй статак, перадалі яго партызанам (160 галоў БРЖ, 40 авечак) і самі пайшлі з партызанамі.

У гутарцы з імі яны заяўляюць, што ім патрэбна ехаць на работу ў Германію, але яны, ведаючы, што там іх чакае пагібель, вырашылі дапамагчы партызанам і самі ўліцца ў іх шэрагі.

Немцы, даведаўшыся аб тым, што партызаны сагналі статак, пусціліся ў пагоню кіламетраў восем. Але партызаны пагналі жывёлу ў іншым напрамку.

6.08.43 года праціўнік з гарнізонаў Дрыса, Бігосава, Вусце, Часнаполле колькасцю да 1200 чалавек выехаў на ўборку ўраджаю ў раён Расіца, Каркалец, Сар'я і заняў абарону па лініі Чарняўшчына, Вялікія Плейкі, Абухава, Абразева, Ніжняе і Верхняе Стунжава, Козлава, Булы, Ліпаўкі.

Атрады занялі абарону па правабярэжжы р. Сар'янкі, вядуць баі з праціўнікам, што выехаў на ўборку. Сабраны ўраджай праціўнік звозіць у гарнізон Вусце, дзе абмалочвае. Абмалочанае збожжа грузяць у вагоны і накіроўваюць на захад. Па звесткам агентурнай разведкі праціўнік на нашым участку хацеў сабраць ураджай да лясных масіваў за шашэйнымі дарогамі Задзежжа — Асвея, Ліс-на — Асвея.

Гэтыя планы праціўніка сарваны. Партызаны сабралі ўраджай у крайніх да праціўніка вёсках Бажкі, Каркалец, Грыбоўцы, Малыя і Вялікія Плейкі, Сар'я, Фальбаркова, Пустэльнікі і па ўсёй былой мяжы Латвіі. Намі скошана 540 гектараў, абмалочана 480 гектараў, засыпана збожжа ў сховішчы 420 тон.

Партызанскі млын.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 32. Л. 55, 56.*

## З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ 1-й ДРЫСЕНСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ЗА ПЕРЫЯД З 1 МАЯ ПА 1 ЧЭРВЕНЯ 1943 г.

31.5.43 прыбыў батальён «народнікаў» «Дзвіна-603» пад камандаваннем маёра Аляксеева з мэтай барацьбы з партызанамі. 870 чал. раскватараваны ў вёсках Балоціна, Грулева, Трэскавічы, Антонава. Арганізавалі некалькі спроб звязацца з імі. 6.06.43 19 чалавек перайшлі да партызан са зброяй — 1 станковы кулямёт, 2 ручныя кулямёты, 16 вінтовак.

11.6.43 у в. Балоціна раззброілі 60 чал. «народнікаў» і са звязанымі рукамі адправілі ў лагер.

10.6.43 група партызан у колькасці 36 чал. з 10 ручнымі кулямётамі пад камандаваннем ст. лейтэнанта Урбана М.В. з дыстанцыі 400—500 м абстралялі вялікую групу «народнікаў».

У выніку забіта — 28, паранена — 11 салдат і афіцэраў.

14.6.43 у дзень Тройцы немцы ў м. Валынцы склікалі мітынг паліцыі, «народнікаў» і мясцовага насельніцтва. Мітынг разбегся, бо за 300 м ад натоўпу разарваліся два снарады, якія мы запусцілі па мітынгу з 122-мм гарматы. Прамым пападаннем снарада разбіты дом у Антонаве, дзе знаходзілася каля 25 чал. «народнікаў». 9 снарядаў ляглі ў размяшчэнні праціўніка. Вечарам правялі артналёт на вёскі Балоціна, Трэскавічы. Снарады клаліся ўдала — адзін снарад разарваўся ля штаба батальёна, паранены вартавы штаба, штаб пераехаў за чыгунку.

3.1.6 па 25.6.43 штодзень да гарнізонаў «народнікаў» высылаліся снайперскія групы, якімі знішчаны 18 салдат і афіцэраў...

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 28. Л. 61, 62, 68.*

## ПЕРАПІСКА КАМАНДЗІРА ЗЛУЧЭННЯ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ ГЕРАСІМАВА З КАМЕНДАНТАМ м. БОРКАВІЧЫ АБ АБМЕНЕ ВАЕННАПАЛОННЫМІ

**1942 г.**

**м. Боркавічы, пану каменданту**

У апошніх аперацыях намі захоплена нейкая колькасць Вашых салдат палонных, частка з іх, з іх слоў, з'яўляецца чыстакроўнымі арыйцамі, яны выказалі гарачае жаданне быць абменены мі, каб зноў вярнуцца да Вас. Камандаванне партызанскіх атрадаў насустрач просьбам палонных нямецкіх салдат прапаноўвае Вам здзейсніць абмен на наступных умовах:

за обер-яфрэйтара Вілі Нізэ — выдаць нам начальніка Дрысенскай паліцыі Жука;

за яфрэйтара Эрыка Хопнера выдаць палоннага параненага ў абедзве нагі і рукі партызана, захопленага ля Свальнянскага моста;

за салдат Фларыяна Крамера і Альфонса Райне выдаць нам 20 чалавек паліцэйскіх па прыкладзеным спісе.

Калі Вы, пан камендант, даражыце сваімі салдатамі, то на гэткую умову абмену, безумоўна, згодзіцеся, бо за трох салдат, як Вы кажаце, доблеснай нямецкай арміі Вам варта аддаць 22 паліцэйскіх, якія прадалі сваю Радзіму, свой народ і пры першым зручным выпадку прададуць і Вас.

Час абмену назначаю Вам 15.XI.1942 с 10.00 гадзін па дарозе Дрыса — Каханавічы, у в. Бажкі, і па дарозе Боркавічы — Расоны ў Дзёрнавічах.

Указваю: абяззброенных паліцэйскіх, што належаць абмену, павінны канваіраваць не больш як 20 нямецкіх салдат; гэткая ж колькасць узброенага канвою партызан будзе знаходзіцца з палоннымі нямецкімі салдатамі.

Асоба, назначаная Вамі для перамоў, і перакладчык павінны рухацца на 200 м спераду, тое ж будзе і з нашага боку.

Камандзір злучэнняў
партызанскіх атрадаў (Герасімаў)

**Камандзіру партызанскай часці ў Дзёрнавічах**

Ваша пісьмо ад 6.XI. знаходзіцца ў маіх руках. Як камендант Боркавіч я зацікаўлены ў вызваленні нямецкіх салдат, я гатовы абмяняць 4-х нямецкіх салдат на 4-х партызан, якія знаходзяцца ў турме ў Полацку, гэта складзе 4 на 4, прытым з тых, што знаходзяцца ў кожным з бакоў.

Абмен на гэтай аснове мог бы адбыцца ў чыстым полі за 500 м на захад ад Дзёрнавіч, на дарозе ў Жукі.

Далейшыя падрабязнасці могуць быць удакладнены.

Адказ чакаецца да 15.XI.42.

Боркавічы, 11 лістапада 1942
Подпіс

**Каменданту нямецкага гарнізона ст. Боркавічы**

Ваша пісьмо ад 11.XI.42 г. паступіла мне 14.XI.42 г. З гэтага пісьма мне стала ясна, што Вы пакуль не маеце намеру абмяняць Вашых палонных салдат на прапанаваных намі ўмовах і выстаўляеце свае ўмовы абмену 4-х нямецкіх салдат на 4-х нейкіх партызан.

На Вашы ўмовы абмену я не магу згадзіцца па наступных прычынах:

1. З партызан даверанага мне падраздзялення ў нямецкім палоне знаходзіцца толькі два чалавекі.

2. Пад выглядам 4-х партызан Ваша разведка не пасаромеецца паслаць да нас 4-х сваіх шпіёнаў.

...Маю намер выменяць на обер-яфрэйтара — начальніка Дрысенскай паліцыі Жука, а на аднаго нямецкага салдата — 10 чалавек з ліку паліцэйскіх па раней высланым Вам спісе. На месца здзяйснення абмену згодны.

Адказ чакаю да 20.XI. 1942. У выпадку неатрымання адказу ці Вашай адмовы ад абмену ўсе палонныя будуць накіраваны ў лагер ваеннапалонных.

Камандзір злучэння партызанскіх атрадаў
Герасімаў

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 28. Л. 21—22.*

## З ДАКУМЕНТАЎ ДРЫСЕНСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ (Герасімава)

Старэйшым вёсак Гваздова, Ліцвякова, Рудня, Юзэфова.

Камандаванне Дрысенскай партызанскай брыгады даводзіць план здачы прадуктаў харчавання з кожнай гаспадаркі дадаткова з кожнага гектара пасяўных плошчаў: збожжавых 32 кг, мяса 15 кг, малака 100 літраў з каровы за год, бульбы 2 цт, сена 1 цт. Тэрмін выканання здачы прадуктаў з 16.11.43 па 20.11.43, за выключэннем малакапаставак. Прадукты здаваць брыгадзе Раманава. 16.11.43. Герасімаў, Сяргушка.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3894. Воп. 1. Спр. 5. Л. 121.*

## З ПАСТАНОВЫ БЮРО ДРЫСЕНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КБ(б)Б

**ад 28 мая 1943 г.**

...6. Командирам и комиссарам, секретарям первичных партийных и комсомольских организаций обратить особое внимание в период наступления Красной Армии на следующее:

а) Усилить борьбу партизанских отрядов на всех коммуникациях, железнодорожных узлах, проходящих на территории нашего района, уничтожить важнейшие железнодорожные и шоссейные мосты и сооружения с тем, чтобы немецкая армия не имела возможности своевременного подвоза боеприпасов и пополнения фронтов, чтобы вся техника и имущество немцев при отступлении их остались на путях и складах, расположенных в нашем районе.

5) Необходимо своевременно предупредить и призвать народ к сохранению общественных и частных ценностей. Все, что можно, закопать в землю, прятать и спасать от ограбления и увоза немцами, угонять скот и прятать запасы продовольствия. Создавать в селах специальные группы по уничтожению немецких поджигателей, которые выделяются отступающими частями для уничтожения населенных пунктов.

в) Организовать в городах специальные группы из местного населения — женщин, детей, стариков для наблюдения за крупными зданиями, заводами и фабриками, которые будут минироваться немецкой армией при отступлении с тем, чтобы тотчас же по уходу немецких войск обезвреживать мины и немедленно доносить о том передовым частям Красной Армии при вступлении их в город.

г) Необходимо принять все меры для того, чтобы уберечь народ от истребления и насильственного угона в Германию.

д) Необходимо решительно усилить разведывательную работу в помощь Красной Армии, сообщать о передвижениях воинских частей, расшифровать всю оборонительную сеть противника вокруг города и на рубежах.

8. РК КП(б)Б обращает внимание командиров и комиссаров, секретарей первичных партийных и комсомольских организаций на необходимость решительной борьбы со всякого рода проявлениями неправильного отношения к населению, с фактами мародёрства, незаконных обысков, изъятий имущества, самогонокурения, с недооценкой роли девушек и женщин в партизанской борьбе, с фактами неправильного отношения к женщинам и девушкам, принимающими иногда форму прямого принуждения к сожительству...

9. Поручить зам. комбрига по разведке тов. Белову и секретарю РК ЛКСМБ тов. Гавриловичу организовать к 10 июня сего года 10-дневные курсы с охватом не менее 100 девушек по диверсионной и разведывательной работе.

10. Поручить начальнику штаба тов. Шибаеву и секретарю РК ЛКСМБ т. Гавриловичу создать и обучить при отрядах комсомольско-молодежные группы по истреблению вражеских танков.

Секретарь РК КП(б)Б Герасимов

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3800. Воп. 1. Спр. 2. Л. 39—40.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак*

## Разгром Беніслаўскага гарнізона

Стварэнне буйных партызанскіх брыгад было хутка адзначана першай буйнейшай дыверсіяй — падрывам Беніслаўскага моста цераз раку Дрыса на Рыга-Арлоўскай чыгунцы ўначы з 3 на 4 жніўня 1942 года.

Пра гэту аперацыю напісана нямала ўспамінаў, зафіксаваны сведчанні ў дзённіках дзеянняў брыгад і атрадаў. Ёсць у апісаннях пэўныя разыходжанні, некаторыя атрады быццам «не заўважылі» ўдзелу ў баі іншых падраздзяленняў, акрамя сваіх. Аднак, урэшце, гэта і не дзіўна, калі ўлічыць, што аперацыя праводзілася ў той час, калі яшчэ толькі-толькі скончылася перафарміраванне партызанскіх структур і не ўсе яшчэ ведалі дакладна ранг і падпарадкаванне той ці іншай партызанскай групы.

А. І. Петракоў.

Нават такі дасведчаны мемуарыст, як В. Лукашонак, называе камандуючага аперацыяй А. Петракова не па імені і не па пасадзе, а як «пасрэдніка штаба партызанскага руху».

Таму, не супастаўляючы розныя апісанні і не камбінуючы з іх агульную карціну, прывядзем урывак з успамінаў аднаго з распрацоўшчыкаў і арганізатараў аперацыі, былога камісара 17-га асобага атрада, а потым брыгады імя Ракасоўскага Аляксандра Васільевіча Раманава.

Група партызан спецатрада «Баявы». У цэнтры — А. І. Петракоў, А. В. Раманаў.

## «Удар дзвюх дывізій»

«...Атрады сканцэнтраваліся ў Рудні... Сонца паліла бязлітасна. Партызаны, рассеўшыся пад тынам, у ценю дрэў, ля перадкоў гармат, адчайна дымілі самасадам ды пілі ваду з вёдраў, пачціва прынесеных дзяўчатамі. Настрой быў прыўзняты: партызаны ўпершыню бачылі саміх сябе, сваю сілу.

Нарэшце атрады рушылі па дарозе на Зябкі. Калона выцягнулася, і я, прымасціўшыся на брычцы побач з Петраковым, сам мімаволі залюбаваўся агромністым па-

А.В.Раманаў, 1943 г. Мал. Л.Айзенберга.

токам людзей, нядрэнна ўзброеных кулямётамі і нават гарматамі.

Атрады, якім належала дзейнічаць на левым флангу, выступілі асобна. Група падрыўнікоў на чале з Мандрыкіным выехала на Дрысу ладзіць плыт. Яму былі прыдадзены адважныя з адважных...

Пераход за пераходам калона марудна набліжалася да месца аперацыі. Ужо пачынала цямнець, хутка густая цемра пакрыла наваколле.

— Усё спакойна. На мосце вартавы ходзіць. Пазіцыю для гармат выбралі, — далажыла разведка, калі калона ўпаўзла ў лясок, што прымыкаў да Беніслаўскай платформы.

— Добра. Дзесяць хвілін прывал! Не курыць! — распарадзіўся Петракоў і сам сеў на сырую ад расы траву, пад куст, у начную цемру, быццам пайшоў некуды пад зямлю.

Навокал было цёмна, хоць вока выкалі. Я вобмацкам пайшоў уздоўж заціхлай калоны, правяраючы яшчэ раз, ці ўсе дастаткова зразумелі свае абавязкі.

Калі атрады рушылі на зыходныя пазіцыі, я зноў паспяшаўся ў галаву калоны, да Петракова. Ледзьве знайшоў яго. Страціўшы раўнавагу на ўзгорку, дзе некалькі чалавек прыладжвалі свой станкач, я пакаціўся ў глыбокі роў, зарослы хмызам. Раптам пачуўся голас Петракова:

«Камісар! Давай вядзі Сяргееўскі атрад сюды, пашукай яму пазіцыю. Я пайшоў да гармат, там нешта не ладзіцца», — і ён нырнуў у цемру. Я разгарнуў сяргееўцаў на маленькім пятачку ля вусця рова і стаў азірацца, выбіраючы месца для каманднага пункта.

Петракоў вярнуўся няскора, загадаўшы паставіць адну гармату побач з нашым пятачком на беразе ракі. Тут, маўляў, ёй давядзецца біць па казарме з адлегласці ўсяго 150 метраў.

— А Мандрыкіна з яго плытом дасюль не відно, — дадаў ён.

— Як бы не спазніліся, — занепакоіўся я.

— Усё пытанне ў гэтым. Бач, ужо віднее. Я яму бубну выб'ю, калі падвядзе!

У ледзь кранутай ранкам цёмнай смузе раптам бухнулі чатыры разрывы злева і справа. Гэта групы загароды рвалі сувязь і рэйкі з боку Боркавіч і Свольны.

— Ну, цяпер усё адно, спозніцца плыт ці не, — прашаптаў Петракоў, кладучыся за бугорчык і прыладжваючы аўтамат. Паглядзеўшы на гадзіннік, ён загадаў:

— Сувязны! Перадай разлікам: агонь!

Кладучыся побач з Петраковым, у змроку, што рассцілаўся над ракой, я раптам убачыў перад сабой навіслую аграмадзіну моста і масіўны, метры тры таўшчынёй, бык, падобны на вялізны прас. Па мосце спакойна шпацыраваў вартавы, раскурваючы цыгарку. Далей за мостам стаяла невялікая цагляная будыніна — вартоўня і нейкая драўляная адрына. Правей стаяла казарма — агромністы двухпавярховы цагляны дом. Удалечы на фоне неба ўжо смутна маячыў Валынецкі касцёл.

З вартоўні выйшаў чалавек, падышоў да вартавога, грукочучы ботамі па мосце, і загаварыў нешта. Вартавы, кінуўшы цыгарку, пайшоў у вартоўню, а гэты застаўся. «Змена варты», — прамільгнула ў галаве.

— Зараз ён накладзе ў штаны, — працадзіў скрозь зубы Петракоў.

Узвіліся дзве зялёныя ракеты.

Быццам уздых палёгкі з грудзей здранцвелых у чаканні людзей залпам грымнулі гарматы, запрацавалі мінамёты, затрашчалі кулямёты, нібы барабан камбайна, што выкалочвае зерне. Вартавога як языком злізала.

— У-а-у-тах! — заспявалі снарады, ды трапілі з першага стрэлу без промаху ў казарму і вартоўню.

— Чы-чы-чы! — заборыста стракаталі ручныя кулямёты і, нібы падпяваючы ім, баском прыгаворвалі станковыя: — Ду-ду-ду-ду!

Атрад імя Шчорса пад прыкрыццём агню ланцугом пакаціўся да моста.

— Куды страляеш, куды страляеш? — зароў раптам Петракоў.

— Бам-м!

— Чорт! Убярыце вы гэты мінамёт з-пад вуха!

У ланцугу сяргееўцаў ляжаў адзін баец і шпарыў са стрэльбы наўгад, адчайна лязгаючы затворам. Галаву ён схаваў за купіну. Нехта сунуў яму кулаком па патыліцы, прымусіўшы біць па цэлі.

Нервовы напал першых хвілін бою прайшоў. Настаў час нармальнай працы ў баі. Атрад імя Шчорса падышоў да моста, залёг там і павёў агонь па вартоўні. Агонь немцаў быў не такі моцны, але на мосце яны білі даволі кучна і прыціснулі шчорсаўцаў да зямлі.

— Аўсяннікаў, наперад! — загадаў Петракоў сяргееўцам, і тыя сарваліся з месца. У бінокль было бачна, як біла наша артылерыя, як лажыліся снарады — у сцяне вартоўні і адрыны вымалёўваліся ўсё новыя рваныя дзіры.

— Таварыш капітан, немцы вядуць агонь па плыту, не даюць плысці. Я ўжо іх шэсць штук зняў там, за чыгункай, — узахлёб дакладваў, прыбегшы з групы Мандрыкіна, Шчупляцоў.

— Дзе плыт?

— Плыт? Вось ён!

Я разгледзеў у бінокль некалькі немцаў, якія, высунуўшы галовы з-за насыпу, вялі агонь па рацэ. Рэчышча блізка падыходзіла да палатна, потым адыходзіла ад яго і зноў заварочвала пад мост. Плыт быў блізка да палатна і абстрэльваўся немцамі. Было бачна: Мандрыкін і двое яго байцоў схаваліся за скрынямі з толам і пакрыху граблі. Па беразе, прыгінаючыся, беглі некалькі чалавек і стралялі па немцах. Я пазнаў Весялова, Міхеева. Паклікаў Шчупляцова.

— Бачыш немцаў за чыгункай? Бі іх!

Адбылася невялічкая замінка. Агонь праціўніка ўзмацніўся. З батарэі далажылі, што снарады канчаюцца. На зыходзе былі патроны ў шчорсаўцаў. Петракоў кінуў у бой рэзерв.

Бубінцы, нібы скочкі на гумавых нагах са старых казак, са зброяй наперавес паімчалі, перамахваючы цераз шырачэзны яр. Сяргееўскі атрад, аглушыўшы кулямётным агнём два дзоты, сарваўся з месца да моста і затаптаўся ў нерашучасці. Наперад выскачыў камандзір атрада.

— Наперад! — рассыпаючыся адборнай мацяршчынай, зароў ён, размахваючы аўтаматам, і кінуўся на мост. І тут нібы прарвала плаціну. Партызаны лавінай рынуліся на мост. Цяпер іх не мог спыніць нават шквальны агонь. Плыт з узрыўчаткай вырульваў з лукавіны пад мост.

— Ур-ра-а-а! — пракацілася ў паветры.

Успышкі, кароткія чэргі аўтаматаў, выбухі гранат — бой перакінуўся на левы бераг. У дотах партызаны ўрукапашную распраўляліся з ацалелымі гітлераўцамі.

Цішыня... У бінокль было бачна, як партызаны забегалі вакол будынкаў, падбіраючы стрэльбы, здымаючы гадзіннікі і сцягваючы боты з забітых немцаў, нешта цягнучы з вартоўні. Яны былі падобныя на мурашак у разбураным мурашніку. А пад мостам па плечы ў вадзе бэрсаліся людзі, прывязваючы плыт да быка.

Петракоў, які стаяў бледны ад напружання апошніх хвілін бою, з палёгкай уздыхнуў, распраўляючы рэўматычныя ногі. З-пад моста ўзляцела чырвоная ракета.

— Адыхо-дзь! Падпальваю! — закрычаў Мандрыкін.

Партызаны, трымаючы пад пахамі трафейную зброю, папяросы, абмундзіраванне і розную драбязу, беглі назад цераз мост

Пад мостам узвілася тоненькая палоска дыму і папаўзла ўгору. Узвіліся дзве ракеты — сігнал для агульнага адыходу. Людзі кінуліся з-пад моста. Я ўстаў на грудок і прыклаў ФЭД да вока, каб зафатаграфаваць момант выбуху. Чакаць тры хвіліны. Зараз... Зараз... Вось...

Ускінуўся велізарны шар дыму, прарэзаны стрэламі агню. Я шчоўкнуў... І адразу раздаўся выбух, выбух аглушальны і масіўны, з металічным тэмбрам, быццам удар молата па дне агромністай металічнай бочкі. Уздрыганулася зямля. Потым пайшоў «дождж»: падалі аскялёпкі цэглы, жалеза, з свістам праносіліся абломкі рэек і шпал — дастала аж да камандnага пункта. Бык узарвала пад камель. Вялізныя маставыя бэлькі з абодвух бакоў абрынуліся ў ваду. Я зрабіў яшчэ некалькі здым-

каў і пайшоў да калоны, дзе, нягледзячы на стомленасць людзей, панавалі ўзбуджанасць і радасць.

Вынікі аперацыі былі наступныя. Вялізны мост даўжынёй 120 метраў узарваны, гарнізон аховы з 65 чалавек цалкам знішчаны. Аперацыя была праведзена ў той момант, калі войскі Калінінскага фронту перайшлі ў наступ.

17 сутак чыгунка бяздзейнічала. Акрамя таго, у некаторых месцах было парвана чыгуначнае палатно і тэлефонная сувязь. У Боркавічах снарадамі гарматы быў папсаваны народны дом, забіта 12 немцаў, на станцыі разбіты паравоз. Артналёт на мястэчка так напужаў тутэйшы гарнізон, што немцы ледзь не ўцяклі ў Баравуху.

Значэнне гэтай аперацыі важнае. Ёю была прадэманстравана сіла ўдару вялікай масы партызан. Яны паверылі ў сваю моц, а насельніцтва шырокай хваляй махнула на бок партызан.

Была яскрава даказана мэтазгоднасць і жыццёвасць партызанскай артылерыі. Нават такія скептыкі, як П. Герасімаў, пранікліся павагай да новай зброі.

Не дзіўна, што пасля гэтага зніклі ўсе гарматы, што валяліся паўз дарог, а з часам брыгады пахваляліся адна перад адной сваёй артылерыяй, на якую раней гладзелі з лёгкай усмешкай.

Праз нейкі час немцы распаўсюдзілі чуткі, што ў раёне Дзёрнавічы — Клясціцы скінуты дзве авіядэсантныя дывізіі Чырвонай Арміі, якія і падарвалі мост. Пэўна, фашыстам сорамна было прызнацца, што іх так моцна пакалацілі партызаны...

У гэтай аперацыі вызначыліся камандзіры і байцы атрадаў, падрыўнікі і стралкі, артылерысты і санітаркі.

Параненыя, да канца аперацыі кіравалі сваім атрадам імя Шчорса камандзір П. Машэраў і начальнік штаба У. Шчуцкі.

Бой на Беніслаўскім раз'ездзе, арганізаваны вопытнымі камандзірамі, прыслалнымі з фронту, выканаў і ролю «тактычных вучэнняў» для яго ўдзельнікаў — партызан Дрысенскай групы атрадаў і зборнага атрада з 50 чалавек захараўцаў, якія засталіся дзейнічаць на сваёй тэрыторыі».

У. П. Шчуцкі.

П. М. Машэраў. 1943 г. Мал. Л. Айзенберга.

Застаецца дадаць адзін сімвалічны, гісторыка-геаграфічны штрых да сказанага. Мясціна, дзе адбыліся падзеі жнівеньскай ночы 1942 г., ва ўспамінах іх удзельнікаў называецца «пералескамі», «кустоўем», «узлескам», з «буграмі», «равамі», «ярам» і інш. Між тым яна мае ўласную адметнасць: штурм вёўся са старадаўняга Княжыцкага гарадзішча Гарадзец над ракою Дрысай, дзе тысячу год таму нашы продкі бараніліся ад нязваных прышэльцаў. Зараз там паляць кастры ў купальскія ночы. На паляне між дубоў пастаўлены ахоўны знак, а з вокнаў пасажырскіх цягнікоў, што грукочуць па Беніслаўскім мосце, праглядаецца чароўная панарама тутэйшых мясцін і светлая стэла на прырэчнай лугавіне як напамінак аб гарачых днях і начах апошняй вайны.

*А.В. Раманаў,*
былы камандзір партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага

# Дакументы сведчаць

## З ДЗЁННІКА БАЯВЫХ СПРАЎ КАМАНДУЮЧАГА АХОЎНЫХ ВОЙСК І ТЫЛУ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» з 1.7.1942 па 31.12.1942

3.8.1942 г. Посещение командующим и начальником штаба 201-й охранной дивизии, с целью обсуждения крайне напряженного положения в Полоцком районе. Ж/д линии Полоцк – Невель, Полоцк – Витебск и Полоцк – Дюнабург на длительное время выводятся из строя. Командир дивизии указал на то, что все усилия, направленные на борьбу с партизанами, будут безуспешны до тех пор, пока не будет прекращен приток партизан через «окно»* в линии фронта на участке 59-го армейского корпуса...

4.8.1942. В ночь с 3 на 4.8.1942 года партизанская банда**, количеством в 200 человек, вооруженных тяжелым пехотным оружием и артиллерией, совершила нападение на ж/д мост через Дриссу, возле д. Бениславо (северо-западнее Полоцка). Охрана моста сражалась до последнего патрона, однако не смогла препятствовать подрыву моста.

В результате подрыва движение по ж/д линии прекращено самое малое на 3 недели.

21 – 30.9.1942 г. Начальник оперативного отдела информирует начальника генерального штаба группы армий о состоянии охраны обоих главных ж/д линий. От указал на то, что с 8.9. на ж/д линию Борисов – Смоленск выдвинут 1-й охранный батальон. На ж/д линии Дюнабург – Полоцк с сегодняшнего дня прибыли на усиление охраны части 481-го охранного батальона.

16.9.1942. ...Заметный рост диверсий на северном участке. Все диверсии настолько серьезны, что движение по главной ж/д магистрали Дрисса – Полоцк – Витебск парализовано на 24 часа.

17.9.1942 г. ...Командование армейского корпуса требует немедленного усиления охраны ж/д линии Витебск – Полоцк – Дрисса.

...В 21.30 отправлено сообщение в группу армий об усилении охраны следующих ж/д линий:

Витебск – Полоцк на 4 роты
Полоцк – Дрисса на 3 роты
Полоцк – Невель на 3 роты

Всего: 10 рот

Выдвигаются на ж/д линии:
Полоцк – Невель – 17.9., ночью, 2 роты
Полоцк – Невель – 18.9., ночью, 1 рота
Полоцк – Дрисса – 17.9., ночью, 2 роты
Полоцк – Дрисса – 18.9., ночью, 1 рота
Витебск – Полоцк – 18.9., ночью, 2 роты
Витебск – Полоцк – 19.9., ночью, 2 роты

Всего: 10 рот

18.9.1942 г. Снова произведено много значительных диверсий на ж/д линии Полоцк – Витебск – Дрисса. Диверсии принимают такой серьезный характер, что это угрожает снабжению группы армий.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 995. Л. 1 – 60.*

# Баявое хрышчэнне

У 1943 годзе штаб 1-й Дрысенскай партызанскай брыгады аддаў загад аб утварэнні новага партызанскага атрада. Вырашана было паслаць групу ў заходнія раёны Беларусі, «абрасці» там людзьмі і прыступіць да баявых дзеянняў.

25 красавіка камбрыг Р.П. Герасімаў выклікаў мяне да сябе і загадаў падабраць

* Маюцца на ўвазе «Віцебскія вароты», 40-кіламетровы разрыў на лініі фронту на стыку варожых армій «Поўнач» і «Цэнтр» паміж Веліжам і Усвятамі.

** Каб скампраметаваць партызанскі рух, гітлераўцы называлі партызан бандытамі, а партызанскія фарміраванні бандамі.

групу з 20 чалавек. Камандзірам назначылі мяне, камісарам Пятра Беладзедава.

3 мая група адправілася на выкананне задання. На шляху трэба было перайсці чыгуначную лінію Полацк — Дзвінск. Месца для пераходу выбралі каля Боркавічаў.

У раён пераходу прыбылі днём. Пачалі абмяркоўваць усе падрабязнасці рыўка праз чыгунку. Беладзедаў прапанаваў адысці ад Боркавічаў у бок Полацка і па яры ля могілак паспрабаваць перайсці. Я адхіліў гэты план, бо ведаў, што далей ад населеных пунктаў немцы выстаўляюць моцную варту. Прапанаваў зрабіць пераход у Боркавічах, паміж станцыяй і семафорам. Гарнізон не нёс тут варты. На змярканні, пад гул поезда, які праходзіў станцыю, мы адным кідком перамахнулі пуці.

Другой, не менш сур'ёзнай перашкодай на нашым шляху паўстала Заходняя Дзвіна. Вада яшчэ не спала, была халоднай. Да Дзвіны выйшлі насупраць вёскі Паддуб'е. Лодкі для пераправы не знайшлі. Марудзіць жа нельга, у навакольных вёсках стаялі нямецкія і паліцэйскія гарнізоны. А ўжо пачало днець. Выручыў партызан Закрасаў, былы марак. Ён кінуўся ў ваду і ўплаў дабраўся да процілеглага берага. Там смяльчак знайшоў затопленую лодку. З дапамогай гаспадара выцягнуў яе і хутка вярнуўся па нас. Дзякуючы смеласці Закрасава, мы беспярашкодна пераправіліся цераз Дзвіну. Праз дзень былі ў намечаным раёне і прыступілі да выканання задання камандавання. Сабралі 3 кулямёты, 37 вінтовак, многа гранат і патронаў. У групу ўлілося 127 чалавек. Так ствараўся партызанскі атрад імя Леніна.

На зваротным шляху атрад атрымаў баявое хрышчэнне. У вёсцы Жукі былога Луначарскага сельсавета заселі паліцэйскія. Каб абысці гарнізон, трэба было ўброд пераходзіць ручай. Людзі маглі вымакнуць. Рухацца ж мокрым нязручна. Наперадзе нас чакаў паўторны пераход праз чыгунку. Вырашылі ісці напрамую, па вёсцы. У нас былі 41 узброены і 107 няўзброеных партызан. Атрад рассыпаўся ў баявы ланцуг і пайшоў на вёску. Паліцэйскія пахаваліся, і калі мы адышлі ўжо далёка ад вёскі, пачулі запозненыя стрэлы.

Пры пераходзе чыгункі Полацк — Боркавічы завязаўся бой. Мы знішчылі 17 нямецкіх салдат, захапілі кулямёт, 2 аўтаматы і 7 вінтовак. У баі загінулі партызаны Міхаіл Стубайла і Міхаіл Собалеў.

І вось вярнуліся ў брыгаду. Трэба было ўзброіць людзей, навучыць іх партызанскай вайне. З групай у 20 чалавек я адправіўся за лінію фронту, па зброю. Пераход туды і назад адбыўся без асаблівых перашкод. Мы прынеслі частку зброі, а потым навучыліся браць яе ў ворага. Успамінаецца адзін баявы эпізод.

У Смалаўках фашысты трымалі моцны гарнізон. Адсюль яны часта ездзілі ў Якубова па боепрыпасы і прадукты. Ва ўрочышчы Самусёўка днём мы і падпільнавалі іх.

Абоз немцаў складаўся з 16 парных падвод. Асобна на аднаконнай ехаў падпалкоўнік, камандзір гарнізона ў Смалаўках. Мы далі магчымасць ім праехаць у штаб дывізіі і сталі чакаць.

Нарэшце паказаўся абоз. Гітлераўцы ехалі назад. Падводы ішлі на адлегласці 20—30 метраў адна ад другой. На кожнай сядзела па 4—5 гітлераўцаў. Мы падпусцілі абоз на 15 метраў і адкрылі па ім агонь. Снайпер Пётр Плакса і кулямётчык Аляксандр Шурыгін збілі першую падводу, якая загарадзіла дарогу. Бой быў жорсткі. Партызаны перайшлі ўрукапашную. 41 фашыста забілі, 13 узялі ў палон і толькі 2 ўцяклі. Сярод забітых быў і камандзір гарнізона.

Захапілі мы тады каштоўныя дакументы, 3 кулямёты, 12 аўтаматаў, 32 вінтоўкі і 7 павозак з боепрыпасамі.

Раніцай наступнага дня нямецкі гарнізон вымушаны быў пакінуць Смалаўкі.

*С. Дзеліжонак,*
былы камандзір партызанскага
атрада імя Леніна

## Група Пятра Беладзедава

«Нашы вочы і вушы...» — так любоўна называлі партызаны сваіх сувязных і падпольшчыкаў. Неацэнную дапамогу ў гады вайны аказвалі нам гэтыя мужныя людзі. Яны збіралі разведданыя, распаўсюджвалі лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро, арганізоўвалі і праводзілі дыверсіі, падбіралі і рыхтавалі папаўненне для атрадаў народных мсціўцаў.

Адна з такіх падпольных груп пад кіраўніцтвам маладога камуніста Пятра Фаміча Беладзедава дзейнічала ў вёсках Бубны, Свольна, Ахрэмцы, Хрусталёва. Групе даручаліся самыя важныя і рызыкоўныя справы. Аб адным выпадку з яе баявой біяграфіі і хочацца расказаць.

Набліжалася 25-я гадавіна Вялікага Кастрычніка, нашы партызаны рыхтаваліся дастойна сустрэць юбілей. Лепшым падарункам да свята ў тую цяжкую для краіны часіну з'яўляліся новыя ўдары па фашысцкіх захопніках. Штаб брыгады распрацаваў план правядзення шэрагу дыверсій у нямецкіх гарнізонах. Групе Пятра Беладзедава даручылі правесці аперацыю на чыгуначнай станцыі Свольна. Тут размяшчаўся добра ўзброены атрад немцаў. Асабліва пільна ахоўвалі гітлераўцы склад боепрыпасаў, што знаходзіўся ў былой канюшні лесасклада. Узмоцненая ахова і днём і ўначы патрулявала ля варот. Вось на яго і нацэліліся беладзедаўцы.

П. Беладзедаў разам з начальнікам штаба брыгады А.А. Шыбаевым намецілі план правядзення аперацыі. Побач са складам немцы часова размясцілі 40 тон сена, якое звезлі з навакольных вёсак. Гэтыя абставіны і было вырашана выкарыстаць у сваіх мэтах.

5 лістапада партызаны Аркадзь Місюк, Сяргей Выдрыцкі і Уладзімір Баярын даставілі міну замаруджанага дзеяння. Яны ж павінны былі страхаваць правядзенне аперацыі, прыкрыць беладзедаўцаў у выпадку іх вымушанага адыходу.

І вось аперацыя пачалася. Да доўгай чаргі сялянскіх вазоў з сенам, што выстраілася ля варот, пад'ехаў яшчэ адзін. Фурманкай кіраваў Пётр Беладзедаў, які вёз у сене старанна замаскіраваную міну. Насцярожаныя вочы яго хлопцаў пільна сачылі па баках. Марудна пасоўвалася чарга, немец-прыёмшчык нетаропка нешта запісваў, непадалёку гучна рагаталі вартавыя. Ішлі гадзіны, расло напружанне падпольшчыкаў. Раптам Пётр накіраваўся да прыёмшчыка, штосьці паказаў яму з-пад палы (як высветлілася пазней, прыхапіў на ўсялякі выпадак бутэльку самагону), потым падышоў да сваёй фурманкі — немец дазволіў «кемліваму селяніну» сена здаць без чаргі.

Уноч з 5 на 6 лістапада наваколле страсянуў магутны выбух. Воз з «сюрпрызам» зрабіў сваю справу. Ад выбуху ўспыхнула сена. Полымя перакінулася на боепрыпасы. Перапалоханыя фашысты ў паніцы мітусіліся ля пажарышча, а тут іх яшчэ абстралялі партызаны, якія да ночы прасядзелі ў засадзе, чакаючы выбуху.

За бліскучае правядзенне аперацыі падпольшчыкі атрымалі падзяку камандавання. Гэты выпадак і яму падобныя — эпізоды слаўнага баявога шляху групы Пятра Беладзедава. Каштоўныя разведданыя, што дастаўлялі нам яе члены, непасрэдны іх удзел у дыверсійных актах наносілі ворагу адчувальныя ўдары.

Не спынілі падпольшчыкі сваю работу і пазней, калі іх камандзіра высачылі фашысцкія памагатыя і Пётр Беладзедаў разам з сям'ёй быў вымушаны пайсці ў партызаны. У ліпені 1943 года пры фарміраванні атрада імя У.І. Леніна П.Ф. Беладзедава назначылі камісарам.

*А. Грыгор'еў,*
былы камандзір 1-й Дрысенскай
партызанскай брыгады

## Зброяй слова

Памятаю, з якім хваляваннем ішлі мы, агітатары падпольнага Дрысенскага райкома партыі, на першае незвычайнае баявое заданне — праводзіць палітычную і растлумачальную работу сярод насельніцтва акупіраваных ворагам вёсак. Не перабольшу, сказаўшы, што рыхтаваліся да выканання гэтага даручэння не з меншым стараннем, чым да баявой аперацыі.

І недарэмна. Людзі прагна слухалі нашы расказы, лавілі кожнае слова, і тут жа навіны з Вялікай Зямлі перадаваліся з вуснаў у вусны, з вёскі ў вёску, станавіліся здабыткам мас.

За мной быў замацаваны пэўны, даволі вялікі ўчастак, які ахоплівaў вёскі Дзёрнавічы, Жукі, Сераднікі, Лугаўцы, Ульянова, Валкі, Барысы, Пескаватка. Тут я са сваім актывам з ліку жанчын і састарэлых мужчын праводзіў гутаркі, сходы, перапісвалі ад рукі і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, выпускалі лістоўкі, распаўсюджвалі газеты.

*М. Лобыр,*
былы партызан атрада «КІМ»
1-й Дрысенскай партызанскай брыгады

## Бой у Каханавічах

**Друкуецца па кн.: І. Захараў. «Вайна ў краі азёр». Мн. 1973.**

**ЗАХАРАЎ Іван Кузьміч** (13.8.1909, в. Ганявічы Лагойскага р-на — 18.5.1982), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (1944). Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Член КПСС з 1937. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1948). У 1941 адзін з стваральнікаў і кіраўнікоў Асвейскага партыйна-патрыятычнага падполля. У красавіку 1942 арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад імя Фрунзе, у ліпені 1942—студзені 1944 камандзір партызанскай брыгады Асвейскай імя М.В. Фрунзе, адначасова ў чэрвені 1942—снежні 1943 1-шы сакратар Асвейскага падполля РК КП(б)Б. З ліпеня 1944 на партыйнай рабоце. У 1953—1963 старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза рабочых будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Аўтар кн. «Вайна ў краі азёр» (2 выд. 1973). Яго імем названа вуліца ў г.п. Асвея Верхнядзвінскага раёна.

...Заклапочаныя нарастаннем народнай барацьбы, немцы пачалі ўмацоўвацца ў раёне. Так, у Каханавічах быў створаны гарнізон колькасцю звыш трохсот чалавек. У гарнізонах тэрмінова будаваліся абарончыя ўмацаванні: дзоты, драцяныя загароды, траншэі.

Гарнізон у Каханавічах нам моцна перашкаджаў. Ён размяшчаўся на скрыжаванні дарог на Невель, Дрысу, Себеж і Асвею, на шляху партызан да чыгункі. Было вырашана разграміць гэты гарнізон.

Вечарам 8 жніўня ў вёсцы Стралкі пачалі збірацца партызаны. Вёска стала падобнай на вайсковы лагер: на ваколіцах стаялі вартавыя, па вуліцах хадзілі ўзброеныя людзі. Калі зусім сцямнела, прыйшлі адзін за адным атрады імя Арджанікідзе, Жданава, Катоўскага, Суворава, «Сяргея». За імі прагрукацелі гарматы нашага артдывізіёна.

...Каханавічы былі ахоплены паўкальцом: злева ад дарогі, што вяла на Стралкі, заляглі партызаны атрадаў імя Арджанікідзе і Жданава, хлопцы з атрада імя Суворава прыкрывалі дарогу на Задзежжа, атрад імя Сяргея займаў пазіцыі з боку Вышнарава. Фрунзенцы размясціліся на могілках, а пазней «асядлалі» цэнтральную вуліцу паміж МТС і школай. На ўзгорку разгарнуўся артылерыйскі дывізіён, падрыхтаваўшыся да стральбы прамой наводкай. Знойдзеныя ў лясах і адра-

мантаваныя ў партызанскіх майстэрнях гарматы не мелі прыцэлаў. Сёння яны праходзілі праверку, выпрабаванне боем.

А трэцяй гадзіне ночы над могілкамі ўзвілася зялёная ракета. З шыпеннем раскідваючы іскры, яна апісала шырокую дугу і ўпала дзесьці каля парку. І амаль тут жа паветра рвануў артылерыйскі залп, затым другі, трэці...

Успышкі разрываў снарадаў служылі арыенцірамі. Гарматы білі па школе, а атрады наступалі, збіваючы на хаду ахову немцаў. Больш як дзесяць ручных і станковых кулямётаў партызан вялі абстрэл праціўніка.

Артпадрыхтоўка доўжылася пятнаццаць мінут. Выканаўшы сваю задачу і прабіўшы ў некалькіх месцах звернутую да могілак сцяну школы, артылерысты зняліся з баявых пазіцый і адышлі ў схованку.

Партызаны ўварваліся ў Каханавічы. Апамятаўшыся, фашысты пачалі агонь у адказ, займаючы абарону. З гарышчаў, нават з дрэў стралялі яны па партызанах.

Чым бліжэй да школы падцягваліся партызанскія ланцугі, тым мацнейшым станавіўся агонь праціўніка. Гітлераўцы пачалі радзіраваць у Дрысу і чакалі адтуль дапамогі. Таму біліся яны жорстка, імкнучыся пратрымацца даўжэй. Нашы радысты злавілі перадачу, яна ішла вольным тэкстам. Дарогу на Дрысу партызаны не блакіравалі, бо наўрад ці здолелі б вытрымаць напор буйных сіл дрысенскага гарнізона. Разлік будаваўся на хуткасці націску.

Шчыльны агонь гітлераўцаў вымусіў партызан залегчы і пачаць перастрэлку. Але вось другі ўзвод уварваўся ў парк.

Нямецкі аўтаматчык забраўся на дрэва, не даючы кулямётнаму разліку ў складзе Пятра Смычкова і Міхаіла Лукашонка падняцца з канавы.

— Ах, вось дзе ты, гад! — вылаяўся Міхаіл, прыцэльваючыся, і немец, ламаючы голле, рынуўся ўніз.

Пётр Смычкоў падстрэліў другога аўтаматчыка, які хаваўся на гарышчы цаглянага будынка.

Іван Пліско і Васіль Кічыгін прымусілі змоўкнуць яшчэ некалькі агнявых кропак ворага. Агонь праціўніка аслаб, і атрад ірвануўся наперад.

У двор школы паляцелі гранаты. Перарэзаўшы калючы дрот, партызаны ўварваліся ў двор. Справа, пераадольваючы супраціўленне ворага, прасоўваўся наперад узвод Мікалая Іванова. Хлопцам давялося нялёгка: трэба было бегчы пад агнём па адкрытай мясцовасці.

Першым падбег да школы Ісак Смірын. Ён ускочыў на бочку, каб убачыць, дзе заселі немцы. Раптам, неяк дзіўна таргануўшыся, выпраміўся і ўпаў уніз, выпусціўшы стрэльбу. Мікалай Іваноў чаргой з аўтамата паласнуў па падстрэшку, дзе ў дзвярным праёме мільганула фігура нямецкага аўтаматчыка. Немец павіснуў у дзвярах.

Узвод хутка заняў школу.

У гэты ж час на ўскрайку мястэчка, дзе размясцілася ў засадзе адзяленне Блінава, успыхнула схватка. Шлях праціўніку, які насядаў, перагарадзілі дзесяць партызан. Цяжка застукаў кулямёт у руках Вестэнберга, яго падтрымалі стрэльбы. Немцы, імкнучыся вырвацца з кола, прасоўваліся наперад. Іх было, відавочна, не менш за сотню. Моцным ударам яны расчлянілі партызанскую засаду.

Уладзімір Вестэнберг працягваў страляць, адразаючы ворагу выхад з мястэчка. Фашысты пачалі абыходзіць яго. Але кулямётныя чэргі працягвалі касіць ворага.

Становішча станавілася сур'ёзным, і Блінаў загадаў аддзяленню адыходзіць. Хаваючыся ў высокім жыце, партызаны выйшлі з бою. Уладзіміра з імі не было. Але стральба ў тым месцы, дзе ён знаходзіўся, не спынялася.

Раптам кулямёт змоўк. Забіты кулямётчык ці адступае? Але праз хвіліну кулямёт запрацаваў зноў. Партызаны вырашылі прарвацца да таварыша. І тут кулямёт змоўк ізноў. Стала ціха...

Пазней мы выявілі, што Вестэнберг быў тройчы паранены, таму і не мог адысці разам з усімі. Ён страляў да апошняга і, акружаны, застрэліўся, каб не трапіць

жывым да ворага. Гераічны ўчынак адважнага кулямётчыка ўсхваляваў усіх.

У час бою партызаны захапілі нямецкія штабныя дакументы і спрабавалі ўзяць некалькі аўтамашын. Але машыны не заводзіліся, і іх давялося падпаліць.

А з дрысенскага гарнізона фашысты спяшаліся на дапамогу. Буйныя сілы немцаў на аўтамабілях, з артылерыяй падышлі да ўскраіны мястэчка і разгарнуліся да бою.

Мы вырашылі адысці...

## «Вогненны» чалавек

Даведаўшыся аб набліжэнні карнікаў, жыхары вёскі Ладэлева пачалі збірацца ў лес, але фашысты, хаваючыся, акружылі вёску, і многія сяляне не паспелі ўцячы. Воргі спалілі Ладэлева. 72 чалавекі былі расстраляны ці згарэлі ў хатах. Загінулі Барыс Ясюкевіч, яго жонка і брат Дзмітры, сем'і Іосіфа Нядбальскага і Марыі Пілюшынай, Васіль Калеснік і шмат інш.

Двое эсэсаўцаў схапілі глуханямога Адольфа Антонавіча Пілюшына і пацягнулі да палаючай пуні. Цудам яму ўдалося выратавацца. Сам Адольф Пілюшын прыйшоў у партызанскі атрад. Ён быў страшны. Абгарэлы, спакутаваны перажытым і доўгай дарогай, Адольф Антонавіч, як толькі апынуўся ў бяспецы, завалiўся на зямлю і страціў прытомнасць. Доўга змагаліся за яго жыццё нашы дактары, і ім удалося перамагчы смерць. У ліку тых нямногіх, што ўратаваліся, былі Марк Марынскі, Іосіф Зінькевіч і некалькі жанчын, якія схаваліся ў лясных зямлянках і дачакаліся вяртання партызан.

## Бой у вёсцы Буракова

Гэта было ў чэрвені 1944 года. Нас, сямёра партызан, выклікалі ў штаб атрада. Камандзір даў заданне пайсці ва ўрочышча, што паблізу вёскі Піскунова Боркавіцкага сельсавета, і даставіць адтуль станковы кулямёт «максім», які быў закапаны ў адным з акопаў.

— Будзьце асабліва пільнымі пры падыходзе да чыгункі. Там магчыма варожая засада, — папярэдзіў ён.

Узброіўшыся двума ручнымі кулямётамі Дзегцярова, пяццю аўтаматамі і ручнымі гранатамі, мы рушылі на заданне. Да ўказанага месца дабраліся без якіх-небудзь прыгод. Кулямёт добра захаваўся, бо быў густа пакрыты змазкай. Побач ляжаў загорнуты ў прамасленую паперу запасны ствол, тут жа знаходзіліся брызентавыя сумка з запаснымі часцямі і тры металічныя каробкі з кулямётнымі стужкамі...

Нясём гэты грозны станкач і цешымся, як будзе фашыстам горача, калі пусцім яго ў работу. І ніхто не прыгадваў, што чакае наперадзе.

Толькі сталі пераходзіць дарогу Боркавічы — Дзёрнавічы, бачым: гарыць сцірта сена ля вёскі Лугаўцы. «Нешта няладнае, — думаем, — напэўна тут дзесьці немцы».

Спяшаемся да ракі, дзе нас павінна была чакаць сувязная. І дзяўчына раптоўна выбегла з-пад абрыву, стала махаць хусцінкай: маўляў, хутчэй.

— Што здарылася? — пытаемся.

— Немцы! На выхадзе з вёскі. Як быць?

— Многа іх?

— Чалавек можа 30—40, — адказала сувязная і дадала: — А зброя ў іх — вінтоўкі і бачыла дзве такія рабрыстыя стрэльбы на ножках, як у вас.

Ага, значыць у ворага ёсць ручныя кулямёты. Два на два. Але ж у нас яшчэ і «максімка»... Вось толькі не падрыхтаваны ён да стральбы. Ну што ж, прыйдзецца на хаду ўсё рабіць.

Скрытна падышлі да вёскі, бачым: немцы не спяшаючыся пераходзяць дарогу Боркавічы — Сядлоўцы і збіраюцца ля могілак. Мы заляглі за крайняй пуняй і

хуценька падрыхтавалі да бою свой станкач. Тут жа размясціліся байцы з ручнымі кулямётамі.

...Гулка затахкаў «максім», засакаталі «дзегцяры». Варожы атрад калыхнуўся і тут жа рассыпаўся. Немцы кінуліся да невялікага лесу, за якім была вёска Буракова, не зрабіўшы ў адказ ніводнага стрэлу.

Партызаны, падбадзёраныя першай удачай, пагналіся за фашыстамі. Вораг кінуўся ў вёску Буракова.

Бяжым, страляем. Сям-там позірк спыняецца на забітых.

Вось першыя хаты. Доўгая вуліца. Мільгаюць постаці фашыстаў. Хлопцы, прыціскаючыся да платоў, вядуць агонь. Бачу: ляжыць забіты салдат. Толькі нагнуўся да яго, каб узяць зброю, як з-за палавіка, што быў развешаны на плоце, высунуўся фрыц, намерваючыся ўцякаць. Я мігам пераскочыў плот і накінуўся на немца. «Будзе «язык»! — мільганула думка. Але «язык» аказаўся мацнейшым за мяне, ён вырваўся, адскочыў убок і стаў адвінчваць галоўку гранаты. Я выбіў гранату з рук. Немец схапіўся за кабуру, выцягнуў пісталет. Але я паспеў схапіць фашыста за руку з пісталетам, а тут на дапамогу падбег Васіль Цалпан і даў чаргу з аўтамата.

Бой пачаў сціхаць. Бачу, партызан Пётр Валенцік вядзе ад пераправы трох немцаў, узятых ім у палон. Прывялі трох палонных Сяргей Кавалеўскі і Іосіф Мароз. А ўсяго хлопцы ўзялі ў палон 7 фашыстаў. З сарака двух чалавек удалося ўцячы толькі аднаму.

Праз нейкі час вораг адкрыў агонь з браняпоезда па Буракоўскім лесе. Але ўжо было позна, снарады клаліся на пустым месцы.

*А. Руткоўскі,*
былы партызан атрада імя Кірава
1-й Дрысенскай брыгады

## Пераправа ў агні

У той час партызанскі атрад «КІМ», дзе я быў начальнікам штаба, размяшчаўся ў ваколіцах вёскі Ваўкі Дзёрнавіцкага сельсавета. Побач, у Верасенцах, знаходзіліся апорныя пункты партызан атрада імя Калініна. Вораг настойліва атакаваў нашы пазіцыі, шукаючы слабае месца, каб прарвацца ў партызанскую зону. Самыя жорсткія баі разгарэліся каля вёсак Белавусы і Клімаўшчына. Са станцыі Боркавічы на гэтых участках гітлераўцы выпускалі па 300—400 мін і снарадаў на дзень. Аднак усе атакі ворага адбіваліся. Вялікую ролю адыграла партызанская адзіная 120-міліметровая гармата, хаця ў нас не хапала снарадаў і камандзір разліку Арлоўскі мог за дзень выпусціць іх не больш 2—3. Толькі ўдары яе настолькі былі своечасовыя і дакладныя, што нярэдка рашалі зыход бою.

Не дабіўшыся поспеху ў майска-чэрвеньскім наступленні, фашысты пачалі перагрупоўку сіл. Наша разведка далажыла, што ля вёсак Бекачы і Слабашчукі ўздоўж дарогі скапілася каля 800 пехацінцаў, з якімі 12 гармат і не менш як 10 мінамётаў. Праціўнік наважваўся ў ноч з 1 па 2 ліпеня фарсіраваць раку Дрыса каля Дзёрнавічаў і нанесці ўдар партызанам з тылу.

Камандзір атрада Іван Рыгоравіч Галубкоў прыняў рашэнне: зрабіць рэкагнасцыроўку мясцовасці і хутчэй заняць абарону насупраць паромнай пераправы, дзе чакаецца варожы ўдар.

Пакуль байцы адпачывалі, я разам з камандзірам узводаў правёў рэкагнасцыроўку ўзбярэжжа рэчкі, дзе меркавалася заняць абарону. Тут аказаліся старыя, закінутыя акопы, відаць, вырытыя яшчэ ў пачатку Айчыннай вайны. Іх можна падправіць і выкарыстаць у баі супраць ворага.

Так і зрабілі. З надыходам ночы першы ўзвод, якім камандаваў Сенягоўскі, размясціўся з правага боку, а другі, пад камандаваннем Кабанава — з левага. Ку-

лямётчыкі Баярына занялі пазіцыі на ўзгорку пры дарозе на Залессе. Іх задача: трымаць пад абстрэлам узлессе уздоўж дарогі Бекачы — Сакалішча — за пераправай. Акопы былі хутка падпраўлены, партызаны падрыхтаваліся сустрэць націск праціўніка.

Арганізаваўшы пункты боепрыпасаў і медыцынскай дапамогі, я накіраваўся да камандзіра атрада, каб узгадніць далейшыя дзеянні. Толькі-толькі бралася на досвітак. У гэты момант вораг адкрыў артылерыйска-мінамётны агонь, які працягваўся звыш дзвюх гадзін. Вёска Дзёрнавічы і ўсё наваколле ахуталася дымам і пылам.

Разлік гітлераўцаў быў вядомы: моцным агнём адрэзаць усе падыходы да пераправы і на пароме перакінуць пяхоту на другі бераг, каб развіваць наступленне ў нашым тыле.

Аднак вораг пралічыўся. Ён не ведаў, дзе размешчаны галоўныя сілы партызан. А яны знаходзіліся ля самай ракі, насупраць пераправы, у акопах.

Праціўніку здавалася, што агнём артылерыі і мінамётаў падаўлена ўсё жывое і цяпер можна лёгка ўварвацца ў партызанскую зону. Калі ўжо добра развіднела, не спыняючы абстрэл нашых пазіцый, гітлераўцы кінуліся да парома. Партызаны абодвух узводаў адкрылі прыцэльны ружэйна-аўтаматны агонь. Кулямётчыкі білі праз галаву сваіх па вышыні, што знаходзілася за пераправай. Своечасовым аказаўся агонь гарматы калінінскага атрада, якая знаходзілася ў вёсцы Барысы. Першы снарад трапіў у гушчу фашыстаў. Ворагі ў паніцы замітусіліся і адкаціліся назад.

Гітлераўскія артылерысты спрабавалі выкаціць гарматы на прамую наводку, аднак трапны агонь кулямётчыкаў не даваў ім гэтага зрабіць. Не прынесла поспеху і паўторная атака.

Так вораг, маючы вялікія сілы, не мог прарвацца на правы бераг ракі і вымушаны быў спешна прымаць меры, каб з меншымі стратамі выйсці з гэтага бою. Толькі апоўдні заціхла страляніна, і праз нейкі час разведка далажыла, што гітлераўцы адышлі.

Пераправіўшыся на другі бераг, адкуль немцы прарываліся да пераправы, мы агледзелі пакінутыя пазіцыі. Заўважылі шмат акрываўленых месц, падабралі 29 вінтовак, многа патронаў. Па гэтых трафеях і акрываўленых месцах мы вызначылі, што вораг страціў не менш як 40 чалавек забітымі і параненымі. У двух патранташах знайшлі запіскі, у якіх на рускай мове алоўкам было напісана прыкладна наступнае: «Малайцы партызаны, добра страляеце. Далі чосу гэтым дурням». Бачна па ўсім, што ў варожым стане былі людзі, якія сімпатызавалі народным мсціўцам.

Хоць бой па тых маштабах быў вельмі жорсткі, аднак нашы страты былі амаль ніякія. Атрымаў толькі кулявое раненне ў нагу партызан-разведчык Васілёнак.

Водгукі бою на пераправе дакаціліся за лінію фронту. Мы атрымалі высокую ацэнку Беларускага штаба партызанскага руху. Газета «Чырвоная змена» ў 20-х чыслах таго ж месяца апісвала падрабязнасці гэтага бою, высока ацаніўшы маральную стойкасць байцоў і ўмелыя дзеянні камандавання атрада.

Варта назваць тых, хто праявіў выключную стойкасць і мужнасць у вясенне-летніх баях 1943 года. Гэта камандзіры аддзяленняў Анатоль Сакалоў, Міхаіл Дашкевіч, разведчыкі Вера Хацько, Віталь Фадацёнак, кулямётчыкі Аляксандр Гардзей, Уладзімір Фалько, Мікалай Цыра, стралкі Антон Вярыга, Віктар Шах, Аляксандр Маркевіч, Сяргей Гардзей, Філат Макрэцкі, Міхаіл Галынскі, Фама Маліноўскі, камандзір гаспадарчага ўзвода Аляксандр Стома, медыцынскія сёстры Вера Беладзед, Валянціна Бадун, Валянціна Скрыпка і многія іншыя.

*У. Гардзей,*
былы начальнік штаба
партызанскага атрада «КІМ»

## Бой ля Казуліна

У красавіку 1943 года мне давялося сустрэцца з групай партызан-разведчыкаў атрада імя Суворава, якім трэба было перайсці чыгунку Полацк—Бігосава і выйсці ў раён былога калгаса «Пагранічны маяк», зараз «Кастрычнік».

Ноччу мы перасеклі чыгунку ля вёскі Савейкі Боркавіцкага сельсавета і выйшлі ў раён Луначарскага, дзе размяшчаўся гарнізон паліцыі. Першую палову дня хаваліся ў лесе, пад вечар прабраліся ў Казуліна. Разышліся па хатах, каб трохі перакусіць, але наша вячэра працягвалася нядоўга.

Да нас у хату прыбег мясцовы хлопчык год 10—12 і сказаў, што некалькі чалавек пайшлі ў паліцыю ў Прудзінкі паведамляць аб з'яўленні партызан у Казуліне. Тут ужо нам было не да ежы. Параіўшыся з камандзірамі разведчыкаў Васілём Цярэшкам і Яўгенам Лучыноўскім, мы вырашылі зрабіць засаду.

Да вайны я працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады ў калгасе «Пагранічны маяк», таму добра ведаў мясцовасць. Мы выйшлі на ўсходнюю ўскраіну Казуліна, дзе і збіраліся даць бой паліцаям. У тыле пакінулі ахову на выпадак, калі нас пачнуць абыходзіць... На левы фланг, на вышыню, таксама паслалі двух партызан.

Не паспелі мы добра размясціцца, як з боку Прудзінак паказаліся паліцэйскія. Яны, па ўсім было бачна, заўважылі нас і палеглі на зямлю. Мы ж адкрылі агонь з усіх відаў зброі, якая была ў нас, з крыкам «ура» пайшлі ў атаку. На тым месцы, дзе ляжалі паліцэйскія, мы налічылі дзевяць забітых здраднікаў і двух немцаў. Потым, пасля вяртання ў атрад, мы даведаліся, што ў гэтым баі быў смяротна паранены начальнік мясцовай паліцыі, а яшчэ адзін паліцай быў знойдзены забітым у хмызняку.

Мы спакойна сабралі трафеі і адышлі ў лес. Наступнай раніцай ля Казуліна з'явілася многа немцаў і паліцаяў. Уступаць у бой з намнога большымі сіламі праціўніка нам не было неабходнасці. Мы пакінулі гэтыя мясціны і лесам накіраваліся ў бок Баравухі.

З партызан — удзельнікаў гэтага бою я ведаю Сігізмунда Кропа, Арцёма Бадуна, Яўгена Лучыноўскага.

У 1946 годзе я дэмабілізаваўся з арміі. Доўгі час спрабаваў знайсці таго невядомага хлопчыка з Казуліна, які так своечасова папярэдзіў нас і, магчыма, выратаваў нам жыццё. На жаль, знайсці яго не ўдалося. Можа, хто-небудзь ведае яго прозвішча, а можа, і сам ён застаўся ў жывых і адгукнецца.

*М. Сяткоўскі,*
Дзвінская праўда,
26.7.1984

## Прывітанне братам-партызанам

«Учора мой знаёмы прынёс мне нумар газеты, прысланы з г. Верхнядзвінска яго братам Д.П. Паршутам з артыкулам «Бой ля Казуліна». Вялікае дзякуй ім за гэта — не магу выказаць, як усхвалявалі мяне газетныя радкі. Дакладна помню падзеі далёкіх ваенных дзён — я і ёсць той «хлопчык з Казуліна», які папярэдзіў партызан аб небяспецы і якога хоча адшукаць М. Сяткоўскі.

...Было гэта позна вечарам у красавіку 1943 года. Мы з маці знаходзіліся ў канцы агародаў, у лазні. На свет капцілкі прыбег, запыхаўшыся, стараста, якога маці сустрэла на парозе. Я схаваўся ў цёмным кутку лазні і пачуў, як стараста, глытаючы словы, вымавіў, што бяжыць у Прудзінкі ў нямецка-паліцэйскі гарнізон. Ледзь перадыхнуўшы, ён рушыў па просецы ў бок Прудзінак. Я прасачыў за

старастам і пабег шукаць партызан. Ля канторы сустрэў дваіх, якія завялі мяне да камандзіра. Яму і расказаў аб пачутым, паказаў, адкуль павінны з'явіцца фашысты. З кім размаўляў — не пытаўся, памятаў аб адным: любой цаной павінен папярэдзіць партызан.

Не ведалі пра мяне і народныя мсціўцы. У Казуліне ж дзейнічала падпольная група камсамольцаў, якая трымала сувязь з партызанамі. У яе разам са мной уваходзілі Марыя Савіцкая, Аляксандр Дадэка, Ганна Асоўская і іншыя камсамольцы. Сувязь з партызанамі мы падтрымлівалі праз Антона Ягоравіча Дадэку і Надзею Андрэеўну Цыра, жыхароў вёскі Дадэкі.

У канцы жніўня 1943 года камандаванням партызанскай брыгады я быў пасланы ў Ліхачоўскі нямецка-паліцэйскі гарнізон з задачай разведкі і аказання дапамогі партызанам у знішчэнні гарнізона. Ён прыкрываў пераправу цераз Заходнюю Дзвіну, і народным мсціўцам цяжка было перапраўляцца на другі бераг, каб выконваць дыверсійныя заданні. У лістападзе 1943 года заданне было выканана, і я працягваў барацьбу з ворагам разам з партызанскім атрадам.

Асабліва хочацца адзначыць дзейнасць у гады вайны народных патрыётаў А.Я. Дадэкі і Н.А. Цыры. Памятаю словы камандзіра 3-га атрада Івана Піліпавіча Буваленкі, які часта паўтараў: «Такіх людзей Радзіма не забудзе».

Асабіста са мной вайна абышлася сурова: бацька Дзмітрый Сільвестравіч Дадэка і маці Яфімія Андрэеўна Дадэка забіты фашыстамі ў вёсцы Прудзінкі, а сёстры Надзея і Ала былі кінуты ў канцлагер. Партызанам удалося вызваліць іх і пераправіць самалётам на Вялікуюу зямлю.

*С. Дадэка*,
Дзвінская праўда, 13.9.1984

## Як бралі «языка»

Перад атрадам была пастаўлена задача даведацца, што робіцца ў Дрысе. Атрымаўшы заданне, я накіраваў разведку за «языком». Разведка хадзіла тры разы, выпрабавала ўсе спосабы, але «языка» здабыць не здолела. Тады я, узяўшы з сабою смелага партызана Ніцецкага, паехаў у Дрысу сам. Байца апрануў жанчынай, а сам надзеў вясковую вопратку. Пропускі на права ўезду ў Дрысу дапамаглі здабыць жыхары блізкай да чыгункі вёскі Думанькі.

А 10-й гадзіне раніцы паклалі аўтаматы ў сані пад салому і накіраваліся ў Дрысу. Калі пад'язджалі да горада, на мосце заўважылі вартавога-фрыца, які правяраў дакументы. Як мы ўжо дамовіліся раней, калі вартавы спыніў нас, вылезлі з саней. Праверыўшы дакументы ў байца, фрыц сказаў «гут» і стаў цераз сані цягнуцца да мяне па дакументы. Вінтоўка ў яго вісела на шыі. У той момант, калі ён браў у мяне пропуск, баец паваліў яго ў сані. Ад нечаканасці і перапалоху фрыц не паспеў нават крыкнуць, як яму адразу заткнулі рот рукавіцай. Так вартавы быў звезены з вартоўні, што стаяла за 50 м ад нас, 150 м ад нямецкага штаба.

Потым за намі наладзілі пагоню, ачапілі кусты ля чыгункі, але мы ў той час яе ўжо мінулі.

Вартавога ж мы перадалі прадстаўніку ЦШПР з разведаддзела т. Янушку. Усе звесткі, якія былі патрэбныя пра Дрысу, «язык» расказаў. За ўдалую аперацыю па здабычы «языка» я маю падзяку ад т. Янушкі.

*Лейтэнант Грабенкін*

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 32. Л. 83.*

## Партызанскі танк

У гэту ноч мы былі ў вёсцы Мікуліна. Выставіўшы пасты, адпачывалі ў каравулцы. На куце моцна капціла зробленая з гільзы газнічка. Партызаны ляжалі хто на падлозе, хто на лавах, некаторыя спалі.

А другой гадзіне ночы нам паведамілі, што з боку Нямыцькаў рухаюцца нямецкія танкі. Партызаны па трывозе высыпалі з хаты і занялі абарону, падрыхтаваўшыся да бою. Сапраўды, ад узлеску на вёску рухаўся танк. Раздалася каманда падрыхтавацца. Кожны з нас меў па дзве супрацьтанкавыя гранаты.

Але раптам танк, загрузнуўшы ў снезе, заглух. З люка вылез танкіст.

— Ах ты сволач, ізноў заглух, — данеслася да нас. — Гаручка дрэнь.

Мы здзіўлена пераглянуліся, пачуўшы знаёмы голас.

— Хто там? — спытаўся Іван Кураш.

— Я, Ангудовіч, — адказаў танкіст.

— А адкуль у цябе танк?

— Ды адрамантаваў, вось і еду, — адгукнуўся той і пачаў стукаць малатком.

Партызаны высыпалі з сваіх сховішчаў і акружылі танк.

— Каб ён не заглух, кепска табе б давялося.

— Ну, гэта яшчэ як сказаць, каму было б кепска, — жартам адказаў Ангудовіч.

Гэта быў танк, захоплены ў адным з баёў. Наш славуты механік наладзіў яго і зараз ірваўся ў бой з карнікамі.

Не кладучыся больш адпачываць, мы рушылі следам за ім на Стралкі.

Зранку зграя карнікаў абрынулася на вёску. Два дзесяткі самалётаў пачалі бамбіць партызанскую абарону. Над Стралкамі ўзвілося полымя. Па вёсцы няспынна білі мінамёты і буйнакаліберныя кулямёты. Пасля інтэнсіўнага абстрэлу ланцугі карнікаў рушылі на вёску. Але партызаны, пераседзеўшы бамбёжку, сустрэлі карнікаў агнём ва ўпор з усіх відаў зброі. Нямецкая атака захлынулася. Фашысты пачалі рыхтавацца да новага штурму. Мо з гадзіну карнікі, дэманструючы сваю моц, займаліся на нашых вачах перагрупоўкай і канцэнтрацыяй сіл, разлічваючы, пэўна, падавіць нас псіхічна.

Зноў на Стралкі пасыпаліся бомбы, забухалі цяжкія мінамёты, пасыпаліся аўтаматныя чэргі. Затым сотні п'яных фашыстаў палезлі ў вёску напралом. Яны спяшаліся заняць гэты важны вузел вялікіх дарог.

У самы адказны момант з-за будынка вынырнуў і паімчаў насустрач карнікам танк. Страляючы на хаду, увесь у снежнай каламуці, гэты грукатун быў падобны на страшыдла, якое несла смерць. Раздалося дружнае партызанскае «ўра». Ад нечаканасці фашысты кінуліся прэч, пакідаючы ўсё, што перашкаджала ім уцякаць. І ваярскі дух, ды і градусы, відаць, адразу выветрыліся.

Было б дастаткова гаручага ды была б гарантыя, што не заглухне танк — папёр бы іх Ангудовіч далёка. А так пахадзіў, пастраляў ды вярнуўся ў вёску. Карнікі ж больш на Стралкі не палезлі. У наступныя дні яны хацелі абмінуць вёску праз Селішча і Барысова, але і там іх сустрэлі партызаны, і зноў у цяжкія хвіліны ў бой выходзіў танк, якога фрыцы баяліся як агню.

*В. Лукашонак*

## Адзначылі юбілей

У ліпені 1943 года мы адзначалі гадавіну арганізацыі сваёй партызанскай брыгады. Азнаменаваць гэты дзень падрыўнікі рашылі ўзрывам яшчэ аднаго нямецкага эшалона. Атрымаўшы заданне, я павёў групу да чыгункі. Месца выбралі недалёка ад Беніслаўскага раз'езда, устанавілі нагляд за чыгуначным палатном. Пад вечар дазоры заўважылі, як да чыгункі падышоў узвод нямецкіх салдат з аўчаркай і, раздзяліўшыся на дзве партыі, зрабіў засады прыкладна метраў за сто адна ад другой.

Падрыўнікі рашылі не адступаць ад

Група партызан-падрыўнікоў атрада імя М. В. Фрунзе.

намечанага плана. У прамежку паміж засадамі мы выбралі месца з падветранага боку з-за аўчаркі і сталі чакаць, пакуль добра сцямнее. Нямецкія партулі адзін за другім хадзілі ўздоўж палатна, асвятляючы ліхтарамі адхон. Цягнікі праскоквалі адзін за другім, аднак выходзіць на дарогу было рызыкоўна.

І вось перад самай раніцай, скарыстаўшы момант, калі падыходзячы эшалон засланіў сабой вартавога, я кінуўся на рэйкі і выключна за 10—15 метраў перад паравозам паставіў міну. Ледзь паспеў я скочыць пад адхон, як прагрымеў страшэнны выбух. Знішчэннем варожага цягніка мы адсалютавалі гадавіне арганізацыі нашай брыгады.

*А. Васілёнак,*
былы партызан-падрыўнік
атрада імя С.М. Кірава

## Разведчыца Каця

Восенню 1942 года камандаванне 1-й Дрысенскай партызанскай брыгады рыхтавала аперацыю па знішчэнні чыгуначнага моста цераз раку Свольна. Атрыманыя звесткі аб размяшчэнні варожага гарнізона, яго сіле неабходна было ўдакладніць. На выкананне задання пайшла маладая партызанка Каця Лыкава.

Скончыўшы перад самай вайной Полацкае педагагічнае вучылішча, яна хацела прысвяціць сваё жыццё дзецям, выхаванню падрастаючага пакалення. Але вайна перакрэсліла ўсе планы, не дала акрыліцца мары. На акупіраванай тэрыторыі быў выдадзены загад: «Усім маладым спецыялістам стаць на ўлік у германскіх улад». Каця не выканала загаду, які пагражаў расстрэлам. Яе можна было бачыць на сходках моладзі, сярод вяскоўцаў. А як толькі ў лясах аб'явіліся партызаны, пайшла да іх. І з таго часу хадзіла на самыя рызыкоўныя заданні. Дзякуючы яе знаходлівасці, смеласці, мужнасці партызанскае камандаванне атрымлівала важныя звесткі аб праціўніку.

...Непрыкметна пранікнуўшы ў родны пасёлак Свольна, яна зайшла да Лукомскіх, якія жылі па суседстве і добра яе ведалі. Лукомская сустрэла Кацю ветліва, прапанавала скінуць паліто, адпачыць, а потым ісці на заданне ўлегцы. Не ведала дзяўчына, што былая суседка выдасць яе ворагу.

Для затрымання партызанкі камендант накіраваў цэлы ўзвод салдат. Кацю схапілі на вуліцы. Яе доўга катавалі, на допыт вазілі на адкрытай чыгуначнай платформе, звязанай. Цвёрда трымалася разведчыца, нікога не выдала, нічога не сказала ворагу. Загінула наша Каця геройскай смерцю.

*А. Грыгор'еў,*
былы камандзір 1-й Дрысенскай
партызанскай брыгады

К. Р. Лыкава.

# Партызанскія шпіталі

**З успамінаў А.В. Раманава, былога камандзіра партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага.**

У кожнай партызанскай брыгадзе быў свой шпіталь. Зімою 1943 г., падчас карных экспедыцый, быў створаны аб'яднаны шпіталь для абслугоўвання ўсіх брыгад партызанскага краю. Ва ўмовах жорсткіх баёў шпіталь быў вымушаны часта мяняць дыслакацыю. Аперацыі рабіліся на сталах. З-за адсутнасці косцевай пілы ампутацыі выконваліся звычайнай слясарнай пілой, якую папярэдне 20—30 хвілін кіпяцілі. Замест ампутацыйнага нажа прымянялі звычайныя скальпелі. Перавязачны матэрыял, а гэта былі абрусы, прасціны, аконныя фіранкі, парашутны матэрыял, бялізна і г.д., стэрылізавалі кіпячэннем у катлах. Наркоз рабілі толькі мясцовы, выкарыстоўваючы звычайны (не наркозны) эфір, калі ж наркотыкі скончыліся, аперацыі пачалі праводзіць без абязбольвання.




План партызанскай зямлянкі.

Халаты былі толькі ў хірургаў. Асвятленнем у начны час пры тэрміновых аперацыях служылі керасінавыя лямпы, пас-

А. Ф. Вараб'ёў, галоўны ўрач Асвейскай партызанскай брыгады імя М. В. Фрунзе.

ля — тлушчавыя «капцілкі» і нават звычайная лучына. Рукі хірурга і аперацыйнай сястры апрацоўвалі мылам і шчоткай з нашатырным спіртам, працавалі ў пракіпячоных пальчатках. А пры адсутнасці іх выкарыстоўвалі цёплую кіпячоную ваду, самагонку, якую выраблялі ў вёсках спецыяльна для гэтых мэт.

Хірургічнага інструменту было надзвычай мала, таму часта выкарыстоўваліся самаробныя прылады.

Для накладання лігатуры на сасуды скарыстоўвалі шоўк з парашутных стропаў. Халаты, з-за адсутнасці аўтаклаваў, кіпяцілі ў печы і ў гарачым, вільготным выглядзе апраналі на хірурга.

Медыкаменты даставалі ўсемагчымымі шляхамі ў былых медветпунктах, куплялі праз сваіх агентаў у гарнізонах. Былі выпадкі, калі медыкаменты з гарнізонаў траплялі да нас атручанымі, у рываноле аднойчы ўрачы знайшлі солі хрому.

Найчасцей сустракаліся ў партызан прастудныя захворванні, кароста. Былі выпадкі захворвання брушным тыфам, крупозным запаленнем лёгкіх. Лячылі, як правіла, народнымі сродкамі. Прэпараты часта рыхтавалі з чыстацелу, насення льну, хвойны настой ужывалі супраць цынгі. У шпіталі працаваў стаматалагічны кабінет. Урач-хірург Рыгор Цэмахаў з Дрысенскай партызанскай брыгады вярнуў да жыцця многіх партызан.

## Дакументы сведчаць

### ЗВЕСТКІ ПАРТЫЗАНСКАЙ РАЗВЕДКІ АБ НЯМЕЦКА-ПАЛІЦЭЙСКІХ ГАРНІЗОНАХ НА ТЭРЫТОРЫІ ДРЫСЕНСКАГА РАЁНА

| Гарнізон | Колькасны склад | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | паліцэскіх і салдат, іх нацыянальнасць | немцаў |
| Адамова | 22 | 20 паліцэйскіх | 2 |
| Беніслаўскі | | 148, аўстрыйцы украінцы | |
| Валодзькава | | 24, балгары, чэхі, украінцы | |
| Войтава | | 85, латышы | |
| Дрыса | 390 | 190 паліцэйскіх | 200 |
| Жоўніна | 50 | 40 паліцэйскіх | 10 |
| Жукова | 28 | 25 паліцэйскіх | 3 |
| Залессе | | 40, латышы | |
| Зялькі | 87 | 80 паліцэйскіх | 7 |
| Луначарскае | 69 | паліцэйскія | |
| Прудзінкі | 37 | 34 паліцэскія | 3 |
| Пярэкі | | 37, латышы | |
| Свольна | | 90, балгары, югаславы, рускія, украінцы | |
| Цясты | 30 | 20 паліцэйскіх | 10 |

Па стане на 29.4.44 ...у гарнізонах праціўніка Залессе, Пярэкі, Войтава знаходзіцца каля 150 чал., па нацыянальным складзе латышы, маюць на ўзбраенні бат. мінамётаў 3, станковых кулямётаў 3, ручных 7, вінтоўкі і аўтаматы. Задача — барацьба з партызанамі. У гарнізоне в. Страшныя знаходзіцца адна рота праціўніка, па нацыянальным складзе

немцы, маюць лёгкую пяхотную зброю, станковыя кулямёты, ручныя кулямёты, аўтаматы і вінтоўкі, з задачай аднаўлення дарог і пабудовы мастоў. 25.4. у гэты гарнізон паступіла рабочая няўзброеная каманда латышоў у колькасці 100 чал. Абаронныя мерапрыемствы праціўніка выяўляюцца ў адрыцці акопаў, кулямётных гнёздаў у раёне в. Сядлоўцы, Страшныя, Саламахі, Вілюкі і нарыхтоўцы лесаматэрыялаў — калоў, стоек і інш. Мост на р. Дрыса ў в. Дзёрнавічы заканчваецца і ў бліжэйшыя 2—3 дні уступіць у эксплуатацыю.

Гарнізон станцыі Бігосава, колькасць каля 100 чал., па нацыянальным складзе латышы, украінцы... Маральны стан латвійскіх салдат і ўкраінцаў гарнізона дрэнны. Мелі месца выпадкі за гэты час спрэчак паміж латышамі і ўкраінцамі аб несправядлівай расправе з мірным насельніцтвам. Спрэчкі даходзілі аж да арышту адно аднаго.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3895. Воп. 1. Спр. 2. Л. 165, 167, 186; Ф. 3894. Воп. 1. Спр. 5. Л. 98; Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 28. Л. 33.*

## ДАКЛАД КАРНАЙ ГРУПЫ «ЦАУНКЁНІГ» АБ ВЫНІКАХ ДЗЕЯННЯЎ

**З 25 лютага па 5 сакавіка 1943 г.**

а) Забітых у баі бандытаў — 1

б) Падвергнуты асобай апрацоўцы — 633 чал.

в) Эвакуіраваныя: 1) адпраўлена маршавым парадкам у зборны лагер у Дрысу: мужчын — 57, жанчын — 89, дзяцей — 54, усяго — 200; 2) перададзена ў якасці працоўнай сілы ў распараджэнне штаба групы Кнехт і батальёнаў — 26; 3) пакінута ў якасці працоўнай сілы пры трох камандах групы Цаункёніг — 8, усяго — 34. Вынікова — 234 (чал.)

г) Захоплена жывёлы:

| | Буйной рагатай жывёлы | Цялят | Авечак | Коней | Жарабкоў |
|---|---|---|---|---|---|
| Сагнана ў Дрысу | 76 | 12 | 246 | 1 | 12 |
| Перададзена групе Кнехт (штабу і батальёну) | 46 | 8 | 27 | | |
| Перададзена ўпаўнаважанаму па сельскай гаспадарцы | | | 65 | | |
| | 122 | 20 | 338 | 1 | 12 |

д) Спалены паселішчы: Буракова, Боркавічы, Сухарукава, Добранікі, Сахонава, Шаўракі, Давыдзенкі, Саліна, Шлыкі, Жарабцова, Затлойшчына, Дзямідава, Дубровы, Асёткі, Папелушова, Курашы, Чырвонцы, Дзедзіна, Маркава, Рагелева, Мазалеўшчына, Царкоўна, Галькаўшчына, Агуркі, Селішча, Гарадзілавічы (большая частка), Вялікае Поле, Плюшчык, Нішча, Дуброва. Акрамя таго, шмат асобных хутароў, а таксама цагельны завод 70/08.

е) Захоплена зброя, боепрыпасы і іншае ўзбраенне, 1 процівагаз.

ж) Іншыя трафеі — каля 1650 кг збожжа.

з) Уласныя страты — няма, расход боепрыпасаў — 2 тыс. патронаў.

Група «Цаункёніг».

*Цэнтральны дзяржаўны архіў Латвіі. Ф. 256. Воп. 1. Спр. 9. Л. 147.*

## ДАНЯСЕННЕ КАРНАЙ ГРУПЫ «КНЕХТ»

**26 лютага 1943 г.**

1. На працягу другога дня наступу ў захопленым намі раёне банды не заўважаны. Усе населеныя пункты былі захоплены намі без значнага супраціўлення. Штаб і жандарскі атрад № 10, а таксама супрацьпаветраная батарэя былі абстраляныя з мінамётаў.

Атрады СД спалілі наступныя вёскі: Шлыкі, Жарабцова, Затлойшчына, Дзямідава, Дубровы, Асёткі, Папелушова, Курашы, Чырвонцы, а таксама 6 асобных двароў. Былі пакараныя атрадамі СД 204 бандыцкія памагатыя.

Аж да вёсак Дубровы і Вялікае Сяло жывёлы не выяўлена. У гэтых вёсках кіраўнікі сельскагаспадарчых упраў павінны арганізаваць яе вываз. Большасць вёсак не мае ні насельніцтва, ні жывёлы, ні харчу.

2. а) Без змен.

б) Намечаная на гэты дзень мэта дасягнута.

в) Трафеі — 1 конь, 7 кароў і каля 10 галоў дробнай жывёлы.

3. Штабы батальёнаў 277-га, 279-га, жандарскі атрад № 10 і супрацьпаветраная брыгада Хацы размешчаны ў в. Вялікае Сяло, батальёны 276-ты — Буды, 278-мы — Кісялі.

4. Без страт.

5. Расход боепрыпасаў: супрацьпаветраная батарэя — 217 асколачных снарадаў, 40 запальных асколачных снарадаў, батальён 279-ты — 3 тыс. вінтовачных патронаў (рускіх), 200 іншых патронаў (рускіх), 150-міліметровая лента (руская), батальён 276-ты — 3500 вінтовачных патронаў (рускіх), 10 белых ракет, штаб — 10 чырвоных і 10 зялёных ракет.

6. Забеспячэнне — батальён 276-ты — абутковага тлушчу 20 кг.

Зенітны атрад абстрэльваў вёску Затлойшчына і спаліў некалькі хат. Акрамя таго, 277-мы батальён падчас свайго руху трапіў пад артылерыйскі і гранатны абстрэл.

Подпіс: Кнехт

*Цэнтральны дзяржаўны архіў Латвіі. Ф. 256. Воп. 1. Спр. 10. Л. 18.*

## ДАНЯСЕННЕ КАРНАЙ ГРУПЫ «БЕРТА»

**27 лютага 1943 г.**

1. 27 лютага 1943 г. каля 8 гадзін 3-я рота 276-га батальёна, якая рухалася ад Вялікага Сяла на Буды, была абстраляная з усходу бандытамі сіламі ў 200 чал. Бандыты занялі вышыню 192,4 за 4 км на паўночы ўсход ад Вялікага Сяла і в. Царкоўна. Для падтрымкі роты былі адразу накіраваныя дзве роты 279-га батальёна, адна рота 277-га батальёна і супрацьпаветраная батарэя Хацы.

Пасля моцнай перастрэлкі бандыты былі адкінуты. Захапіўшы параненых, яны ўцяклі ва ўсходнім напрамку. Адзін з бандытаў быў узяты ў палон і перададзены СД. Вёска Царкоўна была захоплена і спалена. У выніку допыту злоўленага бандыта было выяўлена, што банда, якая нападала, складалася з мясцовых жыхароў з раёна за 15 км на паўночны захад ад Царкоўна.

2. а) Без змен.

б) Банда ў колькасці 200 чал. разгромлена паблізу Царкоўна. Царкоўна спалена.

в) Трафеі: 1 англійскі карабін, 1 супрацьтанкавае ружжо, 1 руская вінтоўка, 1 ручная граната, 61 карова, 30 авечак, 4 жарабяці, 6 коней, 1 міна.

3. Без змен.

4. Страты: 1 лёгкапаранены ў 279-м батальёне.

5. Расход б/п. Супрацьпаветраная батарэя Хацы — 183 асколачныя гранаты, 84 запальныя снарады, 65 бранябойных снарадаў.

6. Забеспячэнне. Супрацьпаветраная батарэя Хацы — 300 асколачных гранат, 100

«Новы парадак» у дзеянні на Верхнядзвіншчыне.

Фашысцкія карнікі рабуюць вёску Кавалькі былога Асвейскага р-на. 1943 г.

запальных снарадаў, 100 бранябойных снарадаў, 279-ты батальён — 8500 вінтовачных патронаў, 12 мін, 75 аўтаматных патронаў, 12 асвятляльных ракет.

Атрыманыя 279-м батальёнам процівагазы не маюць фільтраў. Пададзена заяўка аб дадатковай дастаўцы фільтраў.

7. Без змен. Да п. 1 Атрадамі СД спалены в. Дзедзіна, Маркава, Рагелева, Мазалеўшчына, Радкова і Барташы.

Пакарана: у Мазалеўшчыне — 108 (чал.), у Будах — 45, у Царкоўне — 96. Праціўнік падвергнуўся нападу па фронце і з правага флангу і адступіў у паўночна-ўсходнім напрамку. Спалены вёскі Царкоўна і Гарадзілавічы.

Да 2 б) Былі знойдзены трупы 3 бандытаў. У асобных хатах былі выяўлены лужы крыві, якія відавочна засталіся ад параненых і забітых. 1 бандыт быў захоплены ў палон і перададзены атрадам СД.

(Захоплена:) 61 карова, 30 авечак, 4 жарабяці, 6 коней, 1 вінтоўка рускага ўзору, 1 граната.

Група «Берта»

*Цэнтральны дзяржаўны архіў Латвіі. Ф. 256. Воп. 1. Спр. 10. Л. 19.*

## ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

### НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ, ЗНІШЧАНЫЯ РАЗАМ З ЖЫХАРАМІ Ў ПЕРЫЯД ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ І НЕ АДНОЎЛЕНЫЯ*

| Назвы вёсак | Колькасць (напярэдадні вайны) | | Колькасць знішчаных | | Дата знішчэння |
|---|---|---|---|---|---|
| | двароў | жыхароў | двароў | жыхароў | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Абразэева (Сар'янскі с/с) | 13 | 49 | 13 | 36 | спалена 16.2.43 |
| Аніськава | 12 | 54 | 12 | 32 | спалена 16.12.43 |
| Бабічы | 11 | 40 | 11 | (300)** | спалена ў сакавіку 1943 |
| Бабы | 12 | 38 | 12 | 20 | спалена 16.2.43 |
| Баравок | 14 | 64 | 14 | 47 | спалена 25.2.43 |
| Баравыя | 8 | 46 | 8 | 25 | спалена 16.2.43 |
| Бузова | 14 | 55 | 14 | 55 (250) | спалена 24.2.43 |
| Булы | 39 | 135 | 39 | 127 | спалена 16.2.43 |
| Ваўкі (Валынецкі с/с) | 5 | 28 | 5 | 28 | спалена ў сакавіку 1943 |
| Верхняе Стунжава | 14 | 69 | 14 | 58 | спалена 16.2.43 |
| Гарадзішча | 22 | 96 | 22 | 60 | спалена 25.2.43 |
| Гваздова (Дзёрнавіцкі с/с) | 22 | 82 | 22 | 51 | спалена 23.3.43 |
| Глінцы | 12 | 45 | 12 | 29 | спалена 10.3.43 |
| Дубнікі | 3 | 12 | 3 | 8 | спалена 15.2.43 |

* Вёскі, даты іх знішчэння, колькасць загінуўшых жыхароў даюцца паводле ўдакладненых звестак Верхнядзвінскага райвыканкома.

** Перад дужкамі — ахвяры вёскі, у дужках — разам з ахвярамі іншых населеных пунктаў.

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Еськава | 22 | 80 | 22 | 52 | спалена 24.2.43 |
| Жалабоўшчына | 12 | 49 | 12 | 36 | спалена 16.2.43 |
| Жарнасекі | 8 | 47 | 8 | 38 | спалена 16.2.43 |
| Залешчына | 21 | 90 | 21 | 60 | спалена 16.2.43 |
| Затлойшчына | 30 | 72 | 30 | 61 | спалена 1.3.43 |
| Зенькі | 22 | 66 | 22 | 40 | спалена 16.2.1943 |
| Кабыльнікі | 10 | 35 | 10 | 25 | спалена 1.3.1943 |
| Калюты | 17 | 83 | 17 | 64 | спалена 16.2.1943 |
| Канстанцінава | 7 | 33 | 7 | 17 | спалена 16.2.1943 |
| Карзуны | 3 | 13 | 3 | 13 | спалена 24.2.1943 |
| Коэлава | 8 | 28 | 8 | 25 | спалена 16.2.1943 |
| Кулакова | 18 | 62 | 18 | 42 | спалена 15.2.1943 |
| Ладэлева | 22 | 95 | 22 | 48 | спалена 16.2.1943 |
| Латыгава (Чапаеўскі с/с) | 11 | 66 | 11 | 44 | спалена 10.3.1943 |
| Ліцвякова | 18 | 63 | 18 | 46 | спалена 23.12.1943 |
| Мазалеўшчына | 24 | 79 | 24 | 70 (219) | спалена 2.3.1943 |
| Маркава | 13 | 54 | 13 | 31 | спалена 1.3.1943 |
| Межалы | 18 | 84 | 18 | 57 | спалена 15.2.1943 |
| Немцы | 11 | 49 | 11 | 32 | спалена 15.2.1943 |
| Ніжняе Стунжава | 12 | 73 | 12 | 64 | спалена 16.2.1943 |
| Новыя Маразы | 11 | 58 | 11 | 55 | спалена 16.2.1943 |
| Папартнава | 13 | 59 | 13 | 34 | спалена 16.2.1943 |
| Плігаўкі (Бігосаўскі с/с) | 13 | 43 | 13 | 25 | спалена 16.2.1943 |
| Пляцы | 14 | 69 | 14 | 39 | спалена 16.2.1943 |
| Пустэльнікі | 21 | 84 | 21 | 57 | спалена 16.2.1943 |
| Пучыніна | 6 | 25 | 6 | 16 | спалена 1.3.1943 |
| Пушалаты | 17 | 81 | 17 | 43 | спалена 16.2.1943 |
| Пушчавыя | 20 | 93 | 20 | 48 | спалена 1.3.1943 |
| Рубчыкі | 20 | 96 | 20 | 51 | спалена 25.2.1943 |
| Рэвуты | 19 | 92 | 19 | 45 | спалена 10.3.1943 |
| Сакалова | 11 | 75 | 11 | 68 | спалена 26.2.1943 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Сініцы | 10 | 35 | 10 | 30 | спалена 16.2.1943 |
| Скрыпчына | 11 | 53 | 11 | 42 | спалена 1.3.1943 |
| Суп'янікі | 8 | 57 | 8 | 54 | спалена 16.2.1943 |
| Ціршава | 15 | 77 | 15 | 46 | спалена 16.2.1943 |
| Цыгельнікі | 20 | 63 | 20 | 41 | спалена 16.2.1943 |
| Шабалы | 6 | 25 | 6 | 25 | спалена 24.2.1943 |
| **Знішчаныя разам з жыхарамі і адноўленыя пасля вайны** | | | | | |
| Абрамова | 13 | 65 | 13 | 59 | спалена ў лютым 1943, існуе |
| Абухава (Сар'янскі с/с) | 55 | 167 | 55 | 93 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Агуркі | 16 | 65 | 16 | 32 | спалена 1.3.1943, уваходзіць у склад в. Бяляны |
| Азернікі | 15 | 45 | 15 | 45 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Ардаўскія | 26 | 112 | 26 | 91 (150) | спалена 12.3.1943, існавала да 1970 |
| Бандзелі | 21 | 61 | 21 | 57 | спалена 16.2.1943, існавала да 1995 |
| Барысова | 24 | 110 | 24 | 76 | спалена 1.3.1943, існавала да 1996 |
| Валюкі | 18 | 73 | 18 | 52 | спалена 16.2.1943, існавала да 1996 |
| Ворзава | 26 | 93 | 26 | 53 | спалена 15.2.1943, існуе |
| Галькаўшчына | 16 | 85 | 16 | 47 | спалена 27.3.1943, існуе |
| Задзежжа | 33 | 153 | 33 | 90(200) | спалена 1.3.1943, існуе |
| Запасішкі (Бігосаўскі с/с) | 13 | 46 | 13 | 27 | спалена 16.2.1943, існавала да 1986 |
| Каралёва | 28 | 136 | 28 | 95 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Кашалёва | 18 | 76 | 18 | 39 | спалена ў снежні 1943, існавала да 1980 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Кісялі | 35 | 130 | 35 | 113 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Клагішы | 6 | 23 | 6 | 21 | спалена 15.2.1943, уваходзіць з 1960 у склад в. Ворзава |
| Ліпаўкі | 64 | 220 | 64 | 211 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Любасна | 64 | 325 | 64 | (203) | спалена 1.3.1943, існуе |
| Маразы | 13 | 38 | 13 | 20 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Марцінава | 36 | 170 | 36 | 112 | спалена 12.6.1942, існуе |
| Мотужы | 11 | 36 | 11 | 34 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Муквяціца | 27 | 100 | 27 | 72 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Мушына | 19 | 97 | 19 | 63 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Ніжняе Хаміно | 17 | 68 | 17 | 34 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Пятроўшчына | 18 | 107 | 18 | 104 | спалена 15.2.1943, існавала да 1968 |
| Расіца | 231 | 943 | 231 | (1258) | спалена 16.2.1943, існуе |
| Рудня (Дзёрнавіцкі с/с) | 38 | 142 | 38 | (106) | спалена ў снежні 1943, існуе |
| Сямёнава | 70 | 424 | 70 | 212 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Царкоўна | 59 | 326 | 59 | (196) | спалена 1.3.1943, існуе |
| Ярмоліна | 13 | 43 | 13 | 39 (169) | спалена ў красавіку 1944, існуе |
| **Знішчаныя а часткай жыхароў і не адноўленыя пасля вайны** | | | | | |
| Абухава (Валынецкі с/с) | 19 | 80 | 19 | 6 | спалена ў 1942 |
| Абухава (Каханавіцкі с/с) | 8 | 33 | 8 | 1 | спалена 1.3.1943 |
| Адамова (Каханавіцкі с/с) | 5 | 20 | 5 | | спалена 25.3.1943 |
| Адзіна | 2 | 8 | 2 | | спалена 25.3.1943 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Асавое | 12 | 63 | 12 | 8 | спалена 1.3.1943 |
| Асінаўка (Дзёрнавіцкі с/с) | 17 | 62 | 9 | 3 | спалена ў сакавіку 1943 |
| Астравок | 17 | 86 | 17 | 5 | спалена 16.2.1943 |
| Астроўшчына (Дзёрнавіцкі с/с) | 10 | 44 | 10 | 18 | спалена ў сакавіку 1943 |
| Астроўшчына (Каханавіцкі с/с) | 10 | 53 | 10 | 8 | спалена 1.3.1943 |
| Багамолава | 5 | 38 | 5 | - | спалена ў сакавіку 1944 |
| Багулёнкі | 9 | 50 | 9 | 24 | спалена 1.3.1943 |
| Балотнікі (Асвейскі с/с) | 8 | 33 | 8 | | спалена 17.2.1943 |
| Барсукі (Асвейскі с/с) | 6 | 58 | 6 | 28 | спалена 17.2.1943 |
| Барсукі (Бігосаўскі с/с) | 6 | 22 | 6 | 12 | спалена 16.2.1943 |
| Барташы | 12 | 62 | 12 | 10 | спалена 28.2.1943 |
| Бекачы | 15 | 57 | 15 | 9 | спалена ў жніўні 1943 |
| Беразоўка | 6 | 27 | 6 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Бондарава | 12 | 44 | 12 | (26) | спалена 23.2.1943 |
| Бондары (Каханавіцкі с/с) | 3 | 10 | 3 | | спалена 1.3.1943 |
| Бучанава | 6 | 32 | 6 | | спалена 17.2.1943 |
| Бярозаўка (Чапаеўскі с/с) | 8 | 40 | 8 | | спалена 2.3.1943 жыхары расстраляны ў в. Лісна |
| Васькавічы | 2 | 5 | 2 | | спалена 16.2.1943 |
| Венкялёва | 13 | 53 | 13 | | спалена 1.3.1943 |
| Верх. Дзегцярова | 21 | 90 | 21 | 19 | спалена 17.2.1943 |
| Вілюкі | 10 | 42 | 9 | 12 | спалена ў жніўні 1943 |
| Выгода (Сенькаўскі с/с) | 10 | 31 | 10 | | спалена 16.2.1943 |
| Высекі | 3 | 11 | 3 | | спалена 25.2.1943 |
| Высоцкае | 6 | 26 | 6 | | спалена 25.2.1943 |
| Вярхоўе | 7 | 26 | 7 | | спалена 1.3.1943 |
| Гайкі | 5 | 28 | 5 | | спалена 25.2.1943 |
| Гарбаценкі | 8 | 34 | 8 | | спалена 17.2.1943 |
| Гарбузова | 11 | 38 | 11 | | спалена ў красавіку 1943 |
| Гаўручонкі | 10 | 35 | 10 | 16 | спалена ў ліпені 1942 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Гаціхі | 6 | 31 | 6 | | спалена 1.3.1943 |
| Гейжанава (Бігосаўскі с/с) | 6 | 25 | 6 | 8 | спалена 16.2.1943 |
| Генева | 15 | 88 | 15 | | спалена 16.2.1943 |
| Давыдзенкі | 7 | 29 | 7 | | спалена 17.2.1943 |
| Дзербазы | 6 | 26 | 6 | | спалена ў лютым 1943 |
| Дзямідава | 6 | 31 | 6 | | спалена 28.2.1943 |
| Дзям'янава | 5 | 24 | 5 | 16 | спалена ў лютым 1943 |
| Дубанава | 5 | 24 | 5 | | спалена 3.3.1943 |
| Дубініна | 16 | 69 | 16 | 12 | спалена ў красавіку 1943 |
| Дубнае | 4 | 15 | 4 | | спалена 1.3.1943 |
| Жарабцова | 6 | 33 | 6 | 11 | спалена 17.2.1943 |
| Жыліншчына | 8 | 38 | 8 | 12 | спалена ў лютым 1943 |
| Жулінава | 6 | 33 | 6 | 11 | спалена 17.2.1943 |
| Забалотнікі | 3 | 10 | 3 | | спалена 16.2.1943 |
| Забароўцы | 12 | 38 | 12 | 16 | спалена 16.2.1943 |
| Забор'е (Каханавіцкі с/с) | 3 | 11 | 3 | | спалена 1.3.1943 |
| Зайцава | 18 | 96 | 18 | 40 | спалена ў снежні 1943 |
| Закопанне | 6 | 26 | 6 | | спалена 1.3.1943 |
| Замбарава | 7 | 22 | 7 | | спалена 16.2.1943 |
| Замошша (Чапаеўскі с/с) | 7 | 40 | 7 | | спалена 1.3.1943 |
| Зара (Сар'янскі с/с) | 4 | 14 | 4 | | спалена 17.3.1943 |
| Зарачане | 6 | 22 | 6 | 3 | спалена 16.2.1943 |
| Заручаны | 5 | 21 | 5 | | спалена 1.3.1943 |
| Заручэўе (Каханавіцкі с/с) | 3 | 8 | 3 | | спалена 2.3.1943 |
| Засценкі | 8 | 33 | 8 | | спалена ў лютым 1943 |
| Ілгачы | 8 | 36 | 8 | | знішчана ў ліпені 1944 |
| Кавелева | 3 | 10 | 3 | | спалена 16.2.1943 |
| Каменка (Сар'янскі с/с) | 3 | 10 | 3 | | спалена 16.2.1943 |
| Канцавыя | 4 | 11 | 4 | | спалена 1.3.1943 |
| Кашкоўшчына | 3 | 12 | 3 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Кекары | 9 | 39 | 9 | | спалена 15.2.1943 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Колбаўшчына | 13 | 58 | 13 | | спалена 17.2.1943 |
| Кузеева | 12 | 61 | 12 | (100) | спалена 1.3.1943 |
| Курашы (Асвейскі с/с) | 8 | 38 | 8 | 16 | спалена 1.3.1943 |
| Курашы (Саёўскія) | 2 | 8 | 2 | (30) | спалена 1.3.1943 |
| Курашы (Шяценскія) | 3 | 16 | 3 | 8 | спалена 1.3.1943 |
| Курылава (Хоцькава) | 9 | 59 | 9 | 23 | спалена ў сакавіку 1944 |
| Лазоўка (Сар'янскі с/с) | 1 | 3 | 1 | 1 | спалена 16.2.1943 |
| Латыгава (Каханавіцкі с/с) | 4 | 18 | 4 | | спалена 1.3.1943 |
| Латыгава (Бліжняе) (Каханавіцкі с/с) | 10 | 70 | 10 | | спалена 25.2.1943 |
| Леснікова | 6 | 34 | 6 | | спалена 24.2.1943 |
| п. Ліснянскі | 8 | 38 | 8 | | спалена 25.2.1943 |
| Ліцвякі | 12 | 76 | 12 | 9 | спалена 1.3.1943 |
| Лугаўцы Бігосаўскі с/с) | 8 | 41 | 8 | 12 | спалена 16.2.1943 |
| Луні | 5 | 19 | 5 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Луцішча | 2 | 7 | 2 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Максімава | 6 | 26 | 6 | | спалена 1.3.1943 |
| Макуты | 7 | 31 | 7 | 5 | спалена 2.3.1943 |
| Малінгрудкі | 3 | 10 | 3 | | спалена 25.2.1943 |
| Мал. Гараваткі | 7 | 33 | 7 | | спалена 25.2.1943 |
| Мал. Гудава | 13 | 51 | 13 | | спалена ў лютым 1943 |
| Мал. Паноры | 2 | 8 | 2 | | спалена 16.2.1943 |
| Мал. Шынкарова | 2 | 5 | 2 | | спалена 16.2.1943 |
| Маргужова | 9 | 29 | 9 | | спалена 16.2.1943 |
| Марозава (Сар'янскі с/с) | 8 | 33 | 8 | | спалена 17.2.1943 |
| Масарэўшчына | 9 | 51 | 9 | | спалена 16.1.1943 |
| Масева | 15 | 62 | 15 | | спалена 15.2.1943 |
| Маскалькі | 10 | 42 | 10 | 12 | спалена 17.2.1943 |
| Матэлеўка | 4 | 13 | 4 | | спалена 1.3.1943 |
| Машары | 1 | 4 | 1 | (16) | спалена ў лютым 1943 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Медзвядзі | 12 | 62 | 12 | | спалена 1.3.1943 |
| Мельніца | 11 | 43 | 11 | 15 | спалена ў сакавіку 1943 |
| Мікаленкі | 3 | 10 | 3 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Мінкі | 10 | 44 | 10 | | знішчана ліцені 1944 |
| Міснікова (Бігосаўскі с/с) | 10 | 42 | 10 | 12 | спалена 15.2.1943 |
| Навагоркі | 5 | 21 | 5 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Навасельцы | 8 | 44 | 8 | | спалена 16.2.1943 |
| Найды | 8 | 33 | 8 | 4 | спалена 17.2.1943 |
| Нарубні | 9 | 41 | 9 | 11 | спалена ў сакавіку 1943 |
| Новае Жыцшё | 6 | 30 | 6 | | спалена 18.2.1943 |
| Новы Двор (Сенькаўскі с/с) | 5 | 22 | 5 | | спалена 16.2.1943 |
| Пажарышча | 5 | 21 | 5 | 7 | спалена ў лютым 1943 |
| Палтаракава | 11 | 48 | 11 | 16 | спалена 16.2.1943 |
| Палякі | 8 | 36 | 8 | | спалена 1.3.1943 |
| Пашкоўшчына | 4 | 17 | 4 | | спалена 2.3.1943 |
| Панізова | 15 | 74 | 15 | 1 | спалена 16.2.1943 |
| Першамайскі | 10 | 44 | 10 | | спалена 1.3.1943 |
| Пільнамыслі | 2 | 9 | 2 | | спалена 2.3.1943 |
| Плябанава | 14 | 82 | 14 | 11 | спалена 1.3.1943 |
| Прудок | 6 | 35 | 6 | 17 | спалена 1.3.1943 |
| Пясчанка (Чапаеўскі с/с) | 6 | 28 | 6 | | спалена 1.3.1943 |
| Ракшні | 40 | 126 | 40 | 50 | спалена 16.2.1943 |
| Рудня (Чапаеўскі с/с) | 5 | 32 | 5 | 2 | спалена ў снежні 1943 |
| Руткова | 6 | 26 | 6 | | спалена 24.2.1943 |
| Саліна | 14 | 75 | 14 | 1 | спалена 24.2.1943 |
| Самулешкава | 18 | 59 | 18 | 18 | спалена ў лютым 1943 |
| Сатунькі | 12 | 40 | 2 | 8 | спалена 17.2.1943 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Сахонава (Асвейскі с/с) | 7 | 28 | 7 | 5 | спалена 6.2.1943 |
| Сідараўцы | 3 | 10 | 3 | | спалена ў снежні 1943 |
| Сінічына | 19 | 92 | 19 | 41 | спалена ў лютым 1943 |
| Сіньшчына | 8 | 28 | 8 | | спалена 17.2.1943 |
| Слукі | 6 | 19 | 6 | | спалена 16.2.1943 |
| Смалаўкі | 3 | 10 | 3 | | спалена ў снежні 1943 |
| Снапкі (Каханавіцкі с/с) | 3 | 10 | 3 | | спалена ў снежні 1943 |
| Спеці | 9 | 28 | 9 | 6 | спалена 15.2.1943 |
| Стайкі (Сар'янскі с/с) | 5 | 21 | 5 | | спалена 17.2.1943 |
| Стаклава | 2 | 6 | 2 | | спалена 16.2.1943 |
| Стрыжако | 30 | 100 | 30 | 12 | спалена 25.2.1943 |
| Суніца | 2 | 6 | 2 | | спалена 16.2.1943 |
| Сяргееўка | 12 | 55 | 12 | | спалена 17.2.1943 |
| Сярэдняя Пушча | 2 | 8 | 2 | | спалена ў снежні 1943 |
| Такуны | 2 | 9 | 2 | | спалена ў сакавіку 1943 |
| Тарчылава | 4 | 18 | 4 | | спалена 16.2.1943 |
| Узрэчча | 9 | 37 | 9 | 3 | спалена ў сакавіку 1943 |
| Фартунава | 5 | 22 | 3 | | спалена ў сакавіку 1944 |
| Фенькі | 2 | 6 | 2 | | спалена 25.2.1943 |
| Філіпоўшчына | 11 | 46 | 11 | | спалена ў лютым 1943 |
| Хадуны | 20 | 115 | 20 | (103) | спалена 17.2.1943 |
| Хмельнікі | 2 | 8 | 2 | | спалена 16.2.1943 |
| Цесвіны | 3 | 12 | 3 | 2 | спалена 16.2.1943 |
| Цятна | 5 | 38 | 5 | 18 | спалена 1.3.1943 |
| Чырвоная Ніва | 3 | 13 | 3 | 3 | спалена 1.3.1943 |
| Чырвонцы | 10 | 42 | 10 | | спалена 25.2.1943 |
| Шлыкі (Асвейскі с/с) | 6 | 32 | 6 | 1 | спалена 25.2.1943 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Шчунькі (Сар'янскі с/с) | 6 | 27 | 6 | | спалена у лютым 1943 |
| Шылава | 1 | 5 | 1 | | спалена 15.2.1943 |
| Шыманава | 12 | 41 | 12 | | спалена 1.3.1943 |
| Ярохі | 13 | 68 | 13 | 18 | спалена 1.3.1943 |
| **Знішчаныя з часткай жыхароў і адноўленыя пасля вайны** | | | | | |
| Абразэева (Асвейскі с/с) | 16 | 73 | 16 | 5 | спалена 28.2.1943, існавала да 1958 |
| Аляксееўцы | 18 | 87 | 17 | 6 | спалена 10.11.1943, існуе |
| Арбанава | 15 | 98 | 15 | 1 | спалена 16.2.1943, існавала да 1960 |
| Асвеіца | 13 | 65 | 13 | (55) | спалена 1.3.1943, • існуе |
| Асінаўка (Жоўнінскі с/с) | 13 | 49 | 9 | 3 | спалена, існавала да 1957 |
| Аўгулі | 35 | 123 | 35 | 1 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Аўласкава | 16 | 68 | 15 | 4 | спалена 8.11.1943, існавала да 1972 |
| Барадуліна | 15 | 48 | 15 | 18 | спалена ў лютым 1943, існуе |
| Баркова | 14 | 73 | 14 | 11 | спалена 23.2.1943, існуе |
| Барысы | 10 | 50 | 3 | | спалена ў ліпені 1944 |
| Бічыкава | 13 | 63 | 13 | 6 | спалена 23.2.1943, існуе |
| Буды | 64 | 308 | 64 | 153 | спалена 24.3.1943, існуе |
| Буракова | 26 | 105 | 26 | 12 | спалена ў студзені 1943, існуе |
| Быкі | 30 | 151 | 30 | 29 | спалена ў снежні 1943, існавала да 1992 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Бяляны | 44 | 212 | 44 | 50 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Важаны | 9 | 46 | 9 | | спалена 17.2.1943, існуе |
| Валейкава | 10 | 40 | 10 | 3 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Валясы | 7 | 38 | 7 | 15 | спалена 10.3.1943, існуе |
| Вароны | 30 | 105 | 30 | 12 | спалена 16.2.1943, існавала да 1992 |
| Ваўкі (Дзёрнавіцкі с/с) | 17 | 63 | 17 | 6 | спалена 10.11.1943, існавала да 1966 |
| Верасна | 19 | 83 | 19 | | спалена 10.11.1943, існавала да 1966 |
| Верхняе Хаміно | 7 | 38 | 7 | 4 | спалена 17.2.1943, існавала да 1994 |
| Весніно | 15 | 91 | 15 | 9 | спалена 22.2.1943, існуе |
| Відокі | 31 | 181 | 31 | 29 | спалена 23.2.1943, існуе |
| Вознава | 41 | 196 | 41 | 27 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Войтава | 14 | 55 | 12 | 2 | спалена 10.11.1943, існуе |
| Вопытная | 30 | 130 | 30 | (120) | спалена 16.2.1943, існуе |
| Востраў | 50 | 283 | 50 | 16 | спалена ў лютым 1943, існавала до 1970 |
| Выдрыцкія | 27 | 98 | 27 | 10 | спалена 25.2.1943, існуе |
| Высоцкія | 21 | 100 | 21 | 13 | спалена 24.2.1943, існуе |
| Вышнарава | 53 | 239 | 53 | 56 | спалена 25.2.1943, існуе |
| Вялікае Сяло | 99 | 539 | 99 | (305) | спалена 24.3.1943, існуе |
| Вялікія Плейкі | 39 | 194 | 39 | | спалена 18.2.1943, існуе |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Гаі | 21 | 93 | 20 | 8 | спалена 24.2.1943, існуе |
| Ганчарова | 34 | 165 | 34 | 37 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Гараваткі (Каханавіцкі с/с) | 45 | 200 | 45 | 5 | спалена 25.2.1943, існуе |
| Гарадзілавічы | 45 | 250 | 45 | 55 | спалена 2.3.1943, існуе |
| Гараўцы | 27 | 113 | 27 | 6 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Гарбулі | 26 | 137 | 26 | | спалена 17.2.1943, існуе |
| Гаўрыліна | 15 | 72 | 15 | 6 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Гісялёва | 23 | 87 | 23 | 21 | спалена 16.2.1943, існавала да 1989 |
| Глазкі | 15 | 63 | 15 | | спалена ў ліпені 1944, існавала да 1983 |
| Горнава | 16 | 62 | 11 | 6 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Громаўкі | 21 | 113 | 21 | 15 | спалена 17.2.1943, існуе |
| Грыбоўцы | 16 | 75 | 16 | 12 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Грыгораўцы | 29 | 150 | 29 | 9 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Грыцкова | 6 | 22 | 6 | | спалена ў сакавіку 1943, існавала да 1949 |
| Гудава | 10 | 36 | 10 | 10 | спалена ў лютым 1943, існавала да 1992 |
| Дабраплёсы | 19 | 82 | 19 | 4 | спалена 10.3.1943, існуе |
| Давыдава | 28 | 88 | 28 | 4 | спалена 16.2.1943, існуе |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Даражылава | 18 | 63 | 15 | 8 | спалена 10.11.1943, існуе |
| Дзегцярова (Сар'янскі с/с) | 18 | 117 | 18 | 13 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Дзедзіна | 19 | 120 | 19 | 10 | спалена 27.2.1943, існавала да 1986 |
| Дзёрнавічы | 44 | 212 | 44 | | спалена 10.11.1943, існуе |
| Дзянісенкі | 7 | 33 | 7 | 14 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Добранікі | 12 | 56 | 12 | 3 | спалена 28.2.1943, існавала да 1965 |
| Доманава | 8 | 33 | 8 | | спалена 16.2.1943, існавала да 1964 |
| Доўгае | 47 | 205 | 47 | 49 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Дубрава | 33 | 121 | 33 | 3 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Дубровы | 135 | 832 | 135 | (502) | спалена 28.2.1943, існуе |
| Ельніца | 6 | 32 | 6 | 8 | спалена 2.3.1943, існавала да 1956 |
| Ермакі (Валынецкі с/с) | 22 | 63 | 8 | 2 | спалена ў жніўні 1942, існуе |
| Жудзілаўка | 22 | 55 | 11 | 12 | спалена ў кастрычніку 1942, існавала да 1965 |
| Жукі(Дзёрнавіцкі с/с) | 11 | 72 | 10 | 32 | спалена ў сакавіку 1943, увайшла ў склад в. Іскра |
| Забор'е (Галубаўскі с/с) | 11 | 61 | 11 | 13 | спалена ў лютым 1943, існуе |
| Заламы | 14 | 67 | 14 | 4 | спалена 17.2.1943, існуе |
| Залессе (Дзёрнавіцкі с/с) | 77 | 380 | 77 | | спалена 10.11.1943, існуе |
| Залучча | 24 | 120 | 24 | 5 | спалена ў чэрвені 1942, існуе |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Зара (Галубаўскі с/с) | 32 | 107 | 32 | 45 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Застарыны | 21 | 101 | 21 | 6 | спалена ў кастрычніку 1943, існуе |
| Зашчырына | 22 | 94 | 22 | 11 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Зорка | 9 | 43 | 8 | 6 | спалена ў ліпені 1944, існуе |
| Зулава | 17 | 74 | 17 | 21 | спалена 17.2.1943, існавала да 1989 |
| Зябкі | 64 | 215 | 60 | (42) | спалена 16.1.1943, існуе |
| Зялёнаўшчына | 36 | 132 | 36 | 8 | спалена ў жніўні 1942, існавала да 1986 |
| Іванцова | 39 | 195 | 39 | 30 | спалена 8.1.1944, існавала да 1992 |
| Ігналіна | 20 | 86 | 20 | | спалена 1.3.1943, існуе |
| Ізубрыца | 15 | 75 | 15 | 10 | спалена 10.3.1943, існуе |
| Кабыленцы | 10 | 46 | 10 | | спалена 2.3.1943, існуе |
| Кавалеўшчына (Бігосаўскі с/с) | 22 | 74 | 22 | 17 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Казакова | 20 | 102 | 20 | 10 | спалена 10.11.1943, існуе |
| Казлоўшчына | 55 | 250 | 55 | 5 | спалена 25.2.1943, існуе |
| Казлы | 8 | 31 | 8 | | спалена ў сакавіку 1943, увайшла ў склад в. Іскра |
| Каменка (Асвейскі с/с) | 13 | 60 | 13 | 35 | спалена 25.2.1943, існуе |
| Каменцы | 7 | 25 | 7 | 12 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Канчаны | 93 | 391 | 93 | 11 | спалена 30.2.1943, існуе |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Карабы | 6 | 26 | 6 | | спалена ў ліпені 1944, існавала да 1969 |
| Каранікі | 43 | 213 | 43 | 6 | спалена 17.2.1943, існавала да 1987 |
| Каркалец | 22 | 106 | 22 | | спалена ў лютым 1943, існавала да 1987 |
| К. Маркса | 8 | 38 | 8 | | спалена 25.3.1943, увайшла ў в. Каханавічы |
| Кастрова | 63 | 261 | 43 | 6 | спалена 24.3.1943, існуе |
| Каўшалёва | 10 | 42 | 10 | | спалена ў кастрычніку 1942, існавала да 1995 |
| Каханавічы | 93 | 468 | 93 | 112 | спалена 25.3.1943, існуе |
| Кашырына | 10 | 51 | 10 | 1 | спалена 16.2.1943, існавала да 1954 |
| Коўзелі | 10 | 49 | 10 | 5 | спалена 25.2.1943, існавала да 1955 |
| Княжыцы | 48 | 235 | 48 | 25 | спалена ў верасні 1942, існуе |
| Красілаўка | 10 | 55 | 10 | | спалена 24.3.1943, зараз в. Чапаеўская |
| Краснае (Асвейскі с/с) | 16 | 81 | 16 | 40 | спалена 26.2.1943, існавала да 1965 |
| Краснае (Каханавіцкі с/с) | 14 | 72 | 14 | 12 | спалена 25.2.1943, існавала да 1955 |
| Красова | 30 | 96 | 30 | 25 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Крывасельцы | 42 | 119 | 42 | 31 | спалена 15.2.1943, існуе |
| Крыськава | 18 | 86 | 18 | 20 | спалена ў лютым 1943, існуе |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Крэўнікі | 8 | 27 | 8 | 11 | спалена 16.2.1943, існавала да 1986 |
| Купараўшчына | 14 | 86 | 14 | 8 | спалена 26.2.1943, існавала да 1977 |
| Леснікова | 22 | 110 | 22 | 7 | спалена 24.2.1943, існуе |
| Лешня | 40 | 176 | 40 | 45 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Лісна | 27 | 127 | 27 | (85) | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Лугаўцы (Дзёрнавіцкі с/с) | 15 | 79 | 5 | 9 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Луні (Асвейскі с/с) | 14 | 79 | 14 | 21 | спалена 24.2.1943, існавала да 1950 |
| Лявонішана | 13 | 60 | 13 | 19 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Малашкава | 17 | 85 | 17 | 3 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Малыя Плейкі | 38 | 169 | 38 | | спалена 17.2.1943, існуе |
| Мамонаўшчына | 27 | 97 | 27 | 17 | спалена ў лютым 1943, існавала да 1970 |
| Маскалёнкі | 21 | 126 | 21 | 9 | спалена 3.3.1943, існуе |
| Матукі | 24 | 125 | 24 | 50 | спалена ў лютым 1943, існавала да 1993 |
| Мікаленкі | 16 | 70 | 16 | 17 | спалена 17.2.1943, існавала да 1981 |
| Мікуліна | 22 | 110 | 22 | | спалена ў снежні 1943, існавала да 1977 |
| Мілеўшчына | 10 | 42 | 10 | 4 | спалена ў сакавіку 1943, існавала да 1965 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Міснікава (Галубаўскі с/с) | 28 | 131 | 28 | 43 | спалена ў лютым 1943, існавала да 1992 |
| Міхаліна | 18 | 163 | 18 | 30 | спалена 27.3.1943, існуе |
| Мыленкі | 6 | 35 | 6 | (40) | спалена 1.3.1943, існуе |
| Мышкі | 6 | 25 | 6 | | спалена ў красавіку 1943, існуе |
| Мядзведзева | 28 | 104 | 28 | 25 | спалена 22.2.1943, існуе |
| Мядзведскія | 35 | 165 | 35 | 48 | спалена 24.2.1943, існуе |
| Навалакі | 7 | 39 | 7 | 3 | спалена 17.2.1943, існавала да 1965 |
| Надбелае | 15 | 63 | 25 | 25 | спалена 2.3.1943, існавала да 1956 |
| Нарушова | 26 | 147 | 26 | 9 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Новы Двор (Боркавіцкі с/с) | 29 | 118 | 29 | 17 | спалена ў студзені 1942, існуе |
| Нямыцькі | 12 | 40 | 12 | 5 | спалена 1.3.1943, існавала да 1970 |
| Пагулянаўка | 9 | 32 | 9 | 14 | спалена 15.2.1943, існавала да 1980 |
| Падары | 17 | 91 | 17 | 27 | спалена 26.2.1943, існавала да 1966 |
| Падгайскія | 16 | 78 | 16 | 14 | спалена 24.2.1943, існавала да 1970 |
| Палыкаўшчына | 43 | 237 | 43 | 51 | спалена ў лютым 1943, існавала да 1983 |
| Папелушова | 25 | 125 | 25 | 11 | спалена 25.2.1943, існавала да 1979 |
| Паўлюкі | 28 | 116 | 8 | 2 | спалена 16.2.1943, існуе |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Пашэнькі | 18 | 83 | 18 | | спалена 17.2.1943, існуе |
| Перапечкі | 23 | 89 | 23 | | спалена 16.2.1943, існавала да 1986 |
| Пескаватка | 10 | 38 | 8 | 3 | спалена 10.11.1943, існуе |
| Піскунова | 15 | 65 | 15 | | спалена ў красавіку 1942, існуе |
| Плішчына | 8 | 31 | 7 | 2 | спалена ў ліпені 1941, існуе |
| Поціна | 10 | 57 | 10 | 1 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Прошкі | 17 | 69 | 17 | 8 | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Прудзінкі (Шайтараўскі с/с) | 38 | 141 | 36 | | спалена ў чэрвені 1944, існуе |
| Пярэкі | 13 | 57 | 10 | 8 | спалена 10.11.1943, існуе |
| Рагелева | 16 | 73 | 16 | 45 | спалена 26.2.1943, існуе |
| Рачная | 17 | 73 | 17 | 5 | спалена ў лютым 1943, існавала да 1982 |
| Рубаны | 22 | 140 | 22 | 9 | спалена 24.2.1943, існавала да 1981 |
| Савейкі (Сенькаўскі с/с) | 17 | 94 | 17 | 11 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Сакалоўшчына (Галубаўскі с/с) | 40 | 180 | 22 | 12 | спалена ў студзені 1944, існуе |
| Саламахі | 10 | 46 | 8 | | спалена ў ліпені 1944, існавала да 1960 |
| Саломіна | 17 | 104 | 17 | 13 | спалена 1.3.1943, існавала да 1967 |
| Сандары | 11 | 43 | 11 | 16 | спалена 15.2.1943, існавала да 1980 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Сардыкі | 37 | 163 | 30 | | спалена 16.2.1943, існуе |
| Сар'я | 34 | 193 | 34 | 69 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Саўкялі | 15 | 64 | 15 | 8 | спалена 22.2.1943, існуе |
| Свяціца | 41 | 197 | 41 | (122) | спалена 1.3.1943, існуе |
| Селішча | 25 | 111 | 25 | | спалена ў снежні 1943, існуе |
| Селядцова | 20 | 115 | 20 | 6 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Сенькава | 75 | 294 | 75 | (35) | спалена 16.2.1943, існуе |
| Сераднікі | 6 | 24 | 6 | (74) | спалена ў сакавіку 1943, ўвайшла ў склад в. Іскра |
| Слабада (Дзёрнавіцкі с/с) | 12 | 49 | 10 | 3 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Слабодка | 17 | 71 | 17 | 28 | спалена 1.3.1943, існавала да 1987 |
| Спругі | 7 | 23 | 7 | | спалена 15.2.1943, існуе |
| Стайкі (Шайтараўскі с/с) | 29 | 128 | 27 | | спалена ў чэрвені 1944, існуе |
| Стараселле | 41 | 205 | 41 | 60 | спалена 1.3.1943, існуе |
| Страдна | 16 | 59 | 16 | 7 (215) | спалена 2.3.1943, існуе |
| Стралкі | 65 | 255 | 65 | 122 | спалена ў снежні 1943, існуе |
| Сукалі | 11 | 69 | 11 | | спалена ў сакавіку 1943, існуе |
| Сумкі | 6 | 21 | 6 | (5) | спалена 15.2.1943, існуе |
| Сухарукава | 9 | 34 | 9 | 11 | спалена 23.2.1943, існавала да 1966 |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Сядлоўцы | 8 | 29 | 8 | 6 | спалена ў сакавіку 1943, існавала да 1980 |
| Урагава | 46 | 141 | 46 | 20 | спалена 4.3.1943, існуе |
| Фальбаркова | 24 | 152 | 24 | 72 | спалена 16.2.1943, існавала да 1969 |
| Філіпова | 39 | 165 | 30 | | спалена ў чэрвені 1944, існуе |
| Харкава | 24 | 94 | 24 | 4 | спалена 16.2.1943, існавала да 1986 |
| Ходараўшчына | 5 | 23 | 5 | 8 | спалена 17.2.1943, існавала да 1960 |
| Цвецінцы | 8 | 40 | 8 | 4 | спалена ў сакавіку 1943, увайшла ў склад в. Іскра |
| Цеплюкі | 62 | 219 | 62 | 7 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Цярэшкі | 17 | 75 | 15 | 3 | спалена ў кастрычніку 1942, існуе |
| Чарнавокі | 13 | 89 | 13 | (260) | спалена 8.3.1943, існуе |
| Чурглі | 30 | 113 | 30 | 12 | спалена 24.2.1943, існавала да 1972 |
| Шавёлкі | 8 | 28 | 8 | 1 | спалена 16.2.1943, існуе |
| Шалягова | 42 | 252 | 42 | 19 | спалена 28.2.1943, існавала да 1990 |
| Шаўракі | 29 | 169 | 29 | 27 | спалена 23.2.1943, існавала да 1987 |
| Шупейкі | 5 | 28 | 5 | | спалена ў ліпені 1941, існавала да 1994 |
| Юзэфова | 37 | 160 | 37 | 55 (200) | спалена 1.3.1943, існуе |
| Юралава | 13 | 74 | 13 | 5 | спалена 17.2.1943, існуе |
| Юркава | 9 | 34 | 7 | | спалена ў сакавіку 1943, існуе. |

# Асвейская трагедыя

На знішчэнне партызанскай зоны нямецка-фашысцкія акупанты накіравалі рэгулярныя войскі. Адна з карных аперацый пад назвай «Зімовае чараўніцтва» прайшла ў Дрысенскім і Асвейскім, Полацкім, Расонскім раёнах у лютым — сакавіку 1943 г. Весткі пра тое, што рабілі гітлераўцы, дайшлі і на Вялікую зямлю. Аляксей Талстой надрукаваў у газеце «Правда» артыкул «Асвейская трагедыя», тэкст якога быў выкарыстаны для выдання ЦК КП(б)Б аднайменнай лістоўкі:

Лютуюць нямецка-фашысцкія каты. Патокі нявіннай крыві льюцца там, дзе ступае нага фашысцкага звера. Ап'янёныя крывёю, гітлераўскія нягоднікі не спыняюцца ні перад чым. Нож і атрута, агонь і сякера, шыбеніца і аўтамат — усё пускаюць у ход нямецкія людаеды, каб толькі знявечваць, катаваць, знішчаць савецкіх людзей. Кроў стыне ў жылах ад страшэнных злачынстваў фашысцкай зграі. Здаецца, няма канца садызму, лютасці акупантаў.

Яшчэ зусім нядаўна чалавечая свядомасць была патрасяна страшэннымі злачынствамі немцаў у Краснадарскім краі. Гэта — масавае атручванне савецкіх людзей, забойствы хворых і дзяцей атрутнымі газамі ў машынах смерці — «душагубках».

## ЖУДАСНАЯ КРЫВАВАЯ ТРАГЕДЫЯ РАЗЫГРАЛАСЯ НЯДАЎНА Ў АСВЕЙСКІМ РАЁНЕ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У страшэнную пустыню ператварыўся гэты прыгожы куток зямлі беларускай. У ім нельга пазнаць ранейшы цудоўны азёрны край, шчодры і багаты. Усё, што доўгія годы стваралі туту асвейскія калгаснікі, загінула пад цяжкім ботам нямецкіх катаў-акупантаў.

Гэта было ў сакавіку. Усяго некалькі дзён лютавала тут арда нямецкіх карнікаў. За гэтыя некалькі дзён заплечных спраў майстры дашчэнту спалілі ўсе 158 населеных пунктаў раёна (3.450 жылых дамоў), спалілі раённы цэнтр Асвею і мястэчка Каханавічы, спалілі 9 дамоў сацкультуры, 12 сярэдніх і 90 няпоўных сярэдніх школ, 4 дзіцячыя дамы, 6 бальніц і 2 ветлячэбніцы, 3 машынна-трактарныя станцыі і 3 вялікія млыны. Нямецкія варвары не пашкадавалі і святыні веруючых: яны спалілі дзве праваслаўныя царквы і тры касцёлы.

З халодным садызмам дзікіх звяроў немцы-карацелі спалілі жывымі і ўтапілі ў рацэ Свольна 3.639 мірных жыхароў. І хто ж яны? Гэта 2.118 дзяцей да 12-гадовага ўзросту. Гэта 310 старыкоў звыш 50-гадовага ўзросту.

І гэта яшчэ не ўсё. Карнікі схапілі і пагналі на катаргу ў праклятую Нямеччыну 2.615 мужчын і жанчын. Грабежнікі-немцы забралі ў насельніцтва апошнюю жывёлу, увесь хлеб і хатнія пажыткі савецкіх людзей.

Ахвяры нямецкага тэрору падвяргаліся жудасным катаванням і здзекам. На гру-

Нямецка-фашысцкія захопнікі паляць вёскі на Асвейшчыне.

дзях і спіне 8-гадовага хлопчыка Юхневіча (вёска Бяляны) нямецкія каты выразалі пяціканцовыя звёзды, а затым кінулі яго ў палаючы дом. Ягонай мацеры яны адрэзалі грудзі, а сямігадовай сястрычцы Веры нажом распаролі жывот. Затым іх таксама кінулі ў бушуючае полымя. Такі ж страшэнны лёс напаткаў сям'ю Жоравых з вёскі Барысава. Знявечаныя, але яшчэ жывыя, жанчыны і дзеці былі ўтоплены ў рацэ Свольна.

Адрэзванне грудзей, вырэзванне пяціканцовых звёзд на спінах савецкіх людзей — гэта яшчэ не ўвесь арсенал жахлівых нямецкіх катаванняў. Многім сваім ахвярам немцы выкручвалі рукі і ногі, скручвалі галовы. У некаторых вёсках немцы нават насаджвалі на калы дзяцей — хлопчыкаў і дзяўчынак.

Гэтыя жудасныя катаванні прымяняліся ў масавым парадку. Знявечаных і паўжывых людзей акупанты, звычайна, загналі ў адзін дом, свіран або пуню. Наглуха зачыніўшы будынак, яны аблівалі яго бензінам і падпальвалі. Людзі гарэлі, паміралі павольнай, пакутлівай смерцю.

Большасць сваіх ахвяр немцы вынішчалі шляхам спальвання. Вось асобныя вытрымкі з акта аб зверствах нямецка-фашысцкіх акупантаў у Сухарукаўскім сельсавеце:

Фашысцкія карнікі каля сваіх ахвяр у вёсцы Бяляны былога Асвейскага раёна. 1943 г.

Курган памяці ў г.п.Асвея.

«...Вёска Муквяціца, якая складалася з 25 двароў, спалена поўнасцю. Знойдзены трупы 13 зажыва спаленых і 1 расстралянага мірных жыхароў. Узрост, імёны загінуўшых устанавіць не ўдалося.

Вёска Чарнікова, якая складалася з 18 двароў, спалена поўнасцю. Знойдзены трупы 20 зажыва спаленых мірных жыхараў.

Вёска Каралёва — 25 двароў — спалена поўнасцю. Знойдзены 16 трупаў зажыва спаленых мірных жыхараў, старыкоў і дзяцей...»

Такі ж страшэнны малюнак і ў астатніх дзевяці знішчаных вёсках гэтага сельсавета, ва ўсіх 158 знішчаных населеных пунктах раёна, у раённым цэнтры Асвея і мястэчку Каханавічы, у вялікіх пасёлках Задзежжа і Зайцава.

А катаванні бізунамі і гумавымі палкамі, падвешванне на крук за сківіцу ці рэбры, масавае гвалтаванне дзяўчат і жанчын! Усяго не пералічыш. Немцы — вопытныя каты. Яны, па магчымасці замяталі сляды сваіх злачынстваў. Яны знішчалі, спальвалі і тапілі ўсіх, хто трапіў ім у рукі. Так, моў, лепш — не будзе сведак, не будзе абвінаваўцаў.

Але абвінаваўцы ёсць! Ёсць і мсціўцы! Гэта — паўстаўшы беларускі народ, гэта — узброеныя народы Савецкага Саюза. І калі сёння нямецкія

злачынцы яшчэ не ўсе злоўлены, калі яны яшчэ прадаўжаюць спальваць і катаваць нашых людзей, то заўтра іх агідныя трупы будуць гойдацца ў петлях на плошчах нашых гарадоў і сёл. Мы адпомсцім! У дзень расплаты мы прыпомнім ім і зруйнаваны куток беларускай зямлі, прыпомнім ім асвейскую трагедыю.

Мацней сціскай вінтоўку, партызан! Да помсты цябе кліча кроў замучаных савецкіх людзей. Жыві толькі адной думкай, толькі адным імкненнем — біць акупантаў.

Партызан! Забі ката, душы немца-акупанта, знішчай крывавых гітлераўскіх вылюдкаў, адскай іх брудныя лапы. Забі гітлераўца, інакш ён цябе заб'е.

Вораг лютуе, бо адчувае блізасць сваёй катастрофы. Вогненнае кальцо вакол зграі гітлераўскіх забойцаў з кожным днём сціскаецца. Б'е і гоніць немцаў на захад наша слаўная Чырвонай Армія. Узмацняюць свае ўдары на гітлераўскай Германіі нашы саюзнікі — Англія і Злучаныя Штаты Амерыкі. Не мінаваць фашысцкім катам справядлівай кары за ўсе свае брудныя і крывавыя справы.

*Фонды Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Інв. № 13567.*

## Сведчаць відавочцы

**ПА СТАРОНКАХ КНІГІ А. АДАМОВІЧА, Я. БРЫЛЯ, У. КАЛЕСНІКА «Я З ВОГНЕННАЙ ВЁСКІ» (Мн., 1975)**

**Ганна Паўлаўна Бурак, вёска Лісна:**

«...У лесе мы з нядзелю прасядзелі. Муж гаворыць:

— Паедзем мы бліжэй к дому. Там адзін сусед, гаворыць, пераехаўшы, дык яны ў дзярэўню ходзяць, бульбы прыносяць, зярнят прыносяць, мелюць, калатуху вараць, ляпёшкі пякуць. Вось і мы, гаворыць, паедзем туды.

Ну што я, я ж адна не ўпруся, што я зраблю адна з дваімі дзецьмі? Ну, вот прыехалі, налажылі воз сена, павёз ён, і дачка паехала з ім.

— Я, — гаворыць, — пайду дамоў, можа прынясу картошкі.

Ну вот, яны паехалі, а я асталася так з дзецьмі сваімі. Прыехаў, апошні воз сена налажылі. Ён на мяне гаворыць:

— Няхай рабяты едуць са мной, а то апошняе будзем забіраць, дык не будзе як сесці...

Там і дзежкі былі з жырамі, там усё было. І недзе будзе сесці. А па возеры ісці — ужо быў насліг на возеры, вада бальшая.

— Ногі, — гаворыць, — змочаць, а дзе яны тады будуць сушыць, недзе будзе сушыць.

Ну, а я думаю: няўжо ж ён горш хоча. Я ўзяла рабят, усадзіла яму на сена, яны і паехалі. Ён гаворыць:

— Прыедзем, згрузім, а тады або я, або Клаўдзя да цябе прыедзем.

Ну, вот яны і паехалі, а я засталася. Жду — іх нетуці. І сонца зайшло — усё іх нет, і цёмна стала — усё іх нет. Я ўжо — у паніку, плачу. Што ўжо, значыць, даўно нетуці, што ўжо іх нет. Пайшла да суседа, стала расказваць. Яны гавораць:

— Ясна, што іх нет, ужо іх немцы ўлавілі, там бы яны не сядзелі. Ну, вот раніцай, чуць свет, прыбягае гэты мой большы хлопчык ка мне і гаворыць:

— Мамка, нас немцы ўлавілі. І дзедушку ўлавілі, — гаворыць, — Віцю, і там — гаворыць, — Кузьму з рабятамі ўлавілі, старуху адну... А я гэта прыйшоў, бо найшлі дзвюх кароў і загадалі адну карову мне весці, а другую — другой дзевачцы. Ну, я — гаворыць ён, — думаю: «Павяду гэтую карову да балота, а тады, гаворыць, за сані прывяжу, а сам — у лес». Едзем ціхонечка, прывязаў за сані, а немец назад не глядзіць. Прывязаў гэтую карову і — ходу, у кусты, і пабег. І гэтая дзевачка так сваю карову кінула і пабегла за мною. Падбег, — гаворыць, — пад дзерава, і паваліўся, і лёг...

Бацька мой быў глухі, а меншы хлопчык гаворыць да яго:

— Дзедушка, а нашага Шуры ўжо нетуці.

І плача. А немец гаворыць:

— Не плач, — гаворыць немец, — мальчык, заўтра будзе і Шура ўмесце. І мамка будзець, усе будзеце ўмесце...

Ну, і вот, гаворыць, ён вочарадзь з аўтамата пусціў, гэты немец, якраз у тую сторану, дзе мы ляжалі, у тое дзерава. Еслі б, гаворыць, на адну чвэрць ніжэй, ён бы, гаворыць, мяне ўбіў бы. Дзве пулі папаў у тую сасну.

Ну, і тады яны ўжо пастралялі і паехалі, а ён, хлопчык, знаў, што там на адным астраве два мужыкі капалі зямлянку сабе, ну, вот ён і пабег туды: можа, іх там найду. Прыбягаець туды, а яны, гаворыць, коні выпрагшы, пакурваюць у праспакойнасці. А я як закрычаў на іх:

— А дзядзечкі, скарэй будзем уцякаць! Ужо немцы, — гаворыць, — улавілі і павязлі і дзедушку, і Кузьму, і рабят!..

А яны скоранька запраглі, адзін, гаворыць, дзядзька ўзяў мяне да сябе на сані, у ногі ўшчаміў і, як маглі гэтыя коні бегчы, так яны іх гналі. Выскачылі на азяро, ужо ў палавіну азяра, і немцы з гэтымі ўжо людзьмі на азяро выехалі і пачалі з кулямёта па іх страляць. Але яны ўжо іх не даставалі, толькі гэтымі асколкамі, лёдам абсыпалі іх. Тады яны выехалі к берагу, паставілі аўтамат... не, кулямёт і сталі па іх страляць. Але ўжо іх не даставалі, яны ўжо далёка былі. Ну і вот, яны ўжо тады паехалі к нам, і так ён вот ужо ка мне прышоў і расказаў, што так случылася.

Тады я на суседзяў гавару:

— Ну, раз іх ужо сёння ўлавілі, то заўтра нас уловяць. Яны сюды прыдуць.

Ну, і так палучылася. На зорачку яны прыйшлі к нам, гэтыя немцы.

Нас многа там сабралася. Ну, і вот не маглі ніяк вапрос рашыць. Адзін гаворыць:

— Паедзем за азяро, за Ліснянскае.

А другі гаворыць:

— Не!..

Пытанне: — Гэта вы так гаворыце?

— Суседзі. Там жа многа было, можа, сотні дзве. Ну, і тады яны ўжо так давалтузіліся, і сонца стала ўсходзіць, ужо на азяро не выедзеш; відно, немцы ўсё роўна заб'юць. І тут чуем з-за гары шорах нейкі. Шэрань бальшая была, і шорах бальшы. А людзей многа, не дабіцца толку ніяк. Крычаць:

— Сціхніце! Сціхніце! Хоць узнаць, які звук!

Вот. Тады некалькі хлопчыкаў пабегла на гару, і я ў тым чысле пабегла на гару, і мой хлопчык гэты больш пабег са мною. Ну, чалавек нас с дзесяць пабегла. Толькі мы на гару ўзбеглі — і тут пад намі такі густы-густы соснік. І тут немцы. Ідуць з-пад гары. Мы тады закрычалі і рукамі замахалі на гэтых, што ўжо немцы. І яны як стаялі пад гарой, так і пусціліся ўдоль балота. А мы па гары пабеглі. І вот мы па гары беглі, а ўжо немцы — іх штукі тры бегла за намі — па-руску ўжо крычалі, па матушке на нас, і стралялі, а мы ўсе беглі. На мне быў палушубак надзеты, я расшпілілася, і полы гэтыя махаліся, і куля папала мне ў палу, разрыўная. Тут вырвала клок. Я тады палушубак здзела і кінула. Усё роўна я з ім нікуды не збягу. І ў каго былі якія там хатомкі за плячамі з сухарамі — усё пакідалі. І пабеглі так, як стаём. Прыбеглі к аднаму азяру:

— Ці па балоту аббягаць, ці цераз азяро?

А я гавару:

— Не, — пабягом лепш прама цераз азяро. Пака будзем путацца — тут яны нас і насцігнуць.

Пытанне: — А як называлася возера?

— Карасіна. Вот. Перабеглі так ужо мы гэтае возера. Я первая пабегла, і за мною ўсе пабеглі. Выйшлі на прыталак. Гэта дзела было перад пасхай, прыталкі былі. Стаём. Абціраемся, што з нас пот ліець з усіх. І ўдруг нам наперад едуць немцы, на пары канях. А куды нам дзецца? Уперад ісці — тут лес рэдкі зусім, яны нас тут уб'юць. Назад ісці — там страляюць і людзі крычаць, палюць, дым стаўбом ідзе. Прама страх невазможны! Куды дзецца? І раптам глядзём — ляжыць ад нас так вот елка лахматая, заваленая ў балота. Я гавару на аднаго мальца:

— Давай пад гэтую макаўку ляжам, ты з аднаго боку, я з другога.

А гэтыя ўжо мальчышкі, каторыя былі... Вот такі ельнічак быў, дык яны яго паднялі, і пад ніз палезлі, і там сядзелі. А мы з тым мальцам пад макаўкай: ён з аднаго боку лёг, а я з другога. Адна толькі кофта была астаўшыся на мне, прытом красная, і платок на галаве цёплы быў. Я зняла платок з галавы і накрыла вот так плечы, каб не відалася, што красная. І рукі голыя, і галава голая, і каленкі голыя. Чулкі аб'ехалі, не было калі падцягнуць. І так у снег лягла, у гэтым снягу я ляжала... І цэлы дзень мы адляжалі. І вот яны, калі пад'ехалі да нас, гэтыя немцы — сталі. Ну, мы гаворым, што цяпер тут будзе наша смерць... Злезлі з саней і пачалі глядзець, ці ёсць сляды. Харашо, што мы з гэтай праталкі не збяжалі. Паглядзелі, паглядзелі яны — нетуці нідзе слядоў абратна, пагаркалі па-свойму, выцягнулі папяросы, закурылі, запахла іхнімі гэтымі сігарэтамі, і селі на полі: ад нас, можа, метраў трыста ад'ехалі і здзелалі засаду. Коні выпраглі, агонь разлажылі, выстрал далі. А мы ляжом, ні з месца, нікуды не можна сыйсці. І яны нам відаць. Ну, і вот мы ляжалі цэлы дзень. Як не страляюць — тады нам пачынае мароз перабягаць па спіне, як толькі выстраляць — так сразу жарка, жарка стане, што кіпятком хто-небудзь абварыць. Ну. І вот так ляжалі поўны дзень, да самага сонца. Сонца зайшло. Тады яны коней запраглі, выстрал далі і падаліся. А мы тады ўжо паляжалі з паўчаса, усталі, і рукі — што граблі, і ногі ўжо проста дзвіжэнія нетуці... У снягу адляжаць босымі голымі нагамі...

Ну, і мы тады пайдзём ужо гэтых рабят сабіраць. Сталі гэтых рабят сабіраць, сталі крычаць на іх. Якія блізка былі, тыя папрыбягалі, а мой як збег — абратна назад, цераз азяро; прыбіўся да чужых людзей. І ён ужо там і быў. Я стала крычаць на ўсю галаву. На мяне крычаць:

— Не крычы, а то прыдуць немцы і ўсіх паб'юць!

— Няхай ідуць — мне ўжо ўсё роўна жызнь неінцярэсна, я ўжо, гавару, адна асталася. Няхай, гавару, ідуць.

Ну, і яны не ўчулі, не прыйшлі к нам.

А мы пойдзем ужо тады, абратна паглядзём, дзе яны ўжо гэта нас... Дзе кінулі мы сваіх коней, павозкі. Выходзім ужо тады па сляду, след у след.

Да. Тады на гару ўзыйшлі, чуем — у балоце які-та шорах. Захрускла гэта сучча. Мы абратна паразбягаліся па лесу куды хто, слухаем. Чуем — гавораць па-руску.

— Гэта, — гаворым, — нашы.

Тады абратна ў кучу сабраліся туды, у балота. Аж там з Вялікага Сяла тры чалавекі... Адзін з нашай дзярэўні, а два з Вялікага Сяла, дзе каля Асвеі, такі Сямён ёсць з сынам. Ну, тады мы прыйшлі к ім, пагаварылі, як хто адкуль ішоў, а пра ежу ж — і толку нету. Двое сутак нічога ў роце не было. І ні ў каго нічога. Гэты ўжо чалавек гаворыць, Бельскі:

— У мяне ёсць гароху прыгаршчаў двое.

Дык ён нам па жменечцы ўсім раздзяліў, той гарох, і вось мы той гарох з'елі і пайшлі туды, дзе мы ўжо кідалі ўсё сваё. Прыходзім туды — коні пабітыя, сані паламаныя, падушкі ўсе параспусканыя — белы-белы ўвесь чыста лес! У каго было сала ў дзежках — усё паадкрывана і гэтай патрутай перасыпана, і бумажкі гэтыя з мухамі нарысованыя на пакеціках, што яны ўжо перасыпаны... А людзі ўсе пабітыя, пасцягваныя ў груды, аблітыя бензінам і так гараць, што настаяшчыя дровы, аж прышчыць — як гарацьі Ну, і вот мы тады там пабылі...

Пытанне: — А людзі гэта з вашай вёскі?

— Адусюль былі, з усяго сельсавета былі з'ехаўшыся. Вот. І ўсе там пагіблі. Ну вот, тады мы ўжо ідзём — пойдзем пад дом. Ідзём адзін за адным — гэта ўслед, чалавек дзесяць, і слова ні адзін нікому не гаворыць. Нада спыніцца — тады я за цябе вазьмуся, а ты за другога, за трэцяга — так усе і астанаўліваемся. Паслухаем — нідзе нічога не чуваць. Тады таўкнеш адзін аднаго па вочарадзі, так і пайшлі. Такі наш

страх быў, так мы не маглі гаварыць, што колькі людзей ляжыць і ўсё гарыць...»

І гэта, такое — не дні, не месяцы, а на працягу гадоў. Ганна Бурак працягвае свой горкі расказ.

«...Ну вот, пабеглі мы ў лес. Завязаўся балышы бой. Ужо нам дзецца недзе было. Немцы адступалі. Мы тады...

Пытание: — Гэта як набліжаўся фронт?

— Немцы адступалі, нашы наступалі на іх. Гэта ўжо ў сорак чацвертым было. Ну вот, нам дзецца недзе, і мы тады пабеглі ў азяро. Такое глыбокае, бузянае. Мы ўлезлі ў гэта азяро і за курганне гэтае, за папараць дзяржаліся і ляжалі ў гэтым... Ну, па роўнае горла ў вадзе былі. І к нам як прывяжуцца жабы. Такія балышыя, страшныя — не абараніцца. Возьмеш у руку — я-ак бросіш яе ад сябе падальша. Мінут пяць нет, абратна прыпаўзаець к табе, «ква-ква» крычыць. Мы абратна яе адкінем. Вось так ляжалі да вечара, у гэтым азярэ.

Тады ўжо ўчулі, што машыны ідуць і наша радыё гаворыць. Мы засмяяліся, рады сталі — нашы паехалі! Наша радыё гаворыць!

Вылезлі з гэтага азяра і пашлі, пашлі ў дзярэўню Малашкава. Там не ўзнаць — быў пясок жоўты, а стаў чорны ад гэтых, ад снарадаў. Ну, тады прышлі з Малашкава на Залуку. З гары мы ўжо наблюдалі, што ў Лісна робіцца. Тут балышое дзвіжэніе па балышаку ішло, а якое — мы не знаем. Ну, і каля балота была рож пасеяна. Мужчыны гавораць:

— Нада ісці паглядзець, чые сляды — нямецкія ці нашы?

Пайшлі паглядзелі і гавораць:

— Гэта немцы.

Гэта ўжо нашы пагналі іх. І пайшлі мы. Дагаварыліся, каб па адной каляіне ісці, каб не пасці на міну. Нямнога адайшлі ад гэтай дзярэўні — ляжыць немец забіты.

— Ага, — гаворым, — папаўся хоць адзін!..

Стаім мы на гэтай гарэ... Ой, спутала!.. Падыходзім мы гэта ўжо сюды, к Лісну, дзе піларама, там стаяла кухня нашых краснаармейцаў. Яны нас увідзелі — прыбеглі, нас абнімаюць, цалуюць, і мы іх цалуем і плачам, рады, што ўжо сваіх увідзелі. А яны гавораць, што мы, гавораць, ідзем ад самага Неўля і нідзе, гавораць, не відзім гражданскага чалавека, кроме ваенных. Гаворым, што мы тожа'не з гэтай дзярэўні, мы дзевяць кілометраў адгэтуль. З гэтай дзярэўні яшчэ ніводнага чалавека не было — усе ў палоне, каторыя жывыя былі. Ну, і вот яны нас тут чаем напаілі, накармілі, па шынялю нам далі, па рубашке па вязанай нямецкай далі...

Ну, іх там было набіта, гэтых немцаў, што страшна. Ішла «кацюша», па іх як ударыла, дык яны без намяці ў азяро. І ў азярэ многа было, і па палянке многа было, дык жара была, лета. Мы іх пабіралі ўжо на месцы і закопвалі, каб ужо не было ніякага заражэння...»

**Зінаіда Іванаўна Путра,**
**вёска Боркавічы:**

«...У лесе мы пастроілі зямлянкі. І жылі там да экспедыцыі. Калі пачалася экспедыцыя зімой, то часць партызан прарвалася за фронт, і часць насялення з імі пайшла. Мы ж засталіся. Тры сям'і нас жылі ў балоце, пака экспедыцыя. Экспедыцыя радам ішла, але нам якраз удалося. Толькі мы зайшлі ў балота, і прайшоў снег. Гэта якраз перад Новым годам было. У сорак трэцім, мабыць, зімой. Скот мы не бралі. Толькі нас было чатырох, маці і тры сястры. Там яшчэ дзве сям'і. Тры сям'і нас. Без ската выйшлі ў гэта балота. Снег прайшоў — сляды завеяла, і экспедыцыя радам ноччу ішла. Помню — новы год сустрачалі немцы, стралялі, салют давалі ў дванаццаць часоў. Новы год. І мы ўсё — і разговоры слышалі, і выстралы, усё слышалі, але асталіся. Немцы не дагадаліся. А хто вёз на канях і скот з сабою, тых усіх экспедыцыя дагнала і расстраляла. Мы после выйшлі — жуткая была карціна. Мы прайшлі да сваіх зямлянак. Ляжалі трупы, коні, каровы, па-

расстрэльваныя, — жуткая карціна была...

Другая экспедыцыя ішла летам. Гэта, па-мойму, ужо ў сорак чацвертым. Летам ужо мы сядзелі ў тайніках. Прыйшоў з партызанскага атрада Арлоўскі, помню яго фамілію, выступіў перад насяленнем і расказаў, як строіць гэтыя тайнікі. Пастроілі мы тайнікі. Каждая сям'я строіла сабе тайнік. Што б можна было толькі сесці ўсёй сям'ёй. Зразалі дзірванкі акуратненька. Абчэрціш так вось квадрат. Дзірванкі клалі, пясок увесь выкапвалі, каб можна сесці было, яму такую выкапвалі. У карзіны пясок, аднасілі далёка і пад мох хавалі. Немцы ўжо ведалі, што такія тайнікі сушчаствуюць, і, калі ішла экспедыцыя, яны шукалі... Гэта ўсё мы шчацельна маскіравалі: пясок, потым накладалі досак тоўстых, каб не зыбаліся, і назад роўненька, дзірванок у дзірванок складвалі. Усе як было — назад на гэтыя доскі. Потым па дзірванцах чашуей засыпалі. Точна як наўкол лес расце. І ўстрайвалі, што б дыхаць можна было. Пад бальшое дзерава, окала бальшога дзерава выкапаць, а пад корні каб прасвет быў, некалькі іх. Як сядзіш, што б воздуху нямножка, дыхаць. Там жа доўга сядзець нельзя было, толькі той мамент, пака пройдзе экспедыцыя. Патом вылезе з гэтага тайніка — чалавек жоўты-жоўты, вобшчам — галавакружэнне. У зямлі, поўнасцю ў зямлі.

Другая экспедыцыя калі ішла, у нас быў тайнік. І Кухаронак такі жыў, і Чыгак. Яны з Боркавіч. Удраўшы былі ад немцаў у парцізанскую зону. Ішоў гэты Кухаронак па лесу і якраз найшоў на нямецкую цэп, на экспедыцыю, на самых немцаў напаў. І расцяраўся, ну, і назад, бягом у свой лагер. А немцы толькі засмяяліся, таму што яны зналі, што з усіх канцоў усё ацэплена, тры цэпі ішлі.

Ён адразу як прыбег — замахаў: «немцы ідуць!». Мы тут касцёр пагасілі, які быў... Зямлянка ў нас навярху была, як адкрыта жылі. І адразу ўсе ў тайнік. Як толькі ў свае тайнікі ўлезлі... Такую дзверку дзелалі на завесах, палачкай падпіралі і ўлазілі туды. Ляжаш і нагамі туды ўсунешся... Усе ў тайнікі ўлезлі, і тады за гэтую палачку возьмеш і апусціш. Прышлі немцы, зямлянку ўзарвалі. Мы разгавор чулі нямецкі, вешчы якія былі — яны разбрасалі. Прайшлі па самаму нашаму тайніку — хруп-хруп-хруп ветачкі пад нагамі ў іх...

Мы гэтыя тайнікі рабілі так шчацельна, што было там нас тры сям'і, усе ведалі прыблізіцельна, дзе чый тайнік, а часамі самі не маглі знайсці, штоб падняць гэтую дзверку. Адзін у аднаго.

І вот Кухаронак, кагда прайшла гэтая экспедыцыя, ён першы вылез з тайніка і рашыў прыйці даць нам сігнал, што немцы пайшлі, і знаў, дзе наш тайнік, і не найшоў. Слышым, ён ходзіць, кліча нас па фамілії, вызывае, што немцы, значыць, прайшлі, а мы не верым: а раптам немцы заставілі яго паказаць наш тайнік. А патом прыпаднялі дзверку, паглядзелі праз шчэль, што гэта Кухаронак адзін, ніякіх немцаў няма, і мы вылезлі самі.

А Чыгак не ўспеў тайнік зрабіць поўнасцю, ён яго замаскіраваў, а дзверку гэтую, на завесах, праз каторую нада ў тайнік лезці, ён не ўспеў зрабіць. Пагэтаму яны ўскочылі ў тайнік усе, ялушачку ўзялі ў рукі, селі ў гэтую... Ну, чалавеку толькі каб сесці... І ялушачку гэтую бяруць. І дзяржалі. Дык яны ні жывыя ні мёртвыя сядзелі, усё відзелі праз гэтыя веткі. Сядзяць і відзяць, як немец дайшоў, пачці ужо вот-вот нагой устаць, астанавіўся, пасматрэў. Яны ўжо усё, гаварылі, падгатовіўшы былі: еслі ужо немец стане — ён абваліцца ў іхнюю яму, дык яны какіе-то там вяроўкі падгатовілі, каб адразу яму рот закрыць, што ён і не крыкнуў і не піснуў...

Так мы дзве экспедыцыі і прасядзелі...

Як Красная Армія прыйшла, дык усе ўзрослыя пабеглі ад радасці, а нас, дзяцей, пакінулі, а мы сядзём і не ведаем, што рабіць. Праздноуюць тамака ўзрослыя, салдаты гавораць, што многа прайшлі, а толькі тут мірнае насяленне ўстрэцілі. Усё было ўсюды папалена.

Часа цераз два ўзрослыя вазвраціліся і нам, дзецям, аб'явілі, што нас асвабадзілі — пара выхадзіць з лесу...»

**Ганна Дзядзела, вёска Відокі:**

«...З нашай вёскі ўлавілі дзяўчыну. Яны над ёю надругаліся. На могілках потым знайшлі яе. Ужо нежывая ляжыць, і цукерка... у зубах... А другую забілі ў садзе. Во так ляжыць — дагары, прыкапана, — после мы агледзелі. Сукенка ўся падраная на ёй...»

**Ганна Грабоўская, в. Латыгава:**

Бабулі, якая гэта расказвала, за восемдзесят гадоў, яна ляжала ў ложку, ужо зусім нямоглая. Дачка яе, Барбара Ясюкевіч (у хаце прымак), і суседка Наталля Падгайская, якія добра памятаюць тыя дні, удакладнілі шэптам пра тую цукерку... Бабуля не змагла сказаць: ці па душэўнай далікатнасці, ці з-за памяці беднай пакутніцы.

«...Як яна крычала! Усе млелі. Тут жа вот, у байні, быў такі вялікі гвозд, сантыметраў мо дваццаць. Дык яны ўзялі той гвозд ды ёй у грудзі... Самаковачным гваздом — у грудзі...

А цётку маю на штыках паднялі...»

**Зінаіда Рута, 55 гадоў, г.п. Асвея:**

«...Нас злавілі ў лясу. Дзвесце пяцьдзесят чалавек. Бо немцы шчыталі: «дзвесце пяцьдзесят». Усіх у рад выстраілі і пусцілі па нас аўтамат. Кагда аўтаматы прайшлі па нас — мы ўсе пападалі. У мяне дочка на руках — убілі. Дзевачка, два годзікі было.

Пытанне: — Калі яны вас выстраілі, дык нешта гаварылі вам?

— Пастроілі ў рад па чатыры чалавекі і пусцілі аўтаматы. А калі пусцілі аўтаматы, мы ўсе пападалі. Я ў плячо ранена, у наге пуля ў мяне. А дочку ўбілі. Дочку — за ўтарым разам, кагда пусцілі аўтаматы, дочку ў вісок папалі. А я сама ранена сюды, гэтая старана ў мяне была ўся чорная. Абпалілі, калі з аўтаматаў стралялі.

Пытанне: — А як вы потым выйшлі адтуль?

— Ну, я не адна засталася. У нас тут Скрыпка ёсць. Анастасся. Я была вот так нагой павярнуўшы, а яна стала мяне будзіць:

— Зіна, Зіна, уставай! Ты жыва ілі нет?

А я стала да сазнання дахадзіць. Усталі мы. Калі мы ўсталі, у нас што было... Астаўшыся шэсць чалавек. Жывых з гэтых усіх. З шасці чалавек два ўмерла. Адна ўехала на Сібір...

Пытанне: — Калі вы ўсталі — немцаў ужо не было?

— Не было. Мы тады пайшлі дальша ў лес ужо. Гэта ж ноч ужо была. Цёмна ноччу. Мы пайшлі пад куст, пераначавалі...»

**Марыя Баўтрук, в. Юзэфова:**

«...Каб гэта ўмеў ды спрытна расказаў!..

На папялішчы.

...Мы сталі ўсе ісці, беглі, а яны стралялі. Каторых ранілі. Вот і маіх раніўшы тожа былі. Мае цёткі там былі. А тады ўжо, у лес забегшы, там ужо немцы дагналі. У мяне братавая была, у яе дзеці. Ну, і немцы сказалі вярнуцца сюды назад во, у дзярэўню. Вярнуліся.

Мне было тады гадоў, можа, васемнаццаць. Мы пайшлі як маладзёж, а яны вярнуліся, іх абманулі. А мы далей у лес пабеглі.

А яны вярнуліся з сем'ямі, у іх рабяты былі, усе нашы дзеравенцы. Ну, а тады гэта... запёрлі ў зямлянку. Маю братавую, двое рабят у яе было... Тады загналі ў Задзежжа, там кар'еры. Усіх гэтых нашых дзеравенцаў, што былі дома. Іх раздзявалі, аблівалі...

Я сваю братавую хадзіла іскала. І сястра хадзіла іскала. Двое рабят... Там толькі ляжала адзежа параздзяватая. Мы сваіх пазнавалі... Я сваіх пляменнікаў адзежу пазнала. А людзі спалены былі. Дзе хто ляжаў. А потым іх закопвалі. Ну, прыдзеш, паглядзіш — спалены чалавек, і ўсё...

Як па падшчоту, то загінула тут сто дваццаць пяць чалавек. І радам вот дзярэўня, Кабыльнікі, там саўсём спалілі. Толькі два чалавекі, мужчыны, былі на фронце, засталіся. Да вайны Юзэфова бальшое было. А ўжо як пасля экспедыцыі вярнуліся, то адна баба ды двое рабят, а так усе не вярнуліся, усе пагіблі яны...»

## Чорныя віры памяці

...У вёску Каханавічы ўвайшлі партызаны і анямелі — грудных дзяцей распялі на парканах. Мароз скаваў маленькія ручкі, якія нібыта прасілі абараніць іх.

Сястра Аляксандры Мікалаеўны Белавусавай пазбавілася дзяцей за лічаныя хвіліны. Прасіла смерці і для сябе, але паліцай сказаў фашыстам: не страляйце, яна вам згадзіцца як жонка партызанскага камандзіра.

Скатаваную, абмарожаную, яе непрытомнай кінулі на калёсы. А праз дваццаць пяць гадоў яна пазнала таго паліцая. Як галоўнага сведку яе выклікалі на суд у Пскоў. Зараз жыве ў Рызе. І Аляксандра Мікалаеўна, адпраўляючы выздаравелай сястры пісьмы, наўмысна не падпісвае адрас, каб не зачапілася вока за прыгожую, а для яе жахлівую назву: Каханавічы.

...Рэгіна Аляксандраўна Анкіновіч з вёскі Лявонішана, якой тады было восем гадоў, расказвае:

— Знайшлі адзічэлую курыцу, кожную перынку ёй песцілі, каб хутчэй знесла яечка. А калі, яно, доўгачаканае, з'явілася, аднеслі дзяўчынцы, што ад тыфу канала...

Да дваццаці трох год двойчы на дзень мучылі яе прыступы малярыі. Цела ў шрамах было ад скулля. А вага ўсяго 24 кілаграмы. Сёння мае ўсё, акрамя здароўя — набыты парок сэрца, удушша. Ратуецца адно — рухам, не прызнае ні машын, ні аўтобуса — толькі пеша.

Маці Рэгіны Аляксандраўны Марфа Адамаўна Харчанка, адзіная з уцалелых дарослых з вёскі Юзэфова, ніяк не адважыцца сказаць першую фразу, рукі яе дрыжаць.

— Набілі нас поўную адрыну. А ў шчыліны бачым: на беразе Свольны ставяць у шарэнгі тых, каго ў лясах злавілі, з аўтаматаў правядуць — ды ў ледзяную ваду.

Дзетак з мацярынскіх рук вырываюць — і ў палонку жывымі. А ў кожнай жа па восем-дзевяць. Гáлас на беразе такі, што мароз па скуры. Задыхацца мы пачалі ў той адрыне. Немец нейкі «пашкадаваў», ваконца выбіў, а Рэня мая гэта па-свойму зразумела, па-дзіцячы. Крычыць: «Мамачка, пусці мяне, я пайду да таго дзядзі, можа, ён добры, можа, пацэліць у самае сэрца». Сціснула я яе ды загаласіла.

Марфа Адамаўна спяшаецца сказаць самае галоўнае, толькі дзве-тры фразы, а потым падступаюць слёзы, адно вочы просяць-моляць: не пытайцеся.

— Забівалі па сартыроўцы. Немаўлят — у палонку, жанчын ды падлетка ў — у агонь. Як абрынуўся дах падпаленай аборы насупраць, адразу сціхла галашэнне ў нашай — анямелі ад жаху. Убачылі суседзяў: скажоныя, абвугленыя твары; ужо мёртвыя, яны дагаралі стоячы — гэтулькі шмат іх туды напіхалі.

Развіталася я з дзеткамі, трое ў мой падол учапіліся. А тут немец на матацыкле прыехаў, нешта выкрыкнуў, і нас пачалі грузіць на падводы. Бачыла, як плылі па рацэ дзеці. Тых, хто спрабаваў выбрацца, расстрэльвалі.

Тысячы жыццяў забрала чорная рэчка за адзін дзень. Дзядзьку майго, Мікалая Валаткевіча, яго жонку Соф'ю, іх дачку Аню, унучак ад дачкі Веры Іду і Іну і іх сяброўку Ірачку, што прыехала пагасціць з Ленінграда, маю мачаху Ефрасінню Мікітаўну, яе маленькіх унукаў — Мішу, Клаву, Верачку...

І так захацелася жыць — жыватом, грудзямі, нагамі, рукамі, — каб хоць некаму расказаць потым, як нас палілі і забівалі.

А расказаць не магу. Прыехала пасля вайны з Ленінграда Вера. Ходзіць па бе-разе, кліча сваіх дзяўчынак, праклінае фашыстаў, а я і супакоіць не магу, адразу нямею.

Па ягады з ёй ды з сяброўкай маёй Валяй Свіржэўскай хадзіць баялася. Мужа і чацвярых дзетак Валі ў той жа дзень забілі. Васьмімесячнага Пратасіка на руках у яе застрэлілі, а яшчэ сямігадовую Марусю, пяцігадовую Лёлю ды маленькую Нюрачку. Старэйшы сын, Дзіма, яму 12 гадоў было, кажа: «Мамачка, я пабягу, на бягу адразу забіваюць», і пайшоў петлямі, за кусток ды ў лагчынку. Страчылі — па ім, ды суджана хлапчуку было выжыць. Выратаваўся. Толькі Валя нічога гэтага не ведала, нічога не бачыла. Была ўся ў крыві ад Пратасіка, і фашысты, скінуўшы яе ў яму і зрашэціўшы тых, што ляжалі поверху, чэргамі, не спадзяваліся, што нехта застанецца жывы.

А яна выжыла. Толькі скамянела. Маўчала дні і ночы. А па ягады пойдзем, то яна ўбачыць бярозкі, што побач растуць, абдыме іх ды давай цалаваць-гласіць, нібы пабачылася з сваім Пратасікам, Маруськаю, Лёляй ды Нюрачкай. Фельчар забараніў ёй у лес хадзіць, і яна з'ехала зусім туды, дзе лесу няма. У Мурманску ўладкавалася на карабель павара м. Ды нядоўга пражыла з выпаленай душой, з нязбыўнай памяццю. Гора высушыла.

Яно для матак, што засталіся без дзяцей, за ўсё страшней. Па вясне, як пачнецца крыгаход, прыходзілі жанчыны на бераг і кідалі ў ваду распашонкі. Я іх разумела — ніхто не знайшоў сваіх дзетак, каб пахаваць іх. Ці то Свольна ў Дзвіну вынесла, ці хто з людзей ніжэй вылавіў ды пахаваў безыменнымі.

...Хата Марыі Іванаўны Дашкевіч у Свіраўшчыне стаіць на ўзгорку над самай Свольнай, глядзіць сваімі вокнамі на чорную раку.

— Сонца яшчэ садзіцца, а я ўжо вокны зачыняю, не магу бачыць гэту ваду надвячоркам — крывавай становіцца. Два браты ў мяне загінулі, жонку сярэдняга, Нюру, утапілі з дзеткамі Сенем, Генем, Пашам ды Зіначкай — усе пагодкі былі, старэйшаму толькі чатыры гадочкі было. Не засталося на цэлым свеце ні крывіначкі. Навошта было жыць, скажыце, навошта?

...Скульптары, што праектавалі новы помнік на брацкай магіле ў калгасным цэнтры — Галубаве, пачуўшы расказ Марыі Іванаўны, адмовіліся ад першапачатковай задумы паставіць звычайны абеліск. Зараз на вясковай плошчы пад плакучымі вербамі вы ўбачыце сілуэт жанчыны, што апусцілася на калені і глядзіць ці то ў ваду, ці то ў бездань, дзе плывуць дзіцячыя распашонкі.

*Л. Ламсадзе,*
Советская Белоруссия,
22.7.1988

## Сведчаць відавочцы

**З успамінаў**
**Марыі Максімаўны Абуховіч, в. Вароны:**

Мой брат, Андрэй Уселенак, жыў у Расіцы. Аднойчы ў яго спыніліся партызаны. Пасадзіў ён іх палуднаваць, а сам да лазенкі, на варту. Немцы ж ішлі ў белых халатах, ён іх і не прыкмеціў. Паспеў крыкнуць, каб уцякалі, ды сам не ўратаваўся. На допыце фашысты адрэзалі Андрэю язык, вушы, нос, вочы выкалалі. Усё дазнаваліся пра партызан.

А жонку яго і сямёра дзяцей карнікі спалілі, калі першая карная экспедыцыя ішла. Так з сям'і і кораня не засталося.

**Марыя Данатаўна Грыбоўская, в. Каменцы, успамінае:**

У Каменцах зараз тры хаты стаяць. Сем удоў жыве. Адна бабка на зіму да дачкі з'язджае. Ушасцёра застаемся.

А было... Во... Мароз Марыя з 1918 года. Трымала кніжку пад пахай. Карнікі падумалі, што зброя — трах яе прыкладам. Яна яшчэ крыкнула: «Мама!» Яе зноў... А потым бацьку з маткай заставілі непрытомную дачку самім занесці і кінуць у агонь. Матка без памяці крычала. А пасля і іх забілі...

**Валянціна Васілеўна Пілюшына, в. Ліпаўкі, успамінае:**

З 96 двароў вёскі ў 42 дварах была радня. Я адна засталася з усяго роду.

...У тую ноч сабакі еліся, як не палопаліся. А ў 6 гадзін чуем стрэл. Карнікі па сігналу падняліся з засады. Усё скончылі да 11-ці. І на калені ставілі, і богу маліцца загадвалі. Пуня, ток і восець — адной будынінай стаялі. 178 чалавек там лягло, 25 толькі пакінулі. Было больш, ды прыходзіць фашыст і пытае ў жанчын, хто цяжарны. Нехта прызнаўся. Тады ён падыйшоў і пашчупаў, ці праўда. Ужо будыніна дагарала, дык гэтых жанчын у жар кінулі. Адзін нямецкі памагаты здзекваўся над маёй сяброўкай. А месяц жа назад прыходзіў з-за кардону, танцавалі разам.

А ў касцёле як было. Ад жанчын дзяцей адбіраюць і бабулькам аддаюць, каторых паліць выводзілі. А матка рве на сабе валасы, пена пойдзе з роту, то й памрэ зараз жа.

Там і ксёндз быў. Яму можна было ўратавацца, але ён узяў крыж, накінуў чорны шалік і пайшоў з людзьмі ў агонь.

**Аляксандр Сцяпанавіч Скрыпка, в. Расіца, успамінае:**

На тым баку ракі абора стаяла. Пётра Міцкевіч, а ён у касцёле на вежах схаваўся і трое сутак ляжаў там, расказваў, што з той аборы вырвалася жанчына і бегла, рукі разняўшы. А яе карнікі на штыкі падняліі ў агонь. А ў Забароўцах стаяла распяцце. Сагналі ўсіх да крыжа і загадалі: «Станавіцеся на калені і — маліцеся!» Паставілі людзей у рад і кулямётам перавялі.

**З успамінаў Аляксандра Мартынавіча Шаўрака**

— Калі пачалася вайна, я настаўнічаў у Сар'і. Разам з іншымі педагогамі адыходзіў на Усход. Дайшлі аж да Вязьмы, дзе паступіў у запасны полк. Некалькі дзён невядомы сяржант вёў нас да лініі фронту. Аднак трапілі пад нямецкія танкі. Выжыў цудам, бо схаваўся пад нейкі корч. Фронт, можа сказаць, прайшоў праз мяне. Многія нашы людзі паміралі ў цяжкіх муках, прасілі дабіць. Я з двума ўцалелымі таварышамі рушыў назад, дамоў. Як ішлі — не ведаю, але дабраліся на Сар'яншчыну.

Кінуўся да роднага дома — адтуль павінны былі быць эвакуіраваны жонка, дачка, цешча. Але тое, што чакала мяне, аказалася страшней за смерць. Усю маю сям'ю знішчылі фашысцкія каты. Людзей сагналі ў хлеў і падпалілі. У жонкі на руках была дачушка, якой споўнілася некалькі месяцаў. Калі жонку гналі ў агонь, яна спрабавала выратаваць дзіця — адкінула яго ўбок. Фашыст падняў маленькую

за ножкі, ударыў аб вугал, галоўка дзіцяці адляцела, а трупік быў кінуты ў агонь. Загінулі ўсе.

Я думаў, пазбаўлюся розуму. Жыццё было мне ўжо не патрэбна, і я рвануўся помсціць. Быў палітруком узвода, сакратаром падпольнага райкома камсамола, удзельнічаў у многіх партызанскіх аперацыях і баях. Але вось парадокс: лез заўсёды наперад, тысячу разоў змагаўся пад кулямі, а яны не бралі мяне. Таварышы гаварылі: шчаслівы, у кашулі нарадзіўся. А хіба мне патрэбна было тое шчасце?

Аднак лёс распарадзіўся так, што выжыў, пасля вайны працаваў у Чапаеўскай МТС, у міністэрстве нарыхтовак, нават старшынёй калгаса быў. Цяпер у мяне ёсць сям'я, дзеці, 8 унукаў. Але ад памяці няма выратавання: боль страты не дае мне спакою ўсё жыццё.

### З успамінаў Паўла Антонавіча Цалпана

Я быў сведкам жудасных зверстваў, што чынілі карнікі на Асвейшчыне. Калі мы з атрадам адваёўвалі свае вёскі, а дакладней тое, што ад іх засталося, партызаны сівелі ад відовішча страшных здзекаў над мірным насельніцтвам. Вось у вёсцы Ладэлева, што была на Сенькаўшчыне, зайшлі на папялішчы, а там — вялікая груда астанкаў спаленых зажыва людзей. Яны ляжалі высока, як дровы. У вёсцы Пустэльнікі ў падвале спаленага дома зноў — знявечаныя трупы. Прычым адна жанчына ляжала распятая, а вогнішча было раскладзена ў яе прама на жываце. Страшна расказваць пра такое, але гэта было. Знішчылі ўсё насельніцтва Асвейскага краю.

Трапіўшы ў гушчыню партызанскай барацьбы, фашысцкіх здзекаў, не раз рызыкуючы жыццём пад кулямі ворага, я таксама павінен быў загінуць. Але вось выжыў. Пэўна, каб засведчыць страшныя падзеі для патомкаў. Памятаю, як ля адной з вёсак параніла нашага камісара, а невядомы хлапчук схапіў яго аўтамат і прыкрываў партызан, каб даць ім магчымасць адысці. Успамінаю гэта і плачу: за наша жыццё заплачана крывёю дзяцей, старых, маці. Ці справядліва гэта?

## Куля на дваіх

### З успамінаў Валянціны Пятроўны Ліцвінавай, в. Каханавічы

«Успаміны! Цяжкія, жудасныя, не даюць мне пакою ні днём, ні ноччу. Бо цяпер, у светлы юбілей Вялікай Перамогі, разам з бязмежнай радасцю зноў усплыло былое. Усё ажыло, стаіць перад вачыма. Бачу таго немца, які цэліць мне ў галаву, бачу яго вочы, налітыя свінцом, бачу яго доўгую галаву, каску, бачу дула аўтамата. І... чую стрэл. Гэта быў другі зарад. Першым ён забіў дзяўчынку Раю. А я была наступнай дзяўчынкай, наступнай ахвярай. І мне немец цэліў у галаву. Куля трапіла ў твар, вылецела праз шчаку, парваўшы яе ў шматкі, і параніла плячо Маланні Марачкоўскай, што стаяла побач. Атрымалася куля адна на дваіх. Чула страшэнны плач, крыкі, стогны і... пякучы боль. А потым усё правалілася ў чорную бездань».



Сахонаўскі дуб /на месцы спаленай вёскі Сахонава/.

А было гэта ў трывожным 1944 годзе, калі азвярэлую фашысцкую арду гналі назад, у яе логава. Жыхары вёскі Ардаўскія і навакольных вёсак партызанскага краю яшчэ не адышлі ад жахаў карных аперацый, так і жылі ў зямлянках, хаваліся ў лясах.

Акрамя Валянціны, у сям'і было яшчэ трое дзяцей: два браты — адзін старэйшы за яе, другі — малодшы — і гадавалая сястрычка. Ды наляцелі карнікі ў час чацвёртай экспедыцыі, загналі людзей у балота. Валянціна пры першых стрэлах кінулася куды вочы глядзяць і выслізнула з аблавы. А бацька, малодшы брат і сястрычка так і засталіся ў балоце навечна. Параненая маці зубамі і адной рукой выцягнула з-пад мёртвых цел брата Пятра (потым налічылі на ім 17 ран).

Трэба было жыць. Ужо грукатаў паблізу фронт. І пакрыху спаўзаліся людзі на родныя папялішчы. Але большасць людзей усё ж заставалася ў лесе. Не рызыкнула вярнуцца і маці Валянціны Пятроўны. Цяжка паранены сын балансаваў на грані жыцця і смерці, сама аслабла ад раны. Уся надзея была на дачку.

І вось у той злашчасны надвячорак пайшла Валянціна Пятроўна з лесу ў Ардаўскія, каб змалоць крыху мукі (засталіся жорны ў адной з зямлянак) ды спячы пару хлябцоў. Колькі там сілы было ў галоднай і знямоглай дзяўчынкі... Напрацаваўшыся, забылася пад раніцу цяжкім сном і падхапілася ад стрэлаў. Група немцаў і паліцаяў сагнала ўсіх, каго знайшла, у адну зямлянку і расстраляла. А потым кінулі гранату. Гэта быў той момант, аб якім расказала вышэй Валянціна Пятроўна, гэта той жах і боль, якія не адпускаюць яе і сёння.

«Калі ачуняла, выпаўзла з разбітай зямлянкі. Уцалела яшчэ некалькі чалавек. Схаваліся ў лесе. Я раз-пораз губляла прытомнасць. Потым даведалася, што жыццё нам было падаравана Богам у той дзень двойчы, бо каты вярнуліся яшчэ раз і спалілі і трупы, і зямлянку агнямётам, каб замесці сляды. Як аказалася пазней, гэта была дыверсійная група, якая праса-чылася праз партызанскія пасты з Латвіі з мэтай знішчыць партызанскі аэрадром. Яго не знайшлі, дык з дзецьмі, старымі і жанчынамі расквіталіся.

Людзі звялі мяне з маці і братам, лячыць дапамагалі, ды не надта верылі, што выжыву. Такая страшная рана, ды ў галаву яшчэ. Але прырода родная, ардаўская, таксама лекі давала. Потым забралі нас партызаны, вось і выжыла. І фронт над намі шквалам пранёсся — уцалелі, і ад голаду не памерлі. Вярнуўся з фронту самы старэйшы брат, Мікалай, перавёз нас у Каханавічы.

Дарэчы, тады выратаваў нас латышскі атрад. І каня яны прывялі, і мукі далі, і ўсяляк клапаціліся. Усё гаварылі, што калі хто пакрыўдзіць, толькі скажыце... Вельмі душэўныя былі хлопцы».

**З успамінаў Ефрасінні Фёдараўны Чарнавок, в. Чарнавокі**

Хаваліся мы ў глухім балоце ля возера Дземя. Былі са мной сыны: Пеця, пяці год, і Іван, на два гады старэйшы. Змарнелі зусім. Вырашылі аднойчы рухацца... Толькі вылезлі, аж — немцы. Адзін з іх і гукае: «Аб, аб!» Мы і падаліся назад. Больш ужо не адважыліся высоўвацца. Сядзелі там паўтара месяца. Днём дождж ідзе, а ноччу мароз цісне — вясна ўжо ішла. Пеця хварэў на тыф, там і памёр, ляжаў побач з намі. А Іван раней перахварэў, але там ножку адмарозіў... Мне потым ужо казалі: не выжылі б, так доўга ў балоце седзячы. А таго не ўцямяць, што ў мяне ж вада была — балота ўсё-такі, а яшчэ трава першая вылазіла — чорнагалоўкай мы клічам, і была да яе ў мяне жменя солі... Паспрабавала аднойчы з балота выпаўзці. Сіл не было: падпаўзу ды ўпаду. Ішлі міма партызаны. Стала прасіць: дайце хоць кавалачак хлеба, а яны: «У нас НЗ. Ідзі ў зямлянкі». Дапаўзла. А на другі дзень Іван Амбросенак і Васіль Бекіс прынеслі з балота і сыноў маіх.

Два браты і муж загінулі на вайне, а з сынам Іванам і зараз жыву.

**...і Настассі Фёдараўны Папсуевіч, в. Лісна**

Вайна паразагнала нас па лясах ды балотах. Мы з маці і брацікам Колем у палон трапілі. Апынуліся ў Таболках. А я маці і кажу: уцяку, пайду Фросю шукаць. А там побач і партызаны былі, і кадравыя. Яны і жывёлу перагналі да партызан, і чыгунку ўзарвалі. Дамовіліся з імі, ды кінуліся цераз фронт. Бачу — маці дагоняе, і Коля з ёй. Падхапіў старую ваенны на сябе — і бягом. Ля Сямёнава натрапілі на немцаў, бой быў, але нас праважатыя загарнулі, не кінулі, давялі аж да Малавідаў. Адтуль дабраліся да сваіх лагераў і Фросю сваю знайшлі. Аж назаўтра зноў экспедыцыя наляцела. Як уцякалі мы, Іванка адмарожанай ножкай за бярозу зачапіўся — так ножка і адарвалася...

**З успамінаў Ганны Іванаўны Лось**

У лютым 43-га хаваліся мы ў Вялікім Імху, зямлянкі былі там пароблены. А каторыя за Свольнаю, тыя вярнуліся раней. Мы ж як прыйшлі, то на пажарышчах суседняй хаты знайшлі ў ямішчы 15 абгарэлых трупаў — і старыя, і дзеці. У мужчыны ў грудзі цвік быў загнаны... А ў свірне калгасным спалілі больш як 250 чалавек. Там зараз помнік стаіць. А на месцы хаты толькі бярозка расце. Яшчэ адна магілка — за рэчкаю. Там ляжаў чалавек, а на ім рама надзета аконная — напэўна з агню ўцякаў.

На партызан жа фашысты асаблівую злосць мелі. Неяк у засаду нашы хлопцы трапілі. Сямёна Бекіса разрыўной палажылі, а Макара Марачкоўскага доўга катавалі — руку адрэзалі, вочы выкалалі, закатавалі да смерці.

**...і Віктара Парфёнавіча Лася, в. Страдна**

У нас тут усю вайну нібы лінія фронту была: партызаны абарону ўздоўж Свольны трымалі. Чатыры карныя экспедыцыі пераседзелі мы ў лясах ды балотах. Партызаны латышскія стаялі тут лагерам каля Ніжняга маста ды ля Саханавага Моха, а мы яшчэ з восені 42-га ладзілі хованкі на Брызджалёўцы, між балот. Мне было год чатырнаццаць, брат яшчэ меншы. Заязджалі мы на калёсах, сляды маскіравалі, замяталі, ёлачкі садзілі, каб і знаку не было. Паліцай аднойчы ўзбіўся на нас, «пахваліў»: «О, ды вы тут нядрэнна ўладкаваліся!»

А ўладкаваліся мы па-ваеннаму. Міна ў мяне была, прымайстраваў да яе чаку, зброі наогул хапала. Рыхтаваліся, калі нападуць, падарваць сябе ў апошні момант, бо надта здзекваліся карнікі над людзьмі.

А зімой 43-га, ужо ў час другой экспедыцыі, чуем аднойчы страляніну, крыкі, сабачы брэх. Зусім побач, там, дзе лагер вёскі Міхаліна быў. Чулася адтуль: «Татачка, не кідай!» У дуброўскім жа лагеры было 4 сям'і.

Кінуліся мы ўцякаць па лясным ручаі — бузяная такая рачулка, — каб сабак са следу збіць. Топімся, выбіваемся з сіл. Урэшце завалiліся, восем пацаноў, пад вываранень, затаіліся. Вось ужо і ланцуг паліцаяў міма ідзе. Навёў я «адразанку», трымаю напагатове. Адзін паліцай заўважыў нас, паківаў галавою, маўляў, маўчы. Пайшлі яны далей, а мы зацяліся, думалі, вернуцца.

А ноччу ўдарыў мароз. Сярнічак у нас не было, сталі замярзаць. Вылезлі са хованкі і ўсю ноч да знямогі хадзілі па лесе, каб сагрэцца. Слабых ад тыфу неслі, яны трызнілі ў нас на руках.

Тыф касіў людзей, што сядзелі ў балотах. Сам я таксама пасля захварэў, і бацька мой памёр з тыфу, а сястрычку тыфозную забілі ля кастра. Добра ведаю таго паліцая, пасля вайны ён яшчэ жыў у Вялікім Сяле і дзесяці год не адседзеў...

Выбіліся тады да людзей на вогнішчы, але яны запалоханыя былі, пайшлі мы далей, ацалелі на той раз.

На Брызджалёўцы ёсць яшчэ магілы. І пад Малавідамі шмат людзей пабілі, і пад Ярохамі, і ў Макутах — па ўсіх тутэйшых лясах. Лесанарыхтоўшчыкі спляжылі

курганы, зраўнялі акопы. Зніклі тыя адмеціны, што вялі да іх. І лічу, што трэба дзесьці сярод лесу, напрыклад на Крыжоўцы, паставіць адзін агульны помнік і напісаць на ім, што ў гэтым лесе загінула ад рук карнікаў і пахавана больш за 1000 чалавек. За лічбу ручаюся, бо бачыў усё сваімі вачамі.

Там нямала ходзіць і ездзіць людзей. Хай ведаюць. Хай помняць!

## «Дзяўчынку ён забіў у галоўку...»

Сям'я ў нас была вялікая: бацька — інвалід другой групы пасля грамадзянскай вайны, брат, 1924 года нараджэння, пайшоў ў партызанскі атрад Сімацкага, маці і яшчэ пяцёра дзяцей. Хату нашу ў вёсцы Лісна немцы спалілі ў час бою з партызанамі, у агні загінула ўсё.

Каб не памерці з голаду, маці павяла нас у вёску Латыгава, дзе раней жыла яе маці, якую немцы спалілі. Братоўку з трыма дзецьмі і астатнімі жыхарамі вёскі Латыгава — усяго 14 сем'яў — фашысты расстралялі: выгналі на паляну, пастроілі ў рад і пабілі ўсіх з кулямёта. Жывымі засталіся толькі тры параненыя чалавекі, якія адпаўзлі ў лес. На наступны дзень немцы зноў прыйшлі, паскідалі трупы ў кучу, аблілі бензінам, запалілі, а потым завалілі дровамі.

У вёсцы Ардаўскія жылі дзве сястры маёй маці. Я і дзве мае сястрычкі ў лесе захварэлі на тыф. У лес прыйшла сястра маёй маці і сказала, каб мы ішлі ў вёску, а то памром ад тыфу, голаду і холаду. Прывяла нас маці ў вёску да сястры ў зямлянку.

У Ардаўскіх у той час знаходзіліся мясцовыя жыхары і чужыя бежанцы. Пераначавалі мы, а назаўтра раніцай вёску акружылі немцы. Прыйшлі і ў нашу зямлянку, крыкнулі «Хальт!», але ўбачылі, што мы хворыя, не можам ісці, і зноў запіхнулі ў зямлянку.

Потым увайшоў немец, які прыгнаў яшчэ людзей, стаў на выхадзе, выцягнуў пісталет і пачаў страляць. Адразу забіў сястру маёй маці Еўдакію, другую, Марыю, параніў: куля прайшла навылёт праз лёгкія. Дзяўчынку, што была на руках, забіў ў галоўку. Другую, Валю, параніў. Маю сястру параніў у нагу; мужчыну забіў.

Пачаўся крык, лямант. Немец, расстраляўшы ўсе патроны, падняў крысо шыняля, стаў зноў набіваць абойму. Раптам з'явіўся другі немец, схапіў гэтага за шынель і пацягнуў з зямлянкі. Дзве жанчыны і мая маці выйшлі за імі. Яны пачулі, як на рускай мове адзін сказаў, што будуць кідаць гранаты.

Я ляжала на нарах, калі прыбегла маці і сказала: «Дзеткі, хавайцеся, будуць кідаць гранаты». Сама прысела ля печкі. Я завалілася пад нары, і раптам выбух — праз акенца кінулі гранату на нары, а там было шмат падушак. Бацьку асколкамі пасекла шчаку і руку. Другую гранату ўкінулі ў комін. Печка і комін абрынуліся, многіх пасекла асколкамі.

Так і ляжалі. Першай ачуняла жанчына па прозвішчы Марачкоўская. Мяне аглушыла. Паспрабавала адпіхнуць нагой забітую жанчыну, якая ляжала наперадзе, але нічога не атрымалася. Гэтая Марачкоўская стала на цагліну, паглядзела ў дзірку ад коміна і сказала: «Немцы пайшлі ў напрамку Лісна, хавающца ў лесе, вылазьце, хто жывы».

Яна выцягнула з-пад цаглін маю маці, тая пачала шукаць дзяцей. Меншая сястра Надзя, браты Шура і Лёня засталіся жывыя. Выцягнула і мяне з-пад нараў. Яшчэ некалькі чалавек, у тым ліку і параненыя, падаліся ў лес.

Бацька паранены, сястра крывёй сплывае, п'ём у кожнай лужыне. Маці вярнулася назад у зямлянку, знайшла ручнік, перавязала сястру, бацьку. Завяла нас у лес, зноў вярнулася ў зямлянку, адцягнула забітую сястру, другую, параненую, перавяла ў іншую зямлянку. Пасля партызаны адправілі яе разам з параненай дзяўчынкай на самалёце за лінію фронту. У самалёце дзяўчынка памерла, а жанчыну потым вылечылі.

На наступны дзень зноў з'явіліся немцы, аблілі бензінам і гэтую зямлянку і

спалілі разам з забітымі і параненымі, якіх людзі не ўправіліся забраць.

А мы жылі ў лесе, зноў зрабілі зямлянку. Маці хадзіла ў вёску, даставала з ям збожжа, парыла на агні. Так і жылі да таго часу, пакуль не прыйшлі нашы. З якой радасцю мы іх сустракалі!

*М. Макеенак,* в. Лісна

## Гавораць былыя вязні

Суровы лёс напаткаў тых, хто застаўся жывым з вогненных вёсак Асвейшчыны. Ім была наканавана жудасная смерць — смерць у растэрміноўку. Асвейцы прайшлі попельныя кругі Саласпілса, Майданака, Асвенціма, Духау, Маўтхаўзена, Гузена, Равенсбрука... Нечалавечныя жахі і жудасныя выпрабаванні вытрымаць суджана было нямногім...

### З успамінаў Франца Іосіфавіча Лісоўскага, жыхара в. Масева

Кожны дзень катавалі людзей у нашым бараку. Было чутна, як стагналі людзі за занавескай і сварыліся каты. Асабліва збівалі мужчын, некаторыя з іх на другі ж дзень паміралі. Ляжыць на нарах — як быццам спіць, а ўжо мёртвы.

Над асобнымі жанчынамі здзекваліся інакш. Іх аднекуль прыносілі на насілках і скідвалі на нары.

У нас бралі кроў, але калі пачалі мы хварэць, перасталі. Потым акупанты адда-лі мяне працаваць на хутар. Пры падыходзе нашай арміі мяне жандары адвезлі ў Рыгу, каб параходам адправіць у Германію. З порта я ўцёк, хаваўся ў падвалах, пакуль не выбраўся з Рыгі ў лес, дзе дачакаўся прыходу нашых.

А маму замучылі ў Германіі. Пасля вайны ўдалося знайсці сястру Ніну: яна помніла сваё прозвішча і ведала, дзе жыла да вайны. А вось малодшага брата мы знайшлі на 23 годзе пасля Перамогі.

Сястры і мне асабліва вучыцца не давялося: вайна адняла ў нас маму і тату, і нам з ёю трэба было думаць, як пракарміцца, як апрануцца, бо родных і блізкіх таксама не было...

### З успамінаў Сямёна Сцяпанавіча Валадзёнка, жыхара в. Ярохі

З Асвеі нас гналі на станцыю Зілупэ. Канваіры крычалі: «Мы вас усіх прыкончым!» І сапраўды, пастараліся фашысты: з усёй маёй вялікай радні — чалавек 20 — я толькі з сястрой Аняй застаўся.

Вагоны былі набіты так, што двое сутак ехалі стоячы. Свае надабнасці людзі рабілі пад сябе...

Памятаю, як праходзіла ў бараку нейкая дзіўная камісія. Мы сядзелі голыя ў адным канцы барака, а ў другім канцы афіцэры аглядалі маладых дзяўчат. Нават праз павелічальнае шкло на іх з усіх бакоў глядзелі. Каторая прываблівала іх, адразу ж апраналі яе ў шоўкавае плацце. Потым, як паведаміў старшы барака, а ім быў палітзняволены латыш, дзяўчат адправілі на пакуты, на здзекі гітлераўскай салдатні.

### З успамінаў Наталлі Лемяшонак

Калі падышла мая чарга, доктар вырваў сястру Аню з маіх рук. Пры гэтым доктар уваткнуў мне ў руку іголку і, калі набраў поўную шкляную трубку, адпусціў мяне і стаў выбіраць кроў у маёй сястрычкі. Я стала крычаць і плакаць. Немец паглядзеў на нас і нешта сказаў, а салдат, які стаяў побач, рассмяяўся, сказаў паруску: «Господин врач говорит, чтобы не плакали: девочка всё равно умрёт, а так от неё хоть какая-то польза будет».

Потым праз дзень нас зноў павялі да доктара і зноў бралі кроў. У хуткасці Аня памерла. У нас усе рукі былі паколатыя. Кружылася галава. Кожны дзень паміралі хлопчыкі і дзяўчынкі.

*Па старонках кнігі Панізніка С. «Браніслава». Дакумент. аповесць. Мн., 1985.*

**З успамінаў Самусёнак Веры Іванаўны, жыхаркі в. Слабодка**

З дзецьмі рабілі так: у першую групу траплялі ад аднаго года да 5—6, у другую — ад 7 да 12—13. Мы з сястрой апынуліся ў другой групе. Потым з кожнай групы выдзялялі дзяцей па знешнім выглядзе. Тых, хто меў якія-небудзь бародаўкі, ранкі, болькі на целе, збіралі да кучы, а дзеці з чыстым цельцам траплялі ў асобную групу. З гэтых дзяцей якраз і высмоктвалі кроў для сваіх раненых фашысцкія дактары-нелюдзі. З гэтай групы нашых аднавяскоўцаў у жывых нікога не засталося.

**З успамінаў Марыі Харытонаўны Андрэевай, жыхаркі г. Верхнядзвінск**

Перад вайной у нас была вялікая сям'я — бацька, маці і шасцёра дзяцей, на год-два старэйшыя адзін за аднаго. Бацька адразу ж пайшоў на фронт, і больш мы яго не бачылі, склаў галаву ў баях за Радзіму. Дарослы брат Валодзя, калі раён акупіравалі фашысты, падаўся ў партызаны. А мы, пяцёра малых, засталіся з маці, гаравалі гора акупацыі. А ў кастрычніку 1943 года як сям'ю партызан нас схапілі і вывезлі ў лагер смерці Асвенцім. Вось там і знявечылі дзіцячыя ручкі злавеснай татуіроўкай вязняў. Пасля гэтай экзекуцыі двухгадовая сястрычка Зіначка памёрла на руках мамы. Мой нумар быў 65750-ы...

А неўзабаве нас разлучылі з мамай. І сёння чую адчайны яе плач і крык... Ад гэтага жаху ў брата Шурыка па ўсёй скуры выступілі вялікія чырвоныя плямы і адразу яго некуды звяла надзіральніца. Гэта цяпер ведаю, што спалілі хлопчыка ў газавай камеры, а тады з братамі — Федзем і Сашам — усё шукалі яго.

І вось, калі нас засталося трое, пачаліся вандраванні па дзіцячых лагерах. З Асвенціма перавезлі ў Патуліцу. Там захварэў самы малодшы — Саша. Яго таксама забралі (ён цудам застаўся ў жывых), а нас з Федзем перавезлі ў другі лагер, пад Лодзь. У гэтых лагерах у дзяцей бралі кроў... Вельмі страшна было першы раз, а потым прывыклі і нават не плакалі, можа, таму, што сілы былі на зыходзе...

Старэйшых дзяцей яшчэ ганялі на работу, на фермы, на палі баўэраў. Майго Федзю таксама, было яму тады 14 год. Брат, калі вяртаўся, прыносіў штосьці і мне, крошкі, зразумела, але якія яны былі салодкія!.. Дзякуючы гэтаму, можа, і засталіся тады ў жывых... Нават цяпер я не магу спакойна глядзець, калі раскідваюць хлеб. Ля нашага дома, на беразе ракі, іншы раз размяшчаюцца ўлетку аматары выпіць, набяруцца і пакідаюць і бутэлькі, і кавалкі хлеба. Грэх які... Заўсёды падбяру, няхай хоць жывёла з'есць, хлеб мне выратаваў жыццё.

...А потым не стала і Федзі, вывезлі з іншымі падлеткамі ў працоўны лагер. І засталася я адна, губляючы ў кожным лагеры па родным чалавеку. 23 сакавіка 1945 года нас вызваліла Савецкая Армія. Я гэта ведаю з дакументаў. А той момант не памятаю, бо выносілі салдаты на руках жывыя трупікі, шкілецікі, абцягнутыя скурай... Нічога не памятаю, бо амаль увесь час ужо спала... Гэта потым ужо расказалі мне, як што было. У жывых на той час заставалася ўсяго тры тысячы ледзь жывых дзяцей, а сотні тысяч загінулі. У Федзі, да прыкладу, быў нумар 158730-ы. Аказваецца, нас выратавалі рускія выхавацелі, якія, колькі маглі, цягалі дзяцей у нейкі роў... Фашыстам ужо не было калі шукаць прапаўшых. Спадзяюся, што Бог збярог людзей, што падаравалі нам другое жыццё...

Тых, хто ўцалеў, развезлі па дзіцячых дамах Беларусі, Расіі, Украіны. Я трапіла ў Кіеў. Толькі ў 1949 годзе знайшлі тут мяне родныя. З вялікай нашай сям'і засталіся ў жывых мама, тры браты — Саша, Федзя і Валодзя, што быў у партызанах.

## Трагедыя вёскі Прошкі

**З кн. У. Хазанскага «Спытайцеся ў бяроз...», Мн., 1971 г.**

Перад світанкам, яшчэ да сонца, у самым цэнтры Прошак прагрымела кароткая аўтаматная чарга. Па-асабліваму трывожна адгукнулася яна ў сэрцах людзей.

За вайну прошкаўцы да ўсяго прывыклі. І да стрэлаў, і да выбухаў бомбаў, і да

грукату гармат. Але яшчэ не было выпадку, каб стралялі перад самымі вокнамі. Ды і ноч сёння была не падобная на іншыя — гнятлівая, неспакойная. Напярэдадні ўвечары з Себежа ў вёску прыйшоў вялікі атрад эсэсаўцаў. Яны зрабілі вобыск у хатах, дапыталі некаторых жыхароў.

Выпытвалі ўсё пра партызан, пра месца іх размяшчэння, пра сувязі з імі. Нічога не выявіўшы і пра нівошта толкам не даведаўшыся, размясціліся на начлег.

Такое было ўпершыню. Першы раз за час акупацыі немцы рызыкнулі заначаваць у гэтай глухой лясной вёсцы.

Аніська пачула стрэлы праз сон. Прачнулася ад страху. Запытальна паглядзела ў вочы маці. Кінулася да вакна.

— Нічога, Аніська, не бойся. Відаць, немцы перад адыходам вырашылі папужаць нас, — сказала Палагея Антонаўна, жадаючы супакоіць дачку. Але яна не магла схаваць уласнага хвалявання ад яе.

У цэнтры вёскі, на скрыжаванні дзвюх вуліц, дзе, збіўшыся ў кучу, стаялі эсэсаўцы, з'явілася група вяскоўцаў з бліжэйшых хат. Некаторых падняліпроста з ложкаў. Вяртаючыся з допыту, шмат хто спуджана пазіраў у бок Аніськінай хаты.

Спачатку Аніська падумала, што гэта ёй проста здалося. Але, злавіўшы яшчэ некалькі пужліва-сумных позіркаў, насцярожылася. У сэрца пракралася незразумелая, нічым не растлумачальная трывога.

Няўжо здарылася нешта такое, што напрамую датычыцца іхняй сям'і? Магчыма, данос. Ці немцы даведаліся аб падпольнай камсамольскай арганізацыі? Не, не можа гэтага быць! Яна адышлася да акна, каб не прыцягваць да гэтага ўвагу маці і Валі, Рыгоравай жонкі. Узяла на рукі маленькага Валодзю, які ўжо не спаў і бесклапотна гуляў у сваёй люльцы.

Раптам нехта груба загрукацеў у дзверы. Як толькі Палагея Антонаўна адсунула засаўку, у хату ўварваліся некалькі эсэсаўцаў.

— Лукашонак? Эта жывут Лукашонак? — на ламанай рускай мове гучна запытаўся нямецкі афіцэр з шрамам над брывом.

— Так, тут, — ціха адказала Палагея Антонаўна.

— Бандыт! Бандыт усе! Выходзіт на уліцу! — крыкнуў немец. — Шнэль!

— Куды нас? За што?.. — з трывогай за дзіця спытала Валя.

— Шнэль! Шнэль! — накінуўся на яе афіцэр. Салдаты пачалі падштурхоўваць да выхаду астатніх. Аніська як трымала на руках маленькага Валодзю, так і выйшла з ім. Следам за ёй ідзе Валя. Яна ў лёгкім сарафане, без туфляў. Эсэсаўцы не дазволілі ёй нават апрануцца. Апошняй выходзіць Палагея Антонаўна. На ёй стары фартух, які яна не паспела скінуць у хаце.

Іх вядуць да скрыжавання, у самую гушчу карнікаў, туды, дзе нядаўна прагрымелі стрэлы.

Што ж там такое здарылася? Чаму так замірае сэрца ў Аніські, так пабялела Валя?..

Адбылося трагічнае, непапраўнае, тое, аб чым ніхто не мог і падумаць.

Ах, Рыгор, Рыгор, дзе ж падзелася твая асцярожнасць?

Куды?..

Вось як гэта здарылася.

Напярэдадні вечарам Рыгор на чале групы партызан накіраваўся ў разведку на тэрыторыю Латвіі. У вёску Красова, што за дзевяць кіламетраў ад Прошак, прыйшлі позна. Вырашылі тут адпачыць.

Прошкі былі якраз на шляху групы. Але Рыгору хацелася трапіць сюды параней, каб хоць трохі пабыць сярод сваіх, перадаць пісьмы і прывітанні партызанскім сем'ям. Раздабыўшы веласіпед, ён выехаў наперад, спадзеючыся дачакацца ў Прошках таварышаў.

Як ні ціснуў Рыгор на педалі, вузкія шыны веласіпеда з цяжкасцю адольвалі пясок, выбоістую лясную дарогу. Часта даводзілася злазіць і цягнуць машыну пад гару. Але стомы як не было. Бадзёрыла, надавала энергіі свежае перадсвітальнае паветра хваёвага бору, а яшчэ больш — чаканая сустрэча з роднымі. Як ён сумаваў па іх!

Хутка, цяпер ужо вельмі хутка прылашчыць Рыгор маленькага сыночка, яко-

га не бачыў ужо больш як месяц, абдыме жонку, маці, сястрычку. Раскажа пра камсамольцаў, якія разам з ім пайшлі ў атрад. Былыя падпольшчыкі сталі неблагімі партызанамі. Прымалі ўжо ўдзел у разведцы, засадах і іншых баявых аперацыях.

Добра паказалі сябе хлопцы і ў цяжкім баі пад Ліснам, калі давялося вытрымаць наступ пераўзыходзячых сіл карнікаў. Шкада толькі, што хлопцы не паспелі напісаць дадому нічога. Выезд быў нечаканы, і толькі некалькі слоў напісаў Юлі Паўлаўне Алексей Трафімаў — начальнік штаба атрада. Ды яшчэ партызан Аляксей Блінаў, з суседняй вёскі Гаўрыліна, перадаў маленькую запіску сваёй жонцы.

На раздарожжы Рыгор спыніўся. Прама ляжаў бальшак. Направа дарога ў вёску ішла паўз леснічоўку. Другі шлях — лесам — быў больш бяспечны, але даўжэйшы. Яшчэ з узлеску ён убачыў крайнюю хату Юлі. Калі на плоце ля хаты не вісіць прасціна, то яму нішто не пагражае.

Яе быццам не было.

А можа, прасціну схаваў туман?..

Ужо шмат разоў яна выручала партызанскіх сувязных і разведчыкаў, як і раней дапамагала лясным насельнікам. Але як ні ўспамінаў Рыгор, немцы яшчэ ніводнага разу не начавалі ў Прошках.

І ўсё ж, пад'язджаючы да развілкі, ён злез з веласіпеда і, перш чым вырашыць, па якой дарозе ехаць, паглядзеў наперад, прызадумаўшыся. Усё было як заўжды ў гэтым лясным краі. Шчэбетам птушак абуджаўся лес. Квакалі жабы ў балоце. Ранішні туман слаўся над зямлёй. Усё дыхала спакоем, было такім знаёмым, звыклым. Нішто не прадказвала небяспеку.

Рыгор рашуча сеў на веласіпед і паехаў прама па бальшаку. Паслухмяна і хутка каціліся колы па роўнай, добра наезджанай дарозе, мільгалі па баках прыдарожныя кусты.

Дзіўна створаны чалавек. Гадзіну таму ён праязджаў гэткімі ж палямі. І лес па краях быў падобны, хваёвы. Але такога хвалявання, такой палкай радасці ён не адчуваў. Тое было агульнае, нібы чужое. А тут ён упершыню спазнаў чароўную прыгажосць прыроды, нялёгкую працу земляроба, пакахаў. Тут быў ягоны дом, ад аднаго ўспаміну пра які салодка шчымела сэрца.

З туману пачалі вымалёўвацца першыя будыніны. Рыгор дужэй націснуў на педалі і, хутка даехаўшы да крыжавіны, рэзка звярнуў направа.

І тут адбылося непрадбачанае.

Веласіпедыст на поўным хаду ўехаў у самую гушчу эсэсаўцаў. Яны толькі што сабраліся, каб пакінуць вёску. Знялі пасты і шэрагаваліся на скрыжаванні вуліц.

Рыгор саскочыў з веласіпеда, схапіў гранату, што вісела на поясе, размахнуўся...

Прагрымела кароткая чарга, і ўсё было скончана.

Усё...

Нечаканае ўварванне партызана выклікала перапалох сярод карнікаў. Яны занялі абарону, зладзілі засаду на дарогах, якія вялі ў вёску.

Да месца здарэння выклікалі старасту.

— Хто гэты бандыт? Ён з вашай вёскі? — сярдзіта гледзячы ва ўпор, спытаўся афіцэр.

— Н-не, першы раз бачу, — ледзьве стрымліваючы хваляванне, адказаў Барыс Барысавіч.

— А ты прыгледзься. Мо ўсё-такі прызнаеш?

— Не, не ведаю. Не сустракаўся.

Афіцэр загадаў прывесці жыхароў з некаторых хат.

— Хто што ведае пра гэты бандыт? — зноў запытаўся ён.

— Не ведаем. Не тутэйшы ён. Незнаёмы, — адказваюць людзі. Карнікі абшукваюць забітага. З задняй кішэні штаноў вывальваецца даведка, якая замяняе пашпарт. Тая самая, якую ўдалося раздабыць ва ўправе, калі ён жыў у вёсцы.

Па-здрадніцку выпалі з бота і дзве кароткія запіскі.

— Таксама партызан, таксама бандыт! — накідваецца афіцэр на старасту.— Узяць!

І вось вядуць сям'ю Рыгора, Юлю

Паўлаўну. Толькі жонцы і дзецям Барыса Барысавіча Прошкі ды Юліным сынам удаецца непрыкметна знікнуць.

Аніська глядзела на нежывога Рыгора, і ў галаве яе прамільгнула: «На шырокай плошчы забівалі нас...»

Знешне спакойныя гэтыя людзі, якіх чакае самае страшнае. Усе яны ведалі, што ім будзе ў выпадку правалу, але ніколі ні словам не папракнулі тых, хто прымусіў іх рызыкаваць. Толькі Палагея Антонаўна і Валя не вытрымалі і загаласілі. Але не ад страху за сябе, а ад болю, які ім прычыніла смерць сына і мужа.

Ціснуць слёзы горла і ў Аніські, але яна стрымлівае сябе, не хоча паказаць сваёй слабасці перад ворагамі.

— Пашкадуйце хоць малых! — пачала прасіць эсэсаўцаў Палагея Антонаўна. — Адпусціце дачушку маю і ўнучка. Чым жа яны вінаватыя...

— Маўчаць! — крыкнуў афіцэр.

— Мама, не трэба, — мякка папрасіла Аніська. Ей было шкада маці. У вачах сілком прыведзеных сюды людзей не страх, а нянавісць. Яны адкрыта спачуваюць арыштаваным. Аніська ловіць падбадзёрваючы пагляд Жэні. Дзяўчынка вытрымлівае яго, не апускаючы галавы.

Шмат што хацела б сказаць Аніська гэтай дзяўчыне. Сказаць, што яна дзякуе ёй за давер і ганарыцца, што была разам з імі. І хай не сумняваецца. Яна вытрымае, захавае камсамольскую таямніцу. Шкада толькі, што не паспела напісаць клятву. Але ці ж яна не можа даць яе цяпер, у свой апошні час? Ці ж яе вытрымка — не клятва перад камсамольцамі?

З вёскі Гаўрыліна прывялі жонку партызана Блінава і яе бацьку. Але карнікі чакаюць яшчэ чагосьці, марудзяць з ад'ездам.

І раптам успыхвае факелам на краі вёска хата. Тая, што ля самых могілак. Амаль адначасова загараецца другая, суседняя. Яшчэ праз нейкі час палае ўжо трэцяя, на другім канцы Прошак. Гэта гараць падпаленыя эсэсаўцамі хаты Рыгора, Юлі Лукашонак і Барыса Барысавіча Прошкі.

Тужліва і доўга глядзіць Аніська на агонь, які хутка паглынуў іх дом. Кідае развітальны позірк на абпаленую таполю, што расце побач, на свае бярозкі.

І ідзе разам з арыштаванымі пад крыкі эсэсаўцаў па вуліцы. Апошні раз...

## Страшны юбілей

Дзень 14 жніўня 1943 года пакінуў жудасны след у памяці многіх юнакоў і дзяўчат 1925 года нараджэння — іх вывезлі на прымусовыя работы ў Германію.

Было цёпла, свяціла сонца, калі раніцай мы рухаліся на станцыю Боркавічы. Праводзілі нас сваякі са слязьмі на вачах. Ішла вайна, вельмі страшна было пакідаць родны дом і ехаць у краіну ворага рабамі. Нам было па 18 гадоў, але былі мы не тое, што сучасная моладзь: усе ціхія, сціплыя, скаваныя, нясмелыя.

Нас чакаў эшалон, ужо загружаны моладдзю з Дрысы і вёсак раёна. Пагрузілі ў вагоны-«цялятнікі» па 50 чалавек. На кожны вагон — два немцы з аўтаматамі. Страшна ўспомніць, які стаяў крык і плач, плакалі і мы, і нашы родныя.

Прывезлі ў Полацк і адразу кінулі ў лагер за калючы дрот. Сабралі моладзь з іншых раёнаў і 18 жніўня павезлі на захад праз Круляўшчызну. Ноччу эшалон абстралялі партызаны, хацелі вызваліць нас ад угону ў рабства. Але не ўдалося...

Пасля гэтага нас павезлі на Даўгаўпілс і далей у горад Данцыг (Гданьск). На біржы ўжо чакалі «купцы», пачаўся гандаль — каго куды.

Мы, 33 дзяўчыны з Луначарскага сельсавета, вырашылі трымацца разам. Былі сярод нас Валя Ясюкевіч, Ніна Кабылінская, Зоя Гладыш, Вера Антановіч, Галя Ганус, Люба Прышчапёнак, Галя Навумчык, Ніна Баршчова, Вера Росава, Іна Чыгак і іншыя.

Нас накіравалі на суднаверф. Спачатку

перакідвалі камяні з месца на месца, потым я працавала прыбіральшчыцай, у апошні час вучылі на слесараў.

Працавалі па 12 гадзін — з 7 раніцы да 7 вечара. Жылі ў бараках, у пакоі па 16 чалавек, спалі на двухпавярховых ложках. Кармілі вельмі дрэнна: адзін раз, у абед, давалі баланду, дзе часта плавалі чарвякі з агародніны. Раніцай і вечарам — так званая «кава». Як спявалася ў лагернай песні, «замест хлеба п'ю я каву і спяшаю на Шыхау» — так называлася фабрыка, дзе мы працавалі.

У пятніцу на тыдзень выдавалі адзін бохан хлеба з пілавіннем. Гэты хлеб мы адразу ж з'ядалі, а потым увесь тыдзень харчаваліся толькі баландой.

Адзін год і 7 месяцаў лагернага жыцця заўсёды былі галодныя. І марылі — прыехаць дадому і ўволю паесці хлеба і бульбы.

Пісьмы з Радзімы атрымлівалі вельмі рэдка. Прыйдзе каму-небудзь пісьмо, прачытае яго дзяўчына і плача. І тут жа плакалі ўсе разам, успаміналі Радзіму. Было вельмі тужліва, на душы лягчэй станавілася, калі спявалі савецкія песні. Вахцёр з пагрозамі прыбягаў, калі чуў.

Наш лагер быў інтэрнацыянальным: палякі, французы, балгары, галандцы, партугальцы, югаславы. Усе з нецярплівасцю чакалі вызвалення, толькі і гаварылі пра тое, дзе фронт. І не было межаў радасці, калі прыйшлі нашы. З якой гордасцю мы глядзелі на савецкіх салдат, вызваліцеляў ад рабства.

Адразу пасля вызвалення я працавала на санітарнай «лятучцы». Калі захварэла катаральнай жаўтухай (усё гэта пасля галадоўкі), мяне накіравалі ў эвакашпіталь у Польшчу на лячэнне, дзе я лячылася і працавала да канца кастрычніка 1945 года. Шпіталь потым расфарміраваўся, і я паехала на Радзіму. Вось тады ў мяне і нарадзілася думка стаць медсястрой.

...А роўна 50 гадоў назад мяне вывозілі ў рабства. Страшны юбілей.

*В. Ціханчык (Лукашонак),*
г. Верхнядзвінск

## Адысея хлопца з Расіцы

«Мне было 16 гадоў, калі за сувязь з партызанамі карнікі спалілі Расіцу. Усё памятаю да драбніц. Аднасяльчан заганялі ў будынкі па 50—70 чалавек і запальвалі хату або гумно. Людзі лезлі праз вокны, ламаліся ў дзверы, а фашысты стралялі з аўтаматаў і вінтовак. Ацалелых гналі на станцыю, кідалі ў вагоны, якія закручвалі калючым дротам. Без вады і яды адпраўлялі ў канцлагеры.

...У лагеры мы адразу ўбачылі звярыную сутнасць фашызму. Нас заганялі ў халодны барак па 400—500 чалавек: жанчын, дзяцей, падлеткаў. Распраналі нагола, вопратку забіралі, стрыглі валасы, аблівалі халоднай вадой. Потым голых пераганялі па снезе ў другі барак, дзе мы на гнілой саломе з маленькімі дзецьмі знаходзіліся каля двух тыдняў. Гаварылі, што гэта каранцін.

На дзень давалі 200 грамаў хлеба з пілавіннем і баланду, прыгатаваную з гнілой бульбы і капусных лістоў. А працавалі па 12—14 гадзін і болей. Насілкамі насілі пясок з аднаго месца на другое.

Праз паўтара месяца ад матак сталі адбіраць дзяцей. Жанчыны станавіліся чорнымі ад гора і мук за сваіх дзяцей, непрытомнелі. Гэта было страшэннае відовішча: дзіцёнак плача, крычыць: «Мама! Мамачка! Міленькая!» Здаецца, сэрца разрывалася ад пакутаў.

Так і ад маёй маці адабралі шасцігадовага сына. І мы яго знайшлі толькі праз 18 гадоў пасля вайны.

...Вечарам 28 красавіка 1943 года калону вязняў пасля работы падвялі да барака. Ля дзвярэй стаяла некалькі немцаў, у большасці афіцэры. Людзей па адным прапускалі ў барак. Афіцэр жа выбіраў якога-небудзь падлетка і адводзіў убок. І мяне за рукаў вывеў з калоны і спытаў па-рускі, колькі мне гадоў, ці здаровы, ці былі пераломы рук, ног. Потым скамандаваў:

«Падымі рукі... Паскачы!» Я апынуўся ў групе хлопцаў, сярод якіх ужо стаялі мае землякі Шаўрак Антон, Замбар Чэся, вучні Расіцкай школы Валодзя Завацкі, Валодзя Станевіч... Потым нас, чалавек дваццаць, падвялі да камендатуры, пасадзілі ў крыты грузавік... Хвілін сорак мы ехалі за горад. На беразе Кішвозера стаяла 4—5 невялікіх будынкаў. У адным з іх нас і пасялілі... Штодзённа прыбаўлялася па 2—3 чалавекі, пакуль не стала 37. Гэта былі хлопцы ў асноўным з-пад Асвеі, Сар'і, Каханавіч, Расіцы, Себежа.

І вось аднойчы пад'ехала накрытая брызентам машына. Сталі разгружаць. Бачым — нямецкая уніформа. Нават ёсць чаравікі невялікіх памераў. Пагаворвалі, што з нас хочуць зрабіць паліцаяў, ды мы не верылі... А тут загадалі памыцца і пераапрануцца ў нямецкую форму. Хлопцы адразу сталі панурымі, перасталі паміж сабой размаўляць, некаторыя нават плакалі па начах. Мы зразумелі, якую пастку паставілі нам фашысты: нашы маткі і сёстры ў лагерах, вёскі папалены, старых, дзяцей яны пакідалі ў агонь, а нас прымушаюць служыць ім.

І вось мінула тры-чатыры дні, і нехта збег. Не памятаю, як прозвішча, але праз некалькі дзён яго злавілі ў Рызе, прывезлі назад і пасадзілі ў склеп. Праз дзесяць сутак нас усіх пастроілі, вывелі ўцекача і немец па-руску зачытаў прысуд ваеннага трыбунала: за дэзерцірства — расстрэл. А потым звярнуўся да нас:

— Хто хоча расстраляць мярзотніка — выйсці са строю!

Усе мы стаялі так ціхутка, што чутно было, як праляцела муха. Канешне, ніхто не выйшаў. Свой загад немец паўтарыў тры разы. Ніхто не згадзіўся. Тады немец дазволіў уцекачу стаць у строй, сказаўшы, што сябры яго шкадуюць і яму даравана жыццё.

Але праз дзён дзесяць збег яшчэ адзін хлопец. Ён быў злоўлены, і немцы на гэты раз не выкідвалі жарцікі. Зачыталі прысуд і павялі на расстрэл. Ён ад канвойных пусціўся наўцёкі, але да лесу не дабег: скасіла аўтаматная чарга...

25 жніўня 1943 года нам выдалі нямецкія вінтоўкі, але без патронаў, у Рызе пасадзілі ў вагон і некуды павезлі.

...Спачатку каманда апынулася ў горадзе Порхаве на Пскоўшчыне, а потым у вёсцы Запалянне, што між Порхавам і Дном. Там у звычайнай пуні, абнесенай дротам, немцы размясцілі лагер, дзе знаходзілася каля 200 чалавек. Немцаў, відаць, адправілі на фронт. Несці ахову лагера павінна была цяпер саласпілская каманда.

Падпольная група ўвесь час імкнулася наладзіць сувязь з партызанамі. Гэта ўдалося зрабіць у другой палове верасня 1943 года. У ноч на 25 верасня павінна было адбыцца паўстанне. Меркавалася, што на дапамогу падыдуць партызаны.

Мяне прызначылі ў групу суправаджэння, выводзіць вязняў праз дрот. І вось да паўночы застаецца 20 мінут. 20 мінут да сігналу. Раптам з боку шашы паказалася калона машын. Едзе проста на Запалянне. Думалі, што, як і звычайна, немцы кіруюцца на фронт. Але на вялікай хуткасці машыны пад'язджаюць да лагера, з іх выскокваюць немцы. У момант акружылі лагер, паставілі наўкруг станковыя кулямёты. Нас абяззброілі і загналі ў лагер. Хлопцы зразумелі: здрада...

Раніцой пачаліся допыты з катаваннямі. Калі немцы нічога не дабіліся, сталі выклікаць тых, хто ноччу быў на пастах.

Пад канвоем іх выводзілі ў лес за дом каменданта, распраналі дагала і расстрэльвалі, скідваючы трупы ў старую траншэю. Антон Шаўрак пераскочыў траншэю і кінуўся ў кусты. Па ім ударылі з аўтаматаў і кулямётаў у нагу. Прывалаклі да траншэі і сталі дабіваць прыкладамі. За ўсім гэтым назіралі з лагера саласпілскія хлопцы і чакалі сваёй чаргі. Але расстралялі толькі 18 чалавек, астатніх пагналі ў Порхаў катаваць. А ўсіх вязняў Запалянскага лагера вывезлі ў Саласпілс.

...У Запалянні загінулі Піваваранак Антон і яго брат Валодзя, Чэся Замбар, Антон Шаўрак, Пілецкі, Крук, Пацалуенак Коля і многія іншыя, чые прозвішчы ўжо не магу ўспомніць. У Маўтхаўзене

памерлі Станевіч Валодзя і Валодзя Завацкі. А жывымі пасля ўсіх блуканняў па пакутах засталіся я, Коля Канашонак з Верхнядзвінскага раёна і яшчэ адзін чалавек з Асвейшчыны».

...Васемнаццаты год ішоў Пятру Іосіфавічу Уселенку, калі расчыніліся вароты лагера і паветра волі ўдыхнулі былыя вязні. Ад Гузена да Лінца ў Аўстрыі — 18 кіламетраў. Ён дзе ішоў, дзе поўз на каленях. Не было сілы, не трымалі ногі. Вагой ён быў усяго 28 кілаграмаў.

...Амаль што разам вярнуліся з вызваленай Еўропы сын і маці. Эмілія Рыгораўна прайшла пакуты Саласпілса, Майданака, Асвенціма. Адно засмучала: няма другога сына, Іосіфа. Толькі дванаццаты пошук аказаўся шчаслівым. Бо шукалі Уселенку, а брат Пятра быў названы Язэпам Язэпавічам Усельніксам. У Салапілсе ў яго высмакталі кроў і выкінулі амаль напаўжывога. Нейкі латыш падабраў дзіцянё і выратаваў. І толькі праз 18 год пасля вайны сустрэліся родныя.

*Сяргей Панізнік*

## Праклён

У сакавіку 1943-га немцы ўварваліся ў вёску Ганчарова. Крычалі жанчыны, дзеці, гітлераўцы хапалі ўсіх без разбору, хто спрабаваў вырвацца — расстрэльвалі на месцы. Схапілі і Паўла Харчанку, яго жонку Васіліну паранілі ў руку, дзвюх дачок — Соф'ю і Любу з маленькімі дзецьмі, родную сястру Паўла Марыю.

Сыны Паўла, трынаццацігадовыя Пеця і Міша, кінуліся наўцёкі, хаця выратавацца, бадай, было немагчыма. І ўсё ж хлопчыкі пабеглі да ракі, а потым па даволі слабым лёдзе. Немцы штосьці загергаталі і адкрылі агонь з аўтаматаў. У агульнай жахлівай мітусні ніхто не заўважыў, што сталася з хлопцамі, толькі бацька паспеў убачыць, як пад нагамі Пеці праламаўся лёд і ён шухнуў у ваду. Ці здолеў выбрацца Пеця, ці ўцалеў Міша — бацьку ўжо не суджана было даведацца.

Усіх схопленых немцы пагналі ў Бажкі. Фашысты адабралі старых і аслабелых, загналі ў хлеў, закалацілі дзверы, аблілі газай і запалілі. Назаўсёды засталіся ў памяці ўцалелых невыносныя стогны і крыкі, якія даносіліся з хлява.

У Саласпілсе ў жанчын пачалі адбіраць дзяцей. Папаўзлі чуткі, што ў малых бяруць кроў для нямецкіх шпіталяў. Бедныя маці трацілі розум, не ў сілах перанесці невыносны боль.

...У Соф'і Харчанкі выхапілі з рук дачку Галю, якой было крыху больш за месяц, і дзевяцімесячнага сына Георгія. Маці спрабавала супраціўляцца. Раз'юшаны немец з усёй сілы ўдарыў яе прыкладам, выкінуў у суседні пакой і зачыніў дзверы.

Некаторы час Соф'я ляжала непрытомная. Калі прыйшла ў сябе, кінулася да дзвярэй.

...Яе дачка, яе маленькая Галя была ўжо мёртвая, а з сына каты выцягвалі шпрыц. Ухмыляючыся, немцы аддалі хлопчыка маці. Ён пазнаў яе, хацеў працягнуць ручкі, і тут вочкі закаціліся, і маленькае цельца выцягнулася на руках у маці.

У Любы Харчанкі адабралі трохмесячнага сына. Знайшла яна яго ўжо нежывога ў грудзе брудных лахманоў.

Потым быў Майданак. Працавалі ад цямна да цямна, паміралі прама на хаду. Памёр і Павел Харчанка.

Каб не памерці з голаду, елі ўсё, што траплялася пад руку. Збіралі ў сажалках жаб, п'явак, варылі ў бляшанках. Назіральніца аднойчы заўважыла за гэтым заняткам сястру Паўла Харчанкі Марыю і яе сяброўку, палонную французжанку, і да смерці збіла іх палкай. ...Вярнуліся дадому Соф'я і Люба, жывуць зараз у вёсцы Вусце. А што ж Пеця і Міша? Лёс ахоўвае смелых. Не патануў Пеця, здолеў выбрацца на лёд. Не зачапіла яго і нямецкая куля. Вось толькі полы кажуха, які ён наспех накінуў, былі ўсе ў дзірках. Выратаваўся і Міша, а пасля хлопцы знайшлі партызан.

*І. Тумашэвіч*, г. Верхнядзвінск

## Прывітанне Радзіме

**З ліста А.К. Буткевіч**

2 чэрвеня 1945 г.

Добры дзень, дарагія таварышы!

Гэты ліст я пішу ўжо пасля вызвалення з фашысцкіх кіпцюроў.

Мой муж да вайны працаваў дырэктарам Дрысенскага льнозавода. На пачатку вайны ён быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Я з дваіма дзецьмі і 60-гадовай маці была вывезена ў Саласпілс. Там у мяне адабралі дзяцей. Сама ж я пасля селекцыі трапіла ў лагер смерці Майданак, куды звозілі для знішчэння людзей з многіх краін.

Праклятыя нямецкія вылюдкі катавалі зняволеных, як толькі маглі. Нас шыхтавалі ў калоны і па чарзе білі гумавымі палкамі. За нязначную правіннасць давалі 150 палак. Мала хто пераносіў гэта, а калі вязень і заставаўся жывым, то пазваночнік у яго быў пашкоджаны.

Ставілі распранутых і босых на снег, прывязвалі да слупоў і не адвязвалі, пакуль яны не паміралі. Калі нехта з лагера ўцякаў, то нас «дзесяткавалі»: з калоны кожнага дзесятага бралі для знішчэння. На вачах ва ўсіх іх вешалі, збівалі палкамі, падвешвалі за рукі ці за ногі.

Яшчэ прымушалі нас бегаць на пэўную адлегласць. Як хто не прабягаў норму за адведзены час, той трапляў у газавую камеру. Палілі ў Майданаку людзей у печах-крэматорыях ці проста ў ямах. Гэтыя заводы смерці працавалі дзень і ноч, штодзень знішчаліся тысячы людзей.

Толькі з Дрысенскага раёна сюды разам са мной было прывезена 1250 мужчын і 1200 жанчын. Засталося ў жывых 150 чалавек.

З набліжэннем фронту да Любліна тых, каго людаеды не паспелі знішчыць, у іх ліку і мяне, накіравалі ў Равенсбрук. Лагер гэты быў акружаны вадой, высокай драцянай агароджай, па якой быў прапушчаны ток. Равенсбрук вызначаўся варварскімі адносінамі да вязняў. Метадаў знішчэння было шмат. Бралі ў зняволеных апошнюю кроў, выпілоўвалі косці, зразалі скуру. І ўсё гэта рабілася без наркозу. Блокі, дзе рабілі такія аперацыі, называлі блокамі трусоў.

З Равенсбрука мяне перавезлі ў Лейпцыг, адтуль у хуткім часе нас пагналі далей у тыл. Ішлі мы 15 дзён, крочылі амаль без адпачынку. Есці не давалі нічога, спалі мы на голай зямлі. Дарогі, па якіх нас гналі, былі засеяны трупамі.

28 красавіка 1945 года наша Армія вызваліла нас за ракой Эльба. Не перадаць тую радасць, калі мы ўбачылі сваіх байцоў і афіцэраў з ордэнамі і медалямі на грудзях. Нас адразу ж накармілі, апранулі, аказалі медыцынскую дапамогу. Тады толькі мы сталі падобныя да людзей.

Я працую пры воінскай часці. Думка ў мяне адна — як хутчэй вярнуцца на радзіму, даведацца пра сваю сям'ю, дзяцей. Байцы кажуць, што ў Латвіі вызвалена частка дзіцячых лагераў. Цешу сябе надзеяй, што і мае дзеці таксама жывыя.

Са мной тут працуюць з Дрысенскага раёна Бажэна Браніслава, Варановіч Валя і Геня, Сардыка Вольга, Казлова Ганна, Варша Ганна, Качан Ірына... Мы знаходзімся паблізу ракі Эльба.

## Прарыў

У пачатку красавіка 1944 года гітлераўскія акупацыйныя ўлады, імкнучыся забяспечыць надзейны тыл сваім адступаючым франтавым часцям, распачалі чарговую карную экспедыцыю супраць партызан Асвейскай зоны. Фашысты і паліцаі акружылі даволі вялікі лясны масіў, у якім дыслакаваліся фарміраванні народных мсціўцаў, хавалася ад немцаў шмат цывільнага насельніцтва. Прысутнасць жанчын, дзяцей і старых у раёне баявых дзеянняў абмяжоўвала манеўранасць ат-

радаў, але ж нельга было пакінуць безабаронных людзей на расправу карнікам...

У адным з начных баёў наш атрад згубіў сувязь з асноўнымі сіламі брыгады. Самастойна выйшлі да вёскі Юхавічы, што на Расоншчыне, і тут наткнуліся на варожы заслон. Прабіцца не ўдалося. Пад вечар пачулі гукі бою ў сваім тыле. Праз некаторы час высветлілася, што гэта адбіваліся ад фашыстаў адыходзячыя 1-я Дрысенская партызанская брыгада і група франтавых разведчыкаў капітана Сергіенкі. Разам з імі ішло шмат цывільных. Змучаныя, галодныя, мокрыя (вогнішчаў не палілі) людзі з трывогай і надзеяй паглядалі на партызан...

Камандзіры сабраліся параіцца. Рашылі пад покрывам ночы прарваць кола акружэння. Як толькі сцямнела, 11 штурмавых ударных груп пайшлі на прарыў, адразу ж за імі — астатнія партызаны і мірнае насельніцтва. Ад шквальнага агню з усіх відаў зброі ў лесе стала светла нібы днём. Грымела шматгалосае «Ура!».

Я ўдзельнічаў у многіх баях, але падобнага бачыць не даводзілася: у адзіным імкненні беглі насустрач фашысцкім кулям сотні людзей, і спыніць іх магла толькі смерць. Усё жыццё буду памятаць хлопчыка гадоў дзесяці, які так моцна крычаў «Ура!», што яго звонкі дзіцячы голас гучаў асобнай нотай у грознай сімфоніі бітвы.

Начная атака закончылася поўным поспехам. Пры мінімальных стратах мы выйшлі з акружэння, захавалі свае сілы для далейшай барацьбы з акупантамі і выратавалі ад смерці шмат цывільнага насельніцтва.

*М. Шыпіла,*
былы начальнік штаба імя Сімацкага
Асвейскай партызанскай брыгады
імя Фрунзе

## Яго ведаюць усе

...Бадай, самае пашыранае прозвішча ў Антонаве — Урбан. Да вайны ў вёсцы было 26 Урбанаў, 12 з іх загінулі.

Пасля адступлення Чырвонай Арміі ў 1941 годзе Міша і Жэня Урбаны пачалі збіраць пакінутую на месцы баёў зброю. Накапілі значны «арсенал»: два ручныя кулямёты, больш як дзесяць вінтовак, скрынкі з патронамі, гранаты. Хавалі зброю на лазні.

Былы акружэнец, афіцэр Чырвонай Арміі Свіржэўскі, якому хлопцы паказалі зброю, параіў схаваць яе ў лесе. Міша і Жэня занеслі свой «арсенал» у лес і зрабілі там некалькі стрэлаў з кулямёта. Хтосьці заўважыў іх і данёс немцам. Хлопцаў схапілі і даставілі ў гарнізон, які ахоўваў Беніслаўскі мост.

Некалькі сутак арыштаваных не кармілі, збівалі гумавымі шлангамі, напоўненымі пяском, але хлопцы маўчалі. Калі іх вялі да каменданта на допыт, Міша ўспомніў, як перад вайной ён зрабіў самапал, а потым закінуў яго ў сажалку. Хісткая, але ўсё ж зачэпка...

Немцы прымусілі іх лезці ў сажалку і шукаць самапал. На шчасце, хлопцам удалося знайсці сваю заржаўленую «зброю», і толькі тады немцы адпусцілі іх.

«Арсенал», схаваны ў лесе, хутка перайшоў у рукі партызан, а Міша і Жэня атрымалі першае баявое заданне: хадзіць на работу да Беніслаўскага моста, назіраць за ўсім, выяўляць агнявыя кропкі, вызначаць колькасць салдат аховы, а вечарам паведамляць аб гэтым партызанам.

У жніўні 1942 года народныя мсціўцы разграмілі нямецкі гарнізон і ўзарвалі мост цераз Дрысу.

Партызаны па заслугах ацанілі кемлівасць, добрую зрокавую памяць і смеласць Мішы і Жэні пры падрыхтоўцы аперацыі.

Дамоў хлопцы не вярнуліся, яны сталі разведчыкамі-падрыўнікамі. Шэсць эшалонаў было пушчана пад адхон з іх удзелам.

Аднойчы Жэня і Міша вярталіся з задання. Заехалі ўжо на партызанскую тэрыторыю, асцерагацца, здавалася, не

было чаго. Жэня пакінуў свой аўтамат на санях, крочылі, размаўлялі. Раптам з-за дрэва выскачылі некалькі фашыстаў і накінуліся на Жэню. Той вывернуўся і пабег у лес, а кажушок застаўся ў руках у немцаў. Міша даў чаргу з аўтамата па ворагу і таксама кінуўся ў лес.

Выпадак паслужыў хлопцам добрым урокам і ў той жа час навёў іх на цікавую ідэю. Хлопцы паклалі ў сані замініраваны снарад, паверх кажушок і няспраўны аўтамат. Пусцілі каня ў нейтральную зону, а самі прабіраліся па лесе. Немцы заўважылі каня, падышлі да саней, адзін схапіў аўтамат. Раздаўся выбух. Партызанскі «падарунак» знайшоў адрасата.

4 снежня 1943 года Міша і Жэня вырашылі ўзарваць чыгуначнае палатно ля Беніслаўскага моста. Залажылі самаробную міну, аднак у момант праходжання нямецкага эшалона яна не ўзарвалася.

Хлопцы вырашылі праверыць, у чым справа. Жэня падняўся на насып, Міша з аўтаматам прыкрываў яго. Яркая ўспышка асляпіла Мішу, і ён адчуў, што правальваецца ў нейкую бездань.

Ачуняўшы, ён зразумеў, што здарылася: Жэня наступіў на нямецкую міну. З боку моста данесліся стрэлы і брэх аўчарак. Міша з апошніх сіл цягнуў цела сябра ад чыгункі. Немцы адкрылі агонь з браняпоезда і дзотаў. Юнак быў некалькі разоў паранены. Не маючы больш сіл, Міша прыкрыў цела сябра ламаччам, а сам, хістаючыся, пайшоў далей.

Сілы пакідалі Мішу, ён зноў страціў прытомнасць. Немцы знайшлі яго па крывавым следзе на зямлі, кінулі партызана ў кузаў грузавіка і адвезлі ў лагер ваеннапалонных у Баравуху.

Камендант лагера загадаў вылечыць юнака, каб потым дапытаць і расстраляць. Выратавалі Мішу савецкія ўрачы, такія ж ваеннапалонныя, як і ён. Неяк ноччу на месца, дзе ляжаў Міша, яны паклалі памерлага, немцы падмены не заўважылі.

Так малады партызан стаў звычайным вязнем, але палёгкі гэта не прынесла. Міша нічога не бачыў, ледзь мог рухацца. Калі наша армія падышла да Віцебска, яго разам з іншымі палоннымі немцы адправілі ў лагер смерці Кагенштэйн ва Усходняй Прусіі.

Пасля вызвалення хлопца накіравалі ў шпіталь на Урал. Урачам удалося выратаваць жыццё юнака, а вось вярнуць зрок яны не змаглі.

Толькі ў 1946 годзе Міхаіл Сяргеевіч Урбан вярнуўся дадому. Уявіце сабе яго адчуванне, калі яму зачыталі пахавальную, якую бацькі атрымалі яшчэ ў сорак чацвёртым.

Трэба было жыць, нягледзячы на трынаццаць ран, нягледзячы на слепату. І ён жыў. Разам з жонкай Нінай Антонаўнай вырасцілі двух дзяцей, доўгі час выхоўвалі пляменніцу.

*Р. Урбан*

## Дакументы сведчаць

**Акт раённай камісіі аб выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі раёна**

**г. Дрыса 6 красавіка 1945 г.**

Районная комиссия в составе: председателя комиссии полковника Захарова, членов комиссии: председателя Дриссенского райсовета депутатов трудящихся Хадкевича, капитана госбезопасности Голикова, капитана Кузьмина, старшего лейтенанта госбезопасности Жарова, заведующего Дриссенским райздравотделом Темахова, священника Дриссенского собора Суходольского Ивана Николаевича, представителей общественных организаций и учреждений Гардей и Нетецкой, по расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков и их сообщников, совершенных над советскими гражданами на территории Дриссенского района Полоцкой области в период его оккупации.

На основе документальных данных, свидетельских показаний и заявлений граждан комиссия установила:

Дриссенский район Полоцкой области был оккупирован немецкими войсками 13 июля 1941 года и освобожден 13—18 июля 1944 года.

За время оккупации района немцы планомерно и методично проводили истребление советских граждан и угон на каторжные работы в Германию.

Всего за период оккупации немцами было расстреляно, замучено, сожжено и повешено 6584 человека. Угнано на каторжные работы в Германию свыше 8000 человек. Таким образом из 42 062 человек, насчитывавшихся до войны, в настоящее время осталось 22 016 человек.

В феврале месяце 1942 года в г. Дрисса в специальном лагере было собрано 769 человек еврейского населения, после пыток и издевательств все они вместе с детьми были согнаны на еврейское кладбище, где группами по 10—15 человек заводили в заранее подготовленную яму размером 20х4 метра и расстреливали из автоматов и пулеметов. Детей, бросая в яму живьем, расстреливали на лету. Раненых и недобитых живыми засыпали песком.

Всего по г. Дрисса расстреляно 1165 человек советских граждан.

В феврале 1943 года карательная экспедиция немцев и латышей в составе 315, 316, 317, 318 латышских батальонов и полка «Вейрмаг» собрала мирное население местечка Росица и окружающих деревень в количестве 2500 человек, которых закрыли в 4 колхозных сараях и нескольких домах и заживо сожгли.

Всего по Росицкому сельсовету расстреляно, сожжено и замучено 3012 человек.

В феврале месяце 1942 года в местечке Волынцы немцы расстреляли 84 человека еврейского населения.

В дер. Бузово Каркалецкого сельсовета в феврале 1943 года немецко-латышский карательный отряд собрал мирное население в сарай и заживо сожгли 240 человек.

В дер. Шабалы этого же сельсовета немцы бросили в колодезь гражданку Цыро Анну с ее малолетним ребенком.

17 февраля 1940 года в дер. Нарковичи Луначарского с/совета немцы зверски замучили гражданина Лесничего Михаила Павловича, которому на глазах у его жены и детей жгли зажигалкой пятки, прострелили руку, срезали уши, нанесли 12 кинжальных ран, затем увезли на кладбище и добили насмерть.

В феврале месяце 1943 года в дер. Прудинки немцами были арестованы 14 человек мирных советских граждан, которые были подвергнуты зверским пыткам и издевательствам, вначале, в дер. Прудинки, а затем в г. Дрисса. Акушерке Буевич Анастасии сломали руки, учителю Терешенок пробили череп, лица у всех арестованных были изуродованы до неузнаваемости. Через несколько дней все четыре человека были расстреляны.

В 1944 году в г. Дрисса в карцере СД немцами был зверски замучен советский патриот Ясюкевич Андрей, которому были вывернуты руки, отрезаны уши, затем Ясюкевич был подвешен за половой орган и умер.

В этом же году в г. Дрисса в застенках СД была зверски замучена молодая советская патриотка зубной врач Тамара Пищуленок, которая несколько раз подвешивалась за руки и подвергалась избиению до потери сознания.

В феврале 1943 года в дер. Скорода Борковичского с/совета немцы, производя расправу с местным населением, нашли спрятавшуюся в сарае 14-летнюю девочку Буденко Алису, над которой учинили зверскую расправу: поломали руки, отрезали пальцы и уши, выбили челюсть, а затем в упор расстреляли из пистолета.

В мае месяце 1944 года карательная экспедиция немцев в дер. Рудня Юзефовского с/совета расстреляла 80 человек мирных жителей и несколько человек было закопано в ямы живыми.

В январе 1944 года в дер. Юзефово немцы расстреляли и потопили в реке Свольно более 300 человек ни в чем не повинных советских граждан.

В это же время в дер. Ермолино Юзефовского с/с карательным отрядом немцев было расстреляно 140 человек советских граждан.

На основании документальных материалов расследования установлено, что основными виновниками злодеяний, совершенных над советскими гражданами, являются следующие лица:

1. Помощник шефа — комиссар Дриссенского отделения ГФП немец Шойман.
2. Переводчик ГФП немец Ганс.
3. Инспектор ГФП немец Ото.
4. Шеф Дриссенского отделения немец Ганс.
5. Комендант Дриссенской полевой жандармерии немец Гауптман Швабе 60 лет.
6. Переводчик комендатуры немец Лиденск.
7. Начальник Борковического отделения ГФП немец Филор Мартин.

8. Следователь Борковического отделения ГФП немец Шнайдер Руди.
9. Переводчик ГФП Мензенко.
10. Начальник Дриссенской районной полиции Жук Бронислав Станиславович.
11. Начальник Дриссенской районной управы Козловский Франц Болеславович, 1912 года рождения, уроженец м. Росица.
12. Заместитель начальника Дриссенской районной управы Такальчик Вениамин Григорьевич, 1891 года рождения, уроженец д. Дёрновичи Дриссенского района.
13. Заместитель начальника Дриссенской районной управы Лесничий Николай Фомич, уроженец д. Нурово Дриссенского района.
14. Председатель Дриссенского оргкомитета фашистской организации НСТПР Макеев Иван Алексеевич, уроженец г. Витебска.
15. Начальник районной земельной управы Квятковский Михаил Степанович, 1906 года рождения, уроженец д. Прудинки Дриссенского района.

А также командиры 315, 316, 317, 318 латышских батальонов и полка Вейрмаг, фамилии которых не установлены. Все эти лица должны понести суровую ответственность за свои злодейские, кровавые преступления.

Председатель комиссии: Полковник (Захаров)
Члены комиссии:
Председатель Дриссенского испол-
кома деп. трудящ. (Хадкевич)
Капитан госбезопасности (Голиков)

Священник Дриссенского собора (Суходольский)
Старший лейтенант госбезопасности (Жаров)
Представитель общественных организаций (Гардей)

Зав. Дриссенским райздравотделом (Темахов)
Представитель общественных организаций (Нетецкая)

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3719. Воп. 1. Спр. 7. ЛЛ. 9—10.*

*Сяргей Панізнік*

## ЗАПАВЕТ ЖЫЦЦЯ

* * *

Я жыву за людзей, узвеяных
дымам карнікаў аж да зор;
за бяскроўных дзяцей, пабеленых
шызым інеем чорных нор,
за атручаных, перахрышчаных,
перавучаных чужакоў...
Вырывалі кускамі выжлы
плоць тваіх, Беларусь, вякоў.

Вось чаму
кожны з нас — радовішча:
каб Радзіме
у сіле быць.
Памяць — служба,
і Памяць — здольшчына,
запавет жыцця: «Не забыць!»

* * *

У кожнай крывінцы трапеча страхоцце.
Іх сэрцы не сэрцы — пажараў званы.
Ссівелі яшчэ да свайго паўстагоддзя
дзеці вайны.

Ім хочацца сёння паболей спагады.
Ім хочацца сёння паменей маны.

Хто з нас аржаному акрайчыку рады?
Дзеці вайны.

Пякучая памяць вайны не чарсцвее.
Мацнее прызыў міласэрнай струны.
Трымаюць слязіну-планету на веях
дзеці вайны.

З балючага сэрца сыходзяць ільдзіны.
Вяртаецца праўда ў жытло баразны.
Вы — дзеці Жыцця, вы — іскрынкі Радзімы,
дзеці вайны.



Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам.
У чорныя дні фашысцкай навалы
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас заўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

## Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

Гэтыя жалобныя спісы складзены паводле ўспамінаў ацалелых з вайны жыхароў раёна і пасляваенных актаў абследавання населеных пунктаў Асвейшчыны ў 1945 г.

Камісія па падрыхтоўцы рукапісаў кнігі «Памяць» зрабіла ўсё магчымае, каб спісы былі як мага больш поўнымі. Аднак варта прызнаць, што ў іх трапілі не ўсе імёны, бо шмат якія архівы раёна, у т.л. амаль усе сямейныя, асабліва на Асвейшчыне, былі знішчаны вайной. З многіх спаленых вёсак не засталося ніводнага жывога сведкі. Прозвішчы многіх загінуўшых, на жаль, пакуль што яшчэ не ўстаноўлены. Камісія працягвае іх пошук.

### г. ВЕРХНЯДЗВІНСК

**АНАШКА Ефрасіння Сцяпанаўна.**

**КЛЮЧНІК Мікалай Фёдаравіч,** н. у 1913 у Мінску, падпольшчык.

**КРУК Таіса Сільвестраўна**, н. у 1915.

**ПРОТАС Аляксандр Ігнатавіч**, н. у 1911.

**ЦЯЛУШКА Алена Сільвестраўна**, н. у 1917, загінула ў засценках гестапа.

**БЕЙЛІНА Хана Шаломаўна**, яе дзеці: Ізраіль, н. 1923, Люба, н. у 1925, Абрам, н. у 1927, Павел, н. у 1934.

**БОДНІ**, сям'я.

**ЗІХЕРМАН**, сям'я.

К. К. Цвяцінскі.

**МАКУТОНІН Ілля**.

**МЛЕГІНА Рыва**.

**САКОЛЬСКІ Навум**.

**САКОЛЬСКІ**, сям'я, 5 чалавек.

**ТРАСКОВА Хая Копелеўна**, н. у 1907, яе дачка Люба, н. у 1934, сын-немаўлятка.

**ТРАСКОЎ Міхаіл Зундэлевіч**, н. у 1900.

**ЦВЯЦІНСКІ Канстанцін Канстанцінавіч**, н. ў 1921, расстраляны фашыстамі за сувязь з партызанамі ў г. Дрыса ў 1942.

**ШУГАЛЬ Доба**, расстраляны 2.2.1942.

* * *

**У Верхнядзвінску ў снежані 1942 знішчана 769 чалавек яўрэйскага насельніцтва***.

### г.п. АСВЕЯ

Разбомбленая і выпаленая дашчэнту Асвея страціла шмат сваіх жыхароў. Большасць з іх палегла ў безыменных магілах у прысвальнянскіх лясах і канцлагерах. Гэты спіс складзены па сведчаннях жыхароў Асвеі і па звестках, сабраных адразу пасля вайны.

---

* Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995. С. 304

**АГУРЭЦКІ Віктар Ягоравіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**АНІСІМАВА Ганна**, 40 гадоў, яе дочкі — Наталля, 9 гадоў, і Поля, 6 гадоў.

**БАГДАНАВА Ганна Іванаўна**.

**БАЛЬНІЦКАЯ Тэкля**.

**БАРАДУЛІНА Наталля Л.**

**БУБОВІЧ Бюра**, з мужам, дзецьмі.

**БУРАК Ірына Андрэеўна**, н. у 1912, яе сын, 2 гады.

**БУРАК Фядора**, н. у 1910.

**ВАЛАДЗЁНАК Марыя**.

**ГАРДОВІЧ Анеля Віктараўна**.

**ГЕРОДНІК Міхалай Антонавіч**, н. у 1941.

**ГЕРТМАН Тэкля** з сынам Уладзімірам.

**ГІНЬКО Марыя Антонаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ГРЫБАЧ Алена Ільінічна**.

**ГРЫБАЧ Васіль Міхайлавіч**.

**ГРЫБАЧ Ядвіга Ігнатаўна**.

**ДЗМІТРУК Марыя Мікалаеўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЗАБЛОЦКІ Іван Гаўрылавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**ЗАЛЯЦІЛА Марыя**, яе маці, муж, дачка, сын.

**ЗАХАРЭВІЧ Насця** з сынам.

**ЗЛОТКА Паўліна Аляксандраўна**.

**КАЗЛОВА Клаўдзія Мікалаеўна**, з дзецьмі, яе бацькі і сястра Марыя з дзецьмі — спаленыя ў Малавідах.

**КАЗЛОЎСКІ Пётр Прахопавіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**КАСЕЦКАЯ Вольга А.**, сям'я, 2 чалавекі.

**КАШЛАЧ Зоя Іосіфаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**КУБІНСКАЯ Аляксандра Ігнатаўна**.

**КУПРЫНЕНКА Соф'я Лявонаўна**.

**КУРАШ Марыя Фёдараўна**, 41 год, яе дзеці: Федзя, 7 гадоў; Маруся, 5 гадоў; Галя, 3 гады; Паўлік, 1 год, — спаленыя ў Малавідах.

**КУРДОВІЧ Дамітрый Аўгусцінавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЛЕМЯШОНАК Дар'я**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЛЕМЯШЭЎСКАЯ Барбара Ігнатаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАКЕЕНАК Міхаіл Васілевіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАЛЯЎКА Настасся Іванаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**МАРКОВІЧ Марыя Францаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**МІХНО Вольга Іванаўна**.

**МУРАШКА Таня**, дзве дачкі.

**НАВАЕЎСКАЯ Марыя Міхайлаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**НОВІКАЎ**, расстраляны фашыстамі ў в. Гарадзілавічы.

**ОБУХ Іван Ігнатавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**ПАЧКАЙ Вольга Іванаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ПУДАЎ Дамітрый І.**, сям'я, 2 чалавекі.

**ПУЗАКА Канстанцін Цярэнцьевіч**, сям'я, 5 чалавек.

**ПУЗАКА Цярэнцій Ігнатавіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**РОДЗІК Праскоўя Іванаўна** з дзіцем, спаленыя ў Малавідах.

**РЭВУТ Людвіга Феліксаўна**, расстраляна на Лісняншчыне.

**РЭВУТ Паўліна Усцінаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**САВІЦКАЯ Матрона Мікалаеўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**СІМАЦКІ Мікалай Іванавіч**, вязень Саласпілскага канцлагера, расстраляны ў Румбульскім лесе пад Рыгай.

**ТАБОРА Антаніна Іванаўна**.

**ТРАНЧОНАК Кацярына Іосіфаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**УЖАКЛА Браніслаў Ал.**, сям'я, 2 чалавекі.

**УЖАКЛА Домна**, 46 гадоў, яе дачка Ганна, 11 гадоў, спаленыя ў в. Малавіды.

**ФАЛЬБА Марыя Іосіфаўна**, яе дочкі Валя і Фрося.

**ФАЛЬБА Марыя Пятроўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**ХАДАКОЎСКАЯ Марыя Васілеўна**.

**ЦЯПЛЮК** і дзве яе дачкі — спаленыя ў Асвенціме.

**ЭРДМАН Марыя Іосіфаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЯКУМОВІЧ Марыя Раманаўна**, яе дачка Рада Паўлаўна — спаленыя ў в. Любасна.

**ЯСКЕВІЧ Ісай Рыгоравіч**, н. у 1889, яго жонка Паўліна Рафаілаўна, н. у 1889, — спаленыя ў крэматорыі Люблінскага канцлагера.

**ЯСЮКЕВІЧ Андрэй** — павешаны ў Асвеі за дапамогу партызанам.

**ЯХНО Мікалай І.**, сям'я, 3 чалавекі.

**З пісьма Таццяны Васілеўны Якумовіч, г.п. Асвея**

*...Гэтыя грамадзяне — жыхары г.п. Асвея з вуліцы Прафінтэрна. Усё, што напісала, я пацвярджаю сваім подпісам. Я пісала шмат разоў, але не дапісвала — не магла, а зараз набралася апошніх сіл — адзін смутак. Хай заўсёды будзе мірнае неба.*

## Ахвяры Асвейскага гета

**Усяго ў Асвейскім парку расстраляна 459 яўрэяў. Дакументы захаваліся толькі вось гэты спіс:**

**АКОДЭС Давід Мордухавіч**, сям'я, 5 чалавек.
**БАРДАКОЎ Ізраіль Іцкавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**БАРКАГАН Мендэль Іцкавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**БАСКІН Гяц**, сям'я, 3 чалавекі.
**БАСКІНА Рая Гецалеўна**, сям'я, 2 чалавекі.
**БІМ Саламон Насонавіч**, жонка, 4 дзяцей.
**БЛЯХМАН Гіч Мордухавіч**.
**БЛЯХМАН Іцык Еселевіч**, сям'я, 7 чалавек.
**БЛЯХМАН Іцык Хаімавіч**, сям'я, 7 чалавек.
**БРУШТЭЙН Міхаіл Міхайлавіч**, сям'я, 6 чалавек.
**ВАЙСКОПФ Масей**, сям'я, 4 чалавекі.
**ГАСПЕРАВА Муха**, сям'я, 2 чалавекі.
**ГАСПЕРАЎ Міхаіл Восаравіч**, сям'я, 4 чалавекі.
**ГЕЛЬФАНД Міхаіл**, сям'я, 4 чалавекі.
**ГЕЛЬФАНД Моська Шлёмавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**ГЕЛЬФАНД Саламон Маісеевіч**, сям'я, 7 чалавек.
**ГЕЛЬФАНД Хаім Восравіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**ГЕЛЬФАНД Шалом Аронавіч**, сям'я, 8 чалавек.
**ГУРЭВІЧ Ісак І.**, сям'я, 4 чалавекі.
**ДРУЯН Маісей Залманавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЗАРЖЭЎСКІ Меер Хацкелевіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЗАРЖЭЎСКІ Хаім Саламонавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ІЗРАЙЛІТ Абрам Маісеевіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ІЗРАЙЛІТ Лейба**, сям'я, 5 чалавек.
**ІСЕМІН Ісак Габавіч**, сям'я, 4 чалавекі.
**КАРАНІК Бэрка Месравіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**КЛАС Гірш Абрамавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**КЛІНШЗІНД Моська Бенцыёнавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**КУКЛЯ Самуіл Самуілавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**КУКЛЯ Самуіл Шмоткавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЛЕВІН Бенцыён**.
**ЛЕВІН Моўша Самуйлавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЛЕВІН Хайбус Бенцыёнавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЛІПІНА Хана Лейбаўна**.
**МАТУС Тоўба Матушавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**МІЛЕР Хаца С.**, сям'я, 3 чалавекі.
**НАСОН М.Г.**, сям'я, 3 чалавекі.
**ПАСТАРНАК Абрам Хаімавіч**.
**ПАЦІШ Міхал Абрамавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**ПАЦІШ Міхал Ёселевіч**, сям'я, 4 чалавекі.
**ПЕРАЦ Цынцыпер Бенцыёнавіч**.
**РАСКІН Хацкель Шлёмавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**САЙБЕЛЬ Хася Сіманаўна**, сям'я, 3 чалавекі.
**СІМХОВІЧ Геба І.**, сям'я, 2 чалавекі.
**СКІН Мендэль Залманавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**СМІРЫН Манька Ёселевіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**СМІРЫН Фурнастка Ісакавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**СУХР Абрам Іцкавіч**, сям'я, 4 чалавекі.
**ХАВІНСОН Гіта Баранаўна**, сям'я, 2 чалавекі.
**ХАВІНСОН Залман Марысонавіч**.
**ХАВІНСОН Навум Абрамавіч**.
**ХАЙКІН Хаім**.
**ЦЫНЦЫПЕР Насон**, сям'я, 3 чалавекі.
**ЦЫНЦЫПЕР Хаім**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЦЫРЛІН Анцік Юдавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ШАХМАН Гірш Моўшавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**ШЛІЎКА Міхаіл Іосіфавіч**, сям'я, 2 чалавекі.
**ШЛЮТКІН Шахман Сімкавіч**, сям'я, 4 чалавекі.
**ШУГАЛЬ Хава**, сям'я, 3 чалавекі.
**ШУГАЛЬ Хася Маісееўна**, сям'я, 3 чалавекі.
**ШЭЙХМАН Гіта Хацкелеўна**.
**ШЭЙХМАН Нахім Хаімавіч**, сям'я, 5 чалавек.
**ЭЙДЛІНА Хана Іцкаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

### НІХТО НЕ ВЫЙШАЎ НА РОДНЫ ГАНАК...

З вялікай увагай і болем чытаю ў раёнцы артыкулы, прысвечаныя кнізе «Памяць». У наш жорсткі час, калі мы навучыліся праходзіць міма чужой бяды, забываць аб мінулым, ваша дзейнасць па ажыццяўленні дэвіза «Нішто не забыта, ніхто не забыты» заслугоўвае вялікай удзячнасці. Гісторыя не даруе нам, калі нашы дзеці і ўнукі вырастуць, не ведаючы аб тых нечалавечых пакутах, праз якія прайшлі іх бацькі. Спадзяюся, што на многія пытанні, якія хвалююць сэрца і памяць, мы знойдзем адказ у гэтай кнізе.

Да вайны наша сям'я жыла ў горадзе Дрысе, на вуліцы Савецкай. Было нас у бацькоў пяцёра, я — самая старэйшая. Перад вайной якраз гасцявала ў Ленінградзе. Дадому адтуль ужо не вярну-

лася, бо родны горад быў акупіраваны фашыстамі.

Пеша, без рэчаў і ежы, без родных і блізкіх, я прайшла адна 400 кіламетраў да станцыі Ржэў. З вялікімі цяжкасцямі дабіралася ў тыл, пакуль не апынулася ў Куйбышаўскай вобласці.

І вось улетку 1945 года, у жніверьскі цёплы дзень, калі на світанку спявалі птушкі, пахла свежасцю і водарам кветак, а навокал было так хораша і прыгожа, я з трывогаю і болем падышла да роднага ганка (дом наш уцалеў). З дому выйшлі зусім незнаёмыя мне людзі, якія жылі ў ім з таго часу, як маіх родных пагналі ў гета...

Гора і смутак жывуць у маім сэрцы, калі ўспамінаю сваіх бацькоў, братоў, сястру.

Мой брат, Бейлін Ізраіль Маісеевіч, 1923 г. н., у 1941 г. закончыў 10 класаў; сястра, Бейліна Люба Маісееўна, 1925 г.н., брат, Бейлін Абрам Маісеевіч, 1927 г. н., брат, Бейлін Павел Маісеевіч, 1934 г. н., бацька, Бейлін Маісей Абрамавіч, маці, Бейліна Хана Шаломаўна, як расказала мне Аляксандра Паршута і іншыя відавочцы, ішлі 2 лютага 1942 года ў той жудаснай працэсіі разам з многімі іншымі маімі роднымі і знаёмымі праз родны горад. І апошняй мяжой на іх шляху быў роў...

Па ініцыятыве маёй і майго дваюраднага брата Бейліна Абрама Львовіча на брацкай магіле была ўстаноўлена мармуровая дошка. У Абрама застаўся жывы толькі брат Яфім, яны абодва вярнуліся з фронту, а з сям'і яго загінулі дзевяць чалавек.

У пасляваенныя гады, калі збіраліся дзеці загінуўшых, мы наладжвалі суботнікі і збіралі камяні-помнікі, якія былі раскіданы па ўсім горадзе. Калі мы іх звезлі назад на могілкі, то вырашылі паставіць іх вакол ірва, дзе былі закатаваны нашы родныя.

Прачытаць надпісы зараз цяжка, бо словы напісаны на іўрыце, і, мне здаецца, наўрад ці хто здольны ў горадзе разабрацца ў іх.

Хацелася б яшчэ дадаць, што ў нашым горадзе жылі людзі розных нацыянальнасцей, але сярод нас існавала сапраўдная дружба і ўзаемная павага. Я добра памятаю, што наш дом быў заўсёды адкрыты і гасцінны для любога селяніна, якому даводзілася бываць і начаваць у горадзе. Шмат хто ў вёсках раёна і зараз яшчэ памятае майго бацьку, шаўца, які часта ездзіў па вёсках ладзіць абутак сельскім жыхарам; з прывезенага заробку і кармілася наша зусім небагатая вялікая сям'я.

Магу яшчэ напісаць, што ў той магіле ляжаць нашы суседзі і знаёмыя: Млегіна Рыва, Сакольскія — 5 чалавек, сем'і Зіхерман, Бодня, Сакольскі Навум, Шугаль Доба, Макутонін Ілля і іншыя.

Прабачце, калі мой расказ не атрымаўся. Бо спакойна гаварыць і пісаць аб гэтым нялёгка. Але ж усё, што перажыта, не выкінуць з памяці.

*З павагай Соф'я Маісееўна Батушанская,*
г. Верхнядзвінск

## АСВЕЙСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АБРАЗЭЕВА

**Спалена ў лютым 1943 г.**

З а г і н у л і:

**ДУБРОЎСКІ Барыс Міхайлавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАРОЗ Аляксандр Яфімавіч**, сям'я, 5 чалавек.

### ВЁСКА АБРАМОВА

Спалена ў лютым 1943. Жыхары захоплены карнікамі 1 мая 1943 у лясным лагеры. Адны з іх расстраляны ва ўрочышчы Крыжборык каля в. Каменка, іншыя спалены ў в. Азернікі.

**ДУБІНА Герасім Іосіфавіч**, яго жонка Марфа Антонаўна, іх дзеці: Яніна, Уладзімір, Сяргей, Зінаіда, Аляксандр.

**ЖОРАВА Прузына**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЗАЙЦАВА Ганна Міхайлаўна**, дочкі Вольга Апанасаўна, Яніна Апанасаўна, н. у 1925.

**ЗАЯЦ Іван**, 60 гадоў, 3 дачкі.

**ЗАЯЦ Захвея**, сям'я, 5 чалавек.

**ЗАЯЦ Мікалай А.**, сям'я, 5 чалавек.

**ЗАЯЦ Наталля М.**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЗАЯЦ Павел Адамавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЗАЯЦ Якуб Адамавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЗУБАР Аляксей**, сям'я, 5 чалавек.

**ЗУБАР Марка М.**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЗУБАР Юзэфа**, 30 гадоў, дзве дачкі (да 7 гадоў).

**ІЛЬІЧ Алена**.

**ПАДКАЦІК Даніла**, 60 гадоў.

**ПАДКАЦІК Марыя М.**, сям'я, 3 чалавекі.

**РУМЗЁНАК Фоня**.

**РУДНІЦКІ Цімафей**, 60 гадоў, жонка Марыя, іх дочкі — Прасеня з дочкай і Марыя з двума сынамі і дочкай.

**САМУСЁНАК Таццяна Емяльянаўна** і яе дачка — спалены ў в. Азернікі.

**САМУСЁНАК Антон Іосіфавіч**, н. у 1900, яго шасцёра дзяцей.

**САМУСЁНАК Емяльян Фёдаравіч**, н. у 1896, жонка Ганна, іх дзеці: Лідзія, 16 гадоў; Вольга, 14 гадоў; Тамара, 7 гадоў.

**САМУСЁНАК Валянцін Васілевіч**, 13 гадоў.

**САМУСЁНАК Валянціна Васілеўна**, 13 гадоў.

**САМУСЁНАК Зінаіда Васілеўна**, 16 гадоў.

**САМУСЁНАК Леанід Васілевіч**, 4 гады.

**ТРЫПУК Наталля**, 50 гадоў, дачка Настасся, 20 гадоў.

**ФРУЦКАЯ Марыя Цімафееўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЯРОМЕНАК Вера**, 20 гадоў.

**ЯРОМЕНАК Міхаіл**, сям'я, 5 чалавек.

**ЯРОМЕНАК Палагея**, 30 гадоў, з в. Краснае, яе двое дзяцей.

**ЯРОМЕНАК Прасеня**, 45 гадоў; дачка, сын Вася, 10 гадоў; двое ўнукаў.

**ЯРОМЕНАК Уладзімір Канстанцінавіч**, 30 гадоў, жонка Феня, дзве дачкі — 6—7 гадоў.

**ЯРОМЕНАК Уладзімір Сямёнавіч**, 35 гадоў, сын Пётр, 13 гадоў; дачка Феня, 7 гадоў.

**ЯРОХА Сямён**, сям'я, 3 чалавекі.

**З пісьмаў Марыі Герасімаўны Доўтай, г. Рыга**

*«...На востраве Жаночы Бор нас было, мабыць, каля тысячы чалавек — з вёсак Абрамова, Крыскава, Нямыцкі, Гарадзішча, Каркалец.*

*...Пад 1 мая зрабілі цераз дрыгву грэблю, як стараста параіў: маўляў, выедзем, заарэм агароды ды засеем, восенню будзе што ўбіраць. Так і зрабілі. А ў 9 гадзін раніцы 1 мая заявіўся карны атрад Мартыноўскага на чале з яго намеснікам Рашэтнікавым, што базіраваўся ў Жагулях. Раздзяліўшыся на дзве групы, яны рушылі на Барысова і да нас завіталі па той грэблі.*

*Падышлі ў чырвонаармейскай форме да нашых зямлянак, выклікалі майго свёкра: «Дзе твой сын Мікалай? Мы калінінскія партызаны, хочам запрасіць яго святкаваць Першамай». А свёкар і кажа: «Адкуль прыйшоў, туды і пайшоў».*

*Тады яго сталі біць, а затым выгналі ўсіх з зямлянак і хацелі расстрэльваць. Раптам пачулася страляніна — гэта другая група карнікаў трапіла на партызанскую засаду. Карнікі Мартыноўскага ўдарылі з мінамёта, але міна, зачапіўшыся за сасну, разарвалася над імі і смяртэльна параніла асколкам начальніка штаба карнікаў Пшыка.*

*Нас пагналі, як жывёлу. Саслабелых пасля тыфу людзей білі, а мы ледзьве ішлі — ад 9 раніцы да 9 вечара. Перашкодай стаў узарваны мост на рачулцы паміж вёскамі Каменка і Пушчавыя. Тут нам загадалі сесці. Жыхары Пушчавых кінуліся ўцякаць са сваіх зямлянак, некаторым гэта ўдалося, астатніх далучылі да нас.*

*...Церахаў падзяліў нас на дзве групы. Мой свёкар і я з бацькам засталіся на месцы, а маці з пяццю дзецьмі пагналі да Каханавіч. Усю тую групу з Каханавіч завезлі ў Дрысу, у СД. Пратрымаўшы іх там чацвёра сутак, у суботу 5 мая звезлі ў Азернікі і спалілі там жывымі.*

*...Нас страляліі ў Крыжборыку — колькі было, цяжка палічыць.*

*Мяне выдаў старасга, сказаўшы, што я жонка партызана, па чыю галаву быў высланы атрад карнікаў. Я была цяжарнай, і мяне ўзялі ў палон.*

*З Дрысенскага СД я трапіла ў турму, потым у канцлагер Саласпілс, адтуль — у Равенсбрук.*

*7 верасня ў мяне нарадзілася дачушка Оля. Яна пражыла 9 месяцаў, і яе спалілі ў крэматорыі, бо няма чым было карміць.*

*Нумар мой быў 155333... З усёй колькасці вязняў у жывых засталося 8 тысяч. На радзіму я вярнулася ў студзені 1946 года.*

*Муж мой помсціў за сваю сям'ю, пускаў пад адхон варожыя эшалоны. У 1944 годзе скончыў партшколу. Лічыў, што застаўся адзін на белым свеце, ажаніўся. Яго накіравалі інструктарам парткома ў Заходнюю Беларусь, у Шаркаўшчынскі раён. Яго забілі 30 жніўня 1945 года.*

*На радзіме мяне ніхто не сустракаў. Вярнулася ў Рыгу, праз два гады выйшла замуж за Долгага Сямёна Тарасавіча. Ён у мяне вельмі добры. На фронце быў з першага дня па апошні».*

## ВЁСКА АГУРКІ

**Спалена (16 двароў) у сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**АНДРУЧОНАК Генадзь**, н. у 1930.

**АНДРУЧОНАК Настасся**, н. у 1895.

**АНДРУЧОНАК Сцяпан**, 60 гадоў.

**БОНДАРАВА Клаўдзія Пятроўна**, н. у 1918, дачка, н. у 1942.

**ГЛІНСКАЯ Лізавета**, 55 гадоў.

**ГЛІНСКАЯ Прасеня**, 50 гадоў.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Барбара Піліпаўна**, н. у 1912, яе трое дзяцей.

**ЛУКАШОНАК Антаніна**, н. у 1907, сын Пётр.

**ЛУКАШОНАК Настасся**, 45 гадоў, сын Уладзімір, 4 гады.

**МАЦУЛЕВІЧ Пётр**, дочкі — Марыя, н. у 1921; Зінаіда, н. у 1923.

**МАЦУЛЕВІЧ Піліп**, н. у 1895.

**МАЦУЛЕВІЧ Наталля.**

**МАЦУЛЕВІЧ Клаўдзія Аляксандраўна**, н. у 1929.

**САВІЦКАЯ Ганна Уладзіміраўна**, н. у 1926.

Помнік ахвярам фашызму ў былой вёсцы Агуркі.

**САВІЦКАЯ Палагея Дзмітрыеўна**, н. у 1911, яе трое дзяцей.

**САВІЦКІ Сямён**, 60 гадоў.

**САВІЦКАЯ Настасся**, 75 гадоў.

**САВІЦКАЯ Кацярына Сцяпанаўна**, 40 гадоў.

**САВІЦКАЯ Агата Дзмітрыеўна**, н. у 1882.

**САВІЦКІ Фёдар Кузьміч**, н. у 1928.

**САВІЦКІ Віктар**, н. у 1939.

**СКРЫПКА Павел**, 70 гадоў.

**СКРЫПКА Анеля**, 50 гадоў.

**СКРЫПКА Марыя**, 70 гадоў.

**ЦІХАНАВА Марыя**, н. у 1901, муж Васіль, н. у 1889; дачка Вольга, н. у 1931;

**ЦІХАНАВА Настасся**, 50 гадоў — спалены ў в. Агуркі.

## ВЁСКА АСЕТКІ

**Спалена ў сакавіку 1943.**

Загінулі:

**КАЗАЧОНАК Іван**, сям'я, 4 чалавекі.

**КУХАРОНАК Цімафей**, сям'я, 5 чалавек.

## ВЁСКА БАРКОВА

**Спалена (14 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі:

**АЛЯХНОВІЧ Васіль Вікенцьевіч.**

**АЛЯХНОВІЧ Васіль Іванавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**БАГДАНАВА Дуня Аляксандраўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЗУБАР Тэкля Сцяпанаўна**, 30 гадоў, дочкі: Ядзя, 12 гадоў; Марыя, 10 гадоў; Шура, 6 гадоў; сын Пеця, 4 гады — спалены 1 мая 1943 г. у в. Азернікі; дачка Ніна, 20 гадоў, расстраляна ва ўрочышчы Крыжбарок.

**КАЗЛОЎ Якаў Пятровіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**МЯДЗЮТА Ніна Міхайлаўна**, 10 гадоў — спалена ў в. Відокі.

## ВЁСКА БАРСУКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ДАВЫДЗЁНАК Ігнат**, н. у 1885, жонка Кацярына Антонаўна, 57 гадоў.

**ЯСЮКЕВІЧ Рафаіл Францавіч**, 85 гадоў; жонка Ева Фёдараўна, 83 гады.

**З пісьма Вячаслава Феліксавіча Ясюкевіча, в. Зашчырына.**

*«...У лютым 1943 карнікі перахапілі нашых родных, якія перабіраліся ў лес да партызан. У іх адабралі коней і маёмасць, якую паспелі ўзяць пры ўцёках. А далей гналі пад канвоем у Асвею. Калі ў царкве назбіралася шмат людзей, іх пагналі на чыгуначную станцыю праз Сар'ю.*

*Мой дзед Рафаіл звярнуў на дарогу да сваёй вёскі. Нямецкі афіцэр злез з каня і выстраліў дзеду ў спіну...*

*Бабулю Еву зяці вялі пад рукі далей, але яна супраціўлялася, села на дарогу. Карнікі забілі і яе...*

*Ніхто не хаваў дзеда і бабулю, але месца іх гібелі мы памятаем».*

## ВЁСКА БАРЫСОВА

**Спалена (24 двары) у сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**БАЛАБОЎСКІЯ**, сям'я.

**БЯЛЯНКА Сцяпан Рыгоравіч**, сям'я, 10 чалавек.

**ДАШКЕВІЧ Васіль Л.**, сям'я, 3 чалавекі.
**ІСАКАЎ Васіль** з сям'ёй.
**ІСАКАЎ Іван** з сям'ёй.
**ІСАКАЎ Ігнат** з сям'ёй.
**ІСАКАЎ Мартын** з сям'ёй.
**ІСАКАЎ Сцяпан** з сям'ёй.
**ІСАКАЎ Сяргей Антонавіч**, сям'я, 8 чалавек.
**ІСАКАЎ Фёдар** з сям'ёй.
**КУКОЎСКІ**, сям'я.
**КУРАШ Васіль Адамавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**КУРАШ Кліменцій** з сям'ёй.
**МАКЕЕНАК Пётр** з сям'ёй.
**МАЦУЛЕВІЧ Сямён Міхайлавіч**, сям'я, 6 чалавек.
**НАУМАЎ Аляксандр Мікалаевіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**НАУМАЎ Юрый** з сям'ёй.
**ШКУТАЎ Мацвей Паўлавіч**, сям'я, 7 чалавек.
**ШЛЫК Марыя Іванаўна** з дваіма дзецьмі.
**ШЧАСНАЯ Ганна Аляксееўна**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА БЯЛЯНЫ

**Спалена (44 двары) у сакавіку 1943.**

З а г і н у л і:

**АГУРЭЦКІ Фелікс**, сям'я, 3 чалавекі.
**АГУРЭЦКІ Якуб**, сям'я, 7 чалавек.
**АНДРУЧОНАК Нічыпар**, сям'я, 6 чалавек.
**БАРОХА Альжбета.**
**БАРОХА Наталля Арцёмаўна**, н. у 1908, дачка Люля Мікалаеўна, н. у 1934; сын Мікалай, н. у 1935.
**ВЯРБІЦКІ Ігнась**, сям'я, 7 чалавек.
**ГЛІНСКАЯ Лізавета**, сям'я, 3 чалавекі.
**ЖОРАВА Феня Віталеўна**, н. у 1921, дачка Любоў Ягораўна, н. у 1940.
**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Аўдоцця**, 70 гадоў.
**ЗАШЧЫРЫНЧКАЯ Барбара Ф.**, ся'я, 3 чалавекі.
**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Ганна Адамаўна**, н. у 1893.
**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Караліна Пратасаўна.**
**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Міхаліна**, 65 гадоў.
**ЗАШЧЫРЫНСКІ Іван**, 75 гадоў.
**ЗАШЧЫРЫНСКІ Ігнат Іванавіч**, н. у 1896.
**ЗАШЧЫРЫНСКІ Мацей.**
**ЛЯМНІЦКІ Уладзімір**, сям'я, 2 чалавекі.
**САВІЦКАЯ Агата**, сям'я, 2 чалавекі.
**САВІЦКАЯ Ганна Міхайлаўна**, н. у 1910.
**САВІЦКАЯ Дар'я.**
**САВІЦКАЯ Палагея**, сям'я, 4 чалавекі.
**СКРЫПКА Павел**, сям'я, 3 чалавекі.
**СЛЕСАРОНАК Пётр**, н. у 1901.
**ЦЯРЭНЯ Міхаіл**, сям'я, 6 чалавек.
**ЮХНЕВІЧ** (жанч.), дачка, сын — закатаваныя фашысцкімі карнікамі ў лютым 1943.
**ЯРОМЕНАК Ганна Аляксееўна**, н. у 1909, сыны — Міхаіл, 3 гады; Пётр, 7 гадоў.
**ЯРОМЕНАК Праскоўя**, 70 гадоў.

## ВЁСКА ВЕСНІНО

**Спалена (15 двароў) у лютым 1943.**

З а г і н у л і:

**МАРОЗ Андрэй Іванавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**МАРОЗ Гунэфа Віктараўна**, сям'я, 5 чалавек.
**ЯСЮКЕВІЧ Агата.**
**ЯСЮКЕВІЧ Адам Феліксавіч**, н. у 1888, схоплены за сувязь з партызанамі, загінуў у Полацкім канцлагеры ў 1943.

## ВЁСКА ВІДОКІ

**Спалена (31 двор) у лютым 1943.**

З а г і н у л і:

**ДЗЯДЗЕЛА**, н. у 1870, жонка Агата, сын Міхаіл, н. у 1918; дзве дачкі.
**КАЗАЧОНАК Наталля**, 30 гадоў, сыны — Канстанцін Сцяпанавіч, 9 гадоў; Уладзімір, 7 гадоў.
**КЛІМОВІЧ Дар'я**, сям'я, 5 чалавек.
**ЛАПА Агата**, сям'я, 3 чалавекі.
**МІКУЛЁНАК Пеця**, 10 гадоў, дзве яго сястры, спаленыя ў канцы чэрвеня 1944.
**МІКУЛЁНАК Фадзей**, сям'я, 6 чалавек.
**ОБУХ Лідзія Вікенцьеўна**, н. у 1924, закатаваная ў в. Купараўшчына.
**САЎЛУК... Паўлаўна** з в. Бічыкава, закатаваная ў Відоках.
**ЧАПУК Павел Антонавіч**, сям'я, 6 чалавек.
**ЧАРНАВОК Антон**, сям'я, 4 чалавекі.
**ЧАРНАВОК Домна С.**

## ВЁСКА ВЫШНАРАВА

**Спалена (53 двары) у лютым 1943.**

З а г і н у л і:

**БУХАВЕЦКАЯ Аксюта**, 55 гадоў.
**БУХАВЕЦКАЯ Алена**, 30 гадоў.
**ВЫДРЫЦКАЯ Ганна.**
**ГІНЬКО Марыя**, 56 гадоў.
**ГІНЬКО Матрона**, 40 гадоў.
**ЖУКЛЕВІЧ Іван**, 70 гадоў, жонка, 68 гадоў.
**ЖУКЛЕВІЧ**, 76 гадоў.
**ЗАЛЯЦІЛА Ігналя**, 50 гадоў, жонка Ева, 45 гадоў; дачка Надзя, 18 гадоў; сын Коля, 10 гадоў.

**ЗАЛЯЦІЛА Леакадзія**, 25 гадоў, сын, 13 гадоў.

**ЗАЛЯЦІЛА Адольф**, 53 гады, жонка Адэля, 50 гадоў; дачка Валянціна, 25 гадоў; яе сын Юлюсь, 5 гадоў.

**ЗАЛЯЦІЛА Альбіна**, 35 гадоў, яе дзеці: Ада, 10 гадоў; Валянціна, 7 гадоў; Адась, 4 гады.

**ЗАЛЯЦІЛА Вольга**, 32 гады; дачка, 4 гады; сын, 2 гады; свёкар Ізарэт, 70 гадоў.

**ЗАЛЯЦІЛА Кірыла**, дачка Вольга, 25 гадоў.

**ІВАШКЕВІЧ Іван**, 60 гадоў, жонка, 58 гадоў.

**КУХАРОНАК Марыя**, два сыны, дачка.

**ЛЕБЕДЗЬ Мальвіна**, сын Арсень, 15 гадоў.

**МАРКОВІЧ Осіп**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАСЛЁНАК Феня**, 32 гады, дзве дачкі, 4 і 6 гадоў, свёкар 56 гадоў.

**МАСЛЁНАК Іван**, 40 гадоў, жонка Марфа, 35 гадоў; сын Мікалай, 7 гадоў.

**ОБУХ Ганна Фамінічна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ОБУХ Дарота**, 80 гадоў.

**ПАЎЛЮКЕВІЧ Дзмітрый Ізафатавіч**, 60 гадоў, жонка Барбара, 39 гадоў; іх дзеці: Валянціна, 9 гадоў; Зінаіда, 7 гадоў; Сяргей, 4 гады; Пётр, 2 гады.

**ПАЎЛЮКЕВІЧ Ефрасіння**, 50 гадоў.

**ПАЎЛЮКЕВІЧ Матрона**, 60 гадоў.

**ПАЎЛЮКЕВІЧ Рыгор**, 60 гадоў, нявестка Яніна, 32 гады, з двума сынамі, 8 і 10 гадоў; унук, 5 гадоў.

**РАЗНАЦВЕТАЎ Іван**, сям'я, 4 чалавекі.

**СІВОХА Марыя**, 46 гадоў.

**ШАНДАР Стэфанія**, сям'я, 5 чалавек.

**ШАНДАР Сцяпан**, 56 гадоў.

**ЯБЛОНСКАЯ Юзэфа**, сям'я, 5 чалавек.

**ЯСКЕВІЧ Ульяна**, 28 гадоў, дзве дачкі, 4 і 6 гадоў; сын, паўтара года.

**ЯСКЕВІЧ** (жанч.), 70 гадоў.

## ВЁСКА ГАЛЬКАЎШЧЫНА

**Спалена (16 двароў) у сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**БАХМЕТ Настасся Пятроўна**, сям'я, 6 чалавек.

**ЖОРАВА Куліна**, н. у 1845.

**ЖОРАВА Лізавета Іванаўна**, 25 гадоў, дачка Люба Ягораўна, н. у 1938.

**ЖОРАВА Фядора Вікенцьеўна**, н. у 1920.

**ЖОРАЎ Іван Ісакавіч**, н. у 1882, жонка Марыя, н. у 1880.

**ЖОРАЎ Іван Рыгоравіч**, н. у 1908, жонка Ефрасіння Іванаўна, н. у 1911, дачка Таіса, н. у 1940; сын Віктар, н. у 1939.

**ЖОРАЎ Рыгор Ісакавіч**, н. у 1887; жонка Анеля, н. у 1890.

Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Гальказўшчына.

**ЖОРАЎ Цярэня Аляксандравіч**, н. у 1929.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Ігнат Паўлавіч**, н. у 1890, жонка Настасся, н. у 1892; сын Агафон, н. у 1929; дачка Таіса, н. у 1930.

**ЛАПА Надзея**, н. у 1889, дачка Наташа, н. у 1923.

**ОБУХ Іосіф Палікарпавіч**, н. у 1908, жонка Валянціна, н. у 1910.

**САВІЦКАЯ Праскоўя Ігнатаўна**, н. у 1891, дачка Марыя Іванаўна, н. у 1923.

**САВІЦКІ Дзмітрый Аляксандравіч**, н. у 1940.

**СКРЫПКА Мікалай Іванавіч**, н. у 1887, жонка Праскоўя, н. у 1890, дочкі — Лідзія, н. у 1921, Валянціна, н. у 1928.

**ЯРОМЕНАК Аляксей Аркадзевіч**, н. у 1929.

**ЯРОМЕНАК Ганна Іванаўна**, н. у 1913, жонка Прасення Паўлаўна, сям'я, 5 чал.; малыя дзеці ўтоплены ў р. Свольна, пахаваныя ва ўрочышчы Карчмішча.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Андрэй**, н. у 1847, жонка Улляна, н. у 1844, — спалены ў лютым 1943 у в. Гальказўшчына.

## ВЁСКА ДАВЫДЗЕНКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Кацярына Фёдараўна.**
**ЦЯРЭНЯ Дар'я Міхайлаўна.**

## ВЁСКА ДЗЕДЗІНА

**Спалена (19 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі:

**МАКЕЕНАК Настасся**, сям'я, 5 чалавек.
**САВІЦКАЯ Алена**, сям'я, 5 чалавек.

## ВЁСКА ДОБРАНІКІ

**Спалена (12 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі:

**АРЖАНІК Дар'я Міхайлаўна**, н. у 1900, дачка Антаніна Іванаўна, 12 гадоў.

**МАКЕЕНАК Аляксей Максімавіч**, н. у 1870, жонка Еўдакія, н. у 1870.

**МАКЕЕНАК Зінаіда Дамітрыеўна**, н. у 1933.

**ШУКЛІНА Агата Сцяпанаўна**, н. у 1910, яе трое дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў.

**СТАРЫКАВА Гася Паўлаўна**, н. у 1912, муж Іван, н. у 1910, іх двое дзяцей, 1—3 гады.

**ШЫШЁНАК Яўгенія**, н. у 1887.

## ВЁСКА ЖАРАБЦОВА

**Спалена (6 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі ў 1944:

**РОДЗІК Іван Антонавіч**, н. у 1887, яго сын Іван, н. у 1927 г., пахаваны на 4-м км дарогі Маскалёнкі—Малавіды.

## ВЁСКА ЗАТЛОЙШЧЫНА

**Спалена (30 двароў) у сакавіку 1943. Частка жыхароў спалена ў пуні Мікалая Пудава на хутары Прудок, частка — у вёсцы Мазалеўшчына.**

Загінулі:

**АГУРЭЦКІ Павел Іванавіч**, 40 гадоў, жонка Ганна, два іх сыны: Яфрэм, 16 гадоў; Іван, 13 гадоў.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Леаніда Рыгораўна**, н. у 1920.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Лідзія Міхайлаўна**, н. у 1913, сын Уладзімір Пятровіч, н. у 1937.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Лізавета Андрэеўна**, н. у 1888, дачка Надзея, н. у 1909.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Міхаіл Раманавіч**, 60 гадоў, жонка Таццяна, 60 гадоў, і іх дзве дачкі: Настасся, 24 гады; Ганна, 22 гады.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Эмілія Пятроўна**, н. у 1933, брат Аляксандр, н. у 1935.

**КАВАЛЁНАК Марта К.**, 63 гады, дачка Марыя Сямёнаўна, 20 гадоў.

**КАВАЛЁНАК Марыя Васілеўна**, яе трое дзяцей.

**КАВАЛЁНАК Міхаіл Карпавіч**, 55 гадоў, яго жонка Таццяна, 50 гадоў; дачка Вера, 7 гадоў.

**КАВАЛЁНАК Марыя Іванаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**КАВАЛЁНАК Праксеня Міхайлаўна**, 22 гады, сын Васіль.

**КАВАЛЁНАК Сцяпан Іванавіч**, 65 гадоў; брат Фёдар, 55 гадоў; яго жонка Алімпіяда, 50 гадоў; дачка Валянціна, 15 гадоў; 4 дачкі да 10 гадоў; 2 сыны да 6 гадоў.

**КАЗУСЬ Дамітрый Аляксеевіч.**

**КАЛЕСНІК Юлія Сямёнаўна**, 40 гадоў, яе дзеці: Зінаіда Іванаўна, 10 гадоў; Валянціна, 6 гадоў; Уладзімір, 3 гады.

**ЛУКАШОНАК Васіль Іванавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЛУКАШОНАК Ефрасіння**, сям'я, 4 чалавекі.

**МАКЕЕНАК Аляксандр А.**, сям'я, 5 чалавек.

**МАКЕЕНАК Ганна Б.**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАКСУЛЬ Аляксандр М.**, сям'я, 4 чалавекі.

**МАКСУЛЬ Аляксандра М.**, сям'я, 4 чалавекі.

**МАКСУЛЬ Кацярына А.**, 60 гадоў, сын Павель Васілевіч, 16 гадоў; дачка Фёкла, 12 гадоў.

**МАКСУЛЬ Лізавета Барысаўна**, 50 гадоў, сын Віктар Іванавіч, н. у 1927.

**МАКСУЛЬ**, жонка М. Міхаіла, дачка, сын, 5 і 7 гадоў.

**МАЦУЛЕВІЧ Палагея Іванаўна**, 60 гадоў.

**МАЦУЛЕВІЧ Маісей Мітрафанавіч**, 16 гадоў; сястра Яніна, 22 гады; сын Іван, 4 гады.

**НАВАШЫНСКАЯ Ефрасіння Рыгораўна**, 40 гадоў; дачка Ганна, 13 гадоў; сын Аляксей, 10 гадоў.

**ПУДАВА Васіліса Карпаўна**, 45 гадоў; дачка, 10 гадоў; сын, 12 гадоў.

**ПУДАВА Іна**, 10 гадоў; брат Аляксандр, 4 гады.

**ПУДАВА Ганна**, 45 гадоў.

**ПУДАВА Надзея Дамітрыеўна**, 50 гадоў; яе два сыны: Фёдар Віктаравіч, 17 гадоў; і меншы, 8 гадоў.

**ПУДАВА Настасся**, 60 гадоў; дачка Настасся Осіпаўна, 18 гадоў.

**ПУДАВА**, 45 гадоў; сын Пётр, 8 гадоў; дачка Фяоня, 10 гадоў.

**ПУДАЎ Іван Віктаравіч**, 4 гады.

**ПУДАЎ Мікалай Фаміч**, сям'я, 5 чалавек.

**ПУТРА Ганна Васілеўна**, 4 чалавекі.

**ПУТРА Міхаіл Елісеевіч**, н. у 1942.

**ЦЯРЭНЯ Міхаіл**, 70 гадоў, яго нявестка, двое дзяцей, 5—7 гадоў.

**ЦЯРЭНЯ Фёдар Міхайлавіч.**

**ЦЯРЭНЯ**, 50 гадоў, яе тры сыны, 5—9 гадоў.

**ЦЯРЭНЯ Настасся Осіпаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЦЯРЭНЯ Настасся Сцяпанаўна**, 50 гадоў.

**ЦЯРЭНЯ Пётр Міхайлавіч**, 45 гадоў.

**ЦЯРЭНЯ Фядора Іванаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ЦЯРЭНЯ Яўгенія Міхайлаўна**, 50 гадоў.

**ЧАРНАВОК Еўдакія Пятроўна**, 61 год.

**ЧАРНАВОК Марына Раманаўна**, 30 гадоў, яе дзеці: Віталь Данілавіч, 12 гадоў; Васіль, 8 гадоў; Ефрасіння, 6 гадоў.

...**Сымон**, пад 60 гадоў, яго жонка, пад 60 гадоў, дачка 20 гадоў.

## ВЁСКА КАМЕНКА

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ВОЛЕС Праскоўя Іванаўна**, 56 гадоў.

**ВОЛЕС Рыгор Сямёнавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ВОЛЕС Прохар Ягоравіч**, сям'я, 7 чалавек, прапалі без вестак.

**ДЗІВАНОЎСКІ Генадзь Пятровіч**, н. у 1930, яго брат Іван, н. у 1925.

**ЗУБАР Вольга Якубаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЗУБАР**, сям'я.

**ЗУБАР**, сям'я.

**КОЎЗЕЛЬ Фёдар Рыгоравіч**, 50 гадоў, спалены ў в. Саломіна.

**ЛОСЬ Яўгенія Андрэеўна**, 30 гадоў, забіта ў час карнай аперацыі ў 1943 г. каля в. Селядцова.

**ФРУЦКІ Аляксандр Фёдаравіч**, сям'я, 7 чалавек.

**ЯСКЕВІЧ Марыя Лявонаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА КІСЯЛІ

**Спалена (35 двароў) у сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Агні загінулі:

**ГЛІНСКІ Кірыла**, двое дзяцей.

**ГЛІНСКАЯ Настасся, ГЛІНСКІ Нічыпар**, іх трое дзяцей.

**ЖОРАВЫ**, сям'я.

**КУРАНСКІ Іван.**

**МАКСУЛІ Аляксандр і Наталля**, іх тры сыны.

**МАКСУЛІ Андрэй** і жонка **Натасся**, іх дзіця.

**МАКСУЛІ Барыс і Хвядора**, іх шасцёра дзяцей.

**МАКСУЛЬ Ефрасіння**, яе дзіця.

**МАКСУЛІ Іван і Таццяна**, іх дзіця.

**МАКСУЛЬ Марыя.**

**МАКСУЛІ Мікалай і Настасся**, іх пяцёра дзяцей.

**МАКСУЛЬ Настасся.**

**МАКСУЛЬ Павел.**

**МАКСУЛЬ Таццяна**, яе двое дзяцей.

**МАКСУЛЬ Ян**, яго трое дзяцей.

**ЦЕЦЯРВЁНАК Апанас**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЯКУШОНАК Антаніна.**

## ВЁСКА КУПАРАЎШЧЫНА

**Спалена (14 двароў) у лютым 1943.**

Агні загінулі:

**ДРОЗД Вольга Кліменцьеўна**, яе два сыны.

**ЧАРНАВОК Домна Анупрэеўна**, яе два сыны.

**ЧАРНАВОК Прасеня.**

**ПУТРА Яўгенія**, яе дачка, 7 гадоў, закатаваныя фашыстамі ў лютым 1943 г.

## ВЁСКА КУРЫЛАВА (ХОЦЬКАВА)

**Спалена ў сакавіку 1943.**

Загінулі:

**КАЗЛОЎ Барыс**, пад 60 гадоў.

**МАЦУЛЕВІЧ Васіль Міхайлавіч**, н. у 1880, яго жонка Хрысціна Дзмітрыеўна, н. у 1880, іх

А. Мацулевіч.

дачка Ганна, н. у 1911, нявестка Фядора Іванаўна, н. у 1917, і яе сыны: Алег Міхайлавіч, н. у 1939; Інакенцій, н. у 1940.

**САЎЛУК Ефрасіння Барысаўна**, каля 30 гадоў, і два яе сыны, н. у 1939 і 1940.

**Свольна памятае**

...Напрадвесні 1943 года па Асвейшчыне пракаціласа спусташальная карная экспедыцыя фашыстаў. Жыхары Курылава, як і тысячы асвейскіх бежанцаў, хаваліся ў прысвальнянскіх лясах. 13 сакавіка яны былі схоплены карнікамі. Расправу ўчынілі на прыбярэжным яры над ракой Свольнай, у ваколіцах былой вёскі Глінцы.

Калі гітлераўцы адступілі з Малавідаў, партызан Міхаіл Мацулевіч паехаў шукаць сваю сям'ю. Павыцягваў багром з ракі целы бацькоў, маці, жонкі, двух сыночкаў — усе ляжалі на дне побач, пастраляныя з аўтаматаў. Крыху воддаль знайшоў сястру — магчыма, спрабавала ўцячы ад смерці.

— Былі яны ўсе беленькія, чысценькія, — успамінае стары цяпер ужо чалавек, — але на паветры хутка пацямнелі... Адвёз усіх дадому, пахаваў у адной магіле на Стралкоўскіх могілках.

Там, на Свольне, шмат палегла маіх землякоў, толькі, мусіць, успомніць іх імёны ўжо няма каму. Помню вось Казловых, уся сямейка так у рацэ і засталася...

Брат Міхаіла Васіль працаваў у Асвейскім райкоме камсамола, яшчэ да вайны пайшоў служыць у Чырвоную Армію. Прапаў без вестак. Старэйшы брат Уладзімір прыйшоў з вайны жывым, жыў у Разані, на ўсе яго запыты з радзімы ішлі адказы: уся сям'я загінула. Толькі праз гады браты сустрэліся. Зараз з вялікай сям'і жывы адзін Міхаіл Васілевіч.

Усё, што ў яго засталося, — фотаздымкі. На адным — уся сям'я ў зборы — ад старога да малога, ды яшчэ сусед Пётр Ялоўскі, які таксама загінуў на вайне. На другім — зусім маленькі Алік — нейчыя родныя рукі падтрымліваюць яго — відаць, хлапчанё задаволена, што стаіць на ножках. На трэцім здымку — гэткім жа, як другі — толькі і бачны гэтыя маленькія ножкі ды частка крэсла. Міхаіл Васілевіч беражэ і гэта фота, бо яго там, на дне чорнай Свольны, прыціскала да грудзей сястра Ганна...

Здымкі цьмяныя, бадай, копіі з іх не атрымаюцца. Лепш захаваўся фотапартрэт брата Васіля, які ён прыслаў брату Міхаілу «на добрую і доўгую памяць».

*А. Бубала*

**ВЁСКА ЛУНІ**

**Спалена (15 двароў) у сакавіку 1943.**

З а г і н у л і:

**АЛЯХНОВІЧ Міхаіл Іванавіч**, н. у 1905, прапаў без вестак.

**АЛЯХНОВІЧ Васіль Ігнатавіч**, н. у 1905; жонка Клаўдзія, н. у 1907, іх дзеці: Ніна, 12 гадоў; Валянціна, 11 гадоў; Аляксандр, 10 гадоў; Пётр, 9 гадоў; Яўген, 8 гадоў; меншы сын, 7 гадоў.

**АЛЯХНОВІЧ Марыя**, н. у 1918.

**АЛЯХНОВІЧ Марыя**, н. у 1905, дачка Марыя Паўлаўна, н. у 1931.

**АЛЯХНОВІЧ Пётр Якаўлевіч**, н. у 1929.

**АЛЯХНОВІЧ Рыгор Антонавіч**, 60 гадоў, жонка Ганна, пад 60 гадоў.

**ЛУНЬ Сямён**, 60 гадоў; жонка Фёкла Пятроўна, пад 60 гадоў; іх дачка Агата, н. у 1916.

**ЛУНЬ Тарас Кузьміч**, сям'я, 2 чалавекі.

**СЕМЕНІК Віктар Іванавіч**, сям'я, 6 чалавек.

**СЕМЕНІК Іван Сцяпанавіч**, н. у 1898; жонка Марыя н. у 1900.

**СЕМЕНІК Ксеня Андрэеўна**, сын Цімафей, 6 гадоў; дачка Валянціна, 4 гады, — загінулі ў час карнай акцыі.

**СЕМЕНІК Іван Рыгоравіч**, н. у 1886, загінуў у канцлагеры.

**ШЫЦІК Мікалай Васілевіч**, сям'я, 7 чалавек.

**ВЁСКА МАРКАВА**

**Спалена (13 двароў) у сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

З а г і н у л і:

**АГУРЭЦКАЯ Ганна Іванаўна**, н. у 1907, дачка Тамара Феліксаўна, ўнучка, 2 гады, — спалены ў в. Вышнарава.

**АГУРЭЦКІ Фелікс**, дачка Валянціна — загінулі ў канцлагеры ў Германіі.

**АГУРЭЦКІ Якуб**, 70 гадоў; жонка Марыя, 70 гадоў, — спалены фашыстамі.

**АНДРУЧОНАК Іван Кузьміч**, 55 гадоў, памёр у час карнай аперацыі ў лесе ад тыфу. Пахаваны пры лясной дарозе Нямыцькі—Мікуліна.

**ВЁСКА МІКАЛЕНКІ**

**Спалена ў лютым 1943.**

**ЛЕМЯШОНАК Ганна Піліпаўна.**

## ВЁСКА МІХАЛІНА

**Спалена (18 двароў) у сакавіку 1943.**

**СКРЫПКА Піліп Піліпавіч**, н. у 1889 — загінуў у канцлагеры Майданак.

**СКРЫПКА Кацярына Ануфрыеўна**, н. у 1892 — загінула ў канцлагеры Равенсбрук.

## ВЁСКА МЯДЗВЕДЗЕВА

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**СТОМА Пётр**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЯСЮКЕВІЧ Броня Адамаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЯСЮКЕВІЧ Франц Іванавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА ПАДАРЫ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**АРЖАНІК Лявон І.**, сям'я, 6 чалавек.

**КУДЛА Пётр І.**, сям'я, 3 чалавекі.

**МАКАЁНАК Марыя С.**, сям'я, 2 чалавекі.

**ШУКЛІН Агата Сцяпанаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ШЫПЁНАК Яўген П.**, сям'я, 3 чалавекі.

## ВЁСКА ПАДГАЙСКІЯ

**Спалена (16 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі:

**ДРАЗДОВА Любоў Сяргееўна**, н. у 1918, забіта ў чэрвені 1944.

**КУДЛА Наталля**, яе двухгадовая дачка.

**ЛАПА Рыгор Антонавіч**, сям'я 2 чалавекі.

**МАРАЧКОЎСКАЯ Зінаіда Міхайлаўна.**

**МІКУЛЁНАК Аляксандра Васілеўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**МІКУЛЁНАК Вікенцій Сямёнавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**МІКУЛЁНАК Дар'я Пятроўна.**

**ПАДГАЙСКАЯ Аніcся Вікенцьеўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ПАДГАЙСКАЯ Лідзія**, 18 гадоў.

**ПАДГАЙСКІ Уладзімір**, 15 гадоў, — расстраляны каля в. Мікуліна.

**ШЫЦІК Вера Ягораўна**, яе сястра Ефрасіння — спалены ў в. Відокі ў 1943.

## ВЁСКА ПАПЕЛУШОВА

**Спалена ў лютым 1943.**

**ПРОХАРАВА Кацярына**, сям'я, 5 чалавек — прапалі без вестак.

## ВЁСКА ПУШЧАВЫЯ

Загінулі:

**БУРАК Вольга Мікалаеўна**, сям'я, 5 чалавек.

**БУРАК Ефрасіння Андрэеўна**, 35 гадоў.

**БУРАК Праскоўя Іванаўна.**

**ВЫДРЫЦКІ Васіль Іванавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**ВЫРВІЧ** (мужч.), 40 гадоў.

**ДУБІНА Дзмітрый Сямёнавіч**, сям'я, 6 чалавек.

**ДУБІНА Марыя Ігнатаўна**, н. у 1920.

**КАВАЛЁНАК Марыя Максімаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**КЛІМОВІЧ Агата Якубаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ПАЗНЯК Настасся Захараўна**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА РУБАНЫ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**КРУК Аляксей Пятровіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЛЕБЕДЗЬ Аляксандр Гаўрылавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ХАНЕЙКА Лявон Лявонавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ШАНДАР Варфаламей**, загінуў у Майданаку.

**ШАНДАР Дар'я Раманаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**ШАНДАР Пётр Варфаламеевіч**, н. у 1933, вязень канцлагера Саласпілс, памёр у 1948 г.

## ВЁСКА САЛІНА

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**БЯДУНЬКА Мікалай Уласавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**БЯДУНЬКА Палагея Мацвееўна.**

**МАЦКЕВІЧ Пётр Маркавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА САЎКЯЛІ

**Спалена (15 двароў) у лютым 1943.**

**ВЕРАМЕЙ Надзея Канстанцінаўна**, н. у 1906, загінула пры бамбёжцы г.п. Асвея ў ліпені 1941 г.

## ВЁСКА СВЯЦІЦА

**Спалена ў сакавіку 1943.**

З а г і н у л і:

**АНГУДОВІЧ Фёдар Канстанцінавіч**, яго жонка.

**ВАЛОДЗЬКА Вікенцій Пятровіч**, яго жонка і 4 дзяцей.

**ВАЛОДЗЬКА Матрона Піліпаўна.**

**ВАЛОДЗЬКА Улляна.**

**ВАЛОДЗЬКА Юзэп Пятровіч**, жонка і 5 дзяцей.

**ГІНЬКО Гелена.**

**ГІНЬКО Ілля Карпавіч**, жонка і дачка.

**ГІНЬКО Пётр Усцінавіч**, жонка і 7 дзяцей.

**ГІНЬКО Яфім Давыдавіч**, маці і ўнучка.

**КАЛЕСНІК Ігнат Усцінавіч.**

**КАЛЕСНІК Сцяпан Антонавіч** з жонкай.

**КОНАНАВА Ганна Еўдакімаўна** з сястрой і сынам.

**ЛАЎРУЦЬ Юзэфа**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЛАЎРУЦЬ Ягор Мікалаевіч**, маці і 3 дзяцей.

**ЛОСЬ Савелій Мікалаевіч**, маці, жонка і 3 дзяцей.

**МІХНО Аляксей Васілевіч** з сынам і дачкой.

**МІХНО Еўдакія Васілеўна** з сястрой.

**ПАЧКАЙ Кацярына Герасімаўна**, 2 дзяцей.

**СКРАДАВА Марфа Піліпаўна**, маці, сын.

**СКРЫПКА Васіль Андрэевіч**, жонка і 4 дзяцей.

**СКРЫПКА Зузана Андрэеўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ТАЎСТОБА Анеля Осіпаўна**, 3 дзяцей.

**ЯРОМЕНАК Аляксандр Рыгоравіч**, жонка, сын.

## ВЁСКА СКРЫПЧЫНА

**Спалена (11 двароў) у сакавіку 1943.**

З г а р э л і ў а г н і:

**КОНАНАЎ Захар Макаравіч**, 62 гады, жонка Праксэта, 60 гадоў.

**КОНАНАВА Настасся Іванаўна**, 45 гадоў, яе чацвёра дзяцей ад 3 да 10 гадоў.

**ПЛЕЙКА Матрона Іванаўна**, 44 гады, яе пяцёра дзяцей.

**ПЯТРОЎСКІ Іосіф**, 50 гадоў.

**УЛЬЯНОЎСКІ Андрыян Васілевіч**, 45 гадоў, яго жонка Марфа, 40 гадоў; дачка Лідзія, 12 гадоў; сын Дзмітрый, 4 гады.

**УЛЬЯНОЎСКІ Васіль**, 70 гадоў.

**УЛЬЯНОЎСКІ Дзмітрый**, 60 гадоў, яго жонка Настасся, 60 гадоў.

**УЛЬЯНОЎСКАЯ Фядосся Іванаўна**, 41 год, і яе дачка Марыя, 10 гадоў.

## ВЁСКА СТРАЛКІ

**У снежні 1943 г. бамбёжкай знішчана 27 двароў.**

З а г і н у л і:

**КРАСОЎСКІ Іван Ігнатавіч**, н. у 1876, жонка Марыя — спалены ў в. Царкоўна ў сакавіку 1943 г.

**АДАМЁНАК Конан Іванавіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**АДАМЁНАК Праскоўя Кузьмінічна.**

**ЗАЯЦ Ганна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЗУБР Ефрасіння Аляксандраўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**КАЗЁЛ Барыс Кандратавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**МАЦУЛЕВІЧ Васіль Міхайлавіч**, сям'я, 6 чалавек.

**ТАТАРЫНАВА Ганна Міхайлаўна**, сям'я, 6 чалавек.

**ТАТАРЫНАЎ Аляксей Васілевіч**, сям'я, 4 чалавекі.



Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Скрыпчына.

### ВЁСКА ШАЎРАКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**БАЦЁХА Домна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ДАВЫДЗЁНАК Агафон М.**, сям'я, 10 чалавек.

**ДАВЫДЗЁНАК Параска**, забіта ў в. Шаўракі.

**ДАВЫДЗЁНАК Пётр І.**, сям'я, 3 чалавекі.

**ДАВЫДЗЁНАК Эдзік**, 6 гадоў, яго сястра Галя, дзве меншыя сястры — спалены ў в. Малавіды.

**КУДЛА Улляна**, сям'я, 4 чалавекі.

**УРБАН Даніла**, жонка Алена.

**ЦЯРЭНЯ Аляксандра Міхайлаўна** — спалена ў в. Малавіды.

**ШАЎРАК Анеля** — спалена ў в. Рубаны.

**ШАЎРАК Вікенцій Казіміравіч**, яго жонка Марыя Сцяпанаўна, дзеці: Домна, н. у 1922; Франя, н. у 1924; Юзюк, Пётр — спалены ў в. Малавіды.

### ВЁСКА ЯРОХІ

**Спалена ў сакавіку 1943.**

Загінулі:

**ВАЛАДЗЁНАК Валодзя.**

**ВАЛАДЗЁНАК Еўдакія Іванаўна**, н. у 1890.

**ВАЛАДЗЁНАК Марыя Купрыянаўна.**

**ДАВАНОЎСКАЯ Ефрасіння Філіпаўна**, н. у 1916, сын Віктар Аляксандравіч, н. у 1939.

**КАЛМЫЧЭЎСКІ Віктар Іванавіч**, н. у 1933.

**САМУЙЛАЎ Апанас Тарасавіч**, яго дачка Надзея.

**СЦЯПАНАВА Надзея Іванаўна**, яе сын Яфім.

**СЦЯПАНАВА Шура.**

**ШКУТАЎ Мацвей Паўлавіч.**

**Расправа адбылася ў час карнай аперацыі. Людзі загінулі ў агні, ад куль і ад ран на ўсім шляху ад в. Ярохі да в. Малавіды, куды яны ўцякалі. Шмат хто трапіў у канцлагеры.**

## БІГОСАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА БАНДЗЕЛІ

**Спалена ў лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**АМБРУЖЭВІЧ Яніна**, 15 гадоў.

**БАГАЦКАЯ Марыя Вікенцьеўна**, н. у 1914, яе сын Іван, 7 гадоў; і меншы сын, 2 гады.

**ПЛУЦЬ Іосіф**, 35 гадоў, яго жонка Подзя, 32 гады, дочкі Вікторыя і Яніна, 8 гадоў.

**ЖЫНГЕЛЬ Анеля**, 70 гадоў.

**ЖЫНГЕЛЬ Антунеля**, 87 гадоў.

**ЖЫНГЕЛЬ Ганна**, 50 гадоў.

**ЖЫНГЕЛЬ Паўліна, 74 гады.**

**ЖЫНГЕЛЬ Фаціна**, н. у 1911, сын, 2 гады, і сястра, 16 гадоў.

**ІЖЫК Франц Ігнатавіч**, 64 гады, жонка Франя, 55 гадоў, іх дачка Поля, н. у 1929; сыны Валодзя, 12 гадоў; Валера, 7 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК Іван**, 36 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК Соф'я**, 33 гады.

**ЛОГІН Ганна**, 47 гадоў, яе муж Сяргей, 50 гадоў: дачка Вікторыя, 12 гадоў.

**МАРЦІНКЕВІЧ Адальфіна Вікенцьеўна**, н. у 1912, яе сын, дачка, н. у 1934.

**МАРЦІНКЕВІЧ Адольф**, 60 гадоў, яго жонка Соф'я, 57 гадоў, сын Іосіф, 30 гадоў.

**САМУЙЛЁНАК Людвіг**, н. у 1870.

**САМУЙЛЁНАК Мальвіна**, н. у 1875.

**САМУЙЛЁНАК Ганна**, 25 гадоў.

**СЦЕПАНОВІЧ Эмілія**, 68 гадоў.

**СЦЕФАНОВІЧ Адальфін Вікенцьевіч**, н. у 1912, яго двое дзяцей і прыёмная дачка.

**СЦЕФАНОВІЧ Марыя Вікенцьеўна**, н. у 1915.

**УСЕЛЕНАК Іван Сямёнавіч**, н. у 1923.

**ШУКЕЛЬ Альфонс**, 85 гадоў.

**ШУКЕЛЬ Вера Вікенцьеўна**, н. у 1911, яе дзеці — Павел, н. у 1935, і Марыя, н. у 1938.

**ШУКЕЛЬ Вінцэся**, н. у 1911, яе сын Беня, 9 гадоў.

**ШУКЕЛЬ Ганна.**

**ШУКЕЛЬ Ігнат**, 73 гады, яго жонка Анеля, 70 гадоў.

**ШУКЕЛЬ Люцыян Антонавіч**, 78 гадоў; жонка Ганна, 76 гадоў.

**ШУКЕЛЬ Марыя**, 70 гадоў.

**ЯРАШ Уладзімір Антонавіч**, н. у 1911, яго жонка Геня, н. у 1912; сын Станіслаў, 2 гады; дочкі Ганна і Вера, н. у 1938.

**ЯСЮКЕВІЧ Настасся**, 75 гадоў.

**ЯСЮКЕВІЧ**, хлопчык, 2 гады.

### ВЁСКА БАРАВЫЯ

**Спалена ў лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**АМЯЛЬЧОНАК Кацярына Юльянаўна**, 75 гадоў, яе дачка.

**АМЯЛЬЧОНАК Стэяя**, 72 гады.

**БУКА Канстанцін**, 70 гадоў, яго жонка, 67 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Вера Пятроўна**, н. у 1907, яе дачка Ала Сцяпанаўна, 5 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Паліна**, 45 гадоў, тры яе сыны, 6, 4 і 2 гады.

**ВЕРАБЕЙ Сцяпан**, 73 гады, яго жонка Леанора, 70 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Сямён Карлавіч**, 62 гады, яго пляменніца Валянціна Мікалаеўна, 17 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Эдуард Ануфрыевіч**, 40 гадоў; яго маці, 70 гадоў; жонка Люцыяна, 40 гадоў; дачка, 12 гадоў; сын, 10 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Эмілія**, 45 гадоў; яе сын, 10 гадоў.

**ЛЫСАВА Настасся Герасімаўна**, 43 гады.

**УРБАН Браніслава Ігнатаўна**, 42 гады; яе дочкі Галіна, 9 гадоў , і Зінаіда, 4 гады.

## ВЁСКА БІГОСАВА

**ЗАВОДНІК Гелька (Посавіха)**, 70 гадоў; унучка Ганна, 3 гады, расстраляныя 2.2.1942 у в. Дрысе.

**КІСЯЛЕВІЧ Вікенцій Вікенцьевіч**, н. у 1907, у сакавіку 1943 г. вывезены ў канцлагер, прапаў без вестак.

Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Вароны.

## ВЁСКА ВАРОНЫ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ВАСІЛЕЎСКАЯ Вольга**, 65 гадоў, з в. Лявошкі.

**ЗАВАДСКІ Эдвард Іванавіч**, 65 гадоў; жонка Ганна, 56 гадоў.

**КІЧ Эмілія**, 63 гады.

**ЛЯВОШКА Вольга**, 50 гадоў.

**МАСАЛЬСКАЯ Кліманціна Іванаўна**, 52 гады.

**НЕВЯРОЎСКАЯ Ганна Іванаўна**, 48 гадоў, яе сястра Марыя, 50 гадоў.

**ПАПСУЕВІЧ** (жанчына), 55 гадоў, дачка Надзея Міхайлаўна, н. у 1924.

**ПАЦЭВІЧ Міхаліна**, 60 гадоў.

**УРБАН Зузана Іосіфаўна**, 65 гадоў.

**ШАБАЛТАС Франц Якаўлевіч**, 63 гады.

## ВЁСКА ВОРЗАВА

**Спалена (26 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі ў агні:

**БУЖЫНСКІ Мікалай Якімавіч**, н. у 1903; жонка Казіміра Ігнатаўна, н. у 1906; і дочкі: Валя, 6 гадоў; Ядзя, 4 гады; дзве дачкі, 10 і 8 гадоў.

**БУЖЫНСКІ Аркадзь Якімавіч**, н. у 1912; жонка Ганна Усцінаўна, н. у 1914; дзеці — Зінаіда, 6 гадоў; Люся, 4 гады; Антон, 2 гады.

**БУЖЫНСКІ Фёдар Якімавіч**, н. у 1917; яго сястра, 30 гадоў, з трохгадовай дачкой, бацька Якім Пятровіч, н. у 1874; маці, Домна Максімаўна, н. у 1878.

**ВАРАНОВІЧ Ігнат Пятровіч**, н. у 1903; жон-

Магіла ахвяр фашызму ў вёсцы Ворзава.

ка Міхаліна, н. у 1907; дачка Алена, 5 гадоў; сын Пётр, 7 гадоў.

**ГАДУН Вікенцій Адамавіч**, 60 гадоў; жонка Марыя Пятроўна, 50 гадоў; сын Станіслаў, 17 гадоў; дачка Ядзя, 12 гадоў.

**ГІРУЦКІ Вячаслаў Вікенцьевіч**, н. у 1905; жонка Даната Рыгораўна, н. у 1913.

**ІЖЫК Іосіф**, н. у 1913, жонка Ксеня Якімаўна, н. у 1915; дачка Тамара, 6 гадоў.

**ІЖЫК Пётр Антонавіч**, н. у 1906; жонка Ганна Іванаўна, н. у 1903; дачка Ядвіга, 3 гады.

**КАНЮШЭЎСКАЯ Александрына**, н. у 1880; дачка Яніна, н. у 1903; унучкі — Валянціна, 16 гадоў; Марына, 12 гадоў.

**КАНЮШЭЎСКАЯ Каміля Станіславаўна**, 50 гадоў; дочкі: Валянціна, 25 гадоў; Гелена, 20 гадоў; унучка з в. Карценева, 3 гады.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Канстанцін Осіпавіч**, н. у 1875.

**ЛІДАЕВІЧ Вячаслаў Іванавіч**, н. у 1914; жонка Анеля, н. у 1917; сын Уладзімір, 3 гады.

**МАРХЕЛЬ Апанас Антонавіч**, 60 гадоў; дачка Ганна, н. у 1925; сын Уладзімір, 22 гады; нявестка Яніна, н. у 1924; унук, унучка.

**МАРЦІНКЕВІЧ Іван Іванавіч**, н. у 1880; жонка Юзэфа, н. у 1880; дачка Адэля, н. у 1905.

**НІЦЕЦКІ Пётр Леанідавіч**, 50 гадоў; жонка Тэкля Іванаўна, 45 гадоў, дзеці — Антон, 12 гадоў; Пётр, 10 гадоў; Алена, 11 гадоў, Франц, 14 гадоў; пляменніца Ядзя, 4 гады.

**НЯМІРА Віктар Пятровіч**, н. у 1905, жонка Франя, н. у 1907, дзве дачкі: Валянціна, 10 гадоў; Алена, 6 гадоў.

**НЯМІРА Зузана Сцяпанаўна**, 60 гадоў.

Дзве жанчыны-манашкі па 60 гадоў.

## ВЁСКА ГЕЙЖАНАВА

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ІЖЫК Эдуард Канстанцінавіч**, дзве яго дачкі: Надзея, н. у 1929; Дзіна, н. у 1940.

**ШПАКОЎСКІ Мацвей**, закатаваны ў канцлагеры Саласпілс.

## ВЁСКА ГРЫГОРАЎШЧЫНА

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**БЫКОЎСКІ Уладзімір Сігізмундавіч**, 16 гадоў, навучэнец рамеснага вучылішча, у час ленінградскай блакады.

**ШКЕЛЬ Герасім Паўлавіч**, у канцлагеры.

## ВЁСКА ДУБНІКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ІЖЫК Канстанцін Ігнатавіч**, н. у 1898, жонка Ганна Сільвестраўна, н. у 1900; сыны Дамінік, 12 гадоў; Ігнат, 10 гадоў, — спалены.

**ІЖЫК Сільвестр Сільвестравіч**, н. у 1886, удзельнік рэвалюцыі і грамадзянскай вайны — забіты ў канцлагеры Майданак. Яго жонка Анеля, дочкі Вольга, Ніна, сын Пеця расстраляны ў роднай хаце.

## ВЁСКА ДУМАНЬКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ВОРЗА Эрык Казіміравіч**, н. у 1932.

**ПАНЬКО Іван Станіслававіч**, н. у. 1932, яго брат Эдуард, н. у 1928, — схоплены гітлераўцамі пры мініраванні чыгункі.

## ВЁСКА ЗАПАСІШКІ

**Спалена (13 двароў) у лютым 1943 г. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**КАСЬКОВІЧ Ганна**, яе дачка і сын.

**КОЗЕЛ Пётр Канстанцінавіч** — расстраляны ў Малавідаўскім лесе.

**КРОМАН**, жонка Паўла, іх чацвёра дзяцей.

**ЛАГОШ Ганна**, 40 гадоў, — расстраляная.

**МАЛЕЙ Аляксандра Канстанцінаўна**, 35 гадоў, з сынам Маратам, 4 гады, расстраляныя ў

Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Запасішкі.

в. Сакалова, яе дачка Яніна Міхайлаўна, 6 гадоў, спалена ў в. Жарнасекі.

**ПІВАВАРАНКІ**, муж і жонка, іх дзеці.

**РЫНКЕВІЧ Вера Пятроўна**, 38 гадоў, расстраляная ў в. Сакалова.

**САРДЫКА Агата Іванаўна**, н. у 1890, памерла ад тыфу ў час карнай аперацыі.

**САРДЫКА Міхаіл Іванавіч**, н. у 1894, яго дачка Яніна, 17 гадоў.

**ЯНОВІЧ Ягор** загінуў на фронце, двое яго сыноў прапалі без вестак.

## ВЁСКА ЗАРАЧАНЕ

**Спалена 13 лютага 1943.**

**ГІРУЦКІ Сільвестр**, 60 гадоў; жонка Соф'я, 57 гадоў; дачка Вікторыя, каля 40 гадоў, — спалены ў в. Каменцы.

## ВЁСКА КАМЕНЦЫ

**Спалена (7 двароў) у лютым 1943.**

Загінулі ў агні:

**ГІРУЦКАЯ Аршуля Людвігаўна**, 57 гадоў; яе сын Зынон Станіслававіч, н. у 1916.

**МАРОЗ Іосіф**, 60 гадоў.

**МАРОЗ Станіслаў**, 52 гады; жонка Клімянціна, 46 гадоў; дачка Марыя, н. у 1918.

**ПАПСУЕВІЧ Александрына**, 55 гадоў.

**ПАПСУЕВІЧ Зузана**, 52 гады.

**ПАПСУЕВІЧ Вера**, 54 гады.

**ПАПСУЕВІЧ Сцяпан.**

**УСЕЛЕНАК Вольга.**

**УСЕЛЕНАК Пётр**, 54 гады; жонка Ганна, 50 гадоў.

## ВЁСКА КАРЦЕНЕВА

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Мечыслаў Данатавіч**, н. у 1928, спалены ў в. Ворзава.

**ГІЛУЦЬ**, н. у 1936, прапаў без вестак у канцлагеры Саласпілс, яго брат загінуў пры «медыцынскіх доследах» у канцлагеры Саласпілс.

**СТАНКЕВІЧ** (дзяв. **ПАРХОМЕНКА) Вольга**, былы аграном, загінула.

**СТАНКЕВІЧ Казімір** — спалены ў сваёй адрыне.

**СТАМБРОЎСКАЯ**, страціла розум, калі ў яе адабралі дзяцей, прапала без вестак у канцлагеры Саласпілс.

## ВЁСКА КЕКАРЫ

**Спалена (9 двароў) у лютым 1943.**

**АЛЯХНОВІЧ Юзэфа Уладзіміраўна**, н. у 1902, загінула ў канцлагеры Равенсбрук.

**БЕРНАТОВІЧ Адэля**, спаленая ў 1943.

**ГЯЧ Паша Іосіфаўна**, загінула ў канцлагеры.

**ЦЫНГЕЛЬ Канстанцін Антонавіч** і яго жонка Аўдоля Сабастыянаўна, загінулі ў канцлагеры ў г. Любліне, іх сын Вікенцій, н. у 1940, памёр у канцлагеры Саласпілс.

## ВЁСКА КЛАПШЫ

**Спалена 15.2.1943.**

Загінулі ў агні:

**АНДРУКОВІЧ Іван Герасімавіч**, 15 гадоў.

**ІЖЫК Мальвіна Вікенцьеўна**, н. у 1895, яе дзеці: Баляслаў, 15 гадоў; Ганна, 10 гадоў; Вікенцій, 8 гадоў.

**МАСЛОЎСКАЯ Гунэфа**, н. у 1905.

**МАСЛОЎСКІ Іван Міхайлавіч**, н. у 1904.

**МАСЛОЎСКІ Міхаіл Францавіч**, 70 гадоў.

**НЯМІРА Іван**, 60 гадоў, жонка, дзве дачкі, сын.

**РУБАН** (жанчына), 60 гадоў, яе сын Станіслаў, 18 гадоў; дачка, 35 гадоў; унук, 3 гады.

**РУБАН Станіслаў Іосіфавіч**, н. у 1890, яго сын Іосіф, н. у 1917.

**СУШЫНСКІ Іосіф Станіслававіч**, н. у 1908, яго жонка Ганна Пятроўна, н. у 1910; дачка Франя, 16 гадоў.

**ХЛАМОК Станіслаў Канстанцінавіч**, н. у 1904, жонка Эмілія Іванаўна, н. у 1907, сын Станіслаў, 10 гадоў; дачка Ядзя, 8 гадоў.

**ЧЭКІЛЬ Іван Антонавіч**, н. у 1905, жонка Дуня, н. у 1907, дачка Валянціна, 16 гадоў.

**ШУКЕЛЬ Пётр Пятровіч**, н. у 1900, жонка Міхаліна, н. у 1905, сын Франц, 13 гадоў.

## ВЁСКА КРЫВАСЕЛЬЦЫ

**Спалена (42 двары) у лютым 1943.**

Загінулі:

**ЖОЎНЕР Франц Станіслававіч**, н. у 1870.

**ЛЯХ Іван Станіслававіч**, н. у 1907, памёр 10.9.1945, пахаваны ў г. Рослаў (Германія).

**ЛЯХ Марыя Іванаўна**, н. у 1900.

**САМУЙЛЁНАК Адам Антонавіч**, н. у 1870, жонка Ганна, н. у 1875.

**САМУЙЛЁНАК Ігнат Антонавіч**, н. у 1870.

## ВЁСКА КРЭЎНІКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**БАРЭЙКА Ульяна**, 63 гады.

Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Крэўнікі.

**БАРЭЙКА Марыя**, 30 гадоў.

**ЖЫНГЕЛЬ** (жанчына), 65 гадоў, расстраляна ў лютым 1943.

**ЗАМБАР Юлій**, спалены ў в. Расіца, яго жонка загінула ў канцлагеры Майданак.

**МЯДЗЮТА Барбара Станіслававўна**, 60 гадоў.

**ТРЫБІС Любоў**, 40 гадоў.

**УНСОВІЧ Фёдар Парфёнавіч**, 53 гады — спалены ў в. Цыгельнікі.

**САКСОН Андрэй Станіслававіч**, загінуў у канцлагеры Майданак.

**САКСОН Дзіма**, н. у 1937, памёр пасля вайны ад страты крыві ў канцлагеры.

**САКСОН Іван**, 50 гадоў, яго жонка Паліна, 42 гады; сын, 5 гадоў, расстраляны каля в. Абразэева.

**САЎРУЦКАЯ**, загінула ў канцлагеры Саласпілс.

## ВЁСКА КУЛАКОВА

**Спалена ў лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**ЛАМІНСКІ Сцяпан Аляксеевіч**, н. у 1900, спалены, яго дачка Алена, н. у 1941, памерла ў канцлагеры Саласпілс.

Магіла ахвяр фашызму ў вёсцы Кулакова.

**ЛАМІНСКІ Яўстафій**, 47 гадоў.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Адам Міхайлавіч**, 40 гадоў, яго жонка Вера, дачка Зінаіда і тры меншыя дачкі.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Баляслаў Іванавіч**, н. у 1892, і яго сын Вітольд, н. у 1927.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Ганна**, 60 гадоў.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Іосіф Міхайлавіч**, 35 гадоў.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Клімянціна Іосіфаўна**, н. у 1897.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Марыя Нічыпараўна**, н. у 1915, і яе сын Чэслаў Іосіфавіч, 1 год.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Эмілія Міхайлаўна**, 38 гадоў, сын, 6 гадоў.

**МАРХЕЛЬ Эмілія Паўлаўна**, 40 гадоў.

**МІГАНОВІЧ Фёкла Іванаўна**, 40 гадоў.

**З пісьма Ванды Баляславаўны Лаўрыновіч, г. Мінск**

*...Аб тым, што будуць паліць вёску, папярэдзіла мая двайродная сястра Юлія Іосіфаўна Іжык, якая жыла ў вёсцы Гейжанава. Яна бегла са сваімі чатырма дзецьмі і крычала ўстрывожаным людзям, што выйшлі на вуліцу, каб яны хутчэй збіраліся і ад'язджалі.*

*Быў яшчэ світанак, а на вуліцы ўжо былі не толькі нашы вяскоўцы, але і жыхары з Клагішаў. Юля паспела ўцячы ў Сушкі, толькі гора не мінула яе і там: дзве яе дачушкі былі разарваныя снарадам ужо пасля, як ішоў фронт, а мужа расстралялі яшчэ раней.*

*Дык вось, калі яна прабегла праз Кулакова, усе пачалі хутчэй збірацца: пазапрагалі коней, апранулі дзяцей, схапілі які харч і рушылі ў дарогу. Некалькі сем'яў паспелі праскочыць да Бацянова, там блізка лес. А сем'і Лаўрыновіча Адама, Лаўрыновіча Баляслава і іншыя не паспелі. Іх вярнулі карнікі, якія ішлі ад Чарнагоркі*

*і Сандараўскага лесу. Некаторыя з іх размаўлялі па-руску.*

*У Кулакове пачалася «сарціроўка». Сарціравалі да вечара, бо людзей было шмат. Частку пагналі на падводах і пешака ў Бігосава. Як толькі ад'ехалі ад вёскі, стаў зразумелы лёс астатніх: успыхнулі полымем школа і пуня, якія стаялі на гары і былі добра бачны, а за імі запалалі ўсе хаты. Вечар быў марозны, неба яснае і зорнае, шмат снегу...*

*Ужо пад вясну Юля з жанчынамі хадзіла на пажарышча. Яны пахавалі спаленых людзей і паставілі драўляны крыжык.*

*Пасля вайны мы пайшлі на месца былога Кулакова, там быў ужо лепшы крыж з імем Івана Маслоўскага. Нас ахапіў смутак, што астатнія засталіся безыменнымі. Параіліся з Эдуардам Віктаравічам Лаўрыновічам, Героем Савецкага Саюза, ён з'ездзіў у райком, і ўрэшце побач з крыжам паўстаў помнік жыхарам.*

## ВЁСКА ЛІПАЎКІ

**Спалена (64 двары) у лютым 1943.**

З а г і н у л і:

**АМЯЛЬЧОНАК Нічыпар**, 55 гадоў; жонка Платыння, 50 гадоў; сын, 9 гадоў.

**АМЯЛЬЧОНАК Станіслава**, 40 гадоў; тры дачкі: Вераніка, Лідзія, Галіна.

**АМЯЛЬЧОНАК Эмілія**, 40 гадоў, свякроў, дзве дачкі, 5 і 7 гадоў.

**АСТАПКОВІЧ Марыя,** 57 гадоў.

**АСТАПКОВІЧ Павел Карлавіч**, 35 гадоў; сын Леанід, 12 гадоў.

**АЎСЮК Канстанцін**, 55 гадоў; жонка Вера, 45 гадоў; сын, 4 гады; дачка, 3 гады.

**АЎСЮК Мальвіна**, 55 гадоў.

**БАРСУК Фёдар Андрэевіч**, 50 гадоў.

**БАРЭЙКА Браніслава**, 60 гадоў.

**БАРЭЙКА Ефрасіння,** сын Эдуард, дачка Яніна.

**БАРЭЙКА Праскоўя**, 50 гадоў.

**БАРЭЙКА Е.** (жанчына), 70 гадоў.

**БАРЭЙКА Ф.І.** (жанчына), 68 гадоў.

**БАРЭЙКА Іосіф Францавіч**, 60 гадоў; жонка Тэкля, 57 гадоў.

**БАРЭЙКА Юзэфа Іванаўна**, 35 гадоў; дзве дачкі, 9 і 12 гадоў.

**БЕЛІКАВА Ганна**, яе трое дзяцей.

**БЫКОЎСКІ Ігнат**, 56 гадоў; жонка Кацярына, 53 гады; дзеці — Франя, 16 гадоў; Алена, 14 гадоў; Іосіф, 18 гадоў.

**БЯЛЕЙ Адольф Ігнатавіч**, 56 гадоў; маці, 75 гадоў; сын, 8 гадоў.

**БЯЛЕЙ Настасся**, 45 гадоў, яе двое дзяцей.



Магіла ахвяр фашызму ў вёсцы Ліпаўкі.

**БЯЛЕЙ Міхаіл**, 53 гады; жонка, трое дзяцей ва ўзросце 8—13 гадоў.

**ВАРОНА Гелена Карлаўна**, 55 гадоў; сын Антон Іосіфавіч, 8 гадоў.

**ВАРОНА Ганна**, 60 гадоў.

**ВАРОНА Марыя,** 40 гадоў; сын, 10 гадоў; дзве дачкі, 7 і 8 гадоў; бацька, 70 гадоў.

**ВАРОНА Фёдар**, 70 гадоў; жонка Тэкля, 68 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Антон І.**, 55 гадоў; жонка, сын, 9 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Вікенцій Ігнатавіч**, 55 гадоў; жонка Юлія, 52 гады; нявестка Ганна Васілеўна, 25 гадоў; яе сын Віталь Баляслававіч, 5 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Канстанцыя Іванаўна**, 35 гадоў, сыны — Генадзь, 5 гадоў; Іван, 7 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Марыя Раманаўна**, 55 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Мікалай І.**, 55 гадоў; жонка Еўдакія, 53 гады; дачка, 13 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Пётр**, 43 гады; жонка Ганна, 40 гадоў; сын, 11 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Таццяна,** 50 гадоў; сын 10 гадоў.

Ф. А. Барсук.

**ВЕРАБЕЙ Франя Вікенцьеўна**, 35 гадоў, яе дзеці — Лідзія, н. у 1934; Валянціна, н. у 1936; Аркадзь, н. у 1938.

**ВЕРАБЕЙ Юзэфа Іосіфаўна**, 35 гадоў; дзве дачкі, 5 і 6 гадоў.

**ВЕРАБЕЙ Якаў К.**, 65 гадоў.

**ГАЖЭЎСКАЯ Ядвіга Данатаўна**, 14 гадоў, браты Станіслаў, 16 гадоў; Уладзімір, 6 гадоў.

**ГІРУЦКІ Станіслаў**, 70 гадоў, жонка, 67 гадоў.

**ГОРНІК Гаўрыла Дзмітравіч**, 55 гадоў; жонка Барбара, 52 гады; дочкі Альбіна, 16 гадоў; Рэгіна, 14 гадоў.

**ЗАМБАР** (жанчына), 33 гады, з дзіцем.

**ЗАМБАР Тамара Баляславаўна**, 5 гадоў.

**ЗАМБАР Мальвіна**, 35 гадоў.

**ЗАМБАР Усцін Ігнатавіч**, 55 гадоў; жонка Адэля, 50 гадоў; сын Валянцін, 10 гадоў; маці, 75 гадоў.

**КАЛАСОЎСКАЯ Марыя**, 55 гадоў; сын, 16 гадоў; дачка, 14 гадоў.

**КАРПЁНАК В.** (жанчына), 57 гадоў.

**КАРПЁНАК Каміля**, 30 гадоў.

**КАРЦЕНЬКА В.** (жанчына), 60 гадоў.

**КАЧАН Аксеня**, 70 гадоў.

**КРЫЦКАЯ Надзея**, 60 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК А.**, 72 гады.

**ЛЕВІНЁНАК Гелена Вікенцьеўна**, 35 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК Васіль Раманавіч**, 65 гадоў; жонка Барбара Андрэеўна, 50 гадоў; дачка Франя, 10 гадоў; сын Пётр, 16 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК Вольга Іванаўна**, 63 гады.

**ЛЕВІНЁНАК Іосіф**, 58 гадоў; жонка Аляксандра Раманаўна, 56 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК Марыя Іванаўна**, 50 гадоў; дачка, 12 гадоў; сын, 9 гадоў.

**ЛЕВІНЁНАК П.** і тры члены яго сям'і.

**МІШКІНЬ**, 50 гадоў; жонка, двое дзяцей.

**РАКШНЯ Браніслава Іосіфаўна**, 36 гадоў, сыны Антон Віктаравіч, 16 гадоў; Іван, 14 гадоў.

**РАКШНЯ Дзяменцій**, 70 гадоў; сын Фёдар, 43 гады; дачка Антаніна, 33 гады.

**ТВАРАНОВІЧ Пётр**, 70 гадоў; жонка, 68 гадоў; дачка Дар'я, 48 гадоў.

## ВЁСКА МАРАЗЫ

**Спалена (13 двароў) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**МАРОЗ Соф'я Дзяменцьеўна** — загінула ў канцлагеры Асвенцім.

## ВЁСКА МАСЕВА

**Спалена ў лютым 1943.**

**БЕРАЗОЎСКІ Браніслаў Іванавіч** — спалены ў в. Кулакова.

Б. І. Беразоўскі.

**ЛІСОЎСКАЯ** — загінула ў канцлагеры ў Германіі.

## ВЁСКА МЕЖАЛЫ

**Спалена (18 двароў) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі ў агні:

**ГУДОЎСКАЯ Эмілія**, 45 гадоў.

**ДЗІСМЕНЦІК Канстанцыя**, 40 гадоў; сын Алік; 12 гадоў; маці, 65 гадоў.

**ЗАВАДСКАЯ Гунэфа**.

Помнік на месцы спаленай вёскі Межалы.

**КАВАЛЕЎСКАЯ**, яе сын, 6 гадоў; сястра, 42 гады.

**КАВАЛЕЎСКАЯ Туфіля**, 47 гадоў.

**КАВАЛЕЎСКАЯ Зося**, 57 гадоў, яе сястра, 60 гадоў.

**НЯМІРА Адольф**, 52 гады; жонка Анеля, 46 гадоў; дочкі Марыя і Валянціна, па 19 гадоў.

**НЯМІРА Вільгуся**, 45 гадоў; яе маці, 65 гадоў.

**НЯМІРА Вольга**, 50 гадоў.

**ТРЫБІС**, яго дачка, сын і сястра.

**ШУКЕЛЬ Сільвестр** з жонкай і сынам Іванам.

**ШУКЕЛЬ Яраслаў**, 63 гады; яго дачка, 24 гады.

**ЯРУШ** (жанчына), 60 гадоў.

**РУБАН Уладзімір Францавіч**, н. у 1923, трапіў у акружэнне пры перагоне за лінію фронту трактароў Бігосаўскай МТС, загінуў у канцлагеры.

## ВЁСКА МІСНІКОВА

**Спалена ў лютым 1943.**

**БАБКОВІЧ Даніла**, 66 гадоў.

**БАБКОВІЧ Мікалай**, 65 гадоў.

**ЛАЎЧЫНОЎСКІ Віктар Сідаравіч**, 68 гадоў.

**ЛАЎЧЫНОЎСКІ Іван Ігнатавіч**, 50 гадоў.

**СТАКЛА Сільвестр**, 67 гадоў.

Гэтыя жыхары спалены ў в. Сушкі.

## ВЁСКА НЕМЦЫ

**Спалена (11 двароў) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БАРАНОВІЧ Анеля**, спалена ў в. Вопытная.

**ВЯТРОВА Юлія Ягораўна**, н. у 1861, спалена ў в. Немцы.

**ГРЭЕР Адам Антонавіч**, н. у 1865, спалены ў в. Ворзава.

**ГРЭЕР Іван Адольфавіч**, 4 гады, прапаў без вестак у канцлагеры.

**УСЕЛЕНАК**, 14 гадоў, застрэлены; яго сястра Рэня атручана ў прытулку.

## ВЁСКА НОВАЕ СЯЛО

Загінулі:

**АПАЛЬКА Кацярына Сцяпанаўна**, 50 гадоў.

**ПЛОЦІНА Адэля**, 45 гадоў.

**РАМАНОЎСКАЯ Марыя**, 48 гадоў; дачка Фаіна, 20 гадоў, — загінулі ў час бою партызан з гітлераўцамі за пераправу цераз р. Заходнюю Дзвіну ў 1943.

## ВЁСКА ПАЎЛЮКІ

**ЛЯШКО** (мужчына), 70 гадоў.

**ШАБАЛТАС Нікадзім**, 50 гадоў. Абодва спалены ў в. Вопытная.

## ВЁСКА ПЛІГАЎКІ

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**БУЖЫНСКІ Ігналя** і яго сястра.

**КАСЬКЕВІЧ Подзя**, яе дачка Яніна Пятроўна, н. у 1926; сын Зынон, н. у 1929.

**КОРАШ Антон**.

**КОРАШ** (жанчына), яе дачка Валянціна Феліксаўна, н. у 1929; сын Антон, н. у 1931.

**МАЛЬКЕВІЧ** (жанчына), яе дачка і ўнук.

**МАЛЬКЕВІЧ (БОГУЦЬ)**, яе дачка і ўнучка.

**ШАЦЁР Антон**, жонка, сын Мікалай, н. у 1928; сын Іван, н. у 1930; 2 дачкі адпраўлены ў канцлагер Саласпілс, прапалі без вестак.

**ШАЦЁР Рэгіна Юльянаўна**, 9 гадоў, адпраўлена ў канцлагер Саласпілс, прапала без вестак.

**ШАЦЁР Ігнат**, жонка, сыны — Пётр, н. у 1926; Уладзімір, 7 гадоў.

**ШАЦЁР** (жанчына), яе сын Мікалай Юльянавіч, н. у 1927; дачка Яўгенія, н. у 1929.

**ШАЦЁР Настасся**, яе дачка Ванда Іванаўна, н. у 1926; малодшая дачка, 7 гадоў.

Помнік на месцы спаленай вёскі Немцы.

**З пісьма Валянціна Францавіча Бердзігана, в. Дзёрнавічы**

*«...Пакутліва ўспамінаю імёны людзей, што жылі ў суседняй з Панорамі вёсцы Плігаўкі, якіх я добра ведаў і твары якіх бачу перад сабою, бы жывыя...*

*Уранку 16 лютага 1943 года (гэта быў аўторак) вялікі атрад карнікаў у белых маскхалатах прыйшоў з-за чыгункі ў вёску. У Плігаўках пачалася расправа. З 30 чалавек загінулі 25. Уцалелі нейкім цудам пяцёра дзяцей, якія апоўдні прыбіліся да людзей з суседніх вёсак. Галя Каськовіч пайшла ў Баліны, яна і зараз жыве. Астатнія — Шацёр Рэня і яе аднафамільцы — трое дзяцей з сям'і Антона Шатра — прыйшлі ў Бігосава. Старэйшы з усіх — Іван (13 гадоў) мёс на руках немаўля. Іх потым, напэўна, звезлі ў канцлагер, і звестках аб іх няма дасюль.*

*Сястра і брат Жэня і Коля Шацёр у час расправы ўцякалі ў нашу вёску, але карнікі дагналі іх на конях: пастралялі.*

*На месцы згарэлай хаты Настассі Шацёр быў знойдзены абгарэлы шкілет дзіцяці — напэўна, гэта была яе малодшая дачка. У абгарэлым трупіку на пажарышчы Каськевічаў апазналі хлапчука Зынона.*

*Учыніўшы расправу, карнікі накіраваліся ў Запасішкі. Перад сабою яны гналі старога Антона Кораша, а самі ішлі па снезе па яго слядах. Калі стары знясілеў, яго застрэлілі.*

*Усіх забітых звезлі ў адну пуню, якую падпалілі.*

*У пачатку сакавіка жыхары вёскі Паноры пахавалі сваіх загінуўшых суседзяў. Магілу выкапалі пасярод былой вёскі на месцы згарэлай пуні, дзе зямля была адталай. Паставілі драўляны крыж.*

*Снег па ўсёй вуліцы быў прапітаны парыжэлай крывёй. Паднялі з зямлі старэнькую зімовую шапку, якую насіў дзед Ігнат Бужынскі, паклалі яе на магілу.*

*Пасля арміі я часта прыходзіў у былыя Плігаўкі. Усё там парасло бур'яном. Есць старыя дрэвы. Аднак яшчэ здалёк бачна высокая галінастая плакучая вярба, што расла ля вясковай вуліцы — адзіны помнік былой вёсачцы, яе мірным працаўнікам, якія сталі бязвіннымі ахвярамі фашысцкіх галаварэзаў...»*

## ВЁСКА ПЛЯЦЫ

**Спалена (14 двароў) 16.2.1943. Згарэлі 39 мірных жыхароў. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БАРЭЙКА Марыя Сцяпанаўна**, 45 гадоў, пяць дачок ад 5 да 16 гадоў.

**ПУШЛЯК Аляксандр**, сям'я, 4 чалавекі.
**САДОХА Пётр Пракопавіч** з сям'ёй.

## ВЁСКА НІЖНЯЕ ХАМІНО

**Спалена (17 двароў) у лютым 1944. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**ВЯЛІЧКА Ганна.**

Помнік ахвярам фашызму ў былой вёсцы Ніжняе Стунжава.

**ГАДУН Іван**, н. у 1898.
**ГІРГЕЛЬ Ефрасіння**.
**ГРЫБОЎСКАЯ Настасся**.
**ГРЫБОЎСКІ Мікалай**.
**ДУБАНОС Іван**, н. у 1886, яго жонка Хрысціна Антонаўна, н. у 1900, дачка Вольга, н. у 1930,
**ЗАМБАР Сцяпан**, н. у 1900.
**ЗАМБАР Барыс**.
**ЗАМБАР Ігнат**, яго жонка.
**МАЦКЕВІЧ Марыя**, н. у 1912, яе дачка Валянціна, н. у 1939.
**НОВІКАВА Вольга**, н. у 1912, яе дачка Тамара, н. у 1930, сын Толік, н. у 1932.
**ПАДЗВІНСКІ Уладзімір**, н. у 1910, яго жонка, н. у 1912.
**ПІРОГ Антон Мікалаевіч**, н. у 1871.
**СКРЫПКА Еўдакія**.
**СПІРЫДЗЁНАК Любоў**.
**УРБАН Ганна**, н. у 1901.
**УРБАН Дзмітрый**, н. у 1885.
**УРБАН Барбара Сільвестраўна**, 79 гадоў.
**УРБАН Хрысціна**.

## ВЁСКА ПАПАРТНАВА

**Спалена (13 двароў) 16.2.1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

У агні згарэлі:

**ГІРУЦКІ Баляслаў**.
**ГРЫНЕЎСКІ Іосіф**, сям'я, 4 чалавекі.
**ГРЫНЕЎСКІ Ясь**, сям'я, 3 чалавекі.
**ЛАБЭЦКІ Іосіф**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА ПАШЭНЬКІ

**Спалена (18 двароў) у лютым 1943.**

**МАЗУРА Фёкла А.**
**МЯДЗЮТА Настасся Емяльянаўна**, н. у 1904, расстраляная ў в. Садкоўшчына за сувязь з партызанамі.

## ВЁСКА ПУШАЛАТЫ

**Спалена (17 двароў) 16.2.1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Згарэлі:

**БАБКОВЫ**, сям'я, 3 чалавекі.
**ВАРАХОП Ганна**, сям'я, 3 чалавекі.
**ВАРАХОП Іосіф Іванавіч**, сям'я, 4 чалавекі.
**ВАРАХОП С.І.**, сям'я, 3 чалавекі.
**ГІРУЦКІ Іосіф**, сям'я, 2 чалавекі.
**КАЙРЫШ Уладзімір Якаўлевіч**.
**МАЛЯЎКА Пётр**, сям'я, 2 чалавекі.
**МАТУСЕВІЧ Іосіф**, сям'я, 2 чалавекі.
**РАКШНЯ Уладзімір**.
**РАКШНЯ Юльяна**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА РАКШНІ

**Спалена (40 двароў) 16.2.1943.**

Загінулі:

**ЖУК Нічыпар Казіміравіч**, н. у 1886, яго дачка Станіслава, н. у 1923, спаленыя карнікамі ў лютым 1943.
**ЗАМБАР Віця**, прапаў без вестак пасля таго, як быў выкуплены з канцлагера Саласпілс.
**РАКШНЯ Іван Данатавіч**, н. у 1898, яго

І. Д. Ракшня, Т. А. Ракшня.



Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Сар'я.

жонка Казімера, брат, н. у 1896, жонка брата Тэлісвора Антонаўна, н. у 1899, і дачка Ганна, н. у 1932, брат Сцяпан, н. у 1893, жонка Сцяпана Ганна Аляксееўна, спаленыя карнікамі 13.2.1943.

## ВЁСКА САКАЛОВА

**Спалена (11 двароў) 16.2.1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**КАСЬКЕВІЧ** (жанчына), 35 гадоў, сын, 8 гадоў, і маці па прозвішчы Шаўрак, 60 гадоў.
**МУРЗО Аксеня.**
**МУРЗО Лёля Сцяпанаўна.**
**ПАЛАЗОЎСКІ Іван.**
**ПАЛАЗОЎСКАЯ Алена.**

## ВЁСКА САРДЫКІ

**Спалена (34 двары) у лютым 1943.**

**КАРАНІК Марыя,** партызанская сувязная, расстраляна фашыстамі. Пахавана ў в. Абухава.

## ВЁСКА САР'Я

**Спалена (34 двары) у лютым 1943.**

Магіла ахвяр фашызму ў былой вёсцы Сініцы.

**КАНАШОНАК Георгій Георгіевіч**, настаўнік, загінуў у канцлагеры Саласпілс.
**НАРУБІН (Бычкоў?)... Антонавіч**, 4 гады, — загінуў у канцлагеры Саласпілс.
**ЧЫРКУН Марыя**, н. у 1890, спаленая ў лютым 1943.

## ВЁСКА СІНІЦЫ

**Спалена (10 двароў) у лютым 1943.**

**ЖЫЗНЕЎСКІ Канстанцін.**
**ЖЫЗНЕЎСКАЯ Ефрасіння.**
**КАСЬКОВІЧ Яфім.**
**КАСЬКОВІЧ Аляксандра.**
**ЛІПСКІ Пётр.**
**ЛІПСКАЯ Настасся.**
**СТАРЫНСКАЯ Аляксандра.**
**СТАРЫНСКІ Міхаіл.**
**СТАРЫНСКІ Павел.**
**СТАРЫНСКАЯ Александрына.**

## ВЁСКА СУП'ЯНІКІ

**Спалена (8 двароў) 16.2.1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

Загінулі:

**ЛАЎРЫНОВІЧ Вікенцій**, н. у 1903, жонка і дачка Юлія, н. у 1926.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Іосіф**, жонка і дачка Кліма.
**МІСНІК Лявон**, сястра Маня.
**МІСНІК Альжбета**.
**СТАРЫНСКІ Антон**, н. у 1909, дачка Ніна.
**СТАРЫНСКАЯ Альжбета**, яе пяцёра дзяцей.
**ТВАРАНОВІЧ Павел**, сям'я, 4 чалавекі.

## ВЁСКА ФАЛЬВАРКОВА

**Спалена (24 двары) 16.2.1943 разам з жыхарамі.**

**АМЯЛЬЧОНАК Пётр Якаўлевіч**.
**АМЯЛЬЧОНАК Антаніна Ягораўна**.
**АМЯЛЬЧОНАК Вера Сямёнаўна**, сыны Анатоль, 7 гадоў, Пётр, 5 гадоў.
**АЎСЮК** (жанч.), дачка Яніна.
**АЎСЮК Сцяпан**, жонка і дзіця.
**АЎСЮК Клёся**, дачка Рэгіна.
**ВЕРАБЕЙ Якаў**, жонка і сямёра дзяцей.
**ЖУК Праскоўя**.
**ЖЫЗНЕЎСКАЯ**.
**КУРЫКША Адам**.
**МОТУЖ Іосіф**.
**МОТУЖ Зузана**.
**ПІРОГ Аляксандр**, жонка.
**ПАПСУЕВІЧ** (жанч.).
**ПАПСУЕВІЧ** (жанч.).
**ПАПСУЕВІЧ Ганна**, муж і дачка.
**РУСАК Эмілія**, муж і дачка Рэгіна.
**СТАНЕВІЧ Іосіф**.
**СТАНЕВІЧ Мальвіна**.
**ТВАРАНОВІЧ Антон**.
**ТВАРАНОВІЧ Зузана**.
**ТВАРАНОВІЧ Ганна** і яе трое дзяцей.
**ТВАРАНОВІЧ Казімір**, жонка Юзэфа, іх трое дзяцей.
**ТВАРАНОВІЧ** (жанч.), сын.



Магіла ахвяр фашызму ў вёсцы Фальваркова.

**ТВАРАНОВІЧ Франя**, сын.
**УРБАН Васіль**.
**ЯСЮКЕВІЧ Ганна**.

**Разам з жыхарамі вёскі спалены яшчэ дзве невядомыя сям'і.**

## ВЁСКА ХОДАРАЎШЧЫНА

**Спалена (5 двароў) у лютым 1943.**

**ЖЫЗНЕЎСКІ Пётр Кандратавіч**, 75 гадоў, жонка Палагея, 67 гадоў, нявестка Пілюшына Еўдакія Іванаўна, 45 гадоў, спаленыя ва ўласнай хаце ў лютым 1943.

**З ліста Яўгеніі Максімаўны Сімховіч (Пілюшынай), жыхаркі Гомеля.**

*...Пра гэта цяжка і немагчыма пісаць. Бацька мой памёр яшчэ ў 1931 годзе. А маці, бабулю і дзядулю карнікі спалілі на маіх вачах. Памятаю толькі, што каты жудасна крычалі ў агні, было шмат снегу, наша хата гарэла, і мяне білі, я завалілася ў глыбокі снег, усё цела закалянела; я не плакала — на сэрца лёг цяжкі камень, было бясконца крыўдна ад сваёй бездапаможнасці, не было паблізу аніякай жалязякі — хаця б аднаго забіць...*

*Не бачу за слязьмі радкоў, бо гэта глыбокая рана, якая ніколі не зажыве. Вельмі добра, што і ў нашым раёне, і ў рэспубліцы будуць кнігі-мемарыялы памяці аб загінуўшых, хай ведаюць нашы дзеці і ўнукі аб звярствах фашызму, хай трымаюць мір у сваіх руках, а мы ім дапаможам, колькі маем сіл...*

## ВЁСКА ШАТРОВА

**УРБАН Палагея Ільінічна,**
**ШАЦЁР Ганна Іванаўна** — расстраляныя фашыстамі.

## ВЁСКА ШЧУНЬКІ

**Спалена (6 двароў) у лютым 1943.**

**МЯДЗЮТА Пётр Антонавіч**, н. у 1905, расстраляны ў в. Садкоўшчына за сувязь з партызанамі.

## ВЁСКА НЕ ЎСТАНОЎЛЕНА

**ЛАБОЎКА Ягор Міронавіч**, н. у 1914, памёр ад ран 6.8.1944 у эвакашпіталі 3329 у Зялёным Гарадку пад Полацкам.
**БАБРОНАК Настасся Канстанцінаўна**, н. у 1889, з калгаса імя Тэльмана.

**БАРЭЙКА Алена Васілеўна**, н. у 1918, з калгаса імя Варашылава.

**БАРЭЙКА Палагея Іосіфаўна**, н. у 1897, з калгаса «Чырвоны партызан».

**ГРЫНЕЎСКІ Віталь**, н. у 1915, з калгаса «Кастрычнік», прапаў без вестак пры пераходзе лініі фронту.

**ЖЫЗНЕЎСКАЯ Ганна Іванаўна**, н. у 1914, з калгаса «Чырвонаармеец», прапала без вестак у час карнай экспедыцыі.

**РЭВУТ Соф'я Сцяпанаўна**, н. у 1904, з калгаса «Верны шлях».

**СОЛТАН Марыя Антонаўна**, н. у 1920, з калгаса імя Чапаева.

**ЧУРГЕЛЬ Антаніна Адамаўна**, н. у 1916, з калгаса «Чырвонаармеец».

**ШАЛІМАВА Марыя Фёдараўна**, н. у 1909, з калгаса «Маяк», прапала без вестак у час карнай экспедыцыі.

## СЕНЬКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АРБАНАВА (УРБАНАВА)

**Спалена 16 лютага 1943.**

**АГУРЭЦКІ Віктар**, сям'я, 2 чалавекі.
**МЫШЭНКА Адам**, сям'я, 2 чалавекі.
**ПІЛЮШЫН Іван**, сям'я, 5 чалавек.
**ЧЭРНІК Міцька**, сям'я, 4 чалавекі.
**ЯСЮКЕВІЧ Зынон**, сям'я, 3 чалавекі.

### ВЁСКА ВАЛЮКІ

**Спалена (18 двароў) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БУКА Пётр.**
**БУКА Канстанцін.**
**КАДЫШ Ірына.**
**КАЛЕСНІК Сідар.**
**МАРАЧКОЎСКАЯ Марыя.**
**ПУТРА Марыя** і яе двое дзяцей.

### ВЁСКА ВОСТРАЎ

**Спалена (50 двароў) у лютым 1943.**

**МІХНО Мікалай**, 60 гадоў.

### ВЁСКА ГЕНЕВА

**Спалена 16 лютага 1943.**

**КАВАЛЁНАК Наталля.**
**ЛЕВУЦЁНАК Нічыпар**, сям'я, 6 чалавек.
**ПЛЮШЫН Ігнат**, сям'я, 5 чалавек.
**ПЛЮШЫН Сямён**, сям'я, 6 чалавек.
**ПУТРА Ганна**, сям'я, 2 чалавекі.
**РОДЗІК Ганна.**
**РОДЗІК Пётра**, сям'я, 6 чалавек.
**РОДЗІК Эдвард**, сям'я, 3 чалавекі.

### ВЁСКА ПІСЯЛЁВА

**Спалена (23 двары) у лютым 1943.**

З а г і н у л і:

**БУКЕВІЧ Агата**, сям'я, 2 чалавекі — загінула ў канцлагеры;

**БУКЕВІЧ Павел**, загінуў каля в. Роўнае Поле Расонскага раёна ў час карнай аперацыі ў лютым 1943.

**ЗУБІНСКАЯ Адальфіна** — спаленая ў в. Сенькава, сын Браніслаў Іосіфавіч, 12 гадоў, расстраляны ў в. Сенькава.

**МАЦУЛЕВІЧ Разалія Іосіфаўна**, расстраляна каля в. Задзежжа, дачка Ядвіга Іванаўна, н. у 1923, спалена ў в. Роўнае Поле Расонскага раёна, сын Леанід, н. у 1929, загінуў каля в. Малавіды, пахаваны каля р. Піжаўка.

### ВЁСКА ДУБРАВА

**Спалена (33 двары) у лютым 1943.**

**ТАРАСАВА Клаўдзія**, спалена фашыстамі за сувязь з партызанамі.

### ВЁСКА ЖАЛАБОЎШЧЫНА

**Спалена (12 двароў) 13.2.1943 разам з жыхарамі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БАРЫСЭВІЧ Іван.**
**БАРЫСЭВІЧ Ліна.**
**БАРЫСЭВІЧ Ганна.**
**БУБОВІЧ Марыя**, сям'я, 4 чалавекі.
**КРЫЦЫНЬ Іван**, жонка Ганна.
**КУРАШ Ягор**, сям'я, 4 чалавекі.
**ЛЕМЯШОНАК Антон**, жонка Антаніна, дочкі Антаніна і Валянціна.
**ЛЕМЯШОНАК Ганурата.**
**ЛЕМЯШОНАК Ядвіга**, дачка Галіна.
**МАЦКЕВІЧ Ігнат**, жонка Зузана і іх пяцёра дзяцей.
**САВЕЙКА Пётр**, жонка Міхаліна і іх трое дзяцей.

### ВЁСКА ЗАЛЕШЧЫНА

**Спалена (21 двор) 16.2.1943 разам з жыхарамі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БУБОВІЧ Марыя**, 85 гадоў, зяць Пётр Ада-

На гэтым месцы раней была вёска Залешчына.

мавіч, 63 гады, яго дочкі: Вераніка, 20 гадоў, Ядвіга, 14 гадоў.

**ГАЕЎСКІ Міхаіл**, жонка Анеля.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Антон Антонавіч**, жонка Аляксандра, сын Ігнат і нявестка Марыя.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Вікенцій Аляксеевіч** і яго жонка

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Анеля Вікенцьеўна**, 43 гады.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Фларэнціна**.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Ігнат**, сям'я, 6 чалавек.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Павел**, 2 чалавекі з сям'і.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Пётр**, 4 чалавекі з сям'і.

**ЗАШЧЫРЫНСКАЯ Міхаліна**, яе сямёра дзяцей.

**ІГНАТОВІЧ Пётр**, жонка Кацярына, іх шасцёра дзяцей.

**ЛАПА Зыгман**, дачка Вера.

**ЛАПА Ганна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЛАПА Эдзік**.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Ганна**, сям'я, 4 чалавекі.

**МІЦКЕВІЧ Міхаіл**, жонка Лёля, сын Мікалай.

**НЯДБАЛЬСКІ Пётр**.

**РОДЗІК Іван** з жонкай; дачка, 16 год, загінула ў канцлагеры.

**ЦЭХАН Ганна**.

**ЦЭХАН Дамінік** памёр ад тыфу, жонка спалена.

**ЦЭХАН Алік**.

**ЦЭХАН Алімпія** і яе пяцёра дзяцей.

**ЯНКОЎСКАЯ Лідзія Іосіфаўна**, н. у 1922.

**ЯНКОЎСКІ Зынон Іосіфавіч**, н. у 1927, падарваўся на міне.

## ВЁСКА ЗАШЧЫРЫНА

**Спалена (22 двары) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БУБОВІЧ Леаніда Сямёнаўна**, яе трое дзяцей.

**БУБОВІЧ Сямён**, жонка Міхаліна і двое дзяцей.

**БУБОВІЧ Магуржата**.

**БУБОВІЧ Міхаліна**.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Данат**, сям'я, 2 чалавекі.

**УРБАН Люцыпія**, яе двое дзяцей.

**ФРАЛЁНАК Апанас** з жонкай.

**ФРАЛЁНАК Ганна**.

## ВЁСКА ЗЕНЬКІ

**Спалена (22 двары) у лютым 1943 разам з жыхарамі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БАРТАШ Станіслаў Іосіфавіч**.

**ЗІНЬКЕВІЧ Дамінік Вікенцьевіч**.

**МАРЫНСКІ Альфонс Андрэевіч**, падлетак.

**МАРЫНСКІ Сяргей Сцяпанавіч**, падлетак, расстраляны на пачатку вайны па даносе здрадніка за сувязь з партызанамі.

**МАРАЧКОЎСКАЯ Серафіма Іосіфаўна**, хавалася ў зямлянцы з дачкою Браніславай, якой быў час раджаць. Застрэлена карнікамі, калі вылезла падыхаць. Цела забітай загардзіла ўваход у зямлянку, дзе раджала яе дачка, якая засталася жывой.

**МАРЫНСКАЯ Агнеса**.

**ПУТРА Дзмітрый**.

**ЯСЮКЕВІЧ Уладзімір Пятровіч**.

## ВЁСКА КАНСТАНЦІНАВА

**Спалена (7 двароў) 13.2.1943 разам з жыхарамі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**




Помнік ахвярам фашызму ў былой вёсцы Канстанцінава.

**ДУБРА Віктар.**
**ДУБРА Вольга.**
**ЖУК Юзэфа,** сыны Міхаіл, Алік.
**РОДЗІК Віктар**, жонка Марыя, дачка Станіслава.
**ШПАКОЎСКІ Іван**, жонка Алена, дочкі Галіна і Вера.

## ВЁСКА КАНЧАНЫ

**Знішчана бамбёжкай (93 двары) у лютым 1943.**

**КАЗЛОЎСКАЯ Аўдоцця**, 60 гадоў, спалена ў в. Навалакі.
Трое дзяцей **САЎЛУКА Аляксандра Мацвеевіча** загінулі ў канцлагеры Саласпілс.

## ВЁСКА КАРАЛЁВА

**Спалена (28 двароў) 13.2.1943. Увекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БАРТАШЭВІЧ Канстанцін Францавіч**, н. у 1907, жонка Марыя, дачка Валянціна, н. у 1928.
**БАРТАШЭВІЧ Міхаліна.**
**БАРТАШЭВІЧ Разаліна.**
**БАРТАШЭВІЧ Стэфанія.**
**БУБАЛА Міля.**
**ГАМАНЬКА Анеля**, яе трое дзяцей.
**ГАМАНЬКА Мацей Усцінавіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**ГАМАНЬКА Франя**, яе двое дзяцей.
**ГАМАНЬКА Агата.**
**ГАМАНЬКА Улляна Карпаўна.**
**ДЗЕНІСЁНАК Адальфіна Пятроўна**, яе маці Амелія, трое дзяцей.
**ЗАБІНЯКА Казіміра.**
**ЗАБІНЯКА Саламея.**
**ЛАЎРЫНОВІЧ Адэля**, яе чацвёра дзяцей.
**ЛАЎРЫНОВІЧ Ксеня**, яе двое дзяцей.
**ЛАЎРЫНОВІЧ Аршуля.**
**ЛАЎРЫНОВІЧ Клара.**
**ПУТРА Марыя Альбертаўна** і яе пяцёра дзяцей.
**ПУТРА Станіслаў Вацлававіч**, сям'я, 3 чалавекі.
**САВЕЙКА Алена.**

## ВЁСКА КАШЫРЫНА

**ЖУК Янут**, сям'я, 2 чалавекі.
**САВЕЙКА Фелікс**, сям'я, 3 чалавекі.

## ВЁСКА ЛАДЭЛЕВА

**Спалена (22 двары) 13.2.1943 разам з жыхарамі.**

З г а р э л і ў а г н і:

**ЗІНКЕВІЧ Людміла Мікалаеўна**, 33 гады, яе дзеці: Вера, 8 гадоў, Мікалай, 4 гады, Марыя, 2 гады.
**ЗІНКЕВІЧ Дарота Адамаўна**, 45 гадоў, яе дзеці — Марыя, 14 гадоў, Ганна, 12 гадоў, Эдзік, 2 гады.
**ЗІНКЕВІЧ Разалія**, 56 гадоў.
**ЗІНКЕВІЧ Эдзік**, 1 год.
**ЗІНКЕВІЧ Алена Аляксееўна**, 22 гады, з дзіцем.
**ЗІНКЕВІЧ Настасся**, 34 гады, яе дзеці: Аркадзь, 10 гадоў, Тоня, 12 гадоў, Дзмітрый, 6 гадоў, Міхаіл, 2 гады.
**КАЛЕСНІК Васіль**, 54 гады, жонка Дарота, 50 гадоў, іх сыны Сяргей, 16 гадоў, Васіль, 26 гадоў.
**НЯДБАЛЬСКІ Андрэй**, 56 гадоў.
**НЯДБАЛЬСКІ Якаў**, 26 гадоў.
**НЯДБАЛЬСКІ Іван**, 63 гады.
**НЯДБАЛЬСКІ Іосіф**, 46 гадоў, жонка Вольга, 40 гадоў, іх дзеці: Надзея, 12 гадоў, Марыя, 17 гадоў, Вера, 23 гады, Таццяна, 6 гадоў.
**ПІЛЮШЫНА Мар'яна**, 60 гадоў.
**ПІЛЮШЫНА Вільгіна Осіпаўна**, 32 гады, і яе дзеці: Подзя, 12 гадоў; Фёдар, 9 гадоў; Юзя, 2 гады.
**ПУТРА Ціт Пархвенавіч**, 53 гады, жонка Ганна, 40 гадоў; дачка Оля, 15 гадоў.
**ЯСЮКЕВІЧ Барыс** з жонкай і братам Дзмітрыем.

## ВЁСКА МОТУЖЫ

**Спалена (11 двароў) 13.2.1943 разам з жыхарамі.**

**БУКЕВІЧ Вікенцій.**
**БУКЕВІЧ Марыя.**
**КЛЯШЧОНАК Домінік.**
**МОТУЖ Адольф Віктаравіч**, жонка Казіміра Іванаўна, іх трое дзяцей: Віня, Лёля, Толік.
**МОТУЖ Ірына.**
**МОТУЖ Тавыдор**, сям'я, 4 чалавекі.
**МОТУЖ Яўгенія**, яе чацвёра дзяцей.
**МОТУЖ Анеля**, муж Люнгін, іх чацвёра дзяцей.
**МОТУЖ Забелій**, сям'я, 5 чалавек.
**МОТУЖ Фэля** і яе дзіця.
**ПІЛЮШЫН Сідар**, жонка Адальфіна, іх пяцёра дзяцей.
**ПІЛЮШЫНА Наталля** з дзіцем.
**СУШЫНСКАЯ Пілімоня Антонаўна** і яе трое дзяцей.

## ВЁСКА МУКВЯЦІЦА

**Спалена (27 двароў) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

З а г і н у л і:

**БАЛБЕКА Каэтан**, сям'я, 6 чалавек.
**БАРТАШ Фёдар**, сям'я, 2 чалавекі.
**БАРТАШ Юзап**, сям'я, 4 чалавекі.
**БЕРНІК Васіль**, сям'я, 6 чалавек.
**БУБОВІЧ Міхаліна**, сям'я, 2 чалавекі.
**БУКА Пётра**, сям'я, 2 чалавекі.
**ЖУК Анеля**, сям'я, 5 чалавек.
**ЗАЛЕЎСКАЯ Франя**, сям'я, 5 чалавек.
**ЗАШЧЫРЫНСКІ Зыгман**, сям'я, 4 чалавекі.
**ЗІНЬКЕВІЧ Аўдоля**.
**ЗІНЬКЕВІЧ Ганна,** сям'я, 5 чалавек.
**ЗІНЬКЕВІЧ Лізавета**.
**ЗІНЬКЕВІЧ Пётр Дзмітрыевіч**.
**КАДЫШ Віктар**, сям'я, 2 чалавекі.
**КАДЫШ Надзея Васілеўна.**
**КАДЫШ Сцяпан,** сям'я, 3 чалавекі.
**КАЛЕСНІК Вольга**, сям'я, 3 чалавекі.
**ЛАПОШКА Анэта.**
**ЛАПОШКА Баляслаў**, сям'я, 4 чалавекі.
**ЛАПОШКА Міля**, сям'я, 4 чалавекі.
**ЛАПОШКА Пашка**, сям'я, 2 чалавекі.
**МАРАЧКОЎСКАЯ Адэля.**
**МАРАЧКОЎСКАЯ Сарафіна,** сям'я, 3 чалавекі.
**МАРАЧКОЎСКІ Ілля**, сям'я, 4 чалавекі.
**МАРЫНСКАЯ Адэля**, сям'я, 3 чалавекі.
**МАРЫНСКАЯ Марыя**, сям'я, 4 чалавекі.
**МАРЫНСКАЯ Тэкля**, сям'я, 2 чалавекі.
**МАРЫНСКАЯ Юзэфа**, сям'я, 2 чалавекі.
**МАРЫНСКІ Андрэй**, сям'я, 5 чалавек.
**МАРЫНСКІ Донат**, сям'я, 4 чалавекі.
**МІНІН Малання**, сям'я, 7 чалавек.
**ПІЛЮШЫН Станіслаў**, сям'я, 2 чалавекі.
**ПІЛЮШЫН Сцяпан.**
**ПІЛЮШЫН Якуб**, сям'я, 2 чалавекі.
**ПІЛЮШЫНА Анэта.**
**ПУТРА Дзмітры**, сям'я, 5 чалавек.
**РЫМКЕВІЧ Анеля**, сям'я, 5 чалавек.
**РЫМКЕВІЧ Мар'я**, сям'я, 3 чалавекі.
**СУДНІК Міля**, сям'я, 4 чалавекі.
**СУДНІК Юзэфа**, сям'я, 2 чалавекі.
**ФУНДОРКА Ян**, сям'я, 3 чалавекі.

## ВЁСКА ПАНІЗОВА

**БАЙКОВА Еўдакія Аляксандраўна,** застрэлена і спалена ў сваёй хаце.

### ЦЭЛІЎ УСІМ У ГАЛАВУ...

Не забываюцца гады ваеннага ліхалецця. Для нас усё было як быццам учора. Я хачу расказаць пра свой трагічны лёс.

У тыя дні ў нашай вёсцы Муквяціца ніхто не быў спалены. Выратаваў нас чалавек, які вырваўся з палаючай кузні ў вёсцы Ладэлева, прыбег да нас абгарэлы і папярэдзіў. Дарэчы, ён і зараз жыве ў Сенькаве.

Вось тут нашы дарослыя і зразумелі, што трэба ратавацца любой цаной. У нас былі сваякі ў Дубровах. Мы паехалі туды, а адтуль усе разам падаліся ў Малавідаўскі лес, які лічыўся партызанскай зонай. Аднак ніводнага партызана мы там не бачылі.

Першая карная экспедыцыя нас не закранула, у карнікаў было шмат «работы» ў вёсках. Калі ж усіх і ўсё спалілі, пайшлі «прачэсваць» лес. Там было шмат сем'яў, жылі разам, а калі пайшла другая карная экспедыцыя, разбегліся.

Так расказвалі дарослыя, а зараз пастараюся напісаць тое, што помню сама. Дзяцей — мяне, сястру, дваюраднага брата (яго маці немцы забілі раней) — бацькі павялі ў больш бяспечнае месца. Сястра і брат былі хворыя на тыф.

Узялі падушкі, коўдры. Палажылі брата і сястру, а я села каля іх ног. Мама засталася з намі, бацька пайшоў паглядзець, якім шляхам ідуць карнікі. Праз які час вярнуўся і гаворыць, што ідуць прама на нас, загінем. «Давай кінем іх, хоць самі выратуемся».

«Не, — сказала мама, — ты ідзі, а я з імі застануся». Бацька пайшоў. І тут жа мы пачулі незразумелую мову. Мама, рыхтуючыся да смерці, паклала мяне тварам уніз, сама лягла побач і абняла мяне.

Немец падышоў да нас адзін, мама прыўзнялася і сказала: «Паночак, не забівай нас, мы ні ў чым не вінаватыя». Але той не адклікнуўся і пачаў страляць. З першага стрэлу я адчула, як штосьці цёплае пацякло па правай шчацэ — куля зачапіла вуха.

Чатыры разы выстраліў і ўсім у галаву цэліў. Яшчэ не адышоў ад нас, выкідваючы апошнюю гільзу, як я прыўзняла галаву, гляджу, а ён у белым халаце. На шчасце, немец стаяў адвярнуўшыся. Я зноў апусціла галаву. Потым ён пайшоў.

Быў ужо вечар, сонца заходзіла, асвятляючы макушкі дрэў. Я паднялася з-пад мамінай рукі, паклікала маму, але яна не адклікнулася. Усе былі мёртвыя. Я кінула іх і пайшла ў той бок, куды пайшоў немец.

Іду — ні жывой душы, адны мёртвыя сем'і. Мне стала вельмі холадна. Гляджу, ветрам дрэва павернута. Залезла я ў той вываранень і адседзела ноч. Чула, як нехта хадзіў, храбусцеў снегам, але я не адклікнулася.

Як пазней выявілася, гэта хадзіў бацька. Калі карнікі зніклі, быцька пайшоў паглядзець, ці жывыя мы. Усе былі мёртвыя, а мяне не было.

Вось ён і хадзіў, шукаў мяне, думаў, што немец штыком мяне адкінуў, бывала і такое.

Раніцай я вылезла, іду далей — і зноў толькі адны мёртвыя. Раптам падбегла да мяне нейкая цётка, узяла за руку і павяла, распытваючы, як я засталася жывая. Я ёй расказала ўсё. Яна мяне суцешыла, сказала, што калі бацька застаўся жывы, ён цябе знойдзе, а пакуль пажывеш з намі.

Але, па ўсёй бачнасці, нядоўга я з імі жыла, бо калі хавалі маму, сястру і брата, я ўжо была з бацькам. Іх хаваў адзін бацька, а я стаяла ля магілы. Пахаваныя яны на могілках у вёсцы Дубровы.

Нельга без слёз успамінаць той далёкі і трагічны час, які назаўсёды застаўся ў нашых сэрцах. Няхай будзе праклятая вайна.

*М. Мотуж,*
в. Зашчырына Сенькаўскага сельсавета

## ВЁСКА ПЕРАПЕЧКІ

**Спалена (23 двары) у лютым 1943.**

**ВІНСКІ Станіслаў Браніслававіч.**
**ПІЛЮШЫН Альбін.**

Гэтыя маладыя хлопцы былі схопленыя і накіраваныя ў канцлагер Саласпілс. Там іх апранулі ў нямецкую форму і адправілі з лагера, аднак хутка прывезлі назад і падверглі вытанчаным катаванням на вачах вязняў: прывязаўшы да цела вялікія камяні, прымушалі класціся на зямлю і ўставаць; абкруціўшы калючым дротам, загадвалі бегаць па пляцы, моцна білі — усё, відаць, за тое, што хлопцы адмовіліся ваяваць супраць сваіх. Затым іх пагналі па лагерах пад Пскоў, Рыгу і, нарэшце, спалілі ў лагеры ваеннапалонных.

## ВЁСКА ПУСТЭЛЬНІКІ

**Спалена (21 двор) 16.2.1943 разам з жыхарамі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**БАРШЧЭЎСКАЯ Антаніна.**
**БЕК Ігнат**, жонка Бек Альбіна, іх трое дзяцей.
**БЕКА Віктар.**
**БЕКА Ганна.**
**БУБОВІЧ Вільгельма.**
**БУБОВІЧ Марыя**, сын Пётр, дочкі Вера і Марыя.
**ДУБРА Фёкла.**
**ДЗІКАВА Марыя**, яе трое дзяцей.
**ЕЗУФАВА Марыя** і яе дачка Юзэфа.
**ЕНАРАВУШ Фёдар**, жонка Аляксандра, дочкі Марыя, Валянціна і сын Мікалай.
**ІВАНОВА Ганна Станіславаўна** і яе дачка Валянціна.
**ІВАНОВА Марыя Рыгораўна**, дачка Галіна, сыны Пётр і Міхаіл.
**КЛЯШЧОНАК Яфім**, жонка Марыя, дачка Галіна, сын Іван.
**ЛАЎЧЫНОЎСКІ Зынон.**
**ЛАЎЧЫНОЎСКАЯ Эмілія.**
**ЛІНКЕВІЧ Фёкла.**
**ЛУК'ЯНСКІ Рыгор.**
**ЛУК'ЯНСКАЯ Ганна.**
**ШУК Іван.**
**ШУК Моніка.**

## ВЁСКА ПЯТРОЎШЧЫНА

**Спалена (18 двароў) 13.2.1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

З г а р э л і ж ы в ы м і:

**АБРАЗЕЙ Гіляры**, 70 гадоў.
**АБРАЗЕЙ Франц.**
**АЎДЗЕЙ Павел**, жонка Вікторыя і іх дзеці: Эмілія, н. у 1924, Юзэфа, 12 гадоў, Віталь, 7 гадоў, Павел, 5 гадоў, Ян, 9 гадоў.
**БУБАЛА Франя**, н. у 1912, сын, 5 гадоў, і мачаха Антаніна, 70 гадоў.
**БУБАЛА Марыя**, сын, 3 гады, і дачка, 1,5 года.
**БУБАЛА Агнешка**, 70 гадоў.
**БУБАЛА** (дзявоч.) Часлава Вінцэнтаўна, 30 гадоў; сын, 7 гадоў, сястра Магуржата, 30 гадоў, з сынам і дачкой, пляменніца, 12 гадоў.
**БУБАЛА Настасся**, 35 гадоў, дачка Канстанцыя Канстанцінаўна, 10 гадоў.
**БУБАЛА Вінцэсь**, жонка Казімера, дачка Настасся з мужам Тавыдорам і дзіцем.

На гэтым месцы раней была вёска Пятроўшчына.



Магіла ахвяр фашызму ў вёсцы Пятроўшчына.

**ВАЗНОВІЧ Настасся**, н. у 1911, сын, 5 гадоў, дачка, 3 гады, і сын, 1 месяц.

**ДРОЗД Міхаліна.**

**КАДЫШ Зузана**, 80 гадоў,

**ЛУРЫН Юзэфа Казіміраўна**, 50 гадоў.

**ПАЎЛІНЬ Іван**, сям'я, 2 чалавекі.

**ПАЎЛІНЬ Міля**, сям'я, 2 чалавекі.

**ПАЎЛІНЬ Станіслаў**, 40 гадоў, жонка Анеля, 35 гадоў, і сын, 9 гадоў.

**ПЛЮШЫН Іван**, сям'я, 2 чалавекі.

**ПЛЮШЫН Іван**, сям'я, 4 чалавекі.

**ПЛЮШЫНА Ева**, 60 гадоў, сыны Зыгман, 25 гадоў, Іосіф, 18 гадоў, Віталь, 16 гадоў.

**ПЛЮШЫНА Мальвіна**, каля 70 гадоў, з сынам Станіславам, 16 гадоў.

**ПЛЮШЫНА Марыя**, н. у 1911.

**ПЛЮШЫНА Франя**, н. у 1913.

**САВЕЙКА Люцыяна Дзяменцьеўна**, 50 гадоў, яе дзеці: Анеля, н. у 1920, Гелена, н. у 1924, Станіслава, н. у 1928, Ігнат, 12 гадоў, Зыгман, 10 гадоў, Пётр, 7 гадоў , Ян, 5 гадоў.

Цешча **ЧАПУКА Тавыдора Аршуля**, больш за 70 гадоў.

**ЧАПУК Настасся Францаўна**, 70 гадоў.

**ЧАПУК Юганна**, больш за 70 гадоў.

**ЧАПУК Антон**, н. у 1909, жонка Яніна, н. у 1913, і іх двое дзяцей.

**ШУЛЬЧАНКА Домінік Вікенцьевіч**, 75 гадоў.

**ШУЛЬЧАНКА Васіль**, н. у 1911, жонка Адальфіна, н. у 1912, дачка, 2 гады, сын, 6 месяцаў.

## ВЁСКА СЕНЬКАВА

**Спалена (75 двароў) у лютым 1943.**

**АРЖАНІК Наталля Сямёнаўна**, н. у 1925.

**БАРЫСЭВІЧ Надзея Пятроўна**, н. у 1923.

**БАРЫСЭВІЧ Пётр Пятровіч**, н. у 1882.

**БАЮРЭВІЧ Паўла.**

**ГОМАН Адэля.**

**ГОМАН Домінік Вікенцьевіч**, жонка Таццяна, сын і дачка.

**ГОМАН Паўліна.**

**ГОМАН Пётр Ануфрыевіч**, сям'я, 6 чалавек.

**КАДЫШ Аўдакім**, сям'я, 3 чалавекі.

**КАЛЕСНІК Сцяпан Фёдаравіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**КАПУСТА Антаніна.**

**МАСЛОЎСКАЯ Міхаліна** з дачкой Кацяй.

**СТАНКЕВІЧ Валя**, сям'я, 3 чалавекі.

## ВЁСКА УРАГАВА

**Спалена ў сакавіку 1943.**

**ВАРАНКЕВІЧ Кацярына**, сям'я, 3 чалавекі.

**КАЗАЧОНАК Баніфат**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЛОСЬ Міліна Осіпаўна.**

**ПАПЛАЎСКАЯ Прасеня**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЯСЮКЕВІЧ Ганна П.**, сям'я, 2 чалавекі.

## ВЁСКА ХАРКАВА

**Спалена (24 двары) у лютым 1943.**

**ПЛЮШЫН Дзяменцій Вікенцьевіч**, н. у 1891, расстраляны 25.12.1942 за сувязь з партызанамі, пахаваны ў г. Краслава, Латвія.

**ПЛЮШЫНА Анеля Вікенцьеўна**, спалена ў вёсцы.

**УРБАН Клімянціна**, н. у 1910, расстраляна фашыстамі ў 1942.

## ВЁСКА ЦЕПЛЮКІ

**Спалена (62 двары) у лютым 1943.**

**ПЛЮШЫНЫ**, муж і жонка, іх бацькі.

## ЧАПАЕЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АРДАЎСКІЯ

**Спалена (26 двароў) 9.3.1943 у час бою партызан з карнікамі. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь». Закатаваны і спалены жывымі многія жыхары.**

**АЛЕКСІН** Захар Рыгоравіч, н. у 1900, жонка Лідзія С., н. у 1905, дочкі Зінаіда, н. у 1933, Лёля, н. у 1935, сыны Аляксей, н. у 1939, Мікалай, н. у 1937, Міша, н. у 1942.

**БАРОХА Канстанцін Мацвеевіч**, н. у 1881, жонка Лізавета, н. у 1885.

**БАРОХА Хрысціна Мікітаўна**, н. у 1892.

**ДЗЕНІСЁНАК Ганна Міхайлаўна**, н. у 1902.

**ДЗЕНІСЁНАК Ульяна Мікітаўна**, н. у 1901, яе дзеці — Мікалай Цярэнцьевіч, н. у 1925, Марыя, н. у 1929, Ганна, н. у 1936.

**ЗАБАГОНСКАЯ Ганна Антрэпаўна**, н. у 1908.

Помнік на магіле ахвяр фашызму ў вёсцы Ардаўскія.

**ЗАБАГОНСКАЯ Ганна Іванаўна**, н. у 1924.

**ЗАБАГОНСКАЯ Еўдакія Іванаўна**, н. у 1927.

**ЗАБАГОНСКАЯ Ефрасіння Пятроўна**, н. у 1942.

**ЗАБАГОНСКАЯ Клаўдзія Кандратаўна**, н. у 1919.

**ЗАБАГОНСКІ Іван Ігнатавіч**, сям'я, 6 чалавек.

**ЗАБАГОНСКІ Іван Сямёнавіч**, н. у 1901.

**ЗАБАГОНСКІ Міканор Іванавіч**, н. у 1921.

**ЗАБАГОНСКІ Пётр Сямёнавіч**, н. у 1893, сын Валодзя, н. у 1932.

**ЗАБАГОНСКІ Сяргей Іванавіч**, н. у 1892.

**ЗАБАГОНСКІ Уладзімір.**

**КУКСЁНАК Арына Іванаўна**, н. у 1921.

**КУКСЁНАК Еўдакія Ігнатаўна.**

**КУКСЁНАК Ефрасіння Дзмітраўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**КУКСЁНАК Лідзія Пятроўна**, н. у 1916, яе дзеці: Яўгенія, н. ў 1938, Андрэй, н. у 1936, Іван, н. у 1937, Марыя, н. у 1939.

**КУКСЁНАК Малання Якімаўна**, н. у 1913, сын Уладзімір Андрэевіч, н. у 1933.

**КУКСЁНАК Марфа Арцёмаўна.**

**КУКСЁНАК Праскоўя Іванаўна**, н. у 1910.

**КУКСЁНАК Сцяпан Канстанцінавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**КУКСЁНАК Трафім Лявонавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**КУКСЁНАК Хрысціна Вікенцьеўна**, н. у 1889.

**КУКСЁНАК Надзея Аляксандраўна**, н. у 1910.

**КУКСЁНАК Антаніна Аляксандраўна**, н. у 1919.

**КУКСЁНАК Хрысціна Мікалаеўна**, н. у 1881.

**КУКСЁНАК Ганна Васілеўна**, н. у 1925.

**КУКСЁНАК Хрысціна Рыгораўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**МАРАЧКОЎСКАЯ Хрысціна Мікалаеўна**, н. у 1904.

**МАРОЗ Антрэп Дзяменцьевіч**, н. у 1848.

**МАРОЗ Еўдакія Язэпаўна**, н. у 1885.

**МАРОЗ Іван Усцінавіч**, сям'я, 7 чалавек.

### ВЁСКА АСВЕІЦА

**Знішчана ў сакавіку 1943.**

**СЛЕСАРОНАК Аляксандр Раманавіч**, пісар нямецкай управы, расстраляны за сувязь з партызанамі.

**ХМЯЛЕЎСКАЯ Алена Самуілаўна**, н. у 1937, сястра Феня, н. у 1929.

**ХМЯЛЕЎСКАЯ Вольга Васілеўна**, н. у 1914.

**ХМЯЛЕЎСКАЯ Зінаіда Фёдараўна**, н. у 1911.

**ХМЯЛЕЎСКАЯ Ефрасіння**, н. у 1871.

**ЦЯРЭНЯ Аляксандра Нічыпараўна**, н. у 1905.

**ЦЯРЭНЯ Ганна Фёдараўна**, н. у 1901.

**ЦЯРЭНЯ Ефрасіння Фёдараўна**, н. у 1923.

**ЦЯРЭНЯ Іван Пятровіч**, н. у 1898.

**ЦЯРЭНЯ Пётр Нічыпаравіч**, н. у 1894.

**ЦЯРЭНЯ Малання Ігнатаўна**, н. у 1862.

**ЧАПКЕВІЧ Іосіф**, н. у 1862.

**ЧАПКЕВІЧ Казімера**, н. у 1872.

**ЧАПКЕВІЧ Настасся**, н. у 1880.

**ЧАПКЕВІЧ Цупрыян Сямёнавіч**, н. у 1876, расстраляны ў 1943.

**ХМЯЛЕЎСКІ Фёдар**, н. у 1852.

**ЦЯРЭНЯ Ягор Ягоравіч**, н. у 1927, спалены ў вёсцы.

## ВЁСКА БУДЫ

**Спалена (64 двары) у сакавіку 1943.**

З а г і н у л і:

**КАЗУСЬ Іосіф Ільіч** з сям'ёй, 5 чалавек.

**КАЗУСЬ Палагея Андрэеўна** з дзіцем.

**КАЗУСЬ Фядосся** з трыма дзецьмі.

**КАЛЕСНІК Піліп**, жонка.

**КУРАШ Палагея Іванаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЛАПЕКА Міхаіл Васілевіч**, 80 гадоў.

**ЛОСЬ Фядосся.**

**ЛОСЬ Якаў Мікалаевіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**МАЖЭЙКА Герасім Ізафатавіч**, 45 гадоў, монка Наталіна, унучка, 3 гады.

**МАЖЭЙКА Марына Пятроўна.**

**МАЖЭЙКА Марыя Пятроўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАЖЭЙКА Пётр Іосіфавіч**, жонка, пяцёра дзяцей.

**МАЖЭЙКА Пётр Якубавіч**, сям'я, 9 чалавек.

**МАЖЭЙКА Фадзей Осіпавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**МАЖЭЙКА Хрысціна**, дачка, двое ўнукаў.

**МАКСУЛЬ Марыя Ігнатаўна**, сястра.

**МАКСУЛЬ Якаў Данілавіч** з сям'ёй, 4 чалавекі.

**МУРАЎЁВА Настасся Фёдараўна (Васілеўна)**, яе трое дзяцей.

**НЯКРАСАВА Вольга Гіляраўна**, яе 5 дзяцей.

**НЯКРАСАВА Домна Васілеўна**, дачка, нявестка і двое ўнукаў.

**НЯКРАСАВА Марфа Пятроўна**, яе двое дзяцей.

**НЯКРАСАЎ Арцём П.**, сям'я, 7 чалавек.

**СКРЫПКА Алена.**

**СКРЫПКА Настасся Атрахімаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**СКРЫПКА Анэта Міхайлаўна** з дзіцем.

**СКРЫПКА Ігнат Міхайлавіч**, жонка і чацвёра дзяцей.

**СКРЫПКА Кузьма Максімавіч**, яго нявестка.

**СКРЫПКА Марыя Пятроўна** з дзіцем.

**СКРЫПКА Пётр Іванавіч**, каля 50 гадоў, жонка Фякціста, н. у 1902, дачка Валянціна, н. у 1932.

**СКРЫПКА Пётр Макаравіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ФРУЦКАЯ Марыя Пятроўна**, сям'я, 7 чалавек.

**ЯНКОЎСКАЯ Марыя Осіпаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ЯРОХА Наталля Андрэеўна (Пятроўна)** і яе трое дзяцей — спаленыя ў вёсцы разам з бежанцамі з іншых вёсак.

**ЛАПЕКА Якаў Данілавіч,**

**ЛАПЕКА Настасся Сцяпанаўна** — расстраляныя.

**ЗАВАДСКІ Браніслаў Сцяпанавіч**, 17 гадоў, быў схоплены фашыстамі, арганізаваў групавыя ўцёкі з лагера ў Рызе, зноў схоплены і на вачах зняволеных лагера выкінуты ў мора з парахода.

**НЯКРАСАЎ Сцяпан Пятровіч**, сын, 15 гадоў, загінулі ў канцлагеры Майданак.

**З успамінаў Марыі Сцяпанаўны Завадскай, в. Буды.**

*Шмат народу палягло. І бужане, і ўрагаўцы — з усёй Асвейшчыны. Сотні ў агонь пайшлі і ў Будах, і ў суседняй Мазалеўшчыне. І тым, хто жывы ўцякаў, пакут такіх давялося паспытаць, што і слоў не знойдзеш расказаць.*

*Мой на фронт пайшоў, там і загінуў. Што добрае з адзення партызанам аддалі,нанасілася я лапцей і ў вайну, і пасля вайны. Чацвярых жа дзяцей па лясах ды балотах з сабою цягала. Узбягуць немцы — уцякаем са сваіх зямлянак — ні ноччу, ні днём спакою не было. Дык я што! А ў адной жа беднай васьмёра рабят было!*

*Як пайшоў фронт, пачалі бамбіць нашы лагеры. Мужчыны павялі нас па балотах, а мы шэпчам: «Кідайце нас!» «Не кінем», — суцяшае Іван Лапека (ён загінуў потым на фронце). І так нам тыя балоты даліся! «Вольгачка, — кажу, — не спі, а то адстанем, кінуць нас, назад не вернемся і напарадзе ў багне патопімся». А Іван усё: «Не кінем!»*

*Выбраліся тады ў Макуты, аж там, дзякуй Богу, нашы салдацікі...*

## ВЁСКА ВАЛЯСЫ

**Спалена (7 двароў) у сакавіку 1943. У 1944 расстраляны:**

**БАРОХА Аляксей Іванавіч**, н. у 1925.
**ГІГЕЛЬ Ганна Сямёнаўна.**
**ГІГЕЛЬ Зынон Іванавіч.**
**ЛЯБЁДКА Яўгенія Аляксееўна.**
**ЛЯБЁДКА Валянціна Аляксандраўна.**
**ЛЯБЁДКА Мікалай Аляксандравіч.**

## ВЁСКА ВАСІЛЕЎШЧЫНА

**Спалена (10 двароў) у лютым 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**СЛЕСАРОНАК Сцепаніда Якаўлеўна**, 40 гадоў, расстраляная ў в. Дубровы.
**СЛЕСАРОНАК Сцяпан Ігнатавіч**, 60 гадоў,
**ФАНДОРКА Пудэнця Осіпаўна,**
**ФАНДОРКА Юзэфа Радзіёнаўна**, 70 гадоў, — спаленыя ў в. Васілеўшчына.

## ВЁСКА ВЯЛІКАЕ СЯЛО

**Спалена ў сакавіку 1943.**

З а г і н у л і:

**АЛЕКСІН Захар Сямёнавіч**, н. у 1905.
**АЛЕКСІНА Лідзія Сямёнаўна**, н. у 1908.
**АЛЕКСІН Сямён Іосіфавіч**, н. у 1898.
**АЛЕКСІНА Марфа Васілеўна**, н. у 1899.
**АНДРУЧОНАК Сцяпан Якаўлевіч**, н. у 1894, забіты з самалёта на Асвейскім возеры ў лютым 1943.
**АНДРУЧОНАК Марыя Лявонцьеўна**, н. у 1884, спаленая ў в. Любасна ў лютым 1943, з ёю загінуў унук Пудаў Валерый Філіпавіч, н. у 1938.
**БАРОХА Анэта Андрэеўна**, н. у 1878.
**БАРОХА Іван Максімавіч.**
**БАРОХА Уладзімір Канстанцінавіч** , н. у 1885.

Магіла ахвяр фашызму ў вёсцы Вялікае Сяло.

**БАРОХА Міхаіл Міхайлавіч**, н. у 1903, жонка Надзея, н. у 1903, і бацька Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1875.
**БАРОХА Павел Уладзіміравіч**, расстраляны каля воз. Святое.
**БУРАК Дарота**, н. у 1895.
**БУРАК Ганна**, н. у 1890.
**ЗАШЧЫРЫНСКІ Пётр Пятровіч**, н. у 1881, жонка Анэта Васілеўна, н. у 1884.
**ЗІНЬКО Дзмітрый Рыгоравіч**, н. у 1902, жонка Барбара Сямёнаўна, н. у 1904.
**КОНАНАЎ Іван Лявонавіч**, н. у 1918, жонка Ефрасіння Захараўна, н. у 1919.
**КРЫВІЦКІ Аляксандр Антонавіч**, расстраляны каля воз. Святое.
**ЛОСЬ Васіль Іванавіч**, сям'я, 7 чалавек.
**ЛОСЬ Лізавета Сцяпанаўна**, н. у 1890.
**ЛУКАШОНАК Аляксандра Г.**, н. у 1891.
**ЛУКАШОНАК Вольга Сямёнаўна**, н. у 1913.
**ЛУКАШОНАК Настасся**, н. у 1898.
**ЛУКАШОНАК Сяргей.**
**МАЖЭЙКА Іван Осіпавіч**, сям'я, 7 чалавек.
**МАРАЧКОЎСКАЯ Зінаіда Міхайлаўна**, н. у 1930.
**МАРАЧКОЎСКАЯ Міхаліна**, н. у 1880.
**ОБУХ Яфім Дарафеевіч**, н. у 1887, дачка Вера, н. у 1932.
**ПАЎЛЮКЕВІЧ Канстанцін Іванавіч**, сям'я, 5 чалавек.
**ПРАСНЯК Максім І.**, сям'я, 2 чалавекі.
**ПУДАЎ Мікалай Сямёнавіч (Сцяпанавіч)**, н. у 1891, сын Аляксей, н. у 1930.
**ПУДАВА Ефрасіння І.**, н. у 1925.
**ПУДАВА Палагея Захараўна**, н. у 1908.
**ПУДАВА Наталля Еўдакімаўна**, н. у 1925.
**ПУДАЎ Вікенцій Еўдакімавіч**, н. у 1933.
**ПУДАЎ Сямён Сямёнавіч**, н. у 1893, жонка Лізавета Пятроўна, н. у 1895.
**ПУДАЎ Якім Аляксеевіч**, расстраляны ля воз. Цятна.
**ПУДАЎ Яфім Пятровіч**, н. у 1882, жонка Ганна, н. у 1884.
**ПУДАЎ Мацвей Нікіфаравіч**, н. у 1912, жонка Палагея, н. у 1914.
**ПУДАВА Дар'я**, н. у 1895.
**ПУДАЎ Іван Васілевіч**, н. у 1883.
**ПУДАВА Надзея Міхайлаўна**, н. у 1888.
**ПУДАВА Настасся Канстанцінаўна**, н. у 1888.
**ПУДАВА Настасся Купрыянаўна**, н. у 1928.
**ПУДАВА Арына**, н. у 1878.
**ПУЗАНСКАЯ Ганна Казіміраўна**, н. у 1898.
**САЎЛУК Лідзія Ільінічна**, н. у 1926.
**СІЦЬКО Ефрасіння Іванаўна**, н. у 1910.
**СІЦЬКО Дзмітрый Васілевіч**, н. у 1928.
**СКРЫПКА Дзмітрый Рыгоравіч**, н. у 1888.
**СКРЫПКА Якаў Пятровіч**, н. у 1873.

**СКРЫПКА Пётр Пятровіч**, н. у 1874, жонка Ганна, н. у 1877.

**СКРЫПКА Ефрасіння**, н. у 1890.

**СКРЫПКА Дар'я Мікалаеўна**, н. у 1923.

**ХРЫПЕЛЬ Канстанцін Фёдаравіч**, н. у 1905, расстраляны ў в. Малавіды.

**ШАБАЛОЎСКАЯ Лідзія Лявонаўна**, н. у 1908,

**ШАБАЛОЎСКІ Антон Сцяпанавіч**, н. у 1913,

**ШАБАЛОЎСКАЯ Агаф'я Сцяпанаўна**, н. у 1914, — спаленыя ў в. Вялікае Сяло.

**ШАБАЛОЎСКІ Ілья** — расстраляны ў 1941.

**ДЗЕМІДЗЁНАК Іван Іванавіч**, н. у 1894,

**КАЛЕСНІК Ілья**,

**МАЗУРЭНКА** (жанч.),

**МАЦЯС Нікіфар Андрэевіч**,

**СКРОБ Матрона Аляксееўна**,

**СУВОРАЎ**,

**СУВОРАЎ**,

**ЦЯРЭНЯ Настасся**, муж Ціхан — расстраляныя ў 1943.

**БАРОХА Андрэй Данілавіч**, н. у 1894, сын Леанід, н. у 1928,

**БАРОХА Наталля Логінаўна**, н. у 1918,

**ЗАВАДСКАЯ Ганна Фёдараўна**, н. у 1900, дочкі — Зінаіда, н. у 1928, і Лідзія, н. у 1930,

**КРЫВІЦКІ Гіляры Адамавіч**, н. у 1852,

**КРЫВІЦКІ Георгій Іванавіч**, н. у 1930,

**МАКЕЕНАК Ефрасіння Сяргееўна**,

**ЛАПОШКА Цімафей Канстанцінавіч**, жонка, нявестка Люба і яе двое дзяцей, 2 і 3 гады, — расстраляныя ў в. Курашы ў лютым 1943.

## ВЁСКА ГАРАДЗІЛАВІЧЫ

**Знішчана бамбёжкамі ў лютым—сакавіку 1943.**

Загінулі:

**АДАМЁНАК Лізавета.**

**АДАМЁНАК Марыя Данілаўна.**

**АДАМЁНАК Сямён Сцяпанавіч**, н. у 1928, спалены ў в. Лісна.

**ЗАШЧЫРЫНСКІ Дзмітрый**, жонка і трое дзяцей.

**ПУДАВА Барбара** з дачкой Марыяй.

**ШАБАЛОЎСКІ Арсень Ігнатавіч**, н. у 1903, жонка Ганна, дочкі Соф'я і Таццяна.

**ШАБАЛОЎСКАЯ Ефрасіння Ільінічна**, н. у 1928, спалена ў в. Малавіды ў 1943.

**МАКЕЕНАК Рыгор Іванавіч**, н. у 1891.

**САЎЛУК Г. А.**, н. у 1860.

**САЎЛУК Г. І.**

**САЎЛУК Вера Гіляраўна**, н. у 1899, сын Павел Іванавіч, н. у 1928, дочкі: Зінаіда, н. у 1930, Соф'я, н. у 1932.

**СКРОБ Мікалай Яфімавіч**, н. у 1928, загінуў ад рук фашысцкіх карнікаў 7.1.1944.

**КУРЭЦ Васіль Фадзеевіч**, н. у 1878, расстраляны гітлераўцамі ў 1943.

**СКРОБ Кацярына Іосіфаўна**, н. у 1911, дачка Антаніна Лявонаўна, н. у 1932, і сын Пётр, н. у 1934, загінулі каля в. Лісна ў сакавіку 1944.

**З успамінаў Івана Яфімавіча Скроба, в. Стралкі.**

*Вёска была вялікая, на 110 двароў. Дакладней, быў цэлы россып выселкаў і хутароў: Бярозаўка, Высокае Поле, Глінкі, Данілаўка, Замошша, Крукі, Пясчанка — адна каля другой. Жылі пры бальшаку, побач — лес, таму і не знішчылі фашысты адразу ўсіх — людзі паспявалі ўцячы. Некаторых смерць спасцігла ў іншых мясцінах.*

*7 студзеня 1944 года карнікі зрабілі чарговы налёт на Гарадзілавічы. Жыхары вёскі былі ў лесе — хто ў партызанах, хто з партызанамі. А на ўзлеску ў зямлянцы засталося дванаццаць хворых на тыф старых, жанчын і дзяцей. З імі быў 90-гадовы Гіляры Крывіцкі, які ніколі ў жыцці не хварэў.*

*Ён даглядаў бездапаможных людзей... Прадукты прыносілі з лесу.*

*Вось і на гэты раз прыйшлі ў зямлянку Павел Саўлук, Скроб Мікалай і Валодзя Фалба (з Царкоўны). Заўважыўшы карнікаў, яны кінуліся да балота. Чэргамі з кулямётаў ім зрэзалі чарапы, нібы пад лінейку, і перасеклі паясніцы. Была завіруха, і снег занёс іх; паспелі адбегчы метраў на трыста.*

*Потым фашысты знайшлі зямлянку і закідалі яе гранатамі ў акно. Дзед, які сядзеў на печы, яшчэ быў жывы. Аднак, пачуўшы стогны, гітлераўцы падышлі і, стаўшы ў дзвярах, пачалі расстрэльваць людзей з аўтаматаў. Дзеду трапіла ў грудзі пяць куль. Калі ўсё сціхла, карнікі пайшлі і падпалілі вёску. Яна згарэла датла.*

*Але сведкі гэтай трагедыі засталіся — параненая ў галаву Ганна Крывіцкая і яе паранены ў нагу сын. Яны ляжалі пад нарамі, і частка куль, прызначаных ім, праляцела міма.*

*У мёртвай цішы яны вылезлі з зямлянкі. Каля яе стаяў запрэжаны ў сані конь, на якім, напэўна, прыязджалі з лесу загінуўшыя хлопцы. Конь сам прывёз напаўжывых маці з сынам у партызанскі атрад. Абаіх адправілі за фронт у шпіталь. Адзін з параненых салдат, які быў там на лячэнні, звярнуў увагу на свежы запіс у журнале — там значыліся два яго аднафамільцы. Так сярод пакут і смерці лёс падараваў салдату Анатолю Крывіцкаму шчасце сустрэчы з маці і братам.*

## ВЁСКА ГАЎРЫЛІНА

**Спалена (15 двароў) у сакавіку 1943.**

**БЛІНАВА Соф'я**, расстраляна за сувязь з партызанамі.

**МАШКЕТАЎ Рыгор**, н. у 1904, закатаваны ў в. Гаўрыліна за сувязь з партызанамі.

**СЕМЯНКОЎ Іван,**

**ШЭФ (ЛУКАШОНАК) Валянціна Сцяпанаўна**, настаўніца, расстраляныя ў г. Себежы за сувязь з партызанамі.

## ВЁСКА ГЛІНЦЫ (ГНІЛЬЦЫ)

**Спалена (12 двароў) у сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

**АЛЬШЭЎСКАЯ Ефрасіння**, дачка Валянціна, н. у 1930, сын Мікалай, н. у 1928, сын, 2 гады.

**АРЛОЎ Леанід Лаўрэнцьевіч**, н. у 1940, яго брат **Уладзімір**, н. у 1939.

**АРЛОВА Таіса Васілеўна**, н. у 1929.

**ГАНЧАРОНАК Іван Цімафеевіч.**

**ГАНЧАРОНАК Настасся**, дочкі Алена і Марыя, сын Міхаіл.

## ВЁСКА ДЗЯНІСЕНКІ

**Спалена (7 двароў) у сакавіку 1943.**

**КАЛМЫЧЭЎСКАЯ Ніна Мікалаеўна.**

**КАЛМЫЧЭЎСКАЯ Марыя Юзэфаўна.**

**КАРЦЕНКА Марфа Аляксандраўна**, яе дзеці: Тамара Васілеўна, Фядосся і Надзея.

**МАРОЗ Ганна Пракопаўна,** яе дзеці: Зінаіда Дзмітрыеўна, Ніна, Валянціна, Васіль — расстраляныя карнікамі ў 1944.

## ВЁСКА ДУБРОВЫ

**Не раз цярпела ад карнікаў, бамбёжак і артабстрэлаў.**

З а г і н у л і:

**АБЛЕЦ Наталля Канстанцінаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**АНІСІМАВА Ксеня Іосіфаўна**, н. у 1907, яе дзеці: Марфа Цімафееўна, н. у 1930, Цімафей, н. у 1932, Рыгор, н. у 1932 і Валянціна, н. у 1941.

**АНІСІМАЎ Дзмітрый Раманавіч**, 70 гадоў, жонка Агата Іванаўна, 65 гадоў, сын Уладзімір, н. у 1936.

**БАРОХА Уладзімір Рыгоравіч**, н. у 1892, яго дзеці: Ніна, н. у 1920, Эдуард, н. у1932, Дзмітрый, н. у 1936, Ганна, н. у 1941, загінулі 6.1.1943, пахаваны ў в. Дубровы.

**ГЛІНСКАЯ Ірына Купрыянаўна.**

**ГЛІНСКІ Нічыпар Іванавіч**, сям'я, 8 чалавек.

**ГЛУНСКІ Кірыла Уласавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**ГРЫНЬ Ірына Кузьмінічна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ДЗЯМІДАВА Зузана Рыгораўна**, сям'я, 7 чалавек.

**ДЗЯМІДАВА Марына,** унучка Фаіна 3-х гадоў, унук Мікалай, паўтара года, спалены ў в. Малавіды.

**ДЗЯМІДАЎ Андрэй Максімавіч**, н. у 1930, сястра Галіна, н. у 1933, расстраляны фашыстамі, пахаваны ў в. Дубровы.

**ДЗЯМІДАЎ Вікенцій Макаравіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ДЗЯМІДАЎ Міхаіл Цімафеевіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЖОРАЎ Антон Іванавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**ЖОРАЎ Сямён Кандратавіч**, н. у 1892, расстраляны 5.4.1944 каля в. Курашы, пахаваны ў в. Дубровы.

**ЗУБАР Ганна Сцяпанаўна.**

**КУРАШ Анюта Сцяпанаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**КУРАШ Мікалай Міхайлавіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**ЛАБЭЦКІЯ** — сям'я.

**ЛОСЬ Аляксей Піліпавіч**, сям'я, 10 чалавек.

**ЛОСЬ Палагея Іосіфаўна**, 70 гадоў.

**ЛОСЬ Сафрон Піліпавіч**, сям'я, 10 чалавек.

**ЛОСЬ Піліп Міронавіч**, 70 гадоў, жонка Дар'я Яфімаўна, 68 гадоў, — спалены ў в. Малавіды.

**МАКЕЕНАК Анатоль Мікалаевіч**, н. у 1941, прапаў без вестак у в. Востраў у 1943 пасля таго, як яго маці і брата фашысты схапілі для адпраўкі ў канцлагер.

**МАКСУЛЬ Андрэй Іванавіч**, сям'я, 5 чалавек.

**МАКСУЛЬ Домна Цімафееўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**МАКСУЛЬ Іван Ігнатавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**МАКСУЛЬ Мікіта Цімафеевіч**, сям'я, 9 чалавек.

**МАКСУЛЬ Пётр Іванавіч**, сям'я, 8 чалавек.

**МАКСУЛЬ Таццяна Іванаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**МАКСУЛЬ Улляна Рыгораўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**МАРОЗ Барбара Лаўрэнаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**МІНКОВА Еўдакія Калістратаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**НОВІК Мікалай Міхайлавіч**, н. у 1920, інвалід, спалены ў в. Малавіды.

**ПЛЮШЧЫК Ігнат Маркавіч**, сям'я, 3 чалавекі.

**ПУДАВА Палагея Захараўна**, н. у 1907, дачка Наташа, н. у 1930, тры сыны — Віктар, н. у 1935, Яўген, н. у 1938, Леанід, н. у 1940.

**СКРЫПКА Ахрэм Станіслававіч**, сям'я, 2 чалавекі.

**СКРЫПКА Ягор Сцяпанавіч**, сям'я, 9 чалавек.

**СЛАБАДА Агата Лявонаўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**СЛАБАДА Лідзія**, н. у 1912, яе дзеці Зінаіда Уладзіміраўна, н. у 1934, Яўгенія, н. у 1936, Віктар, н. у 1940, Пётр, н. у 1940, расстраляны фашыстамі ў 1943, пахаваны на могілках у в. Дубровы.

**СЛАБАДА Іван Сцяпанавіч**, н. у 1898, жонка Вольга Канстанцінаўна, н. у 1896.

**ШЧАСНЫ Васіль Васілевіч**, н. у 1892, сын Сяргей, н. у 1922, расстраляны 8.9.1942 у Асвейскім парку за сувязь з партызанамі, пахаваны ў в. Дубровы.

**СЛАБАДА Андрэй Іванавіч**, сын і дачка н. у 1928 і 1930, расстраляны і пахаваны каля Саёўскага балота.

**СТАНКЕВІЧ Марыя Фадзееўна**, унучка Дзіна,

**СТАНКЕВІЧ Ала**, партызанская сувязная, фашысты падверглі яе жорсткім катаванням — расстраляны і пахаваны ў в. Дубравы.

**СТАНКЕВІЧ Валянціна**, настаўніца, яе двое дзяцей — спалены фашыстамі ў печы.

**ЦЕРАХАЎ Аляксандр Піліпавіч**, н. у 1900, спалены ў 1942, жонка Ганна Андрэеўна, н. у 1905, сын Пётр, н. у 1923, застрэлены фашыстамі, дачка Настасся, н. у 1940, прапала без вестак у 1943.

**ШЛЫК Марфа Іванаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

**ШЧАСНЫ Максім Каліставіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**ШЧАСНЫ Міхаіл Пятровіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**ШЧАСНЫ Пётр Каліставіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЯКУШОНАК Ганна Міхайлаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**ЯКУШОНАК Ефрасіння Т.**

**ЯКУШОНАК Павел Купрыянавіч**, сям'я, 4 чалавекі.

**ЯРОХА Андрэй Іванавіч**, сям'я, 3 чалавекі, загінулі ў час карных аперацый.

**З ліста Яфіма Цімафеевіча і Міхаіла Цімафеевіча Анісімавых з вёскі Дубровы.**

*«Вялікі вам дзякуй, што ўзяліся за такую справу. Пра вайну гаварыць заўсёды цяжка, а пісаць і яшчэ цяжэй, асабліва, калі ты страціў у тыя часы сваіх родных — маці, сясцёр, братоў, сваякоў і суседзяў. Нашых родных фашысты спалілі ў вёсцы Малавіды...»*

*Гэта пісьмо прыйшло ў рэдакцыю разам з пісьмом **Зінаіды Аляксандраўны Ужакла**, яе родныя таксама пахаваныя ў Малавідах.*

*«Шмат разоў бралася за ручку і паперу, але не хапала сіл пісаць. Чытаю спісы ахвяр фашызму і ўспамінаю далёкае, да канца жыцця незабыўнае.*

*...Усе мае продкі жылі ў Асвеі. У час вайны, у сакавіку 1943, мая маці Ужакла Домна Сцяпанаўна і сястрычка Ганна былі спаленыя ў Малавідах разам з жыхарамі Асвеі, вёсак Кісялі, Ярохі, Малавіды, Дубровы і іншых.*

*На ўзгорку, дзе зараз стэла, спалілі 173 чалавекі. Ёсць у гэтай вёсцы і іншыя месцы, дзе знішчалі людзей.*

*...Сама я прайшла праз канцлагер Саласпілс. Там было шмат людзей з Асвейшчыны. Памятаю, як расстралялі каля лагернай агароджы ў рове Гінько Вольгу (50 гадоў) і Спарак Аўдоцыю (70 гадоў) з трохгадовым унукам Стасікам, бо яны былі зусім слабыя.*

*...Добра памятаю, што вёска Вялікае Сяло была спаленая ў сакавіку 1943 года. Было там многа людзей і з іншых вёсак. Палілі іх і ля дарогі, і ў лазні каля возера. Жанчыны і старыя, ведучы за рукі дзяцей, неслі абразы і маліліся. З абразамі — і ў агонь...»*

## ВЁСКА ЕЛЬНІЦА

**Спалена ў лютым 1943.**

Загінулі:

**ГРЫБОЎСКАЯ Ефрасіння М.**, сям'я, 2 чалавекі.

**ГРЫБОЎСКАЯ Жэня Іванаўна**, сям'я, 3 чалавекі.

**ГРЫБОЎСКАЯ Марыя Аляксееўна**, сям'я, 2 чалавекі.

**МАКЕЕНАК Аляксаха**, 30 гадоў, дачка Маня, каля 3 гадоў, сын Віця, каля 2 гадоў.

**МАР'Я**, 20 гадоў.

**МАРОЗ Аляксаха Фядотаўна**, сям'я, 5 чалавек.

**МАРОЗ Іван Вікенцьевіч**, сям'я, 10 чалавек.

**МАРОЗ Кацярына Рыгораўна.**

**МАРОЗ Марфа Пятроўна**, сям'я, 7 чалавек.

**МАРОЗ Міхаіл Іванавіч**, 50 гадоў, жонка Хрысціна Рыгораўна.

**МАРОЗ Осіп Ціханавіч.**

**МАРОЗ Таццяна Данілаўна**, н. у 1912.

## ВЁСКА ЗАЛУЧЧА

**ТРАНЧОНАК Гаўрыла Багданавіч**, сям'я, 5 чалавек.

## ВЁСКА ІГНАЛІНА

**Спалена ў сакавіку 1943.**

**ПІЛЕЦКІ Сцяпан**, н. у 1879.

**СКРЫПКА Дзмітрый**, вясковы староста, расстраляны за сувязь з партызанамі.

**СЛЕСАРОНАК Ганна Дзмітраўна**, н. у 1909, яе Генадзь Міхайлавіч, н. у 1938.

**СТАСЕЎ Мікалай Мікалаевіч**, н. у 1922.

**ФРАЛЁНАК Ірына**, н. у 1877.

**ХМЯЛЕЎСКІ Тарас Фёдаравіч**, н. у 1904.

**ЧАПКЕВІЧ Настасся**, н. у 1908, дочкі Валянціна Сідараўна , н. у 1930, Марыя, н. у 1937, сын Уладзімір, н. у 1936, і свякроў.

**ЧАПКЕВІЧ Магуржата**, н. у 1862.

**ЧАПКЕВІЧ Ядвіга Адамаўна**, н. у 1910.

**ШРОМ Ягор Усцінавіч**, н. у 1901.

**ЯСКОВА Аксіння**, н. у 1881.

## ВЁСКА ІЗУБРЫЦА

**Спалена (15 двароў) у сакавіку 1943.**

**МАКЕЕНАК Марыя Міхайлаўна** і яе дзве дачкі: Тамара, 8 гадоў, і Марыя, 7 гадоў.

**ЧАРНАВОК Аляксандра Іванаўна**, н. у 1905.

## ВЁСКА КАБЫЛЕНЦЫ

**Спалена (10 двароў) у сакавіку 1943.**

**ДЗЕНІСЁНАК Васіль Сямёнавіч**, н. у 1923, расстраляны карнікамі каля воз. Лісна.

**ДЗЕНІСЁНАК Марыя Іванаўна**, сям'я, 4 чалавекі.

## ВЁСКА КАСТРОВА

**Спалена ў сакавіку 1943.**

З а г і н у л і:

**ВАРАНЕЦКІ Піліп Іванавіч**, н. у 1896, жонка Марыя Данілаўна, н. у 1900, дочкі Клаўдзія, н. у 1923, Фаіна, н. у 1924, Настасся, н. у 1927.

**ВАРАНЕЦКАЯ Анэта**, н. у 1876.

**ВАРАНЕЦКІ Пётр Пятровіч**, н. у 1907.

**ЛУКАШОНАК Антон Сцяпанавіч**, н. у 1884, жонка **Анэта**, н. у 1884.

**ЛЯДАК Станіслаў Восіпавіч**, н. у 1890, жонка Аляксандра Міхайлаўна, н. у 1893, дзеці: Надзея, н. у 1930, Ілля, н. у 1932, Ціхан, н. у 1934, Аляксей, н. у 1938.

**ЛЯМНІЦКАЯ Таццяна Кузьмінічна**, н. у 1901, сын **Віктар Пятровіч**, н. у 1926.

**ЛЯМНІЦКІ Фёдар Купрыянавіч**, н. у 1890.

**ЛЯМНІЦКІ Фёдар Максімавіч**, расстраляны і спалены ў вёсцы в. Красова 7.6.1944.

**ВАРАНЕЦКІ Іван Мікалаевіч**, 35 гадоў, жонка Клаўдзя Іванаўна, дзве дачкі і сын загінулі ў час карнай аперацыі ў лютым 1943 пад в. Лісна.

**ПУЗАНСКАЯ Ганна Мікалаеўна**, сыны **Аляксандр** і **Ягор.**

**ПУЗАНСКІ Фёдар Казіміравіч.**

**ПУЗАНСКІ Пётр Пятровіч**, н. у 1928.

**ЧАПКЕВІЧ Антон Антонавіч**, н. у 1889, жонка Ганна Аляксееўна, н. у 1890, сын Франц, н. у 1928, дачка Паўла, н. у 1935.

**ЧАПКЕВІЧ Гаўрыла Пятровіч**, н. у 1884, жонка Анэта Іванаўна , н. у 1885, дачка Мар'я, н. ў 1917, сын Браніслаў, н. у 1920, дачка Адэля, н. у 1935.

**ЯСЬКОЎ Ануфрый**, н. у 1895.

**ЯСЬКОВА Ганна**, н. у 1876, расстраляна і спалена ў в. Кастрова.

**ЛЯМНІЦКІ Іван Андрэевіч**, н. у 1921, прапаў без вестак.

**ТУЧЫНСКАЯ Марыя Варфаламееўна**, н. у 1889.

**ЯСЬКОВА Ганна**, н. у 1890, загінула пры бамбёжцы.

**ЯРОМЕНАК Марыя Міхайлаўна**, 12 гадоў, расстраляная фашыстамі 26.12.1943 ва ўр. Брыздджалёўка, пахаваная ў Дубровах.

## ВЁСКА КРАСОВА

**Спалена (30 двароў) у сакавіку 1943.**

**АРЖАНІК Іван Сцяпанавіч**, н. у 1870.

**АРЖАНІК Марыя Раманаўна**, н. у 1863.

**АРЖАНІК Кузьма Сцяпанавіч**, н. у 1880.

**АРЖАНІК Фядосся**, н. у 1882.

**БУРАК Рыпіна**, 70 гадоў.

**ВАРАНЕЦКАЯ Гелена**, сям'я, 3 чалавекі.

**ЛУКАШОНАК Пётр Ігнатавіч** , н. у 1865, жонка Тэкля Вікенцьеўна, н. у 1867, сын Серафім, н. у 1907.

**МАЛЬКОВІЧ Іван**, 50 гадоў, жонка Ганна, 48 гадоў, дачка Марыя, 20 гадоў, з дачкой Святланай, 1 год.

**ПЯТРОВІЧ Сямён Мікалаевіч**, 60 гадоў, жонка Марта Мікалаеўна, 60 гадоў.

**СЛЕСАРОНАК Іван Аляксеевіч**, н. у 1918, жонка Любоў Пятроўна і іх дачушка, н. у 1943, загінулі ў час карнай аперацыі каля в. Роўнае Поле Расонскага раёна.

**ШРОМ Канстанцін Еўдакімавіч**, 63 гады.

**ШРОМ Кузьма Ігнатавіч**, 75 гадоў, жонка Марыя, 70 гадоў.

**ШРОМ Марк Калістратавіч**, н. у 1864, сястра Палагея, н. у 1868.

**ШРОМ Нічыпар Еўдакімавіч**, 65 гадоў.

## ВЁСКА КУРАШЫ (САЁЎСКІЯ)

**Спалена ў сакавіку 1943.**

**КУРАШ Дар'я,**
**КУРАШ Ігнат,**
**КУРАШ Марыя,** яе маці і дачка,
**КУРАШ Марыя**, яе чацвёра дзяцей,
**КУРАШ Мікіта Купрыянавіч** і яго жонка Кацярына Вікенцьеўна,
**КУРАШ Раман** — зарэзаныя нажамі, расстраляныя або спаленыя ў в. Малавіды ў 1943.

## ВЁСКА КУРАШЫ (ЦЯЦЕНСКІЯ)

**Спалена ў сакавіку 1943.**

**КУРАШ Андрэй Міхайлавіч**, жонка Анэта, дачка Яроха Наталля Андрэеўна і яе двое дзяцей, нявестка Фядора Ігнатаўна і яе двое дзяцей, яшчэ адна нявестка з дваіма дзецьмі.
**КУРАШ Антон Міхайлавіч**, жонка Вольга Ігнатаўна, сын Сямён, дачка Хрысціна.
**КУРАШ Мікалай Міхайлавіч**, жонка Настасся Паўлаўна, унук Уладзімір Іванавіч, унучка Палагея Іванаўна.

## ВЁСКА ЛАТЫГАВА

**Спалена ў сакавіку 1943. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».**

З а г і н у л і:

**БАРОХА Пётр Фёдаравіч**, н. у 1939.
**ГРЫБОЎСКАЯ Вольга Мікалаеўна**, н. у 1891.
**ГРЫБОЎСКІ Іван Фёдаравіч**, н. у 1935.
**ГРЫБОЎСКІ Аляксандр Фёдаравіч**, н. у 1937.



Помнік ахвярам фашызму ў вёсцы Латыгава.

**ГРЫБОЎСКАЯ Лізавета.**
**ГРЫБОЎСКАЯ Марыя Пятроўна**, н. у 1895.
**ГРЫБОЎСКАЯ Лідзія Сцяпанаўна**, н. у 1937.
**ГРЫБОЎСКІ Віктар Сцяпанавіч**, н. у 1939.
**ГРЫБОЎСКАЯ Марыя Фёдараўна**, н. у 1880.
**ГРЫБОЎСКАЯ Настасся Язэпаўна**, н. у 1898.
**ГРЫБОЎСКАЯ Марыя Іванаўна**, н. у 1935.
**ГРЫБОЎСКІ Пракоп Мікітавіч**, н. у 1895, жонка Аляксаха Сяргееўна, н. у 1905, і іх дзеці: Аляксандра, н. у 1927, Пётр, н. у 1930, Надзея, н. у 1933, Валянціна, н. ў 1937, Мікалай.
**ГРЫБОЎСКІ Сцяпан Мікітавіч**, н. у 1891, жонка Марыя Рыгораўна, н. у 1892, дочкі Соф'я, н. у 1935, Марыя, н. у 1930.
**ЗАБАГОНСКАЯ Агата Ермалаеўна**, н. у 1889.
**ЗАБАГОНСКАЯ Антаніна Іванаўна**, н. у 1933.
**ЗАБАГОНСКІ Іван Іванавіч**, н. у 1935.
**ЗАБАГОНСКАЯ Марфа Аляксандраўна**, яе дзеці: Уладзімір Іванавіч, 7 гадоў, Антаніна, 4 гады, Валянціна, 1 год.
**ЗАБАГОНСКАЯ Настасся Іванаўна**, н. у 1881.
**КУКСЁНАК Еўдакія Ігнатаўна.**
Да 119-й стралковай дывізіі носпех прыйшоў 11 ліпеня.

**З журнала баявых дзеянняў 119-й стралковай дывізіі**

«Праціўнік у 3.00 11.07 пачаў адыход у паўночна-заходнім напрамку, прыкрываючыся агнём артылерыі і мінамётаў, 365 сп пачаў у 4.40 пераслед адыходзячага праціўніка, у 6.00 полк уварваўся на ўсходнюю ўскраіну мястэчка і станцыю Боркавічы, з ходу збіў заслоны і факельшчыкаў і ў 6.45 цалкам ачысціў Боркавічы. Развіваючы наступленне, завалодаў н.п.Скарада, Няверава, Забелы-1. Праціўнік з паўночнага берага р.Дрыса флангавым кулямётным агнём спыніў полк на заходняй ускраіне н.п. Забелы-1. Камандзір палка прыняў рашэнне абысці адкрытае месца з захаду, і да 17.00 полк выйшаў у Забелы-2, працягваючы рух на Валынцы».

Гадзінай пазней на гэтыя пазіцыі выйшаў і 421-ы полк.

Падтрымліваючы наступленне суседзяў, моцны ўдар па праціўніку нанесла 332-я дывізія. У аперзводцы за 11 ліпеня налічваецца 40 вызваленых вёсак. Вызваліцеляў з 332-й у гэты дзень сустракалі ў Адамове і Забор'і, Нураве і Барсуках, Вадве, Моханаве і Касталомах. На наступны дзень, развіваючы поспех, дывізія за паўдня прайшла яшчэ 22 кіламетры і вызваліла 43 населеныя пункты ў міжрэччы Дзвіны і Дрысы. Жыхары Прудзінак і Ляшчылава, Хрусталёва і Ракусіна, Цястоў і Шайтарава маглі пачынаць мірнае жыццё.

На ўчастку 1115-га стралковага палка, які рухаўся ўздоўж Заходняй Дзвіны, фашысты арганізавалі ўпартае супраціўленне, замацаваўшыся ў лясным масіве, што цягнуўся ад Несцераў да Смулькава.

Полк нанёс сакрушальны ўдар у напрамку Дрысы, прарваў абарончы рубеж. Адначасова 270-я стралковая дывізія 6-й гвардзейскай арміі разграміла групоўку праціўніка на левым беразе Заходняй Дзвіны. Пасля інтэнсіўнага артабстрэлу 973-ці стралковы полк гэтай дзівізіі на досвітку 12 ліпеня фарсіраваў раку і распачаў вулічныя баі ў горадзе, аблегчыўшы тым самым перадавым часцям 4-й ударнай арміі задачу па вызваленні Дрысы. 332-я дывізія рапартавала ў штаб 4-й ударнай арміі:

«12 ліпеня 1115-ты стралковы полк прарваў упартае супраціўленне праціўніка на рубяжах Несцеры — Барсукі — Хараброва, Смулькава — Спартак і м.Дрыса. У 13.15 перадавыя часці палка ўварваліся ў м.Дрыса і ў 13.40 полк цалкам авалодаў м.Дрыса».

378-я дывізія ачысціла ад гітлераўцаў усё міжрэчча Свольны і Дрысы да Асвейска-Полацкай шашы.

17 ліпеня часцямі 325-й стралковай дывізіі 22-й арміі ва ўзаемадзеянні з партызанскай брыгадай імя М.В. Фрунзе вызвалены г.п.Асвея.

За гады вайны, як сведчаць гістарычныя даведнікі, на тэрыторыі раёна фашысты загубілі 20228 мірных жыхароў, на франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 5190 чалавек /у т.л. 640 партызан і падпольшчыкаў/. На тэрыторыі раёна пахавана 2880 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, спалены 426 вёсак, з іх 186 не адрадзіліся.

*Падрыхтаваў да друку*
*А.Бубала*

## За наш родны горад

Ёсць у скверы нашага горада помнік. Круглы год ля падножжа яго ляжаць вянкі кветак. Помнік пастаўлены афіцэрам Савецкай Арміі маёру Міхаілу Маскоўскаму і старшаму лейтэнанту Аркадзю Панціелеву, якія загінулі, вызваляючы Верхнядзвінск.

Вось расказ пра жыццё і баявы шлях аднаго з герояў.

Старшы лейтэнант Панціелеў быў агітатарам палка. Нарадзіўся ён у горадзе Почапе Арлоўскай вобласці ў 1919 годзе. Бацькі яго неўзабаве пераехалі на жыццё ў Маскву. Там Аркадзь вучыўся, уступіў у камсамол. У школе Аркадзь працаваў атрадным важатым. У піянерскім Артэку ён быў любімым забаўнікам дзяцей.

Пра школьныя гады сябра Аркадзя маёр Журбіцкі расказвае: «Аркаша быў сярод нас першы завадатар. То ён прыдумае новую гульню, то арганізуе цікавы паход. Памятаю, як напярэдадні першамайскага свята 1935 года ён арганізаваў майстэрню па вырабе педальных аўтамабіляў. І колькі было радасці ў рабят, калі ім дазволілі на сваіх машынах праехаць па Краснай плошчы.

Мы жылі побач. Пасля заканчэння школы я паступіў у авіяцыйнае вучылішча, а Панціелеў у Маскоўскі педагагічны інстытут.

Пасля інстытута Аркадзь працаваў інструктарам школ Маскоўскага камітэта камсамола, потым яго выбралі сакратаром Фрунзенскага РК ВЛКСМ»

Але пачалася вайна. Панціелеў настойліва дабіваецца адпраўкі ў армію. У жніўні 1942 года яго накіроўваюць на вучобу ў ваенна-палітычнае вучылішча. А ў пачатку 1943 года Аркадзь ужо на фронце.

Камуніст Панціелеў адразу актыўна ўключаецца ў жыццё часці. За мужнасць і доблесць пры штурме Вялікіх Лук ён быў прадстаўлены да першай урадавай узнагароды — медаля «За адвагу».

Ордэн Чырвонай Зоркі Аркадзь атрымаў за тое, што ў крытычную хвіліну бою першым падняўся ў атаку і асабістым прыкладам натхніў салдат роты.

За гераізм, праяўлены ў баях за Верхнядзвінск, Аркадзь Панціелеў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны.

...У паўночна-заходнім напрамку ад горада немцы, выкарыстаўшы пад абарончыя рубяжы старыя ўмацаванні, перагарадзілі шлях нашым войскам. Танкі гітлераўцаў былі закапаны і ператвораны ў нерухомыя агнявыя кропкі.

Камандаванне вырашыла паслаць у тыл ворага танкавы дэсант. Камандзірам групы аўтаматчыкаў назначыла Аркадзя Панціелева. Ад хуткасці і смеласці залежала ўсё. Танкісты зайшлі ў тыл ворага, і аўтаматчыкі кінуліся ў атаку. У першых радах — Аркадзь. Некалькі дзесяткаў крокаў аддзялялі яго ад варожых пазіцый. І тут смельчака скасіла куля. Але нішто ўжо не магло спыніць нашых байцоў. Яны авалодалі пазіцыяй.

Баявыя сябры цяжка перажывалі смерць Аркадзя. Аб гэтым гавораць іх пісьмы бацькам Панціелева. Вось што пісаў з фронту яго аднапалчанін Міхаіл Замбары: «Выконваю вашу просьбу і паведамляю пра лёс Аркашы. Цяжка ўспамінаць перажытае гора. 14 ліпеня наш полк вёў жорсткі бой. Выконваючы баявое заданне, Аркадзь быў смяротна паранены ў грудзі, у вобласць сэрца...»

Пахаваны Аркадзь у горадзе Дрыса ў гарадскім садзе, з усімі ваеннымі ўшанаваннямі.

Аб тым, як любіў жыццё старшы лейтэнант Аркадзь Панціелеў, расказваюць яго пісьмы родным. Вось яго апошняя пісьмо бацькам:

«Дарагія мае! Вельмі прашу не хвалюйцеся, што стаў рэдка пісаць. Я здаровы і цэлы. Зараз вельмі многа работы, ды прытым я ўвесь у руху. Але справы добрыя, радасныя. Вельмі, вельмі хутка мы пераможам, і тады ўсе збяромся разам».

У пісьме да брата-лётчыка Якава Аркадзь пісаў: «Мы з табой шчаслівыя і абавязкова будзем жыць. Сутнасць у тым, каб перамагчы і жыць. Праўда?» — пытаўся ён брата.

Так, воіны-вызваліцелі жывуць у памяці народа.

*М.Рыц*

## У баі за Дрысу

...Пачатак ліпеня 1944 года. Перадавыя часці нашых войск ушчыльную падышлі да Дрысы.

У ліку штурмаваўшых горад былі і воіны асобнага батальёна 4-й ударнай арміі, якім камандаваў маёр Анатоль Качкар.

...Два дні ішлі бесперапынныя баі. Ні на гадзіну не змаўкала кананада. Руху наперад нашых часцей перашкаджалі ўмацаванні праціўніка на поўдні горада. Разведчыкі, якім было даручана выявіць дакладнае месцазнаходжанне варожых умацаванняў, з задання не вярнуліся. Час ішоў, але далей чакаць было нельга.

У размяшчэнне батальёна прыбыў камандзір дывізіі палкоўнік Тапорчын. Маёр Качкар вызваўся сам пайсці ў разведку. Атрымаўшы загад камандзіра, ён з двума аўтаматчыкамі пад прыкрыццём ночы адправіўся ў нялёгкі шлях.

Баявыя сябры прасілі яго быць асцярожным. Маёр Васіль Ярулін і капітан Мікалай Чысцякоў не клаліся спаць. Яны чакалі вяртання Качкара.

Трое смельчакоў прабраліся да першай лініі нямецкіх траншэяў. І раптам ударыла аўтаматная чарга. Праз момант ужо нельга было вызначыць, адкуль страляюць. Здавалася, страляе ўвесь лес, увесь бераг Дзвіны. Адстрэльваючыся, маёр па ўспышках засякаў лінію нямецкіх траншэяў, варожыя агнявыя кропкі.

...Штосьці востра і рэзка ўдарыла ў жывот. Качкар страціў прытомнасць. Калі апрытомнеў, усё зразумеў. У начной перастрэлцы загінуў сяржант Цялегін, а радавы Гур'ян, сам паранены ў нагу, нёс камандзіра да сваіх.

Некалькі разоў Качкар загадваў Гур'яну кінуць яго і далей дабірацца аднаму. Батальёну патрэбны звесткі, без якіх магло загінуць шмат людзей. Гур'ян не хацеў пакідаць камандзіра. Сабраўшы апошнія сілы, Анатоль прашаптаў: «Прашу, паўзі адзін». І Гур'ян падпарадкаваўся. Ён змог даставіць камандаванню схему варожых умацаванняў і агнявых кропак, якую паспеў нанесці на карту смяротна паранены камандзір.

На світанні раскацістае «ўра» ўскалыхнула паветра. Качкар не чуў гэтага пераможнага крыку — сябры знайшлі яго мёртвым. Пасінелай рукой ён моцна сціскаў пісталет. Здавалася, нават пасля смерці ён не хацеў развітацца са зброяй, якую яму ўручыла Радзіма.

*М.Рыц*

## Грымоты над Ужыцай

Рэчка Ужыца ўяўляла сабой другі значны рубеж супраціўлення гітлераўцаў. На галоўным напрамку наступлення, г.зн. на шляху 119-й стралковай дывізіі, акапалася на заходнім беразе ракі 290-я палявая дывізія фашыстаў. Галоўнымі апорнымі пунктамі былі вёскі Атокі і Ілгачы. Пярэдні край уяўляў сабой траншэі з кулямётнымі пляцоўкамі. Пасля адпачынку 13—14 ліпеня, калі дывізіі рыхтаваліся да рыўка на Латвію, першым пачаў начны штурм варожых пазіцый 634-ты полк. Ён асядлаў баль-

шак, што вёў на Пакаёўцы /нямецкую бетонку/, адбіў дзве контратакі праціўніка і, абышоўшы яго з флангу, нанёс раптоўны ўдар.

За дзень у ходзе бесперапынных атак 365-ты полк авалодаў, фарсіраваўшы Ужыцу, варожымі ўмацаваннямі ля Атокаў. Фашысты падцягнулі новыя сілы і пры ўдзеле танкаў і самаходнай артылерыі, якіх надвячоркам падтрымалі інтэнсіўнай бамбёжкай 14 самалётаў, абрушыліся на 634-ты полк, імкнучыся адарваць яго ад асноўных сіл дывізіі. У ноч на 16 ліпеня камандаванне кінула ў раён бою 421-ы стралковы полк, які знаходзіўся ў рэзерве ў в.Бароўка. Да раніцы фронт быў выраўнены.

На гэты дзень на іншых участках лінія фронту таксама праходзіла па берагах Ужыцы і яе прытокаў. Жорсткія баі разгарнуліся каля вёсак Выдрыцкія, Гараваткі, Чырвонцы, у наступальных баях гінулі салдаты ў Мінках і Бузове, пад Грыбоўцамі і Чурглямі. Выйшаўшы з лясоў, да Асётак, Жарабцова і Стралкоў прабіліся дывізіі з Расоншчыны. З поўначы і ўсходу між азёрамі Лісняншчыны і Себежскага краю выйшла 22-я армія. Адгрымелі баі пад Гаўрылінам і Красовам, Кастровам і Валясамі. Вогненным кальцом палыхала Асвейскае ўзвышша. Наперадзе былі рака Сар'янка і Асвея.

*А.Бубала*

## Баі на прыдзвінскай зямлі

**З успамінаў гвардыі маёра ў адстаўцы П. Пятровіча, ветэрана вайны**

Адзін з нашых палкоў увесь час наступаў уздоўж чыгункі. Адстойваючы станцыі, вораг супраціўляўся асабліва ўпарта.

Так было і пад Дрысай. Сустрэўшы адчайнае супраціўленне ворага, стралкі былі вымушаны спыніцца і акапацца. На дапамогу пехацінцам адразу ж прыйшлі мінамётчыкі старшага лейтэнанта Кулікова, якія ні на крок не адставалі ад пяхоты. Былі тэрмінова падрыхтаваны і перададзены на батарэю даныя на знішчэнне засечаных агнявых кропак праціўніка.

Мінамётчыку асноўнага мінамёта Асыкіну спатрэбілася для прыстрэлкі ўсяго дзве мінуты. Адразу ж адкрылі беглы агонь. Варожы кулямёт на правым фланзе быў знішчаны. Праз які час змоўкла і другая агнявая кропка ворага.

Усё ішло нармальна, але на ўскраіне пасёлка па нашых самаходках прамой наводкай адкрыла агонь варожая гармата. Тут жа былі прынятыя меры па яе знішчэнні. Падрыхтаваў даныя і карэкціраваў агонь артылерыі старшы лейтэнант Куркін, назіральнікамі былі малодшы сяржант Чарнецкі і радавы Тапароў. Зладжана і хутка дзейнічалі члены разліку Каплуноў, Мельнікаў і Лючаў. Была дадзена каманда адкрыць беглы агонь усім узводам.

Аднак фашысты паспрабавалі вывезці падбітую гармату, ужо і аўтамашына падышла. Гэта заўважылі нашы назіральнікі, і зноў на батарэю паляцела каманда. Хутка зрабілі даварот і адкрылі агонь. Была знішчана і машына.

...Падраздзяленне падышло ўжо да невялікай рэчкі Ужыца. Але тут раптам па ланцугу разнеслася: «Раніла

камандзіра». Камсамолец Мікалай Сарока не разгубіўся і ў гэтую цяжкую мінуту прыняў камандаванне на сябе. «Узвод, слухай маю каманду! За мной, наперад!» — пачуўся яго ўпэўнены голас. Падбегшы да берага, ён кінуўся ў раку.

Узвод фарсіраваў рэчку ўброд, на хаду страляючы, праследаваў праціўніка. Пасля бою камандзір роты вынес падзяку камсамольцу Сароку за ініцыятыву і ўмелыя дзеянні.

...Падцягнуўшы тылы, папоўніўшы боезапас, нашы часці працягвалі наступленне. Галоўны батальён, які ішоў па пятах адступаючага праціўніка, сустрэў водную перашкоду — раку Сар'янку. Паступіў загад: фарсіраваць рэчку і заняць бліжэйшы населены пункт.

Камбат арганізаваў вывучэнне абароны праціўніка і месцаў пераправы. Выявілася, што абарона немцаў добра ўмацавана, яны займаюць выгадную пазіцыю. Аб гэтым далажылі камандзіру палка. Адказ быў па-ваеннаму лаканічным: «Дзейнічайце самастойна».

Немцы мелі апорны пункт з траншэямі, мінным полем і драцяной загародай. Бераг з боку праціўніка круты, зарос густым хмызняком, а наш бераг зусім адкрыты і добра праглядаўся.

Камандзір роты старшы лейтэнант Хадановіч задумаў перахітрыць ворага. Стварыўшы бачнасць фарсіравання ракі ў гэтым месцы, ён вырашыў пераправіцца цераз яе крыху лявей, дзе берагі пакатыя і рака значна мялейшая. Так і зрабілі.

Тры станковыя кулямёты пад камандаваннем старшага лейтэнанта Часнакова былі пастаўлены на вышыньку, адкуль добра праглядалася абарона праціўніка. Кулямётчыкі мелі задачу сваім агнём увесці праціўніка ў зман і ў выпадку контратакі прыкрыць роту. Крыху правей была пастаўлена на прамую наводку 45-міліметровая гармата пад камандаваннем лейтэнанта Цюрына. З гэтага месца добра праглядаліся амаль усе агнявыя кропкі праціўніка, якія хаваліся пад прыкрыццём зарослых могілак.

Калі ўсё было гатова, байцы роты ўброд і ўплаў пераадолелі раку, а ў гэты час кулямёты і гармата вялі інтэнсіўны агонь па праціўніку. Гітлераўцы думалі, што нашы воіны фарсіруюць рэчку насупраць могілак, і пайшлі ў атаку, але натрапілі на моцны агонь кулямётаў і гарматы і вымушаны былі залегчы.

А асноўныя сілы батальёна ўжо сканцэнтраваліся ў выгадным месцы. Кулямёты і гарматы, якія выканалі сваю задачу, былі зняты і прыбылі на асноўны рубеж. Батальён з фланга зайшоў немцам у тыл, нечакана напаў на іх і выбіў з занятых пазіцый. Баявая задача была паспяхова выканана.

У іншым месцы пры фарсіраванні ракі Сар'янка вызначыўся камсорг роты Аляксандр Глейзер. Ён першым смела кінуўся ў раку і пераправіўся на другі бераг уброд. Услед за ім фарсіравалі рэчку два аддзяленні. Калі праціўнік адкрыў моцны кулямётны агонь, Аляксандр Глейзер па-пластунску падпоўз да дзота і закідаў яго гранатамі. Глейзер захапіў двух палонных.

Нашы воіны пайшлі ў атаку, выбілі немцаў з траншэй і занялі вышыньку. Хутка на гэтым беразе была ўжо ўся рота.

...Некалькі дзён наша дывізія наступала, не дазваляючы ворагу замацавацца.

## Сар'янка памятае

У межах раёна Сар'янка была апошнім сур'ёзным натуральным рубяжом на шляху наступлення Чырвонай Арміі, і немцы пастараліся выкарыстаць спаўна абаронныя магчымасці непераадольна крутых берагоў ракі, падарваўшы пры адступленні масты і сканцэнтраваўшы ля рэдкіх брадоў свае рэзервы.

Становішча было настолькі сур'ёзным, што рашэннем Галоўнага Камандавання сюды былі кінуты некалькі танкавых брыгад — 24-я, 41-я, 70-я, якія маршам з-пад Новасакольнікаў і Дрэтуні выйшлі на Сар'янку напярэдадні рашучага штурму, які намячаўся на 17 ліпеня.

**З журнала баявых дзеянняў 119-й стралковай дывізіі**

**16 ліпеня**

Дывізія мае задачу: да 22.00 16.7 авалодаць н.п.: Важаны, Гарбулі, Бярозаўка і цалкам ачысціць ад праціўніка ўсходні бераг Сар'янкі ў сваёй паласе.

Часці 290-й пд праціўніка адышлі на інжынерныя збудаванні на заходнім беразе Сар'янкі, моцным агнём кулямётаў чыняць упартае супраціўленне нашым часцям. На працягу дня артылерыя і мінамёты праціўніка выпусцілі да 1200 снарадаў і мін.

365-ты сп на працягу дня вёў цяжкія баі з буйнымі сіламі праціўніка, што пераходзілі ў атакі, і, прасунуўшыся наперад, выйшаў на рубеж: хмызняк 700 м на пд-зах Сардыкі — усходняя ўскраіна Гарбулі. 364-ы сп працягваў бой з занятых напярэдадні рубяжоў. 421-ы сп, выбіўшы праціўніка з безыменнай вышыні на пн-усх ад н.п. Пакаёўцы, завалодаў мостам цераз р.Ужыца.

**17 ліпеня**

Дывізія мае задачу: да 4.00 17.7.1944 ачысціць усходні бераг р.Сар'янкі і выйсці на заходні бераг, заняўшы пазіцыі для атакі на рубяжы Сардыкі — асобны домік на зах. беразе Сар'янкі за 800 м на зах. ад в.Гарбулі.

Бліжэйшая задача: знішчыць праціўніка у н.п. Сардыкі, завалодаць н.п. Плігаўкі, Паноры, далей наступаць уздоўж Зах.Дзвіны.

Праціўнік працягвае аказваць упартае супраціўленне, асабліва інтэнсіўны агонь з боку Мал.Абухава і н.п. Сардыкі.

365-ты сп у 6.30 у выніку ўпартых баёў завалодаў н.п. Бярозаўка, да 12.00 выйшаў на заходні бераг Сар'янкі, пацясняючы праціўніка да н.п. Вусце-І.

421-ы сп фарміруецца як атрад пераследавання.

*Падрыхтаваў да друку А.Бубала*

## На подступах да Асвеі

**З успамінаў генерал-палкоўніка Л. М. Сандалава, былога начальніка штаба 2-га Прыбалтыйскага фронту**

10 ліпеня 1944 года войскі 2-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем генерала арміі А.І.Яроменкі паспяхова разгарнулі наступленне з раёна Полацка на захад, да граніц Латвіі.

22-я армія генерал-лейтэнанта

Г.П.Караткова рушыла на Асвею. На подступах да яе вораг паспеў замацавацца на загадзя падрыхтаваных пазіцыях. Але, узмоцненыя танкамі і артылерыяй, батальёны маёраў Макартчана і Новікава прарвалі абарону фашыстаў, выбілі іх з вёскі Кісялі і адкінулі за шашу Себеж — Дрыса.

Атака была імклівай і нечаканай. Услед за нашай моцнай артпадрыхтоўкай, якая прыціснула немцаў да дна траншэі, аддзяленні сяржантаў Ткачэнкі, Іванова і старшага сяржанта Маскаленкі ўварваліся на пазіцыі ворага. У кароткай сутычцы было знішчана да 20 гітлераўцаў, а сямёра, на чале з афіцэрам, захоплены ў палон.

Развіваючы поспех, аддзяленні Ткачэнкі, Іванова і Маскаленкі адкінулі і другую лінію абароны праціўніка.

Вораг у беспарадку падаўся за шашу. Але ён яшчэ не страціў надзею замацавацца і пад вечар, падцягнуўшы рэзервы, пры падтрымцы танкаў, самаходных гармат і авіяцыі рабіў спробу вярнуць страчаныя пазіцыі.

Пяць жорсткіх контратак давялося адбіць байцам батальёнаў Макартчана і Новікава. Сярод многіх і многіх герояў тут выдзеліўся кулямётчык Валачкоў са ўзвода лейтэнанта Новікава. У час атакі ён бег наперадзе свайго аддзялення, ва ўпор расстрэльваў гітлераўцаў з ручнога кулямёта. Ранены ў руку, ён працягваў весці агонь адной рукой.

Нашы байцы ўтрымалі захоплены рубеж. Дзесяткі фашыстаў знайшлі на подступах да яго свой бясслаўны канец.

Агнём зенітак пад камандаваннем Супранава былі збіты чатыры самалёты «фоке-вульф-190». Танкісты і артылерысты падбілі «фердынанда» і два танкі ворага.

17 ліпеня войскі арміі Караткова ўшчыльную падышлі да Асвеі. На ўсход і на паўднёвы ўсход ад яе працягнуўся ланцуг вышынь, на якіх немцы загадзя пабудавалі абарончы рубеж пад назвай «Рэер». І вось, адкаціўшыся пад націскам нашых войск амаль на 100 кіламетраў, яны ўхапіліся за яго. На подступах да вышынь разгарэўся жорсткі бой, які не спыняўся ўвесь дзень.

Наступленне на Асвею разгарнулася ў двух напрамках: з паўднёвага ўсходу і паўночнага захаду. Першымі да вышынь прарваліся танкісты галаўной брыгады танкавага корпуса генерала М.Г.Сахно. Перадавую роту танкаў вёў ардэнаносец лейтэнант Уладзімір Солахаў. Услед ішлі танкі малодшых лейтэнантаў Жыльцова і Шумілава.

Тым часам нашы падраздзяленні, што дзейнічалі з паўночнага ўсходу, ушчыльную падышлі да вёскі Буды і захапілі яе.

Але пануючыя вышыні заставаліся яшчэ ў руках фашыстаў. Трэба было хутчэй ліквідаваць апошні тут аплот ворага. Гэтую задачу бліскуча выканалі аддзяленні сяржантаў Лявонава і Фёдарава. Пакуль рота капітана Лапшына вяла перастрэлку, адцягваючы на сябе агонь і ўвагу ворага, байцы Лявонава злева, а Фёдарава справа па-пластунску дасягнулі флангаў нямецкай абароны. Ручны кулямётчык з аддзялення Лявонава Антон Світко ўзняўся на ўвесь рост і з заклікам «Наперад, за мной!» кінуўся на ворага. Заслон нямецкіх аўтаматчыкаў быў знішчаны.

Нашы войскі штурмам авалодалі Асвеяй, знішчылі рэшткі гарнізона праціўніка і 18 ліпеня ўступілі на тэрыторыю Латвіі.

## У баях за Асвейшчыну

**З успамінаў А. Крываротава, удзельніка вызвалення Асвейшчыны**

...Цяжкія баі разгарэліся ў ліпені 1944 года на тэрыторыі Асвейшчыны. Стралковы батальён капітана Кудраўцава, які ўваходзіў у склад 208-й стралковай дывізіі 90-га стралковага корпуса, заняў 13 ліпеня не вельмі выгадную пазіцыю ля невялікай вёскі.

Вечарам камбат атрымаў загад: «Авалодаць ключавой пазіцыяй на пагорку, замацавацца і быць гатовым да вызвалення населенага пункта Асвеіца. Перарэзаць бальшак Себеж—Асвея, у ходзе наступлення прыступіць да вызвалення населеных пунктаў Кастрова, Ігналіна, Красова і раённага цэнтра Асвея. Пачатак наступлення: 3 гадзіны 15 мінут 14 ліпеня 1944 года».

Дакладна ў вызначаны час па ўсім полі разнеслася дружнае «ўра». Наперадзе байцоў бранявым шчытом ішла рота «трыццацьчацвёрак» гвардыі лейтэнанта Абрамава. Здавалася, яшчэ дзве-тры мінуты — і лава наступаючых змяце гітлераўцаў.

Аднак немцы, умела выкарыстоўваючы мясцовасць, не толькі добра акапаліся, але і сканцэнтравалі вялікія сілы. З фланга па танках ударыла самаходка: хітра схаваны «фердынанд» біў прамой наводкай без промаху. Загарэўся адзін танк, потым другі. Танкісты замарудзілі рух, спыніліся. І тут — новы ўдар, зноў страты. Танкі пайшлі ў абход.

Пакуль немцы білі па танках, камбат павёў воінаў наперад. Яны ўварваліся на пагорак і знішчылі большую частку фашыстаў, узялі ў палон 70 чалавек, захапілі 9 гармат, 7 мінамётаў, 11 кулямётаў, узялі і іншыя трафеі.

Камандзір стралковай роты лейтэнант Паракін першым па сігналу павёў байцоў, наблізіўся да першай траншэі праціўніка, куды па яго камандзе паляцелі дзесяткі гранат. Гэта дало магчымасць без страт авалодаць першай траншэяй і наблізіцца да другой, дзе, захапіўшы дзве гарматы ворага, павярнулі іх супраць немцаў.

У разгар бою лейтэнант уварваўся ў варожы бліндаж, захапіў дакументы і кулямёт, скасіў больш за дзесятак гітлераўцаў, але і сам атрымаў смяротную рану. Па прыкладу камандзіра камсамолец радавы Андрыянаў гранатамі знішчыў двух афіцэраў, узяў у палон пяць салдат. У рукапашнай схватцы адважны баец загінуў.

Праз якую гадзіну немцы ачунялі, падцягнулі больш як батальён пяхоты і пры падтрымцы артылерыі і мінамётаў пайшлі ў атаку. Ішлі напралом, упэўнена, на поўны рост, на хаду страляючы з аўтаматаў. Іх было намнога больш, чым нас, аднак на нашым баку перавага: мы паспелі акапацца, устанавіць кулямёты, процітанкавыя ружжы, наладзіць сувязь з дывізіёнам артылерыі гвардыі капітана Дзікарова.

Падпусціўшы ворага на адлегласць дакладнага паражэння, адкрылі агонь з усіх відаў зброі і за лічаныя мінуты знішчылі больш за сотню гітлераўцаў. Немцы адступілі, але, атрымаўшы падмацаванне танкамі, зноў пайшлі ў атаку з усіх бакоў. Камбат убачыў, што фашысты стараюцца не дапусціць нас да Красова і Асвеіцы, і падняў байцоў у контратаку.

Усё пайшло ў ход у той кароткай кровапралітнай сутычцы: і куля, і граната, і штык, і прыклад, і сапёрная рыдлёўка. Батальён паспяхова адбіў усе атакі немцаў, якія страцілі 7 танкаў, больш за 200 салдат і афіцэраў, авалодаў населеным пунктам Красова, перарэзаў бальшак Себеж — Асвея.

У баі загінула нямала савецкіх воінаў, сярод іх і малодшы сяржант М.М.Гардзееў, які быў пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Разгром варожых сіл на гэтым участку дазволіў вызваліць Кастрова, Ігналіна, Асвеіцу, Вялікае Сяло, Жукі, Лісна і ўшчыльную падысці да Асвеі. Тут былі задзейнічаны ўсе роды войск 90-га і 44-га корпусаў. Пасля ўпартых баёў, якія даходзілі да рукапашнай, савецкія воіны ўварваліся ў Асвею, ачышчаючы ад акупантаў дом за домам, вуліцу за вуліцай. 17 ліпеня над пасёлкам узвіўся чырвоны сцяг.

## Вызваленне станцыі Бігосава

**З успамінаў В.В.Кір'янава, капітана 70-га танкавага батальёна, удзельніка бою**

Цяжкая пераправа цераз раку Сар'янка засталася ззаду. Але фашысты не хацелі без бою пакідаць рубяжы, чапляліся за кожны дом, скрыжаванне дарог, за кожны ўзгорак.

Каля вёскі Сініцы нашым танкам перагарадзіў шлях агонь «фердынандаў» і супрацьтанкавай батарэі, якія хаваліся ў Сардыцкім лесе. У паядынак з імі ўступілі нашы самаходкі, а з боку ракі Сар'янкі — танкі 24-й гвардзейскай брыгады. Танкі ўрэшце занялі пазіцыі, а далейшай аперацыяй стаў кіраваць камандзір танкава-дэсантнага батальёна капітан Іван Сцяжко.

Уранку, на пераправе, ён быў паранены, але поле бою не пакінуў. Імя гэтага мужнага афіцэра не раз да гэтага было на старонках корпуснай газеты.

Ён загадаў лепшаму разведчыку Фёдару Асафаву разведаць абарончыя рубяжы ворага каля вёскі Кавалеўшчына.

Чакаць вяртання разведчыкаў не было часу, і хутка пачалася атака. На блізкіх подступах да вёскі капітан Сцяжко, які веў байцоў, загінуў — варожая куля трапіла яму ў сэрца.

Тым часам разведчыкі Асафава ў дзёрзкім рэйдзе ўзялі ў палон нямецкага афіцэра і двух салдат, затым разгромілі штаб і, захапіўшы карты і каштоўныя дакументы, вярнуліся ў батальён. Дакладваць ім давялося ўжо маёру Джыміеву.

Маёр вырашыў штурмаваць пазіцыі ворага зноў. Немцы былі гатовы да бою, і першая атака першай роты захліснулася. Пачаўся зацяжны бой, у які ўцягнуліся асноўныя нямецкія сілы. Тым часам узвод старшага лейтэнанта Булдакова пачаў абхадны манеўр.

Бой быў жорсткім. Некалькі нашых машын загарэлася. У баі вызначыліся камандзіры танкаў Аляксандр Кірносаў, Віктар Раеў, камсорг батальёна Віктар Маскаленка, аўтаматчык Міхаіл Маскаленка.

Танк лейтэнанта Івана Варсунова адным з першых на вялікай хуткасці прарваў баявыя парадкі варожай пяхоты, расстрэльваючы яе ва ўпор.

Былі адбіты тры контратакі, знішчана гаўбіца і пяць падвод ворага.

Узвод Булдакова ў абхадным манеўры пракладваў свой шлях агнём, лавіруючы між дотамі, выкарыстоўваючы няроўнасць мясцовасці. Фашысты ў паніцы пачалі адступленне.

Камандзір першай роты капітан Танін працягваў камандаваць нават тады, калі яго ў час адной з контратак цяжка параніла.

Вёска Кавалеўшчына і суседняя з ёй Папоўшчына былі ўзяты, далей было Бігосава.

Паралельна з гэтым напрамкам наступленне на станцыю Бігосава вялі танкі 2-га батальёна, якім камандаваў капітан Пётр Бусыгін. Яны цераз Шатрова дасягнулі бліжніх подступаў да Бігосава, забяспечыўшы тым самым свабодную пераправу цераз Сар'янку мотастралкам 5-й брыгады маёра Дзіцюка.

Аднак палі, нашпігаваныя мінамі, не дазволілі ўварвацца на станцыю з поўдня. Перашкаджаў моцны агонь «фердынандаў».

Сам будынак вакзала быў ператвораны ў крэпасць, шквальны агонь вёў браняпоезд.

Каб не даць ворагу магчымасці арганізаваць абарону на наступных рубяжах, капітан Бусыгін вырашыў зрабіць смелы тактычны ход. Пакуль група сапёраў Васіля Юшко рабіла праходы ў мінных палях, першая танкавая рота глыбокім абходам праз Балінскі лес і вёску Стаклы выйшла на чыгунку з боку Латвіі.

З'яўленне савецкіх танкаў з тылу было для немцаў поўнай нечаканасцю.

Танк з бартавым нумарам 742, якім камандаваў Уладзімір Ніканораў, на імклівым ходу вёў прыцэльны агонь. Вакол ірваліся снарады, але вадзіцель Іван Мітрафанаў ухіляў машыну ад агню.

Не ўсе снарады нашага танка рыкашэцілі. Хутка адна з агнявых кропак браневіка замоўкла. Мітрафанаў ушчыльную прыціснуў танк да браняпоезда, але раптам, на самай мяжы ўваходу ў мёртвую зону, дзе была поўная небяспека, танк уздыбіўся, спыніўшы агонь. Ён быў падстрэлены «фердынандам», які быў замаскіраваны ў кустах. Адважны экіпаж 742-га загінуў.

Дэсантнікі, якія пакінулі браню танка крыху раней, завязалі бой з гарнізонам, прабіваючыся да вакзала. Насустрач браневіку рынуліся астатнія шэсць танкаў. Быў падбіты танк Агіра, але камандзір перасеў на іншую машыну, і атака не спынялася. Вось змоўкла другая агнявая кропка браняпоезда, а неўзабаве ён пакінуў поле бою.

Фашысты трапілі ў лавушку. Адзіны магчымы шлях адступлення быў закрыты батальёнам маёра Дзіцюка, з поўначы, ад Вопытнай, падыходзілі танкі Дзмітрыева.

На станцыю ўварвалася самаходная ўстаноўка Шытава. Вадзіцель Васіль Фядотаў падмяў гусеніцамі дзве варожыя гарматы. Але зноў са схованкі раздаўся стрэл «фердынанда». Узвіўся агонь. Шытаў, ратуючы жыццё вадзіцеля, кінуўся збіваць полымя, але другі залп абарваў жыццё абодвух.

За смерць баявых сяброў адпомсціў экіпаж танка старшага лейтэнанта Івана Краўчанкі, які, падышоўшы збоку, ва ўпор расстраляў «фердынанда».

За гэты час пад скрыжаваным агнём група Юшко зрабіла праходы ў мін-

ных палях і размініравала Панорскі мост. На дапамогу танкам і дэсанту выйшла самаходная артылерыя 515-га палка. Сапёры Юшко ўжо працавалі на стрэлках і пуцях,абясшкоджваючы фугасы, міны, закапаныя авіябомбы. Жорсткі кароткі бой быў сведкам мужнасці нашых воінаў. Лейтэнант Юрый Бармін ляжаў мёртвым у акружэнні трох дзесяткаў знішчаных ім фашыстаў.

Фашысты, якія былі загнаныя ў будынак вакзала, склалі зброю. Сярод 132 палонных быў і камандзір баявой групы маёр Бус. Было захоплена 5 гармат, 7 мінамётаў, 30 кулямётаў, больш як 250 аўтаматаў і вінтовак, а таксама 1 легкавік і 1 бранявік.

Загад захаваць чыгуначную станцыю непашкоджанай і здаць яе камандаванню быў выкананы.

Яшчэ не паспелі выйсці з сховішчаў мясцовыя жыхары, як ацалелыя танкі з дэсантнікамі на брані і самаходкі рушылі ў бок Латвіі.

**З пісьмаў Р. Я. Строгіна краязнаўцам Асвейскай школы**

...14 ліпеня 1944 года я, Строгін Рыгор Яўгенавіч, камандзір мінамётнага ўзводу 291-га сп 115-й Холмскай стралковай дывізіі, быў паранены ў баі ў раёне вашага пасёлка. Гэта здарылася там, дзе гарэлі пяць нашых танкаў, што падтрымлівалі нас.

На тэрыторыю Віцебскай вобласці наша дывізія прыйшла ў значна парадзелым складзе, а пад Асвеяй у страі і зусім мала засталося. Я думаю, што ў ваш пасёлак прыйшла іншая, гвардзейская дывізія, са свежымі сіламі, толькі што ўведзеная ў бой. Я бачыў яе арлоў і тэхніку, калі мяне везлі ў шпіталь. Да Асвеі мы прайшлі з баямі больш за 180 км, але ў вашым пасёлку так і не давялося пабыць.

Там загінула шмат маіх таварышаў і малодшых па званні, але час сцірае імёны ў памяці. Зараз помню толькі гэтых: камандзір мін.роты лейтэнант Тамілаў, мал. сяржант Вашчанка, сяржант Баярынцаў — абодва загінулі ў акопчыку /прамое пападанне снарада/. Радавы Валжанкін быў паранены ў жывот. Ён прыняў страшэнна пакутлівую смерць.

Там усе гэтыя хлопцы і пахаваныя. Ці ёсць іх прозвішчы на помніках?

...Я быў паранены ўдзень. Сам дабраўся да шпіталя праз жыта — ці то поле было ўжо зжата, ці моцна прымятае, ісці было можна, але я чамусьці хутка траціў сілы.

Убачыў двух скрываўленых артылерыстаў-сяржантаў, якія набліжаліся да мяне, падтрымліваючы адзін аднаго. У абодвух былі забінтаваныя галовы. У аднаго было забінтаванае і вока, а ў другога ніжняя частка твару ўяўляла сабой суцэльную рану. Я спытаўся, чым іх гэтак? Адзін адказаў, што гарматным адкатнікам. Кажа, што іх гармата і нямецкі танк адначасова падбілі цэль. Сапраўды, непадалёк стаяла разбітая гармата, а значна далей — палаючы танк з крыжамі.

Мы ўзяліся за плечы і пайшлі ўтрох. Але сілы пакідалі мяне, яны ж самастойна наўрад ці змаглі б ісці далей. Тут нам сустрэліся яшчэ двое, адзін, памятаецца, старшына. Я папрасіў іх дапамагчы вывесці раненых...

Памятаю, як мяне адзін афіцэр пасадзіў у легкавушку, своечасова давезлі ў шпіталь. Шкада толькі, што не ведаю прозвішча гэтага выратавальніка. На фронце мы дапамагалі адзін аднаму. Будзьце і вы заўсёды патрыётамі сваёй Радзімы.

**З пісьма В. Ц. Мядзведзева**

Добры дзень, рабяты Асвейскай сярэдняй школы!

З гарачым прывітаннем да вас ветэран 325-й Дзвінскай дывізіі Мядзведзеў Васіль Цімафеевіч. Вялікі дзякуй вам, што

не забываецеся на тых, хто вызваляў нашу зямлю ад фашысцкай нечысці.

Так! У ліпені 1944г. у складзе 325-й дывізіі мы вызвалялі і вашы мясціны.

Памятаю, калі ўвайшлі на тэрыторыю Беларусі, то на нашым шляху не было ніводнага населенага пункта — усё было спалена. Праўда, выходзілі з лесу партызаны, сем'і партызан. Як цяжка было глядзець на разутых, распранутых і галодных людзей, асабліва дзяцей.

Плакалі ўсе — мы і жыхары, якія выйшлі з зямлянак. Аддавалі мы свой паёк дзецям, аддавалі ўсё, што маглі.

Вельмі цяжка ўспамінаць мінулае. Мне тады было 23 гады... Быў паранены, кантужаны. У сакавіку 1943 г. у акопах прынялі ў партыю. Маю ўзнагароды.

г.Цюмень

### З пісьма П. П. Пірагова

Паважаныя вучні!

Мая батарэя 122-мм гармат прымала актыўны ўдзел у вызваленні Асвеі.

Батарэя падтрымлівала батальён, які наступаў уздоўж дарогі, а немцы контратакавалі. Моцна даймалі «тыгры», якія стралялі з засады. На адным з узгоркаў, дзе батарэя стаяла на прамой наводцы /на паўночны ўсход ад Асвеі/, адбыўся самы моцны бой з танкамі і пяхотай праціўніка. Навокал балоты, лес. Праз лясы прасочваліся немцы з акружэння.

Атрымаўшы загад камандзіра дывізіёна Чарнышова, я з двума разведчыкамі накіраваўся на батарэю, якая была за 2,5км ад назіральнага пункта. На шляху было балота. Я пайшоў напрасткі, а разведчыкі — у абход; мы павінны былі сустрэцца на сухім месцы.

На сваім шляху я нарваўся на немцаў-акружэнцаў. Сустрэча была нечаканай для абодвух бакоў. Акрамя пісталета ды гранаты, у мяне нічога не было. Але і немцы не чакалі каманды «Рукі ўгору!». Чатыры фрыцы кінулі аўтаматы, паднялі рукі і здаліся ў палон. Узяўшы аўтамат, з гранатай у руках, я вылез з чатырма немцамі з балота, дзе мяне ўжо чакалі, хвалюючыся, мае разведчыкі.

За свой учынак /хаджэнне без салдат па лесе/ я атрымаў вымову, а немцаў здаў у штаб палка. Батарэя заняла больш выгадную пазіцыю.

Зранку пачаўся бой. Знішчыўшы агнявыя кропкі праціўніка, мы ўварваліся ў Асвею і працягвалі наступленне на г.Дагду.

Пасёлак ваш не разгледзеў добра, бо гналі немцаў. Памятаю толькі, што побач было вялікае возера.

г.Табольск

### З пісьма маці Барыса Селіванава Асвейскім школьнікам

Атрымала ад вас віншаванні з Днём Перамогі, доўга плакала, перачытваючы яго. Вельмі, вельмі вам удзячна, вялікіправялікі вам дзякуй. Не забыліся на старэнькую маці. Сагрэлі душу мне, колькі мне радасці, родным, суседзям — усе за мяне рады. Усе дзякуюць вам, і мне здаецца, адчуваецца, што сын мой жывы...

Мой сын Юра, з Далёкага Усходу, прыедзе на магілу брата. Яны вылятаюць з жонкай Тамарай самалётам на Рыгу. Я вельмі рада, яна настаўніца, а ён любіць школу, хай павучацца ў вашых, як выхоўваць чуласць у дзяцей. Вы ўжо паклапаціцеся аб іх... А я вось Барысу вершык напісала, мо і не пісьменна, але вы выкіньце непатрэбнае...

**Памяти сына-комсомольца Селиванова Бориса Петровича**

Сынок мой! Тебе навсегда восемнадцать,
И всюду то страшное слово — война!..
Ушел добровольцем на фронт ты сражаться,
Звало тебя сердце, народ, страна.
Танки гремели, пули свистели,
Смерть стерегла вас на каждом шагу,
Видя, как сёла родные горели,
Метко вы били по злому врагу.
Память о вас никогда не угаснет,
Памятник вам утопает в цветах,
Путь ваш, путь трудный, правдивый и ясный,
Вечно живёт в благодарных сердцах.

# Нашы землякі — Героі Савецкага Саюза

**БУРАК Андрэй Мацвеевіч** нарадзіўся 17.10.1943 г. у в.Асвеіца Верхнядзвінскага раёна. Герой Савецкага Саюза /1943/. Працаваў брыгадзірам у калгасе. З 1938 г. рабочы на заводзе імя В.У.Куйбышава ў Ніжнім Тагіле і ва Уральскім леспрамгасе. У Чырвонай Арміі з 14.6.1941 г., наводчык кулямёта. Вызначыўся ў верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра каля г.п.Ржышчаў Кіеўскай вобласці. Агнём кулямёта прыкрываў пераправу войск, знішчыў некалькі агнявых кропак ворага. На захопленым плацдарме ўдзельнічаў у адбіцці 3 контратак праціўніка. Загінуў 17.10.1943 г. Пахаваны ў с.Шчучынка Гарлыцкага раёна Кіеўскай вобласці. У в.Ігналіна на ўшанаванне яго памяці пастаўлена стэла.

А. М. Бурак

## Подзвіг кулямётчыка

Імкліва рухаючыся ўперад, часці 40-й арміі ноччу 22 верасня 1943 г. выйшлі на бераг Дняпра. Услед за перадавымі атрадамі падышлі да ракі асноўныя сілы. У першую ноч пачалося фарсіраванне Дняпра. Спачатку перапраўляліся разведвальныя і перадавыя атрады, а затым цэлыя падраздзяленні.

198-мы гвардзейскі стралковы полк 68-й гвардзейскай стралковай дывізіі, дзе служыў радавы А.Бурак, пачаў фарсіраванне ракі 24 верасня.

Камандзір палка атрымаў ад камдыва загад паслаць на правы бераг групу разведчыкаў.

Радавому Андрэю Бураку не давялося адправіцца з імі.

— Не гаруй, таварыш, — супакоіў яго камандзір. — Знойдзецца і табе справа. Будзеш прыкрываць таварышаў. Займай з кулямётам вось тую пазіцыю, — і ён паказаў на ледзь бачны за кустамі ўзгорачак.

Пераправа цераз Днепр спачатку праходзіла без перашкод. Але калі першыя лодкі з разведчыкамі дасягнулі сярэдзіны ракі, гітлераўцы заўважылі іх і адкрылі агонь.

Андрэй, ужо ўзяўшы на прыцэл варожыя пазіцыі на тым беразе, даслаў кароткую чаргу па мільгаўшых успышках. Адна з іх знікла. Камандзір узвода радасна ўсклікнуў:

— Кулямёт знішчаны. Малайчына!

Побач на спушчаны на ваду плыт ужо спешна грузілі боепрыпасы, садзіліся аўтаматчыкі. У хуткім часе на ім са сваім кулямётам уладкаваўся і Андрэй.

Праз пяць хвілін плыт адштурхнулі ад берага, і байцы наляглі на вёслы. Радавы Бурак застыў у напружанай позе за кулямётам. Ён нават не адчуваў, як скрозь шчыліны прасочвалася халодная вада, як хвалі захлёствалі перагружаны плыт.

Усе спяшаліся на дапамогу таварышам з першай групы, якія з апошніх сіл адбіваліся ад насядаўшых гітлераўцаў. Паспелі. Пад моцным агнём фашысты хутка адступілі.

Не паспеў Андрэй Бурак асталяваццa з кулямётам, як фашысты пайшлі ў чарговую атаку. Абаронцы невялікага плацдарма маўчалі. Гітлераўцы ўпэўнена ішлі ўперад. Андрэй узяў на мушку ланцуг варожых салдат. Калі прагучэў сігнал, пры-

цэльны агонь кулямёта Бурака абрушыўся на фашыстаў. Першым упаў афіцэр. Быццам спатыкнуліся на нябачнай перашкодзе і ўпалі на зямлю яшчэ некалькі салдат. Чым бліжэй падыходзілі фашысты, тым менш іх заставалася ў ланцугу.

Атака захлынулася.

Змоўк кулямёт Бурака. Змоўклі аўтаматы яго сяброў. Ціха стала над полем бою. Раптам над плацдармам з'явіліся варожыя бамбардзіроўшчыкі, адну за адной скідалі бомбы. Затым з-за ўзгорка паказаліся варожыя танкі. Адзін з іх рухаўся прама на акоп Бурака. Андрэй няспешна падрыхтаваў звязку гранат. Калі танк падышоў бліжэй, кулямётчык прыўзняўся і кінуў звязку насустрач машыне. Грымнуў выбух. З перабітай гусеніцай танк спыніўся на месцы.

...Цяжкія баі на плацдарме працягваліся ўвесь дзень 24 верасня. Адбіваючы атакі ворага, кулямётчык Бурак знішчыў каля ста гітлераўскіх салдат. А пакуль ён і яго таварышы стрымлівалі націск фашыстаў, на плацдарм перапраўляліся падраздзяленні дывізіі.

У бесперапынных баях мінула некалькі дзён. Але 17 кастрычніка 1943 года ў адной з жорсткіх атак наш зямляк Андрэй Бурак загінуў смерцю мужных. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

*Н.Салаўёў*

**З прадстаўлення камандавання на прысваенне гвардыі чырвонаармейцу, наводчыку кулямёта з стралковай батарэі 198-га гвардзейскага стралковага палка 68-й гвардзейскай дывізіі Андрэю Мацвеевічу Бураку звання Героя Савецкага Саюза**

Таварыш Бурак у час фарсіравання р.Днепр 24.9.43 паказаў выключную мужнасць, стойкасць і гераізма. Пад моцным кулямётным, артылерыйскім і аўтаматным агнём, пад няспыннай бамбёжкай ворага т.Бурак вёў знішчальны агонь па агнявых кропках праціўніка з свайго «максіма». Яго кулямёт прымусіў замоўкнуць некалькі кулямётных разлікаў супраць нашай пераправы. Калі ў кулямёта т.Бурака распаліўся ствол, то т.Бурак замяніў іншым і працягваў прыкрываць пераправу. На правым беразе спатрэбілася падмацаванне, туды быў пасланы т.Бурак з сваім разлікам.

Пераправіўшыся пад ураганным агнём праціўніка, ён адразу пачаў ва ўпор расстрэльваць варожых салдат, пры гэтым адбіў тры контратакі лікам пераўзыходзячых сіл праціўніка з вялікімі стратамі для ворага.

Тав.Бурак Андрэй Мацвеевіч абараняў самы цэнтр плацдарма нашай пераправы, выбіваючы з агнявых кропак праціўніка і прасоўваючыся крок за крокам наперад.

Гэтым ён адыграў выключную ролю ў пераправе нашых войскаў. Усяго знішчыў з кулямёта на левым і правым берагах Дняпра сто нямецкіх салдат і афіцэраў.

Тав.Бурак Андрэй Мацвеевіч дастойны ўрадавай узнагароды — ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка» і прысваення звання Герой Савецкага Саюза.

*Камандзір 198-га Гвардзейскага стралковага палка*
*Гвардыі маёр Арцем'еў.*

6 кастрычніка 1943г.

Заключэнне вышэйстаячых органаў:
Дастойны ўрадавай узнагароды — звання Герой Савецкага Саюза.

*Член Ваеннага Савета*
*Генерал-маёр Кулік*

*Камандуючы 40-й Арміі*
*Генерал-палкоўнік Маскаленка*

Кастрычнік 1943

**ЗАБАГОНСКІ Сямён Аляксандравіч** нарадзіўся 14.1.1910 г. у в.Залучча Верхнядзвінскага раёна. Герой Савецкага Саюза /1943/. Член КПСС з 1944. З 1941 г. на Заходнім, Цэнтральным, Варонежскім,

С. А. Забагонскі

І. К. Захараў

І. М. Кабзун

4-м Украінскім франтах. Памочнік камандзіра ўзвода сяржант С.А.Забагонскі вызначыўся пры вызваленні Кіеўскай вобласці. У ноч на 24.9.1943 г. на чале групы разведчыкаў фарсіраваў Дняпро на поўнач ад г.п.Ржышчаў, светлавымі сігналамі паказаў месца для прычальвання лодак і платоў. Падраздзяленні палка паспяхова пераправіліся цераз раку. Удзельнічаў у баі за плацдарм, адбіцці контратак. Пасля вайны працаваў у Томскай і Ленінградскай абласцях. У вёсцы Залучча ў памяць аб С.А.Забагонскім пастаўлена стэла. Памёр 27.1.1955.

**ЗАХАРАЎ Іван Кузьміч** нарадзіўся 13.8.1909 г. у в.Ганявічы Лагойскага раёна. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці. Герой Савецкага Саюза /1944/. Заслужаны работнік культуры БССР /1960/. Член КПСС з 1937 г. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП/б/Б /1948/. У 1941 г. адзін з стваральнікаў і кіраўнікоў Асвейскага партыйна-патрыятычнага падполля. У красавіку 1942 г. арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад імя Фрунзе, у ліпені 1942—студзені 1944 г. камандзір партызанскай брыгады Асвейскай імя М.В.Фрунзе, адначасова ў чэрвені 1942—снежань 1943 г. першы сакратар Асвейскага падпольнага РК КП/б/Б. З ліпеня 1944 г. на партыйнай рабоце. У 1953—1963 гг. старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза рабочых будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

Аўтар кнігі «Вайна ў краі азёр» /1973/. Яго імем названа вуліца ў г.п.Асвея. Памёр 18.5.1982.

**КАБЗУН Іван Міхайлавіч** нарадзіўся 24.11.1902 г. у в.Барсукі Шайтараўскага с/с. Працаваў у сельскай гаспадарцы, потым набыў спецыяльнасць цесляра. У Чырвонай Арміі ў 1924—1927 гг. З 1930 служыў у войсках АГПУ-НКУС, з снежня 1939 — у пагранічных войсках.

Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. Камандзір кулямётнага ўзвода 5-га пагранічнага палка лейтэнант І.М.Кабзун 27.1.1940 г. з невялікай групай пагранічнікаў аказаўся ў акружэнні, на працягу 46 дзён вёў няроўны бой, быў цяжка паранены. З астаткамі групы выйшаў з акружэння. Званне Героя Савецкага Саюза І. М. Кабзуну прысвоена 26.4.1940 г. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

Пасля савецка-фінляндскай вайны вучыўся ў Вышэйшай школе НКУС. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у 1942 г.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Эдуард Віктаравіч** нарадзіўся 27.10.1909 г. у в.Кулакова Верхнядзвінскага раёна. Удзельнік партызанскага руху ў Гомельскай вобл. Герой Са-

І. М. Кабзун (справа) з баявым таварышам ля свайго кулямёта. 1942 г.

Дошка ў гонар Э. В. Лаўрыновіча

Э. В. Лаўрыновіч

І. А. Макеенак

вецкага Саюза /1944/. Член КПСС з 1932 г. З 1933 г. на партыйнай рабоце ў Краснадарскім краі. З 1938 г. старшыня калгасаў у Буда-Кашалёўскім раёне. З жніўня 1941 г. у тыле ворага: камандзір дыверсійнай групы, узвода атрада імя Калініна партызанскай брыгады 1-й Гомельскай. У 1943—1971 гг. на савецкай і адміністрацыйнай рабоце. Аўтар кнігі «Вогненныя рэйкі». Памёр 12.3.1982.

**МАКЕЕНАК Іван Андрэевіч** нарадзіўся 15.7.1914 г. у в.Гарадзілавічы Верхнядзвінскага раёна. Герой Савецкага Саюза /1945/. Член КПСС з 1944 г. У Чырвонай Арміі з 1936 г. З 1941 г. на Чарнаморскім флоце. Удзельнік абароны Севастопаля, вызвалення Марыупаля, Новарасійска, Бярдзянска.

За выдатнае выкананне баявых заданняў пры вызваленні Марыупаля ў верасні 1943 г. быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Загінуў 28.3.1944.

## Подзвіг дэсантніка

У сакавіку 1943 г. Івана Андрэевіча па яго настойлівай просьбе залічылі ў дэсантны атрад, якім камандаваў старшы лейтэнант К.Ф.Альшанскі. Атрад быў сфарміраваны з 68 маракоў-добраахвотнікаў 384-га асобнага батальёна марской пяхоты і 12 сувязістаў адной з часцей 28-й арміі 3-га Украінскага фронту.

Фашысты, адступаючы пад ударамі нашых войскаў, намерваліся ўзарваць Мікалаеўскі порт. Каб не дапусціць гэтага, перад батальёнам была пастаўлена задача высадзіць у порт атрад з Бугскага лімана.

Калі маракі падышлі да прычала, Альшанскі выслаў разведку, але бераг быў

пусты — фашысты не чакалі ў сваім тыле нашых воінаў. Альшанскі заняў тры будынкі, разлічваючы арганізаваць кругавую абарону і забяспечыць кантроль над раёнам, сам ён з радыстам і групай байцоў размясціўся ў канторы порта, а дзве іншыя групы занялі кантору элеватара і доўгае, раздзеленае цэментавымі перагародкамі памяшканне свінарніка.

Ноччу 26 сакавіка 1944 г. атрад на рыбацкіх лодках прайшоў з вёскі Багаяўленкі 15 кіламетраў уверх па Паўднёвым Бугу, абодва берагі якога на працягу 7 кіламетраў знаходзіліся ў руках ворага, і на досвітку высадзіўся ў порце Мікалаева. Яго задачай было: скрытна высадзіўшыся ў тыле ворага, парушыць камунікацыі фашыстаў, выклікаць паніку, сарваць намечаны на 26 сакавіка ўгон мірных жыхароў у фашысцкае рабства, аблегчыць рух нашых часцей на Мікалаеў.

Зняўшы варожых вартавых, дэсантнікі занялі некалькі будынкаў порта, элеватар і прыстасавалі іх да абароны.

Вораг не чакаў смелага і дзёрзкага ўдару маракоў. Атрад унёс замяшанне і разгубленасць у яго рады. На барацьбу з дэсантнікамі былі кінуты буйныя сілы, але маракі выстаялі.

Атрад двое сутак вёў з праціўнікам няроўны бой, адбіў 18 контратак, знішчыў каля 700 гітлераўцаў.

У цяжкія гадзіны бою была перададзена радыёграма: «Мы, байцы і афіцэры, маракі атрада таварыша Альшанскага клянёмся перад Радзімай, што задачу, якая стаіць перад намі, будзем выконваць да апошняй кроплі крыві, не шкадуючы жыцця».

Дэсантнікі ўтрымлівалі элеватар да падыходу нашых войскаў. У гэтым баі 28.3.1944 г. смерцю храбрых загінуў І.А.Макеенак. Сваю задачу дэсант выканаў дастойна: перашкодзіў згону 120 тысяч мірных жыхароў у рабства, папярэдзіў разбурэнне горада.

Усе ўдзельнікі легендарнага дэсанта і іх праваднік І.А.Макеенак сталі Героямі Савецкага Саюза.

*А. П. Ярохін*

**МЯДЗЕЛЬ Міхаіл Маркавіч** нарадзіўся 17.10.1910 г. у в.Задзежжа Верхнядзвінскага раёна. Герой Савецкага Саюза /1943/. Член КПСС з 1939 г. З 1941 г. на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім і Варонежскім франтах. Старшы лейтэнант М.М.Мядзель вызначыўся пры вызваленні Украіны.

## Ратная слава земляка

Фашысты ўчэпіста трымаліся за кожны горад, населены пункт, рэчку. 8 верасня 1943 года быў атрыманы загад авалодаць вышынёй 160,0 (Канатопскі раён, Сумская вобласць). Фашысты, што ўмацаваліся на ёй, на ўсіх подступах вялі ўраганны агонь. Асабліва цяжка давялося роце, палітруком у якой быў М.М.Мядзель. У адну з крытычных хвілін палітрук падняўся на ўвесь рост і з крыкам «За мной!», кінуўся наперад, імклівым рыўком рота пераадолела вогненны рубеж і далейшымі сваімі дзеяннямі ў значнай меры садзейнічала перамаганоснаму зыходу бою.

Асабліва ўпарта супраціўляліся гітлераўцы на подступах да Дняпра. Жорсткі

М. М. Мядзель

бой ішоў па ўсім левым узбярэжжы ракі. 1031-му стралковаму палку пад камандаваннем палкоўніка Новікава ўдалося ўклініцца ў абарону праціўніка...

Пераадольванне шырокай паўнаводнай ракі з высокім крутым берагам, занятым ворагам, было вельмі цяжкай і адказнай справай. Для ажыццяўлення гэтай дзёрзкай і небяспечнай аперацыі адбіраліся лепшыя з лепшых. Адной з груп, якая перапраўлялася на паўднёвы захад ад сяла Акулінава ў раёне Рыбнага промыслу, што ў Чарнігаўскай вобласці,камандаваў Мядзель.

Сабраўшы розныя плывучыя сродкі, пагрузіўшы на іх зброю, пад покрывам ночы рушылі байцы да правага берага. У жорсткай кароткай сутычцы выбілі фашыстаў з іх траншэй і гнёздаў, стварылі тут свой плацдарм, які ўтрымлівалі да падыходу асноўных сіл, а потым забяспечвалі іх бесперашкодную пераправу.

За ўдзел у гэтай аперацыі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 кастрычніка 1943 года Міхаілу Маркавічу Мядзелю і яго баявым сябрам было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Давялося Міхаілу Маркавічу (да таго часу ён стаў парторгам артылерыйска-зенітнага палка) ваяваць і на Далёкім Усходзе. І там ён свята выконваў свой партыйны і воінскі абавязак. Да канца вайны на гімнасцёрцы М.М.Мядзеля побач з Залатой Зоркай Героя заззялі ордэн Леніна, два ордэны Чырвонай Зоркі і 6 медалёў. Памёр 21.11.1981 г. Пахаваны ў Маскве.

**ТРАЯН Надзея Віктараўна** нарадзілася 24.10.1921 г. у г.Верхнядзвінску, удзельніца партызанскага руху ў Мінскай вобласці. Герой Савецкага Саюза /1943/. Скончыла 1-ы Маскоўскі медыцынскі інстытут /1947/, кандыдат медыцынскіх навук. Член КПСС з 1946 г. У Айчынную вайну на падпольнай рабоце ў Смалявічах. З яе ўдзелам створана падпольная камсамольская арганізацыя, якая перапраўляла людзей у партызаны, збірала звесткі пра ворага, памагала сем'ям партызан. З ліпеня 1942 г. разведчыца партызанскай брыгады Дзядзькі Колі. Удзельніца падрыхтоўкі знішчэння ката беларускага народа генеральнага камісара Беларусі гаўляйтэра В.Кубэ. Пасля вайны на грамадскай рабоце, выкладчык ВНУ, прарэктар 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута, з'яўлялася членам прэзідыума Усесаюзнага савета ветэранаў вайны і працы, старшыня выканкома Саюза таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР. Жыве ў Маскве.

Н. В. Траян

## Дакументы сведчаць

